УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА"

Факультэт філалагічны

Кафедра літаратуры

УЗГОДНЕНА
загадчык кафедры
_________А.У. Крыклівец
16 мая 2020 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_________С.У. Нікалаенка
16 мая 2020 г.

ЗБОРНІК ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫХ КОМПЛЕКСАЎ
ПА ВУЧЭБНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

для спецыяльнасці

1-21 05 01 Беларуская філалогія

Складальнікі: А.У. Крыклівец, В.Ф. Падстаўленка, Л.Я. Глазман, В.І. Русілка

Разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні навукова-метадычнага савета
21.05.2020, пратакол № 5

Репозиторий ВГУ

УДК 821.161.3(075.8)
ББК 83.3(4Беи)я73
Б43

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 5 ад 21.05.2020.

Складальнікі: загадчык кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **А.У. Крыклівец;** дацэнт кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **В.Ф. Падстаўленка;** старшы выкладчык кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук **Л.Я. Глазман;** дацэнт кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **В.І. Русілка**

Р э ц э н з е н т ы :
кафедра сусветнай літаратуры і замежных моў УА "ПДУ";
загадчык кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Г.А. Арцямёнак*;
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В.Э. Зіманскі*;
дацэнт кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Г.А. Гладкова*;
прарэктар па вучэбнай рабоце ДУДАД "ВАІРА",
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Ю.У. Маханькоў*

Б43 **Беларуская літаратура: Гісторыя і сучаснасць для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія :** зборнік вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных дысцыплінах / склад.: А.У. Крыклівец [і інш.]. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2020. – 127 с.

Прапанаваны зборнік вучэбна-метадычных комплексаў адрасаваны студэнтам і выкладчыкам-філолагам. Ён уключае вучэбна-метадычныя комплесы па дысцыплінах "Гісторыя беларускай літаратуры" (пратакол НМС № 6 ад 17.06.2016), "Гісторыя беларускай літаратуры XX–XXI стагоддзяў" (пратакол НМС № 6 ад 17.06.2016), "Методыка выкладання беларускай літаратуры" (пратакол НМС № 6 ад 29.06.2015).

**УДК 821.161.3(075.8)**
**ББК 83.3(4Беи)я73**

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2020

Рэпазіторый ВГУ

# ЗМЕСТ


ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........................................................ 4
ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ........................................................ 6
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XI–XVIII СТАГОДДЗЯЎ *(В.Ф. Падстаўленка)* ........................................................ 7
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ *(Л.Я. Глазман)* ........................................................ 16
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ *(Л.Я. Глазман)* ........................................................ 33
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1930-Х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1950-Х ГАДОЎ *(В.Ф. Падстаўленка)* ........................................................ 53
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ *(А.У. Крыклівец)* ........................................................ 60
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ *(А.У. Крыклівец)* ........................................................ 66
МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ *(В.І. Русілка)* .. 73
ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ ........................................................ 87
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ........................................ 87
1 семестр ........................................................ 87
2 семестр ........................................................ 89
3 семестр ........................................................ 91
4 семестр ........................................................ 93
5 семестр ........................................................ 99
6 семестр ........................................................ 104
7 семестр ........................................................ 107
МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ................ 111
7 семестр ........................................................ 111
КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ........................................................ 114
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (ЭКЗАМЕН) ........................ 114
1 семестр ........................................................ 114
2 семестр ........................................................ 115
3 семестр ........................................................ 117
4 семестр ........................................................ 119
5 семестр ........................................................ 121
6 семестр ........................................................ 122
7 семестр ........................................................ 124
МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (ЗАЛІК) .... 126
7 семестр ........................................................ 126


Репозиторий ВГУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта выкладання дысцыплін** – даць студэнтам цэласнае ўяўленне пра гісторыка-храналагічнае развіццё беларускай літаратуры; зарыентаваць на канцэптуальнае навуковае разуменне гісторыі беларускай літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага руху, нацыянальнай спецыфікі, мастацкіх формаў адлюстравання і светапазнання, жанрава-стылёвых тэндэнцый развіцця; раскрыць разнастайнасць і асаблівасці гісторыка-літаратурнага працэсу; падрыхтаваць высокакваліфікаваных выкладчыкаў беларускай літаратуры.

**Задачы вывучэння дысцыплін:**

− раскрыць значэнне беларускай літаратуры ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў;

− паказаць веліч і значэнне беларускай класікі;

− вызначыць узаемадзеянне традыцый і наватарства ў развіцці беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзя;

− даць характарыстыку найбольш важным напрамкам, плыням, індывідуальным стылям, пэўным фактам у гісторыі беларускай літаратуры і ў сучасным літаратурным працэсе;

− даць студэнтам грунтоўныя веды па асноўных праблемах сучаснай методыкі выкладання літаратуры ў школе;

− выпрацаваць трывалыя навыкі выбару і выкарыстання аптымальных метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры;

− навучыць правільнай арганізацыі ўрока літаратуры і пазакласнай працы па літаратуры.

**Патрабаванні да засваення вучэбных дысцыплін (з уключэннем патрабаванняў адукацыйнага стандарта).**

Змест вучэбнай праграмы і засваенне вучэбных дысцыплін накіравана на забеспячэнне наступных **кампетэнцый.**

**Акадэмічных кампетэнцый:**

− АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.
− АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.
− АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.
− АК-4. Умець працаваць самастойна.
− АК-5. Быць здольным прадуцыраваць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).
− АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.
− АК-8. Мець навыкі вуснай і пісьмовай камунікацыі.
− АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**Сацыяльна-асобасныхкампетэнцый:**

– САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.
– САК-2. Быць здольным да сацыяльных кантактаў.
– САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.

**Прафесійных кампетэнцый у напрамках**

**Навукова-педагагічная і вучэбна-метадычная дзейнасць:**

– ПК-1. Планаваць, арганізоўваць і весці педагагічную (вучэбную, метадычную, выхаваўчую) дзейнасць.
– ПК-2. Выкарыстоўваць розныя тэхналогіі навучання мове і літаратуры.

Рэпазіторый ВГУ

– ПК-3. Ствараць і рэдагаваць дакументы з улікам спецыфікі дзелавой камунікацыі.
– ПК-4. Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку вынікаў.

**Навукова-даследчая дзейнасць:**

– ПК-5. Планаваць, арганізоўваць і весці навукова-даследчую працу ў галіне філалогіі.
– ПК-6. Выбіраць неабходныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і выкарыстоўваць новыя метады, зыходзячы з задач канкрэтнага даследавання.
– ПК-10. Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах.

**Праектная дзейнасць:**

– ПК-11. Выкарыстоўваць сучасную метадалогію лінгвістычных і літаратуразнаўчых даследаванняў, сродкі аўтаматызацыі праектавання, афармляць праектную дакументацыю;
– ПК-12. Праводзіць аналіз праектнай дзейнасці ў гуманітарнай сферы, распрацоўваць прапановы па павышэнні эфектыўнасці запланаваных даследаванняў.

**Арганізацыйна-кіруючая дзейнасць:**

– ПК-13. Арганізоўваць працу малых калектываў выканаўцаў для дасягнення пастаўленых мэт.
– ПК-14. Выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці навыкі педагагічных (дзелавых) кантактаў.
– ПК-15. Узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных спецыяльнасцей.
– ПК-18. Выкарыстоўваць сучасныя сродкі тэле- і інтэрнэт-камунікацый.

**Інавацыйная дзейнасць:**

– ПК-20. Ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывах развіцця галіны, інавацыйных тэхналогіях, праектах і рашэннях.
– ПК-23. Праводзіць доследы, заснаваныя на інавацыйных тэхналогіях і методыках.
– ПК-24. Авалодваць і ўкараняць у навучальны працэс інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі.

**Студэнт павінен**
**ведаць**:

– літаратурны працэс у сувязі з гісторыяй грамадства;
– спасціжэнне гісторыі літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага развіцця;
– творчасць буйных беларускіх пісьменнікаў;
– нацыянальную спецыфіку беларускай літаратуры;
– спецыфіку арганізацыі працэсу навучання літаратуры;

**умець:**

– характарызаваць асноўныя перыяды развіцця літаратуры;
– характарызаваць літаратурны напрамак, плынь, жанр;
– аналізаваць творчасць пісьменніка, заканамернасці літаратурнага развіцця;
– выкарыстоўваць тэхналогіі пабудовы сучаснага ўрока літаратуры;

**валодаць:**

– адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;
– навыкамі розных спосабаў аналізу літаратурнага твора.

Рэпазіторый ВДУ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва раздзела | Лекцыі (колькасць гадзін) | Практычныя заняткі (колькасць гадзін) |
|---|---|---|---|
| 1. | Гісторыя беларускай літаратуры XI–XV стагоддзяў | 40 | 20 |
| 2. | Гісторыя беларускай літаратуры XVI–XVIII стагоддзяў | 28 | 16 |
| 3. | Гісторыя беларускай літаратуры XIX стагоддзя | 54 | 16 |
| 4. | Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя | 54 | 40 |
| 5. | Беларуская літаратура 1930-х – першай паловы 1950-х гадоў | 50 | 40 |
| 6. | Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя | 38 | 30 |
| 7. | Гісторыя беларускай літаратуры канца XX – пачатку XXI стагоддзя | 30 | 20 |
| 8. | Методыка выкладання беларускай літаратуры | 26 | 20 |

Репозиторий ВГУ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XI–XVIII СТАГОДДЗЯЎ

## ЛІТАРАТУРА XI–XV СТСТ.

### Асноўныя этапы і факты вывучэння даўняй беларускай літаратуры. Персаналіі

Вычарпальна аднавіць літаратурны працэс XI–XIII стст. зараз праблематычна. Прычынай таму стала страта асноўнай часткі помнікаў старажытнага пісьменства ў выніку шматлікіх войнаў, нашэсцяў, стыхійных бедстваў, унутранай рэлігійнай і сацыяльнай барацьбы, знішчэння літаратурных твораў. У працяглым па часе працэсе развіцця даўняй беларускай літаратуры традыцыйна вылучаюцца наступныя этапы:

1. ЛІТАРАТУРА СЯРЭДНЯВЕЧЧА XI –пач. XVI ст.;
   а. літаратура перыяду ранняга Сярэднявечча (XI –першая палова XIII ст.);
   б. літаратура перыяду позняга Сярэднявечча (сярэдзіна XIII ст.–пачатак XVI ст.);
2. ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ І РЭФАРМАЦЫІ (XVI ст.);
3. ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ БАРОКА І АСВЕТНІЦТВА XVII –XVIII стст.;
   а. алітаратура перыяду ранняга Барока і Контррэфармацыі (канец XVI ст. – 80-я гады XVII ст.);
   б. літаратура перыяду позняга Барока (канец XVII ст. – 30-я гады XVIII ст.);
4. ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА (1740-я гады – канец XVIII ст.).

Даўняя літаратура адрозніваецца ад сучаснай сваімі спецыфічнымі ідэямі, жанрамі, іх іншым функцыянаваннем і сферай ужывання. Так, у літаратурных творах эпохі Сярэднявечча выяўляліся не толькі эстэтычныя, але і рэлігійна-філасофскія, грамадска-палітычныя погляды нашых продкаў, іх элементарныя навуковыя ўяўленні пра свет.

Старажытная беларуская літаратура фармавалася дзякуючы дзвюм плыням: перакладной і арыгінальнай літаратурам. У ходзе ўзаемадзеяння перакладныя творы асіміляваліся, а арыгінальныя набывалі агульнатыповыя рысы. Першапачаткова літаратура не была іманентна самадастатковай, а выконвала рэлігічныя задачы з акцэнтам на маральна-дыдактычных аспектах. Гэта стрымлівала развіццё ўласна мастацкай літаратуры, а таксама абумовіла значную залежнасць твораў ад сацыяльна-палітычных падзей і светапоглядных установак таго часу.

**“Аповесць мінулых гадоў” – яркі** помнік старажытнай літаратуры, каштоўная крыніца нашых ведаў пра жыццё продкаў. У гэтым творы шырока адлюстравана гераічная барацьба ўсходніх славян супраць качэўнікаў і Візантыйскай імперыі за сваю незалежнасць, гісторыя станаўлення хрысціянства на старажытнай Русі, сацыяльная і рэлігійная барацьба ў Кіеўскай дзяржаве і інш. Тут захаваліся ўнікальныя звесткі па беларускай гісторыі (факты пра Полацкую зямлю, першых полацкіх князёў **Рагвалода**, Брачыслава, Усяслава Чарадзея, Рагнеду).

Летапісец прытрымліваўся пазіцыі агульнага паходжання ўсіх славян, праводзіў ідэю гістарычнага адзінства і палітычнай незалежнасці ўсходнеславянскіх зямель.

Працягам “Аповесці мінулых гадоў” быў **Кіеўскі летапіс**, які складаўся на працягу XII ст. Як помнік эпохі пачатку феадальнай раздробленнасці Кіеўскі летапіс цікавы і тым, што ў ім захаваўся шэраг арыгінальных і вельмі каштоўных звестак па гісторыі Полацкага княства. Так, пад 1159 г. змешчана падрабязнае апавяданне пра паўстанне палачан супраць князя Расціслава Глебавіча і вяртання ў Полацк пасля пяцігадовага выгнання князя Рагвалода Барысавіча.

**Кірыла Тураўскі (паміж 1113-1130–1182-1188)** – найбуйнейшы майстар слова старажытнай Беларусі, выдатны культурны і рэлігійны дзеяч. Творчая спадчына яго налічвае больш за 70 твораў. Першую групу складаюць “Дыдактычныя парады і

Рэпазіторый ВГУ

павучанні”. Важнейшае месца тут адводзіцца ідэі шанавання настаўнікаў сваіх. Другая група – урачыстыя казанні на царкоўныя святы (напрыклад, “Слова ў першую нядзелю пасля Пасхі”). Напісаў каля 30-і малітваў, якія з’яўляюцца сапраўднымі шэдэўрамі старабеларускай духоўнай паэзіі. Лірычны герой малітваў адрозніваецца інтэлектуальнасцю і духоўнасцю, ён прагне дасканаласці і свабоды, гармоніі з прыродай, добрай славы, марыць вярнуцца да праведнага жыцця. Асаблівае месца ў творчасці Кірылы Тураўскага займаюць прыпавесці (напрыклад, **“Пра чалавечую душу і цела**”).

**Еўфрасіння Полацкая (1110–1167–1173)** – нябесная заступніца Беларусі, асветніца, выключны па значнасці **рэлігійны і культурны дзеяч. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”** – помнік прыгожага пісьменства Беларусі канца XII – пачатку XIII стст. У творы сінтэзуюцца агіяграфічныя і прыгодніцкія элементы, тут цікава раскрываецца вобраз святой Еўфрасінні як у сімвалічным, так і ў рэалістычным плане.

**Клімент Смаляціч (?–1164)** – царкоўна-палітычны дзеяч, мысліцель, пісьменнік. У яго творчай спадчыне захаваліся “Пасланні да прасвітара Фамы” і “Павучанне аб любові”. У “**Пасланнях…**” аўтар разважаў аб прызначэнні духоўных асоб у пошуку ісціны, раскрыцці ідэй Бібліі і антычных мысляроў (Гамера, Арыстоцеля, Платона).

**Аўраамій Смаленскі(1172–1221)** – асветнік, рэлігійны і грамадскі дзеяч. За актыўнае прапаведванне хрысціянства і ўзорнае жыццё праваслаўная царква кананізавала Аўраамія. Яго вучань манах Яфрэм напісаў “Жыціе прападобнага Аўраамія Смаленскага”.

**Працягвае ў гэты перыяд актыўна развівацца і плынь свецкай літаратуры.** У **Галіцка-Валынскім летапісе** змяшчаюцца звесткі пра станаўленне ВКЛ, пра жыццё і дзейнасць Міндоўга, Войшалка, іншых князёў. Ён паслужыў узорам і крыніцай для пазнейшых твораў: “Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага” і “Хронікі Быхаўца”.

**“Слова пра паход Ігаравы” заслужана лічыцца шэдэўрам** сусветнай паэзіі эпохі Сярэднявечча**.** Прыблізна ў 1185–1187 гг. узнік гэты твор, ён стаў найвышэйшым дасягненнем старажытнай літаратуры. Паэма прысвечана гістарычна сапраўдным падзеям, у ёй дзейнічаюць рэальныя гістарычныя героі. Аповед тут эмацыйна афарбаваны, ліра-эпічны паводле жанравай прыроды. У цэнтры твора – апісанне няўдалага пахода князя Ігара на полаўцаў. Паэт услаўляе гераізм і рыцарскую доблесць старажытнарускіх воінаў. Па сваёй ідэйнай сутнасці паэма з’яўляецца ўсхваляваным аўтарскім словам пра лёс усёй Рускай зямлі перад вялікай агульнай пагрозай. Тут глыбока выявіліся грамадзянскі патрыятызм творцы, яго шырокі гістарычны кругагляд, народная мудрасць.

У сувязі з завяршэннем палітычнай цэнтралізацыі і ўзмацненнем этнічнай кансалідацыі беларускіх зямель у XV ст. узніклі агульнадзяржаўныя **беларуска-літоўскія летапісы**. У іх прадстаўлены погляды перадавых людзей старажытнай Беларусі, якія былі прыхільнікамі вялікакняжацкай улады, выступалі не за феадальную раздробленасць, а за адзінства і магутнасць краіны, за яе высокі міжнародны статус. Першым такім летапісным творам быў “**Летапіс вялікіх князеў літоўскіх**”. Помнік прысвечаны гісторыі драматычнай барацьбы за ўладу паміж нашчадкамі князя Гедыміна, апісвае спробы аб’яднаць усходнеславянскія рэгіёны.

У цэнтры ўвагі невядомага аўтара – жорсткая барацьба паміж князямі Ягайлам Альгердавічам і яго дзядзькам Кейстутам Гедымінавічам. Нягледзячы на агульны аб’ектыўны аповед, сімпатыі аўтара належаць Кейстуту і Вітаўту, якія намаляваны з відавочным спачуваннем як сумленныя і высакародныя людзі, чые вобразы супрацьпастаўлены здрадліваму і бязлітаснаму Ягайлу.

Рэпазіторый ВДУ

## ЛІТАРАТУРА XVI–XVII СТСТ.

### Асноўныя факты літаратурнага працэсу. Персаналіі

У першай палове XVI ст. у асяроддзі патрыятычна настроенай арыстакратыі была створана **"Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага",** легендарная гісторыя Літвы ад міфічнага князя Палемона да Гедыміна. У гэтым помніку, напісаным у форме гістарычнай аповесці, сцвярджаецца высакароднае паходжанне літоўскіх князёў і шляхты ад рымскіх патрыцыяў.

Заслужаную вядомасць **Яну Вісліцкаму (каля 1485–1490–пасля 1516)** прынесла выдадзеная ім навалацінская паэма **"Пруская вайна"** (1515), прысвечаная перамозе над Тэўтонскім ордэнам ля Грунвальда аб'яднаных войскаў ВКЛ і Польшчы. У паэтычнай экспазіцыі твора аўтар звяртаецца з просьбаю да алімпійскіх багоў і музы Каліопы, каб яму хапіла натхнення ўзнавіць легендарны радавод вялікадзяржаўцаў**. Далей** апісваецца захопніцкая палітыка тэўтонцаў і разгром іх пад Грунвальдам. Фіналам твора з'яўляецца сцэна вяселля караля Ягайлы з Соф'яй Гальшанскай. У паэме ўдала спалучаюцца адпаведныя жанравыя і агульныя мастацкія традыцыі з пераканаўчай аўтарскай пазіцыяй.

**Мікола Гусоўскі (1470–1533)**, беларускі паэт-гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння, прадстаўнік новалацінскай усходнееўрапейскай школы, дзеяч славянскай культуры.

У складзе дыпламатычнай місіі ад ВКЛ Гусоўскі трапіў у Рым, дзе задумаў напісаць свой лепшы твор **"Песня пра зубра"**, выдадзены ў Кракаве ў 1523 г. Тут аўтар выступіў выразнікам прагрэсіўных грамадска-палітычных і эстэтычных поглядаў таго часу, папулярызатарам гісторыі і культуры Беларусі ў сусветнай прасторы, прадстаўніком рэнесансавага рэалізму. У паэме выразна прасочваецца патрыятычны заклік да яднання еўрапейскіх народаў перад пагрозай турэцкага нашэсця, услаўляецца свабодная, гарманічна развітая і мужная асоба, гучыць ідэя патрыятызму, раскрываецца антываенны пафас, сцвярджаецца рэнесансавая канцэпцыя гарманічных стасункаў чалавека, грамадства і прыроды. Гусоўскі з'яўляецца таксама аўтарам паэм "Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпені месяцы" (1524), "Жыццё і подзвігі святога Гіяцынта" (1525). Яго паэзія паўплывала на станаўленне гістарыяграфіі Вялікага княства Літоўскага, спрыяла росквіту лацінскай і ўласнабеларускай літаратур.

**Францыск Скарына (паміж 1480–1490–каля 1551)** – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, асветнік, гуманіст, пісьменнік, грамадскі дзеяч, вучоны. У 1517 годзе Скарына выдаў сваю першую кнігу – "Псалтыр", пасля яшчэ 22 кнігі Старога Запавету пад агульнаю назваю "Библия руска". У яго творах своеасабліва сінтэзаваліся антычныя і сярэдневяковыя падыходы з ідэалогіяй еўрапейскага Адраджэння, хрысціянскі гуманізм з рэнесансава-гуманістычнымі ўяўленнямі. Асветніцкія і патрыятычныя ідэі Скарыны садзейнічалі ўсебаковаму духоўнаму, інтэлектуальнаму і грамадскаму развіццю чалавека.

Яго выданні адметныя вяршынным мастацкім узроўнем, тэхнічнай (выдавецкай) дасканаласцю і майстэрствам, яны былі арыентаваны на ўсе пласты беларускага насельніцтва. Кнігі асветніка вылучаліся зручнымі памерамі, а асабістыя каментарыі Скарыны былі разлічаны на ўспрыняцце кніжнай прамудрасці простымі ("паспалітымі") людзьмі. Духоўная спадчына Францыска Скарыны была асэнсавана і ў значнай ступені развіта наступнымі пакаленнямі беларускіх мысліцеляў, гуманістаў-асветнікаў.

**Рэфармацыйны рух у Беларусі прывёў да значных змен у грамадскім і літаратурным жыцці краіны.** Другая чвэрць XVI ст. стала перыядам папулярызацыі рэфармацыйных ідэй у шэрагу заходнееўрапейскіх рэгіёнаў. Рэфармацыя з'явілася

Репозиторий ВГУ

заканамерным вынікам пачатку распаду феадальнай сістэмы і зараджэння ў ёй новых, капіталістычных адносін. У літаратуры таго часу часта ставіліся актуальныя пытанні грамадска-палітычнага і культурнага жыцця краіны, рабіліся спробы крытычна асэнсаваць з'явы рэчаіснасці, праблемы сацыяльнай няроўнасці, маральнай адказнасці чалавека за свае ўчынкі.

**Сымон Будны (каля 1530–1593)** – беларускі пісьменнік, публіцыст і кнігавыдавец, царкоўны дзеяч, філосаф. Ён заснаваў у Нясвіжы друкарню, дзе ў 1562 г. выйшла першая кніга – "Катэхізіс". Твор раскрывае рэлігійныя тэмы ў зручнай мастацкай форме кароткіх пытанняў і разгорнутых адказаў. На працягу 1574 г. Будны выдаў у Лоскай друкарні на лацінскай мове некалькі твораў: "Аб дзвюх прыродах Хрыста", "Кароткі доказ, што Хрыстос не з'яўляецца … богам" і інш. У 1576 г. выйшаў галоўны рэлігійна-філасофскі твор Буднага "Пра найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры", у якім аўтар абагульніў свае радыкальныя ідэі.

**Васіль Цяпінскі (каля 1540–пасля 1603)** – беларускі гуманіст-асветнік, пісьменнік і кнігавыдавец, перакладчык, пачынальнік біблейскай (новазапаветнай) выдавецкай беларускамоўнай традыцыі. У сваім родавым маёнтку ён арганізаваў друкарню з намерам выдаваць кнігі на беларускай мове. Жадаючы надрукаваць Евангелле на царкоўнаславянскай і беларускай мовах, Цяпінскі распачаў складаную перакладчыцкую дзейнасць, якая была паспяхова завершана ў 1570 г. Прадмова да гэтай кнігі адрозніваецца публіцыстычнай эмацыйнасцю, вастрынёй пастаўленых пытанняў. В. Цяпінскі асуджаў царкоўную і свецкую эліту, якая абыякава ставіцца да будучыні Айчыны. Пісаў пра сваё высокае прызначэнне служыць свайму народу. Цяпінскі заклікаў паноў і духавенства дапамагаць паспалітаму люду адкрываць школы і ўздымаць навуку. Такім чынам, асветніцкая канцэпцыя Васіля Цяпінскага была разлічана на ўздым нацыянальнай культуры, школьнай справы, пісьменства, кнігадрукавання, умацаванне пазіцыі беларускай мовы, абуджэнне грамадзянскай актыўнасці суайчыннікаў.

**З перыядам Рэфармацыі і Контррэфармацыі звязана станаўленне беларускай палемічнай літаратуры.** У апошняе дзесяцігоддзе XVI ст. у літаратуры Беларусі пачынаецца актыўная палеміка вакол мэтаў і прынцыпаў аб'яднання Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла. Так, напрыклад, уніяцкай праблематыцы прысвячаў свае творы **Пётр Скарга (1536–1612)**. У трактаце "Аб адзінстве Божай царквы з адзіным пастырам…" (1577) ён выказваўся за дамінаванне адзінага касцёла і падпарадкаванне хрысціянскіх каралёў Папе Рымскаму, адмаўляў роўнасць усіх цэркваў, а прыналежнасць да праваслаўя лічыў адзнакай некультурнасці. **Іпацій Пацей (1541–1613)** – дзяржаўны, палітычны, рэлігійны дзеяч, развіваў ідэі П. Скаргі. У кнізе "Унія" паказаў блізкасць праваслаўнай і каталіцкай веры. Прапагандаваў ідэі хрысціянскай еднасці.

**Супраць П. Скаргі**выступілі артадаксальныя праваслаўныя аўтары. **Хрыстафор Філарэт** – беларуска-украінскі пісьменнік, аўтар "Апокрысіса" (1597). Галоўнай мэтай названай кнігі стала апраўданне праваслаўных, асуджэнне ўніятаў. **Стафан Зізаній** – пісьменнік-публіцыст, настаўнік брацкіх школ, змагар супраць уніі. Напісаў ў 1595 г. першы праваслаўны Катэхізіс. Тут выкрыў двурушніцтва вышэйшых праваслаўных колаў напярэдадні Брэсцкай уніі.

Пяру **Лявонція Карповіча (1580–1620)**, рэдактара выданняў віленскага праваслаўнага брацтва, прапаведніка, пісьменніка-публіцыста, належаць "Казанне двое" і "Казанне на пахаванне князя Галіцына". Яны характарызуюцца ўзвышаным, тыпова барочным стылем, уменнем проста раскрыць сэнс біблейскіх падзей і жыццёвых фактаў.

Рэпазіторый ВГУ

У выніку дыскусій у палемічнай літаратуры сфарміравалася гістарычная дактрына рэлігійнай цярпімасці, мірнага суіснавання ў межах адной дзяржавы розных канфесій.

**Мялецій Сматрыцкі (1577–1633) – царкоўны і культурны дзеяч, пісьменнік, настаўнік, аўтар аднаго з першых падручнікаў па граматыцы (**"Граматики славенския правилное Синтагма"**).** У 1610 годзе выйшаў **"Трэнас, або Плач адзінай святой сусветнай усходняй царквы…"**. Гэты твор сведчыць аб пісьменніцкай сталасці Сматрыцкага, які дасканала авалодаў паэтыкай барочнага стылю. Апісваючы сучасны яму стан праваслаўнай царквы, Мялецій выкарыстоўваў народна-паэтычную, міфалагічную і біблейскую сімволіку.

"Трэнас" – твор высокага грамадзянскага гучання. Сматрыцкі даў знішчальную характарыстыку пастырам, якія сваімі ўчынкамі не апраўдвалі прызванне настаўніка. Пісьменнік-паleміст праявіў добрае веданне гуманістычнай літаратуры Заходняй Еўропы. У "Трэнасе" шырока цытуюцца творы Пятраркі, Мантуана і многіх іншых.

**Апанас Філіповіч (каля 1596–1648)** – рэлігійны дзеяч, настаўнік "маскоўскага ілжэцарэвіча", таленавіты пісьменнік-публіцыст. Да нашага часу дайшоў "**Дыярыуш**" **(**1646) **Філіповіча – самабытны помнік старабеларускай мемуарнай літаратуры.**У ім змешчаны падарожныя і тлумачальныя запіскі, успаміны і дзённікі, аўтабіяграфічны нарыс, легенды і містычныя аповеды, пасланні і лісты, выкрывальныя прамовы, філасофскія развагі. Філіповіч выступаў за адраджэнне праваслаўнай царквы і саюз з Расіяй, крытыкаваў палітыку Рэчы Паспалітай.

**Прагрэсіўнай культурнай з'явай стала старабеларуская паэзія позняга Рэнесансу.** Сапраўдны паэтычны росквіт эпохі Адраджэння прыпадае на апошнюю чвэрць XVI ст. Галоўнае месца ў тагачаснай свецкай паэзіі займалі панегірычныя жанры, гэтак званыя "эпіграмы", што суправаджалі выявы гербаў гарадоў і славутых магнатаў. Жанраўтваральны пачатак "эпіграмы" – матыў услаўлення, здзіўлення пэўнай велічнай з'явай.

**АндрэйРымша (каля 1550–пасля 1595)** – самы вядомы паэт Вялікага княства Літоўскага другой паловы XVI ст.,пакінуў пасля сябе вялікую літаратурную спадчыну. Але нам вядомы толькі некалькі твораў, у тым ліку вершы на старабеларускай мове "Храналогіі", тры эпіграмы на гербы беларускіх магнатаў. Пра высокі мастацкі ўзровень Рымшы сведчыць "Дзесяцігадовая аповесць ваенных спраў князя Крыштофа Радзівіла" – адзін з лепшых героіка-эпічных прыкладаў у гісторыі беларускай літаратуры.

**Шырокую мастацкую плынь уяўляе сабой гісторыка-мемуарная літаратура Беларусі XVI–XVII стст.** У другой палове XVI ст. традыцыйнае летапісанне спыніла сваё развіццё, на змену яму прыйшлі разнастайныя творы ў выглядзе гістарычных аглядаў, хранографаў, мемуараў, сямейных дзённікаў. Істотнымі рысамі гэтых помнікаў свецкага пісьменства было тое, што ўсе яны ствараліся адразу пасля падзей, праяўлялі цікавасць да бытавых дэталей, асобы чалавека, яго імкненняў.

Па часе напісання (пачатак XVII ст.) мемуары **Фёдара Еўлашоўскага (1546–каля 1616)** з'яўляюцца самым раннім помнікам мемуарнага жанру з усіх вядомых нам твораў беларускай літаратуры. Працуючы над дзённікам, Еўлашоўскі імкнуўся выхаваць нашчадкаў у духу ўласных ідэалаў. Менавіта гэтым і абумоўлена падрабязна апісаная ім аўтабіяграфія. Тут пісьменнік апавядае аб перажытым, згадвае падзеі асабістыя і грамадскія. Узнаўляючы ў памяці хроніку шляхецкага жыцця і паказваючы на гэтым фоне сваіх сучаснікаў, мемуарыст спрабуе пранікнуць у іх псіхалогію і растлумачыць чалавечыя ўчынкі ўмовамі сацыяльнага жыцця.

**"Баркулабаўская хроніка" з'яўляецца ўзорам рэгіянальнага летапісання.** Амаль адначасова з мемуарамі Еўлашоўскага на поўдні Магілеўшчыны ў сяле

Баркулабава былі напісаны ўспаміны невядомага жыхара той мясцовасці, яны і склалі "Баркулабаўскую хроніку".Па стылі выкладзенага матэрыялу, па яркасці намаляваных эпізодаў твор уяўляе сабою мастацкую сістэму эмацыйна насычаных карцін пра нядаўна перажытае. Мемуарыст праяўляў цікавасць да некаторых грамадска-палітычных і рэлігійных фактаў (Брэсцкі царкоўны сабор 1596 г., з'яўленне ў Магілеве казакоў, царкоўных брацтваў, абодвух самазванцаў). Аўтар гэтай хронікі выступае як яркая творчая індывідуальнасць, як прадстаўнік дэмакратычнага напрамку ў беларускай літаратуры XVII ст.

Для **літаратуры барока** асабліва характэрны жанры рытарычнай царкоўнай пропаведзі і школьнай драмы, дзе важнае месца займаюць алегарычныя фігуры-персаніфікацыі. Самабытна развіваюцца ў гэты перыяд розныя жанры сатыры, раман, вялікія і малыя формы метафарычна насычанай паэзіі. Цэнтральны герой барочнай літаратуры ўнутрана раздвоены і супярэчлівы. Прадстаўнікі беларускага барока – С. Полацкі, А. Белабоцкі, Ф. Утчыцкі, Т. Яўлевіч, С. Косаў.

XVI–XVII стст. сталі перыядам росквіту **смехавой культуры Беларусі.** Барочная проза вельмі блізкая да парадыйна-сатырычнай паэзіі па выкарыстаных выяўленчых сродках. У ёй з'явіліся свецкія творы новага тыпу. Яны парадзіравалі жанры афіцыйнай літаратуры – соймавыя прамовы, царкоўныя казанні, дзелавыя пасланні. Па сваім змесце і мове парадыйная проза належыць да новай традыцыі. Гэта ўжо вынік свядомай мастацкай творчасці з ярка выражанымі рысамі новага барочнага стылю (гратэскнасць, парадаксальнасць, шматзначнасць).

З'яўленне сатырычнага **"Ліста да Абуховіча"** было абумоўлена канкрэтным гістарычным фактам здачы Смаленска 24 верасня 1654 г. рускаму войску. У гэтым памфлеце аўтар высмейваў польскую і мясцовую апалячаную шляхту, прадстаўніком якой быў Піліп Абуховіч, паказваў яе бяздарнасць у ваеннай справе і палітыцы, хцівасць і зайздрасць. Твор напісаны вобразнай, рытмізаванай і часткова рыфмаванай народнай моваю, багата аздобленай шматлікімі мастацкімі выяўленчымі сродкамі вуснай паэтычнай творчасці.

**"Прамова Мялешкі"** з'яўляецца пародыяй на сеймавую прамову, нібыта сказаную Іванам Мялешкам у 1589 г. у прысутнасці караля. Гэта востры палітычны памфлет, сатыра на грамадска-палітычныя парадкі, якія панавалі ў тагачаснай Рэчы Паспалітай. Ананімны пісьменнік выступіў шчырым патрыётам-дэмакратам, ён імкнуўся надаць герою некаторыя камічныя рысы, што было жанрава-стылёва апраўдана і забяспечыла твору шырокую папулярнасць. Аўтар свядома "дэмакратызаваў" свой стыль, з гэтай прычыны пісаў эмацыйна-выразнай мовай, аздобленай трапнымі народнымі прыказкамі, прымаўкамі, метафарамі.

**Сімяон Полацкі (1629–1680)** – культурны і грамадскі дзеяч, паэт, драматург, публіцыст, настаўнік. Ён жыў на зломе дзвюх эпох — Сярэднявякоўя і Новага часу. Полацкі заўжды цягнуўся да навацый, эксперыментатарства, разам з тым пераважная большасць яго твораў ідэйна звязана з жыццём, рэчаіснасцю. Мастацкую мову С. Полацкага адрознівалі асаблівая манерная мудрагелістасць, насычанасць разгорнутымі метафарамі, іншасказальнымі выразамі.

Навукова-творчая дзейнасць Сімяона Полацкага сінтэзуе лепшыя ідэі і прынцыпы тагачаснай літаратуры, філасофіі, багалюбства, спалучае пастулаты заходняй і ўсходняй патрыстыкі, антычнай і хрысціянскай эстэтычнай думкі, што, як слушна лічыцца, робіць яе фенаменальнай, унікальнай з'явай беларускай, усходнеславянскай і сусветнай культуры. У сваіх творах С. Полацкі ўзняў вялікую колькасць светапоглядных, грамадскіх, этычных пытанняў, сутнасна экстэнсіфікаваў тэматычнае кола беларускай і рускай літаратур, распачаў арыгінальную эстэтыка-філасофскую тэндэнцыю.

Рэпазіторый ВДУ

## ЛІТАРАТУРА XVIII СТ.

### Асноўныя факты літаратурнага развіцця. Персаналіі

У часы барока ўзніклі першыя творы беларускай драматургіі. Гэта былі невялікія інтэрмедыйныя сцэнкі, якімі перапынялася дзеянне ў школьных драмах. З гэтым перыядам звязаны і першыя батлеечныя творы (“Цар Ірад”, “Цар Максіміліян” і іншыя). **Школьны тэатр** быў тыповым прыкладам для барока, тут усё скіроўвалася на тое, каб уздзейнічаць на пачуцці гледачоў, уразіць іх уяўленне. Сюжэты для п’ес браліся са Святога Пісання, антычнай міфалогіі і гісторыі, гісторыі краін Усходу і Заходняй Еўропы.

Яшчэ да сярэдзіны XVII ст. адносяць зараджэнне беларускай **батлейкі**. Яе прадстаўленне складалася з некалькіх частак. Першая, асноўная, частка была запазычана з заходнееўрапейскага тэатра, прысвячалася рэлігійнай тэматыцы, раскрывала вядомы евангельскі сюжэт пра нараджэнне Ісуса Хрыста. У другой частцы распрацоўваліся традыцыйныя сюжэты беларускіх інтэрмедый, якія ў выкананні кожнага батлеечніка дапаўняліся рознымі дадатковымі сцэнамі. Батлейка стала сімвалам і асновай беларускага тэатральнага мастацтва.

Эпоха Асветніцтва прэзентавала новую канцэпцыю чалавека, новыя ідэі, якія ўвасобіліся ў грамадска-філасофскай думцы і мастацтве, у шматмоўнай літаратуры Беларусі і ўласна беларускай літаратуры. Рацыяналістычная ідэалогія Асветніцтва прынцыпова адрознівалася ад суб’ектыўнага ідэалізму часоў Контррэфармацыі. Аўтараў цяпер звязвалі не рэлігійныя падыходы, а культ розуму.

**Саламея Пільштынова (Русецкая) (1718–пасля 1760)** –асветніца, аўтарка мемуараў, першая жанчына-доктар у Рэчы Паспалітай. Яе пяру належыць кніга “Авантуры майго жыцця”. Па жанравых прыкметах гэта раман-аўтабіяграфія, прыгодніцкі твор. Яго стыль адлюстроўвае барочныя традыцыі з відавочнымі кантрастамі, непрадказальнымі пераходамі ад радасных падзей да трагічных.

Развіццё **школьнай драматургіі** пераходнага перыяду знайшло лагічнае завяршэнне ў творах, пастаўленых у канцы XVIII ст. на сцэне Забельскай дамініканскай калегіі. У 1787–1791 гг. для гэтага тэатра былі напісаны польскія трагедыі на антычныя тэмы (“Свабода ў няволі” К. Марашэўскага, “Сапар” і “Феміістокл” М. Цяцерскага), некалькі камедый і інш.

**Міхалам Цяцерскім (?–1797)** была зроблена польска-беларуская перапрацоўка камедыі Мальера “Доктар па прымусу”. Вядомы сюжэт Цяцерскі напоўніў беларускім каларытам. Героі маюць французскія імёны, але паводзяць сябе як мясцовая збяднелая шляхта. Удалым прыкладам Забельскага тэатра з’яўляецца і **“Камедыя” Каэтана Марашэўскага.** Гэтая п’еса своеасабліва сінтэзавала старыя традыцыі і новыя, асветніцкія тэндэнцыі. Тут выразна выяўляюцца элементы барочнай драмы-маралітэ (павучальнасць фіналу, адсутнасць жаночых вобразаў, выкарыстанне біблейскага матыву). Але асобныя сцэны маюць адносна самастойны характар, нагадваюць устаўныя інтэрмедыі. У цэлым у “Камедыі” пераважаюць рысы новай літаратуры, тут праўдзіва адлюстроўваліся супярэчнасці прыгоннай вёскі, але цэнтральны канфлікт твора вырашаецца ў маральна-этычным плане.

Гэта апошні буйны прыклад прыгожага пісьменства пераходнага перыяду і адначасова першае значнае праяўленне новай беларускай літаратуры.

### Літаратура

Мастацкія творы для абавязковага вывучэння

1. Біблія: “Быццё”, “Псалтыр”, “Песня песняў”, “Эклезіяст”, “Прытчы Саламона”, “Кніга прамудрасці Саламона”, “Евангелле”, “Прароцтвы Яна Багаслова”.

Репозиторий ВГУ

2. “Александрыя”.
3. “Троя”.
4. “Трышчан”
5. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”.
6. “Жыціе Кірылы Тураўскага”.
7. “Жыціе Аўраамія Смаленскага”.
8. “Аповесць пра Мяркурыя Смаленскага”.
9. “Словы (казанні)” К. Тураўскага. “Прыпавесць пра сляпога і кульгавага”.
10. “Аповесці мінулых гадоў”.
11. “Слова пра паход Ігаравы”.
12. “Хаджэнне Ігнація Смаляніна ў Царград”.
13. “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”.
14. “Летапіс 1446 года”.
15. “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”.
16. “Хроніка Быхаўца”.
17. “Песня пра зубра” М. Гусоўскага. Вершы.
18. “Пруская вайна” Я. Вісліцкага.
19. Прадмовы Ф. Скарыны “Да ўсёй Бібліі”, “Да Псалтыра”, “Да Юдзіф”, “Да Іова”.
20. “Прадмова да Катэхізіса” С. Буднага.
21. “Прадмова да Евангелля” В. Цяпінскага.
22. “Лісты” Ф. Кміты-Чарнабыльскага.
23. “Храналогія” А. Рымшы. “Экпіграмы”. “Дзесяцігадовая аповесць пра ваенныя справы пана Крыштафа Радзівіла”.
24. “Падарожжа ў Святую зямлю” М.К. Радзівіла.
25. “Дзённік” Ф. Еўлашоўскага.
26. “Дыярыуш” А. Філіповіча.
27. “Трэнас” М. Сматрыцкага.
28. “Прамова Мялешкі”.
29. “Ліст да Абуховіча”.
30. “Баркулабаўская хроніка”.
31. “Дыярыуш” С. Маскевіча.
32. “Дыярыуш” П.К. Абуховіча.
33. “Мемуары” Я.У. Пачобута-Адляніцкага.
34. “Хроніка” Я. Цадроўскага.
35. Вершы С. Полацкага.
36. “Магілёўская хроніка” Т.Сурты і Ю.Трубніцкага.
37. “Віцебскі летапіс” М.Панцырнага і С.Аверкі.
38. “Камедыя” К. Марашэўскага.
39. “Авантуры майго жыцця” С. Пільштыновай (Русецкай)

Асноўная літаратура


1. Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1. / Укл. А. Мальдзіс. – Мінск, 1993.
2. Анталогія даўняй беларускай літаратуры. XI – першая палова XVIII ст. / Пад рэд. В.А. Чамярыцкага. – Мінск, 2003.
3. Беларускія летапісы і хронікі / Укл. У. Арлоў, - Мінск, 1997.
4. Гарэцкі, М.І. Гісторыя беларускае літаратуры / М.І. Гарэцкі. – Мінск, 1992.
5. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд / Пад рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – Мінск, 1997.


Репозиторий ВГУ

6. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 1. Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. / Пад рэд. В.А. Чамярыцкага. – Мінск, 2006.
7. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 2. Новая літаратура: другая палова XVIII–XIX ст. / Пад рэд. У.І. Мархеля, В.А. Чамярыцкага. – Мінск, 2007.
8. Кніга жыцій і хаджэнняў / Укл. А. Мельнікаў. – Мінск, 1994.
9. Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура / А.А. Лойка. – Мінск, 2001.
10. Старажытная беларуская літаратура: Зборнік / Уклад. Курбека Л. С., Марук У. А. – Мінск, 2002.
11. Старажытная беларуская літаратура (XII-XVII стст.) / [уклад., прадм. і камент. І. Саверчанкі]. – Мінск, 2007.

<u>Дадатковая літаратура</u>

1. Беларуская літаратура XVI ст. / [уклад. І.В. Саверчанкі]. – Мінск, 2015.
2. Булахаў, М.Г. "Слова пра паход Ігаравы" і Беларусь. У 2 ч. / М.Г. Булахаў. – Мінск, 2000.
3. Гаранін, С.Л. Шляхамі даўніх вандраванняў. Гістарычна-тэарэтычны нарыс развіцця беларускай паломніцкай літаратуры XII-XVI стст. / С.Л. Гаранін. – Мінск, 1999.
4. Кавалёў, С.В. Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. / С.В. Кавалёў. – Мінск, 1993.
5. Кавалёў, С.В. Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу / С.В. Кавалёў. – Мінск, 2002.
6. Кавалёў, С.В. Гісторыя беларускай літаратуры: другая палова XVI ст. / С.В. Кавалёў. – Мінск, 2005.
7. Кавалёў, С.В. Літаратура Беларусі позняга Рэнесансу: жанры, творы, асобы / С.В. Кавалёў. – Мінск, 2005.
8. Мальдзіс, А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду: другая палавіна XVII–XVIII ст. / А.І. Мальдзіс. – Мінск, 1980.
9. Мельнікаў, А.А. Кірыл, епіскап тураўскі: жыццё, спадчына, светапогляд / А.А. Мельнікаў. – Мінск, 1997.
10. Міско, С. Школьны тэатр Беларусі XVI–XVIII ст. / С. Міско. – Мінск, 2000.
11. Некрашэвіч-Кароткая, Ж.В. Нясвіжская Мельпамена: Драматургія Францішкі Уршулі Радзівіл / Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая. – Мінск, 2002.
12. Падокшын, С.А. Іпацій Пацей: царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік / С.А. Падокшын. – Мінск, 2001.
13. Саверчанка, І.В. Старажытная паэзія Беларусі: XVI–першая палова XVII ст. / І.В. Саверчанка. – Мінск, 1992.
14. Саверчанка, І.В. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока / І.В. Саверчанка. – Мінск, 1998.
15. Яскевіч, А.А. Падзвіжнікі і іх святыні / А.А. Яскевіч. – Мінск, 2001.

Репозиторий ВГУ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

### *Літаратурны працэс першай трэці XIX ст.*

Першую трэць XIX ст. азнаменавалі напалеонаўскія войны ў Еўропе, вайна 1812 г., дзекабрысцкі рух у Расіі, нацыянальна-вызваленчы рух на ўскраінах Расійскай імперыі.

Літаратура першай трэці XIX ст. – самы ранні этап развіцця новай беларускай літаратуры. Цэнтрамі літаратурнага руху і былі Вільня і Полацк. Гэты перыяд – росквіт польскамоўнай рамантычнай літаратуры. Віленскі універсітэт стаў цэнтрам культурнага руху, мастацтва, свабодалюбства. У ім дзейнічалі студэнцкія таварыствы шубраўцаў, філаматаў і філарэтаў.

“Шубраўцы” – польскае слова, якое абазначае “вісельнік, гуляка, круцель, шэльма, чалавек, па якім плача шыбеніца”. Літаратурна-грамадскае таварыства разумных і дасціпных, якое існавала ў Вільні ў 1816-1822 гг., аб’ядноўвала літоўцаў і беларусаў. Мэта таварыства – маральнае ўдасканаленне людзей праз дасціпнае высмейванне розных грамадскіх і асабістых заган.

Філаматы – тайнае студэнцкае таварыства ў Віленскім цніверсітэце. З’явілася ў 1817 г., разгромлена ў 1823 царскімі ўладамі. Філамат – стар.грэч. “filio” – “люблю” і “matas” – “веды”.
Заснавальнікамі яго былі А.Міцкевіч і Т.Зан. Мэта таварыства – узаемадапамога ў час самаадукацыі студэнтаў. У 1818г. удзельнікам філамацкага таварыства стаў Я.Чачот. Ён прапанаваў таварышам пашырыць кола дзейнасці – патрыятычнае выхаванне ў рэчпаспалітаўскім і ліцвінскім духу. Як адгалінаванні ўзніклі таварысты “Прамяністых” і “філадэльфаў”.

У 1820 г. узнікае арганізацыя “Філарэтаў” (грэч. “аматараў дабрачыннасці”). Адной з асноўных была ідэя барацьбы за свабоду роднага краю.

У 1823 г. філамацкая арганізацыя была раскрыта, філаматы высланы ў глыб Расіі. Філаматы спрыялі развіццю беларускай літаратуры тым, што разгарнулі актыўную краязнаўчую дзейнасць, цікавіліся беларускім фальклорам, этнаграфіяй. У той час модным літаратурным напрамкам быў рамантызм, які асноўваўся на цікавасці да незвычайнага, да ліку якога адносілі нацыянальную гісторыю, культуру. Многія філаматы творча апрацоўвалі сюжэты беларускага фальклору (А.Міцкевіч, Я.Чачот, А.Ходзька). Некаторыя спрабавалі пісаць на беларускай мове (Я.Чачот і Т.Зан).

### *Літаратурныі працэс сярэдзіны XIX стагоддзя*

Дзейнасць беларуска-польскіх пісьменнікаў спрыяла развіццю беларускай літарараатуры, нягледзячы на жорсткую рэакцыю царскіх уладаў пасля падаўлення паўстання 1830-31 гг.

Ужо ў 1950-1960-я гг. царскі ўрад вымушаны пайсці на значныя палітычныя змены, адмяніць прыгоннае права. Тым не менш, выбухнула паўстанне 1863 г. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

Літаратурны рух быў цесна звязаны з грамадскімі падзеямі. Буйнымі культурнымі цэнтрамі ў той час былі Вільня, Мінск і Віцебск.

У гэты час пішуць В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі.

Сярод найменш вядомых аўтараў гэтага перыяду вылучаюцца Юльян Ляскоўскі (зб. “Беларускі бандурыста. Зборнічак вандроўны”, аповесць “У Амерыку па золата”), Ігнацы Яцкоўскі (“Палітычныя творы”, “Трохгадовае знаходжанне на Усходзе”, мемуары “Аповесць з майго часу, або Літоўскія прыгоды”), Адам Плуг (гутаркі-ўспаміны “Жукаў Барок”, “Родная песенька”, рамантычна-дыдактычная проза “Споведзь”, “Дзетазабойца”, вершы-прысвячэнні, апавяданні на беларускай мове



Рэпазіторый ВДУ

(“Кручаная баба”)), Павел Шпілеўскі (фальклорныя, этнаграфічныя працы, аповесць “Цыгане”, п’еса “Дажынкі”, апавяданні), Арцём Вярыга-Дарэўскі (“Альбом”), Аляксандр Рыпінскі (балада “Нячысцік”), Геранім Марцінкевіч (драма “Час над Дзвіною”, паэма “Першае падзенне чалавека”, вершы), Ялегі Вуль (верш “К дудару Арцёму ад наддзвінскага мужыка”), інш.

### *Літаратурны працэс апошняй трэці XIX ст.*

На развіццё беларускай літаратуры ў 1870-90-я гг. паўплываў шэраг гістарычных падзей. Гэта час эканамічных змен (“Часовыя правілы для Заходняга краю” 1864 г.), грамадска-палітычных (фарміраванне ідэалогіі народнікаў, а з 1890-х гг. - рэвалюцыйных настрояў сярод працоўных).

Паступова з канца 1870-х гг. адкрываюцца рэальныя вучылішчы (пасля паўстання 1863 г. амаль усе навучальныя ўстановы былі зачыненыя, ужыванне польскай і беларускай моў забаронена, адміністрацыйныя пасады займалі расійскія чыноўнікі). Цяжкія часы перажывае друк на тэрыторыі Беларусі. У 1884 г. пачынае выходзіць народніцкая газета “Гоман” (Пецярбург), што адлюстроўвала ідэі рэвалюцыйнай моладзі, а з 1886 г. – “Мінскі лісток”.

У 1882 г. апублікаваны на рускай мове “Пісьмы пра Беларусь Данілы Баравіка”, што задумваліся як перыядычнае выданне. Яны знайшлі водгук ў 1884 г. у “Пасланні да землякоў-беларусаў шчырага беларуса”.

Атрымлівае распаўсюджанне канцэпцыя заходнерусізму (К.А. Гаворскі, М.В.Каяловіч), якая адмаўляла самастойнасць і самабытнасць беларускай нацыі.

Гэта час актыўнай літаратурнай дзейнасці Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, Э.Ажэшкі, А. Абуховіча, Ф. Тапчэўскага, А. Кіркора, А. Ельскага, В. Савіча-Заблоцкага, З. Манькоўскай, М. Косіч і інш.

### *Ананімныя творы XIX ст.*

Ананімнасць твораў беларускай літаратуры XIX стагоддзя – вельмі распаўсюджаная з’ява. Прычыны: рукапіснае і вуснае бытаванне, негатыўнае стаўленне да беларускай літаратуры з боку царскай улады, адносіны саміх аўтараў да сваёй творчасці, рамантычны пафас, свядомае сцвярджэнне народнага погляду на свет.

Адзін з самых вядомых ананімных твораў першай паловы XIX ст. – паэма ***“Энеіда навыварат”***. Гэта бурлескна-травесційны твор. Захавалася першая песня. У выніку даследаванняў устаноўлена аўтарства твора (В.П. Равінскі). Паэма напісана паводле гераічнай паэмы “Энеіда” Вергілія, твора, які ўхваляў рымскіх імператараў, падкрэсліваў іх боскае паходжанне. Твор напоўнены намёкамі на антычную першакрыніцу з аднаго боку (знешне паводзіны людзей вырашаюць лёс і багі), з другога – паказвае жыццё людзей пачатку XIX ст. Стылізацыя пад антычнасць, травестацыя ўспрымаюцца чытачом як умоўнасць, бо перад чытачом тыповыя карціны беларускай рэчаіснасці, падымае праблемы прыгоннага права, узаемаадносін людзей у грамадстве. “Энеіда навыварат” паклала пачатак у літаратуры адлюстраванню жыцця народа ў XIX ст., пры гэтым выкарыстала форму іншасказальную ў спалучэнні з гумарыстычна-сатырычнай.

Найбольш распаўсюджаным жанрам ананімнай літаратуры была ***вершаваная гутарка*** – гэта публіцыстычны бессюжэтны твор, у якім адсутнічаюць акрэсленыя вобразы-характары, яго галоўная мэта — выяўленне адносін да грамадскага жыцця, ацэнка з’яў сацыяльнай рэчаіснасці. Мастацкія прыкметы: даступнасць формы твораў, шырокае выкарыстанне ў іх сродкаў народнай мовы (прыказак, прымавак, фразеалагізмаў і г.д.)

Рэпазіторый ВДУ

У ананімных гутарках 30-40-х гадоў на першы план вылучаецца маральна-этычная праблематыка. Да іх адносяць: *“Вось цяпер які люд стаў”, “Праўда”, “Гутарка Паўлюка”, “Скажы, вяльможны пане” (гутарка-дыялог), “Віншаванне бондара Савасцея”*.

Да ананімных твораў сярэдзіны стагоддзя адносяць паэму *“Мачаха”*, падпісаную псеўданімам Адэля з Устроні. Гэта рамантычны твор, напісаны ў фальклорным стылі.

У ананімных творах 1950-60-х гг. пануюць матывы асуджэння прыгонніцкага ладу; радасці, што наступае час адплаты панам, ідэалізацыі будучай волі, развенчвання міфу, што мужык не можа без пана. Найбольш вядомыя з такіх твораў – верш *“Вясна гола перапала”, “Гутарка Данілы са Сцяпанам”, “Гутарка старога дзеда”, “Гутарка двух суседаў”.*

Самым яскравым прыкладам ананімнай літаратуры гэтага перыяду стала сатырычна-гумарыстычная паэма ***“Тарас на Парнасе”.***Упершыню надрукавана ў 1889 г. у газеце “Мінскі лісток”. У выніку даследаванняў устаноўнена аўтарства твора (К. Вераніцын). Сатырычныя выпады скіраваны супраць псеўданароднай эстэтыкі, славянафільскай ідэалізацыі патрыярхальнага побыту, сентыменталізму. Значнае месца займае літаратурная палеміка. Паэма адметная па кампазіцыі: апавяданне ў апавяданні, казачная канцоўка. Мова твора- гутарковая, перасыпаная параўнаннямі, эпітэтамі, прастамоўямі.

У 1860 г. у Маскве была напісана паэма *“Два д’яўлы”*. Аўтарства належыць таксама К. Вераніцыну. Месца дзеяння ў творы – Віцебск і Гродна. У паэме пераплятаюцца рэальнае і фантастычнае.

Ананімныя творы, дзякуючы сваёй распаўсюджанасці і народнасці, сталі тым плацдармам, на якім развівалася беларуская літаратура XIX стагоддзя.

### *Творчая спадчына паэтаў філаматцкага асяроддзя*

Таварыствы філаматаў і філарэтаў былі згуртаваннямі беларускай моладзі. Са 135 чалавек, прыцягнутых да следства, 113 паходзілі з Беларусі. Многія з іх вызначаліся бясспрэчнымі літаратурнымі здольнасцямі. Гэта Ян Чачот, А.Міцкевіч, Т.Зан, А.Адынец і інш. Таварыства было не толькі палітычным, але і сяброўскім аб’яднаннем вольнадумцаў. У літаратурным аддзеле праводзіліся выступы з дакладамі, чыталіся і абмяркоўваліся літаратурныя творы. Менавіта ў філаматцкім асяроддзі сфарміраваўся талент А.Міцкевіча. Філаматы былі носьбітамі протабеларускай ментальнасці. Выразы беларускага паходжання ў іх творах былі натуральнай з’явай. Яны карысталіся беларусізмамі як у гутарцы, так і ў карэспандэнцыі і творах. Мовазнаўцы адзначаюць, што беларусізмы ў творчасці паэтаў-філаматаў сустракаюцца даволі часта. Філаматы, як правіла, былі людзьмі маладымі, таму найбольш выразныя ў іх творчасці матывы жыццялюбнасці, гарэзнасці, энтузіязму. “З пагоняй наш сцяг” (1821 г.) М. Рукевіча і (“Песня філарэтаў”) 1823г. А. Адынца гучаць як гімны маладосці. Па форме гэта застольныя тосты.

Тэматычны спектр лірыкі філаматаў надзвычай шырокі: услаўленне сяброўства, заклікі да свабоды, да барацьбы, асуджэнне сацыяльнай несправядлівасці. Не менш надзённыя праблемы ўздымаліся і ў іх публіцыстыцы. Яны абмяркоўвалі літаратурныя пытанні, спосабы сацыяльных і грамадскіх адносін і многае іншае. Міцкевіч напісаў вялікую прадмову “Пра рамантычную паэзію” (1822), у якой вядзецца палеміка з адэптамі класіцызму.

### *Тамаш Зан (1796–1855)*

Пісаў па-польску. Аўтар невялікай камедыі “Грэцкія піражкі”, у тэксце сустракаюцца беларуская прыказкі. Напісаў паэму “Табакерка”. Яе галоўны герой –

Рэпазіторый ВГУ

стары ваяка-шляхціц, улюбёны ў родны край. На сваёй табакерцы ён выкалаў сцэны з беларускага народнага жыцця.

Балада “Свіцязь” Зана насычана маральна-этычнай праблематыкай. У цэнтры – злачынства і пакаранне. Твор “Цыганка” ўслаўляе каханне.

Зан звяртаецца да класічнай формы трыялета. Адзін з трыялетаў прысвечаны Соф’і Малеўскай. Верш прасякнуты пачуццём кахання і самаахвярнасці.

Па звестках гісторыкаў літаратуры, на Урале Зан пісаў вершы па матывах беларускіх народных песень. Верш “Пінчук” на польскай мове расказвае пра чалавека, які нягледзячы на перашкоды ў жыцці пяе і танцуе.

***Ануфрый Петрашкевіч (1793–1863)***

У ранні перыяд творчасці звяртаўся да тэм народнага жыцця і гісторыі. Гістарычнай тэме прысвечаны верш “Роздум каля руінаў Гедымінавага замка”. У творы паэт згадвае гістарычны шлях ВКЛ і сцвярджае думку, што слава продкаў асвятляе шлях нашчадкам. Пра народнае жыццё расказваецца ў вершаваным творы “Купала”.

***Антоній Адынец (1804–1885)***

Адынца праславіў верш “Песні філарэтаў”. Верш напісаны на злобу дня. Заклікае сяброў філаматаў адагнаць смутак, не забываць, што яны маладыя. У творы славіцца сяброўства. У вершах ранняга перыяду звяртаўся да персанажаў беларускага фальклору і міфалогіі (верш “Хохлік”).

***Аляксандр Ходзька (1804–1891)***

Вершы пачаў пісаць на польскай мове ў студэнцкія гады. У канцы 20-х гадоў у Пецярбурзе выдаў кнігу паэзіі на польскай мове, куды ўвайшлі арыгінальныя творы, напісаныя па матывах персіцкай паэзіі, пераклады новагрэчаскай паэзіі. У сталыя гады ён рабіў пераклады персіцкай паэзіі на польскую і французскую мовы. Беларуская тэма прадстаўлена ў яго творчасці ў філамацкі перыяд: “Старац”, “Незнаёмец”, “Гербы”, “Вясенняя ноч у Літве”, “Маліны”.

***Антоній Гарэцкі (1787–1861)***

Уваходзіў у склад таварыства шубраўцаў. Пісаў вершы, эпіграмы, элегіі, байкі. У 1828 г. за твор “Байка пра фурманаў” быў арыштаваны, бо высмейваў К.П. Раманава, правіцеля тагачаснага княства Польскага, роднага брата Аляксандра і Мікалая І. Яго выпусцілі пасля таго, як пакінуў заяву, у якой абавязваўся ніколі не пісаць сатырычных вершаў. Прымаў удзел у паўстанні 1830г. Пасля яго разгрому выехаў за мяжу. Жыў у Дрэздане, потым у Парыжы. У 1834 г. У Парыжы выдаў зборнік “Паэзія ліцвіна”. Выступаў пад псеўданімам ліцвін, якім падкрэсліваў свае этнічныя карані. Яго паэзія была патрыятычнай, услаўляла свабодалюбства і асобу. У многіх вершаў Гарэцкі звяртаецца да сямейнай тэмы, асуджае прыгоннае права. Напрыклад, “Да мужыкоў”, “Думка мужыка”. У некаторых вершах звяртаецца да гісторычнай і філасофскай тэматыкі. Напрыклад, праводзіць лаканічнае асэнсаванне вечных праблем у вершы “Ці не праўда?”

***Ян Аношка (1775–1828)***

Напісаныя на польскай мове вершы паэта фалькларызаваліся, збеларушваліся і пасяляліся ў сялянскім асяроддзі.

Паэт спалучаў у вершах рацыяналізм з містыцызмам, аўтабіяграфізм з афарыстычнасцю і метафарычнасцю, пластычную вобразнасць з каларытнасцю мастацкай дэталі. Ён выкарыстоўваў парадоксы, інверсіі, паралелізм, антытэзу, іншыя сродкі мастацкай выразнасці. Лірычны герой Аношкі – чалавек незвычайна чуйны да несправядлівасці. Разам з тым ён неазлоблены мезантроп.

У вершах “Муза з вясковае далі”, “Мае думкі” ён праслаўляў жыццё ў вясковым зацішшы. Высмейваў шляхту, чалавечыя заганы (“На п’янага ветрагона”). Славіў чалавека-земляроба, выказваў захапленне яго гаспадарлівасцю (“На дажынкі”).



Репозиторий ВГУ

Філасофская лірыка прадстаўлена вершамі, звернутымі да Бога, у якіх услаўляецца яго літасць і промысел. Або вершамі, прасякнутымі сумам і роспаччу (“У роспачы”). У вершы “Чужы дом” апісваецца горкі лёс бяздомнага . паэт параўноўвае чужыну і радзіму. Вядомыя нам 47 вершаў Аношкі ўвайшлі ў гісторыю беларускай літаратуры.

***Францішак Рысінскі (1749–прыбл. 1830)***

Пісаў эпіграмы, гумарыстычныя, філасофскія, лірычныя вершы на польскай, французскай, рускай і беларускай мовах. Друкаваўся ў польскіх выданнях. Яго шаржы, эпіграмы, вершы распаўсюджваліся ў вуснай форме і мелі поспех. Вершы пра каханне напісаны на змешанай польска-беларускай мове (макаранічнай мовай).

***Юзэф Маралёўскі (1777–1845)***

У 1818г. выдаваў часопіс “Месенчнік палонскі”. Гэта было выданне на польскай мове, але там друкаваліся творы ўраджэнцаў Беларусі, змяшчаліся этнаграфічныя звесткі пра Беларусь. Маралёўскі працаваў у розных літаратурных жанрах, пісаў элегіі, эпіграмы, пейзажныя, філасофскія вершы, перакладаў Гарацыя на польскую мову. У асноўным пісаў на польскай мове. Беларуская тэма знайшла адбітак у яго творчасці ў пейзажнай лірыцы. Гэта вершы-прысвячэнні “Палаце”, “Дзвіне”, “Полацкай зямлі”, “Полацку”. Аўтар паэтызаваў полацкі край. У вершы “Полацку” падкрэслівае, што полацкая зямля пачала пачатак дзяржаўнасці і культуры на гэтых землях.

**Асобы**

***Адам Міцкевіч (1798–1855)***

Нарадзіўся на Навагрудчыне на хутары Завоссе. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. Адзін са стваральнікаў філамацкага таварыства (1817-1823 гг).

У 1822-23 гг. выдае зборнік “Паэзія”, куды ўвайшла паэма “Гражына” і II і IV часткі паэмы “Дзяды”. У кастрычніку 1823 г. Міцкевіча арыштавалі, выслалі ў Расію. У час ссылкі знаходзіўся ў Пецярбургу, Адэсе, падарожнічаў па Крыму. Яго крымскія санеты былі выдадзены асобным зборнікам у 1826 г.

Вядомым імя Міцкевіча зрабілі рамантычныя балады (“Рамантычнасць”, “Свіцязанка”, “Рыбка”, “Лілеі”). Балады Міцкевіча пабудаваны на мясцовым фальклоры.

20-я гады сталі пачаткам паэмнай творчасці Міцкевіча. Першая па часе напісання паэма “Гражына”, якая мае падзагаловак “Літоўская аповесць”. “Гражына” – твор гераічнай паэзіі. У аснову пакладзены народныя песні і паданні часоў сярэднявечча. Ліцвінскі патрыятызм выявіўся ў тэматыцы, праблематыцы і вобразнай сістэме твора. Паэма пазначыла гістарычную і героіка-патрыятычную лінію ў творчасці Міцкевіча.

Эстэтыка рамантызму найбольш яскрава праявілася ў паэме “Конрад Валенрод”, напісанай у Маскве ў 1828 г. Паэма – своеасаблівая гістарычная аповесць пра цану любові да Бацькаўшчыны. Апалогія помсты, а заадно і метафара абагульнення трагізму, маральных канфліктаў, якія здараліся ў тагачасным грамадстве. *Валенрадызм* – гэта свядомы выбар амаральных сродкаў барацьбы для дасягнення значнай мэты пры ўмове, калі іншыя сродкі з’яўляюцца немагчымымі.

У 1829 г. Міцкевічу ўдалося выехаць за мяжу і назаўсёды пакінуць межы Расіі. Ён распачынае вандроўкі па краінах і гарадах Еўропы. Міцкевіч пабываў у Германіі, у Чэхіі, Швейцарыі. У 1832 г. у Дрэздане за кароткі прамежак часу напісаў III частку паэмы “Дзяды”. Паэма “Дзяды”, на думку даследчыкаў, з’яўляецца не закончаным творам А.Міцкевіча. Задума напісання твора ўзнікла ў 1820 г., калі Міцкевіч перажываў драматычны час у асабістым плане. Паэма складаецца з 4-х частак.

Репозиторий ВГУ

У жніўні 1832г. Міцкевіч пераехаў у Парыж. Там ён напісаў паэму-эпапею “Пан Тадэвуш”, якую скочыў у лютым 1834 г. Паэма “Пан Тадэвуш або апошні наезд на Літве”. Да твора Міцкевіч дадаў падзагаловак “Шляхецкая гісторыя 1811-1812 гадоў у 12-ці кнігах вершам”. У першай палове XIX ст. было прынята называць твор у гонар галоўнага героя. Наезд – форма вырашэння канфліктаў паміж шляхтай, у якой крытэрыем справядлівасці выступае грубая сіла. Ментальны паказ краёвай шляхты дазваляе называць паэму эпапеяй і энцыклапедыяй Літвы і Беларусі к.18 -п.19 ст.

У славутым Каледж дэ Франс Міцкевіч чытаў лекцыі па лацінскай і славянскіх літаратурах, выступаў як журналіст. Міцкевіч не пакідае планаў змагацца з ворагамі былой РП, збіраў сродкі на фарміраванне легіёнаў. Так у 1848 г. ён арганізаваў такі легіён для барацьбы за незалежнасць Італіі (у 19 ст. Італія змагалася за незалежнасць ад Аўстра-Венгрыі). У 1849 г. ён рэдагаваў у Парыжы газету “Трыбуна народаў”. Калі пачалася Крымская вайна, ён выехаў у фатальнае падарожжа ў Канстантынопаль, каб садзейнічаць арганізацыі легіёнаў для барацьбы з Расійскай Імперыяй. Там Міцкевіч захварэў на халеру (па другіх звестках быў атручаны) і 26 лістапада 1855 г. яго не стала. Цела паэта перавезлі ў Парыж і пахавалі ў прыгарадзе. У 1890 г. труну з прахам перавезлі ў Кракаў і ўстанавілі ў падзямеллі кафедральнага сабора Вавельскага замка.

### *Ян Чачот (1796–1847)*

Ян Чачот нарадзіўся на Навагрудчыне ў сям’і беззямельнага шляхціца. У 1806 г. сям’я пераехала ў ваколіцы Новай Мышы ля Баранавіч (часам падпісваўся Ян з Новай Мышы). Дзіцячыя гады прайшлі ў ваколіцах Калдычэўскага возера і легендарнай Свіцязі. У 1809 г. паступіў у Навагрудскую дамініканскую школу граматы, дзе пасябраваў з А.Міцкевічам. У 1816 г. паступіў у Віленскі універсітэт, вымушаны быў вучыцца за свой кошт, пайсці працаваць. Адным з першых уступіў у філаматкае таварыства, а ў хуткім часе стаў адным з яго кіраўнікоў. У 1823 г. высланы на Урал, потым у глыб Расіі. У 1833 г. Чачоту дазволілі вярнуцца на Радзіму. Пераязджае ў мястэчка Лепель, уладкоўваецца працаваць дробным чыноўнікам у дырэкцыі Бярэзінскага канала. З 1837 па 1846 гады ён выдаў у Вільні 6 кніг “Вясковых песенак з-над Нёмна і Дзвіны”. У 2-х апошніх зборніках побач з фальклорнымі тэкстамі змясціў 29 беларускіх уласных вершаў, якія насілі пераважна дыдактычны характар. У канцы 30-х пераязджае на Навагрудчыну. Цяжка хварэў пасля ссылкі, памёр у беднасці 23 жніўня 1847 г. у Друскеніках.

Як паэт Чачот заявіў пра сябе ў 1818 г. Пісаў па-польску і беларуску. Адным з першых стаў рукапісны зборнік “Зосіны песні”, у якім сабраны беларускія песні пра каханне, перакладзеныя на польскую мову. Беларускамоўныя творы маюць пераважна гумарыстычны характар. Прысвечаны сябрам з нагоды іх прыезду ці імянінаў (драматычная сцэнка “Яжовы імяніны”, напісаная з нагоды імянін украінца Юзэфа Яжоўскага; верш “Едзе міленькі Адам”, прысвечаны прыезду Адама Міцкевіча ў Вільню). У 1823 г. пад час следства над філаматамі Чачот напісаў на беларускай мове верш “Да лятуць, лятуць, да дзікія гусі...”. Элегічны і настальгічны твор, у якім згадваюцца дзікія гусі, якія адлятаюць у вырай і кідаюць развітальны кліч роднай староньцы.

Гісторыкі літаратуры ведаюць 8 польскамоўных рамантычных баладаў Чачота (“Бекеш”, “Навагрудскі замак”, “Калдычэўскі шчупак”, “Радзівіл, або заснаванне Вільні”, “Мышанка”, “Свіцязь”, “Падземны звон у Пазяневічах”, “Узногі”). Усе яны заснаваны на матывах беларускага фальклору.

У вершах на польскай мове Чачот актыўна звяртаўся да патрыятычнай і любоўнай лірыкі (“Неяк ля гаю”). Патрыятычная лірыка носіць настальгічны характар (“О ты, край мой нешчаслівы”).

Рэпазіторый ВДУ

У позні перыяд творчасці Чачот займаўся збіраннем беларускага фальклору, пісаў вершы на беларускай і польскай мовах. Беларускамоўныя вершы Чачота гэтага перыяду дыдактычныя, павучальныя, большасць стылізавана пад народную песню (“Да мілых мужычкоў”, “Ой, у кусце”, “Быў я колісь кавалём”, “Кепска робім, жоначкі”, “Калі ў землю зерне кінеш...”)

Чачот быў прыхільнікам сацыяльнага раўнапраўя. Адным з першых стаў прапаведваць тэму сацыяльнага “выроўнівання” пана і селяніна.

Сёння сталі вядомы тэксты яго цыклу “Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года” (1842-1844). Яны ўключаюць больш за 50 песень баладнага тыпу. Гэта паэтычная гісторыя ВКЛ, напісаная з мэтай уваскрасіць славу продкаў. Цыкл меркавалася выконваць пад музыку.

Ян Чачот быў амаль адзіным пісьменнікам свайго часу, які пры жыцці апублікаваў значную колькасць беларускіх вершаў.

***Тадэвуш Лада-Заблоцкі (1811–1847)***

Нарадзіўся ў незаможнай шляхецкай сям’і ў вёсцы Лугінавічы былога Сененскага павета Магілёўскай губерніі. Вучыўся ў Віцебскім вучылішчы для хлопчыкаў пры Базыльянскім манастыры. Потым у Віцебскай гімназіі. Скончыць вучобу не змог з-за матэрыяльных праблем. У 1837 – вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, заснаваў тайнае таварыства аматараў айчыннай славеснасці, якое займалася зборам патрыятычных польскіх вершаў, патрыятычнай і дэмакратычнай прапагандай сярод студэнтаў. За распаўсюджанне вершаў палітычнага зместу Лада-Заблоцкі ў лістападзе 1834 г. быў арыштаваны, выключаны з Маскоўскага універсітэта і адпраўлены ў Віцебск. Па прыгавору быў асуджаны на шматгадовую катаргу, якую па рашэнні Мікалая І замянілі 22 гадамі ссылкі на Каўказ. Там уладкоўваецца на чыноўніцкую працу, пасябраваў з ссыльнымі русскімі і мясцовымі інтэлігентамі, ссыльнымі польскімі паэтамі. У 1846 г. быў вызвалены ад ваеннай службы, але з Каўказа не вярнуўся. Апошнія гады працаваў на Кульпінскіх саляных заводах (Грузія), дзе і памёр у 1847 г. ва ўзросце 36 год у час эпідэміі халеры.

У 1845 г. у Пецярбурзе выйшаў адзіны зборнік яго вершаў на польскай мове “Паэзія”, дзякуючы Р.Падбярэскаму. Літаратурная дзейнасць Лады-заблоцкага ахоплівае 16 гадоў. Як паэт фарміраваўся пад уздзеяннем кніжнай традыцыі. Яго ўвагу прыцягваў унутраны свет сучасніка, ён не звяртаўся да фальклорных матываў. Па сваёй эстэтычнай праграме Лада-Заблоцкі быў блізкім да рамантыкаў, аддаваў перавагу рэфлектыўна-медытатыўнай лірыцы.

Апісальная лірыка прадстаўлена паэмай “Ваколіцы Віцебска”, напісанай на Каўказе, вершамі “Да Дзвіны”, “Далжанскае возера”, “Вілія”, “Лучоса”. У вершах апяваецца жыццё на прыродзе. Лада-Заблоцкі — арыгінальны, яркі паэт-пейзажыст.

У паэме “Ваколіцы Віцебска” ад імя апавядальніка ў думках робіць падарожжа па родных мясцінах. Супастаўляе пышную прыроду Італіі са сціплай беларускай. Згадвае гістарычныя мясціны Віцебска. Успамінае пра вайдэлотаў беларускай зямлі, якія спявалі песні пра мінулае народа.

***П. Багрым (1813(?)–1891(?))***

Нарадзіўся у Крошыне каля Баранавіч у сям’і дзяржаўных сялян. Вучыўся ў школцы пры мясцовым касцёле, вучыўся паспяхова, пісаў літаратурныя творы. Напісаў цыкл вершаў “Сумныя песні” (“Элегіі”). Вясной 1828 г. пачаўся сялянскі бунт, а потым вобыскі і арышты ўдзельнікаў. У час вобыску салдаты забралі ў Багрыма 3 сшыткі вершаў “Сумных элегій”, лёс якіх па наш час невядомы. Потым П.Багрым трапляе ў войска, вяртаецца са службы, праславіўся як майстар-каваль. Вершаў больш не пісаў, памірае каля 1891г. Па другой версіі, П.Багрым са службы не вярнуўся. Па трэцяй,

Репозиторий ВГУ

П.Багрым у войска не трапіў, застаўся ў родных мясцінах, займаўся кавальскай справай.

Верш “Зайграй, зайграй, хлопча малы” па форме нагадвае песню-скаргу. Яго аснову склалі рэадьныя жыццёвы факты і мастацкае абагульненне. Верш багата насычаны матывамі жалобных народных песень, паданняў, павер’яў. Па гучанню і рытміцы таксама нагадвае народную песню. У цэнтры твора сацыяльна афарбаваныя перажыванні лірычнага героя.

***Франц Савіч (1815–1845)***

Франц Савіч, як і П.Багрым, аўтар адзінага верша. Удзельнік паўстання 1830-1831 гг.. У медыка-хірургічнай акадэміі вылучыўся гурток рэвалюцыйна настроеных студэнтаў, у 1836 г. тут было створана “Дэмакратычнае таварыства”, якое і ўзначаліў Ф.Савіч. Таварыства мела статут, гэта была нелегальная палітычная радыкальная арганізацыя. Яе вызначалі антыпрыгонніцкі характар, дэмакратызм. Члены таварыства выступалі за роўнасць нацый. Працягваючы традыцыі філаматаў, на сваіх сходах яны выступалі з вершамі на беларускай мове. У 1838 г. яно было раскрыта, Ф.Савіч сасланы на Каўказ.

У Віленскім “Дэмакратычным таварыстве” Ф.Савіч напісаў пракламацыю “Заўвагі аб маральнай вайне народа з дэспатызмам або якое наша становішча і што ў цяперашні час трэба рабіць людзям дабрамысным”. Асуджалася марнатраўства, п’янства, безнадзейнасць у грамадстве.

На мове пінскіх ваколіц быў напісаны верш “Дзе ж тое шчасце падзелася?” Паэт звяртаўся да мужыкоў і адрасаваў верш ім. Твор накіраваны супраць дэспатыі, прасякнуты духам інтэрнацыяналізму.

***Юзаф Ігнат Крашэўскі (1812–1887)***

Заснавальнік гісторычнай прозы. Закончыў Віленскі універсітэт. Быў удзельнікам паўстання 1830-1832-1гг. Праз год знаходжання ў турме быў вызвалены. Пісаў Крашэўскі вельмі і вельмі шмат. Спачатку яго творы былі звязаны з рамантычным накірункам.

Вядомасць прынеслі цыкл раманаў і “Аповесці з народнага жыцця”. Першы раман “Старое паданне”. Пазней “Кароль з Нясвіжа”, “Кароль і Бандароўна”. Усе творы гэтага цыклу адлюстроўваюць гісторыі Літвы і Беларусі. Аўтар – майстра белітрызацыі беларускай гісторыі. Паказаны побыт, жыццё, звычкі простага народа. З раманам “Кароль і Бандароўна” звязаны сюжэты купалаўскіх паэм “Бандароўна” і “Магіла льва”. Раман “Кароль з Нясвіжа” прысвечаны Пані Каханку. За аснову ўзяў твор “Успаміны Сапліцы”. Крашэўскі адзін з першых звярнуў увагу на жыццё беларускай вёскі і стварыў “Народныя аповесці”. Яны вылучаюцца дэмакратызмам. “Гутарка Саўкі”, “Улляна”, “Астап Бандарчук”, “Будачнік”, “Хата за вёскай”, “Гісторыя колышка ў плоце”.

***Фадзей Булгарын (1789–1859)***

Цэнтральнай постаццю расійскай часопіснай барацьбы 30-40-х гадоў XIX ст. стаў этнічны беларус (які ўсімі расіянамі ўспрымаўся як паляк) – Фадзей (Тадэвуш) Булгарын. Расійскі падданы, апалячаны беларус, патрыёт Рэчы Паспалітай, адзін з самых супярэчлівых літаратараў гэтай эпохі. У доме, дзе нарадзіўся Булгарын, быў культ Тадэвуша Касцюшкі.

Булгарын быў членам Таварыства шубраўцаў. У 1819 г. пераехаў у Пецярбург, але падтрымліваў цесныя кантакты з таварыствам да 1830г. Булгарын уваходзіў у кола зносін будучых дзекабрыстаў. За перыяд актыўнай выдавецкай дзейнасці Ф.Булгарын здзяйсняе некалькі буйных праектаў: выдае часопіс “Северный архів” (1822-1829), у якасці дадтка да яго выходзяць “Літературные лісткі” (1823-1824); выпускае першы рускі тэатральны альманах “Русская Талія” і друкуе ў ім урыўкі з грыбаедаўскага “Гора

ад розуму"; разам з Грэчам рэдагуе часопіс "Сын Отечества", у 1829 г. аб'яднаны з "Северным архівом". Вяршыняй яго журналісцкай дзейнасці стала адзіная ў Расіі штодзённая грамадска-палітычная газета "Северная пчела", якая выходзіла пад ягонай рэдакцыяй з 1825 па 1859 год.

Да 1825 г. Булгарын падтрымліваў дзекабрыстаў. Але пасля паўстання дзекабрыстаў стаў царскім асведамляльнікам. Найбольш знакаміты раман – "Іван Выжыгін". У ім і ў іншых творах і запісах аўтар праявіў сябе як антысеміт.

Газета Булгарына "Северная пчела" чыталася, але яго самога ненавідзелі, ім пагарджалі, ягоныя творы разыходзіліся тысячнымі тыражамі, але крытыка не шкадавала чорнай фарбы для таго, каб зменшыць ягоны ўплыў.

***Ян Баршчэўскі (прыбл. 1794–1851)***

Паходзіў Я. Баршчэўскі з беднай беларускай шляхты, яго бацька быў уніяцкім святаром у невялікай вёсцы ці засценку Мурагі на беразе возера Нешчарда (цяпер Расонскі раён). Вучыўся ў Полацкай езуіцкай калегіі, ужо там займеў славу "вершапісца".

У 1817 г. уладкаваўся на дзяржаўную службу ў марскім ведамстве ў Пецярбурзе, што дало яму магчымасць пабываць у многіх краінах Еўропы, у тым ліку ў Англіі, Францыі, Фінляндыі. Восенню 1839 года ў Пецярбурзе пачаў выдаваць альманах "Незабудка" (1840 – 1844 гг.). Выйшла 5 нумароў на польскай мове. У альманаху Баршчэўскі друкаваў свае беларускамоўныя вершы "Ах, чым жа твая, дзеванька, галоўка занята?", "Гарэліца, "Бунт хлопаў, напісаныя ў адпаведнасці з паэтыкай класіцызму, і шматлікія польскамоўныя вершы. Польскамоўную паэзію гэтага часу падзяляюць на: творы суб'ектыўна-лірычнага плана; балады літаратурна-рамантычнага характару; балады, напісаныя паводле беларускіх народных легендаў і паданняў. Значнае месца ў паэзіі Я. Баршчэўскага займаюць вершы-рэфлексіі, вершы-разважанні на рэлігійна-філасофскую тэматыку ("Смутак", "Да Станіслава Юр'евіча", "Вясна ў сталіцы", "Пачаноўская гара", санеты). Пад уплывам беларускіх народных легендаў ды паданняў Ян Баршчэўскі напісаў балады "Русалка-спакусніца", "Дзве бярозы", "Дзявочая крыніца", "Зарослае возера".

У 1844 – 1846 гг. выходзіць "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях", напісаная на польскай мове. Кампазіцыйна "Шляхціц Завальня" складаецца з апавяданняў-прытчаў, устаўных навел, лірычных адступленняў і ўспамінаў. Звязваюцца яны пры дапамозе шырока вядомага са старажытнасці прыёму: увядзення вобраза слухача і каментатара народных апавяданняў — Шляхціца Завальні. У творы казачнае і фантастычнае пераплецена з рэальным і будзённым. Апісанне ідзе па трох лініях, аб'яднаных пэўным адзінствам. Першы план – рэальны – малюецца тое, што адбываецца ў хаце шляхціца Завальні, побытавы лад жыцця, сямейныя адносіны, характары гасцей. Гэты план з'яўляецца фонам для разгортвання фантастычнага плану (апавяданні). Трэці – лірычныя адступленні аўтара. Пэўнае значэнне ў кампазіцыйнай структуры твора мае і вобраз пляменніка пана Завальні, Янкі.

Пасля спынення выдання "Незабудкі" Я.Баршчэўскі пакідае назаўсёды Пецярбург, вяртаецца ў сваёй маёнтак на Валыні.

У другой палове 1840-х гг. выходзяць "Драўляны дзядок і кабета Інсекта" (ідэйна працягвае "Шляхціца Завальню), аповесць "Душа не ў сваім целе" (пошук ідэальнага героя ў беларускім грамадстве), паэма "Жыццё сіраты" (гісторыя жыцця і смерці дзяўчыны-сіраты, якую загубілі нягоднікі). Усе творы Баршэўскага насычаныя сімволікай, за якой хаваецца вобраз Беларусі і яе лёсу.

Памёр 11 сакавіка 1851 года, пахаваны на могілках у Цуднаве.

Рэпазіторый ВГУ

## *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808–1884)*

Нарадзіўся ў шляхецкай сям'і. Але дваранскае паходжанне В. Дуніну-Марцінкевічу неаднаразова даводзілася пацвярджаць у сувязі з неабходнасцю вырашэння розных асабістых і сямейных пытанняў, бо гэтага патрабавала бюракратычная сістэма імперскай Расіі.

З сярэдзіны 1820-х гг. В. Дунін-Марцінкевіч жыў у Мінску, быў на дзяржаўнай службе: памочнікам каморніка і каморнікам межавога суда, служачым палаты крымінальнага суда, перакладчыкам у каталіцкай духоўнай кансісторыі, меў пасаду пры дваранскім сходзе. У 1831 г. узяў шлюб з дачкой адваката Юзэфай Бараноўскай, з якой яны мелі семярых дзяцей. У 1840 г. набыў невялікі маёнтак Люцынка ў Пяршайскай воласці Мінскага павета і пасяліўся там, пакінуўшы дзяржаўную службу.

Першыя творы напісаны на польскай мове. Гэта тэксты да аперэт "Спаборніцтва музыкаў", "Чарадзейная вада", а таксама "Рэкруцкі яўрэйскі набор" (у 1841 г. пастаўлена ў Мінску аматарскім гуртком), дзе была ўзнята тэма рэкрутчыны, як перашкоды ў шчаслівым уладкаванні жыцця яўрэйскай сям'і. Тэксты і партытуры гэтых твораў практычна не захаваліся

У 1846 г. у Вільні асобным выданнем выйшла лібрэта музычна-драматычнага твора - оперы "Сялянка" (пазней з'явілася іншая назва - "Ідылія"). "Ідылія" лічыцца прынцыповай з'явай у станаўленні новай беларускай літаратуры. Калі паны тут гавораць па-польску, то персанажы-сяляне - упершыню ў літаратурным творы - па-беларуску.

Тэатр, або драматычны гурток, Дуніна-Марцінкевіча - створаны ім аматарскі тэатральны калектыў - існаваў у 1840-1850-я гг. Ён лічыцца першым беларускім нацыянальным тэатрам сучаснага тыпу. Трупа складалася больш чым з 20 чалавек, у іх ліку сам пісьменнік, ягоныя дзве дачкі і сын, прадстаўнікі мінскай інтэлігенцыі. У спектаклях удзельнічаў хор сялян з Люцынкі, існаваў і аркестр. Ставіліся галоўным чынам п'есы Дуніна-Марцінкевіча. Дзейнасць калектыва была забаронена ўладамі, але спектаклі праходзілі (фактычна нелегальна) у розных гарадах Беларусі да 1856 г.

У 1850-я гг. В. Дунін-Марцінкевіч жыў пераважна ў Мінску, часта бываў у Вільні. У 1854 г. ажыццявіў паездку на Палессе. У гэты перыяд упершыню ў Мінску выйшлі з друку яго паэтычныя зборнікі: "Гапон" (1855 г.), "Вечарніцы і Апантаны" (1855 г.), "Цікавішся? Прачытай!" (1856 г.), "Дудар беларускі, або Усяго патроху" (1857 г.). У выданні ўвайшлі прысвечаныя жыццю сялян вершаваныя аповесці і апавяданні, напісаныя не толькі па-польску, але і па-беларуску.

У 1857 г. В. Дунінам-Марцінкевічам напісаны беларуская балада "Травіца брат-сястрыца", "Быліцы, расказы Навума", "Злая жонка", "Халімон на каранацыі".

У другой палове 1850-х гг. В. Дунін-Марцінкевіч пераклаў з польскай мовы на беларускую паэму Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш".

У 1861 г. у Вільні выйшла вершаванае гістарычнае апавяданне "Люцынка, або Шведы на Літве" (1857 г.), дзе паэтызаваліся мужнасць і гераізм продкаў сучасных беларусаў у барацьбе з захопнікамі. Гэта апошняя кніга В. Дуніна-Марцінкевіча, выдадзеная пры яго жыцці.

В. Дуніну-Марцінкевічу былі блізкія погляды шляхецкіх рэвалюцыянераў пачатку 1860-х гг. Пісьменнік і яго сям'я мелі дачыненне да нацыянальна-вызваленчага руху, падтрымлівалі ўдзельнікаў паўстання 1863-1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

Апошнія дзесяцігоддзі жыцця В. Дуніна-Марцінкевіча (з сярэдзіны 1860-х да сярэдзіны 1880-х гг.) прайшлі ў Люцынцы. У 1866 г. ім была напісана на беларускай мове камедыя (ці, як вызначаў яе жанр сам пісьменнік, фарс-вадэвіль) "Пінская шляхта". У гэтай п'есе высмейваюцца фанабэрыя і адначасова страх перад уладамі

Репозиторий ВГУ

дробнай шляхты, несправядлівы суд. Сярод позніх твораў пісьменніка таксама сатырычная камедыя "Залёты" (1870 г.).

### *Францішак Багушэвіч (1840–1900)*

Нарадзіўся ў фальварку Свіраны пад Вільняй у сям'і дробнага шляхціца. Скончыў Віленскую гімназію (1861), паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, аднак праз два месяцы быў выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Вярнуўся на радзіму, працаваў настаўнікам у в. Доцішкі. Удзельнічаў у паўстанні 1863-1864 гг. Ратуючыся ад рэпрэсій, вымушаны быў пераехаць на Украіну. У 1865 г. паступіў у Нежынскі юрыдычны ліцэй, пасля заканчэння якога працаваў судовым следчым на Украіне, у Расіі і Вільні.

Аўтар двух паэтычных зборнікаў "Дудка беларуская" (1891, псеўданім – Мацей Бурачок) і "Смык беларускі" (1894, псеўданім – Сымон Рэўка з-пад Барысава), кніжкі-апавядання "Тралялёначка" (1892), некалькіх апавяданняў, допісаў і артыкулаў. Падрыхтаваныя да друку зборнікі "Скрыпка беларуская" і "Беларускія апавяданні Бурачка" з-за цэнзурнай забароны не былі надрукаваны, і лёс іх да сённяшняга дня невядомы. У 1885-1891 гг. Ф. Багушэвіч пад рознымі псеўданімамі супрацоўнічаў у польскім часопісе "Kraj" (Пецярбург).

Сваю друкарскую дзейнасць пачаў з публіцыстычных твораў, для якіх характэрны дэмакратычная накіраванасць, паказ добрага ведання побыту народа, сцверджанне паўназначных правоў роднай мовы. У сваіх творах звяртаў увагу на крызіс сельскай гаспадаркі, узнаўляў карціны голаду, пісаў пра сялянскіх эмігрантаў, гаротнае жыццё (допісы рамізнікаў, гарадская бедната, цесныя кватэры беднякоў). Узоры публіцыстыкі Багушэвіча—прадмовы да яго паэтычных зборнікаў.

Зборінк "Дудка беларуская" пачынаецца вершам "Мая дудка", што вызначаецца лірыка-рамантычным напевам. Гэта пісьмовае разважанне пра прызначэнне і ролю мастацтва. Па характары твор эпічны. Сведчаннем эпічнага асваення жыцця пісьменніка з'яўляецца большасць яго вершаў. Ідэйная накіраванасць вершаў: услаўленне чалавечай працы ("Дурны мужык, як варона"), праўдашукальніцкі матыў ("Праўда", "Як праўды шукаць"), патрыятызм ("Хрэсьбіны Мацюка", "Мая хата"), асуджэнне парэформеннай рэчаіснасці і суда("У астрозе", "У судзе", "Быў у чыстцы", "Як праўды шукаюць"), паказ процілеглых сацыяльных сіл ("Бог не роўна дзеле", байка "Воўк і авечка"), любоўная лірыка ("З кірмаўшу"), цікавыя здарэнні з сялянскага жыцця ("Здарэнне", балады "Хцівец і скарб на святога Яна", "Дзе чорт не можа, там бабу пашле").Асноўная тэма зборніка—асуджэнне сацыяльнай няроўнасці.

Вершаваны зборнік "Смык беларускі" адкрываецца праграмным вершам "Смык", які вызначаецца ярка акрэсленай пазіцыяй паэта. Ён падкрэслівае, што крыніца мастацкага натхнення можа і павінна быць нялёгкае жыццё народа, і мастацтва павінна палепшыць жыццё народа. У зборнік увайшоў цыкл "Песні" (10 песень, розных па сваёй тэматыцы, але аднолькавыя па крыніцы ўзнікнення—стылізацыя пад фальклор).

Многія вершы ў зборніку прасякнуты горкай іроніяй, у іх уздымаюцца праблемы ілжывага гуманізму ("Скацінская апека"), прыгоннага права ("Панская ласка", "Ахвяра"), паказваюцца высокія маральныя якасці сялян (верш "Балада") і падкрэсліваецца неабходнасць змен у адносінах да селяніна ("Не цурайся"), гучыць ідэя патрыятызму ("Свая зямля"), асуджаецца недальнабачнасць, маральная непрыстойнасць паноў (байка "Свіння і жалуды").

Проза Ф.Багушэвіча прадстаўлена апавяданнем "Тралялёначка" (1892), навеламі "Палясоўшчык", "Дзядзіна", "Сведка". Навелы аўтара носяць гумарыстычны характар. Іх аснова – народныя анекдоты, у якіх аповяд вядзецца ад удзельнікаў падзей.

Рэпазіторый БДУ

***Уладзіслаў Сыракомля (1823–1862)***

Людвік Францішак Уладзіслаў Кандратовіч нарадзіўся ў сям'і арандатара. Продкі паэта належалі да старадаўняй беларускай шляхты, паланізаванай у выніку гістарычных падзей у Вялікім Княстве Літоўскім. Вучыўся ў павятовай школе пры дамініканскім кляштары ў Нясвіжы, потым у Наваградку. Бацька дапамог яму ў 1841 годзе ўладкавацца на службу ў канцылярыю кіраўніцтва радзівілаўскімі маёнткамі. У 1844 пераехаў у Залучча.

Сыракомля перакладаў на польскую мову паэтаў-лаціністаў, рыхтаваў “Гісторыю літаратуры ў Польшчы”, пісаў вершы, гутаркі, карэспандэнцыі ў газеты. Літаратурныя клопаты вымагалі частых сустрэч з выдаўцамі, паўстала непазбежнасць пераезду ў Вільню. У верасні 1852 У. Сыракомля, даручыўшы гаспадарчыя клопаты будучаму паэту В. Каратынскаму, які жыў у яго з сярэдзіны 1850, пераехаў з сям'ёю ў Вільню, потым у маёнтак Барэйкаўшчына. Сакрэтны нагляд за Сыракомлем, усталяваны пасля яго знаходжання за мяжой у 1858, паглыбіў канфлікт з царскімі ўладамі. Сыракомля быў зняволены, потым знаходзіўся пад хатнім арыштам.

Уладзіслаў Сыракомля шырока вядомы ў славянскім свеце як аўтар лірычных вершаў і паэм, народных гутарак, гісторыка-літаратурных даследаванняў, фальклорных прац і перакладаў з лацінскай мовы.

З твораў, напісаных Сыракомлем па-беларуску, да нас дайшлі толькі два — верш “Добрыя весці” (1848, 1861) і вершаваная лірычная мініяцюра “Ужо птушкі пяюць ўсюды...” (1861).

Многія творы вясковага лірніка (“Пілігрым”, “Кавалак хлеба”, “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах”, “Вёска”, “Манаграфія ракі Нёман”) прасякнуты абвостраным пачуццём любові да бацькоўскай зямлі.

***Вінцэнт Каратынскі (1831-1891)***

Паэт, журналіст і перакладчык. Працаваў хатнім настаўнікам каля Любчы (Навагрудскі раён), сакратаром У.Сыракомлі (з 1850). Друкавацца пачаў у 1856 годзе. У 1857—58 супрацоўнічаў у часопісе «Тека Wilecska» («Віленскі зборнік»), з 1860 — у газеце «Віленскі веснік». З 1866 супрацоўнік «Gazety Warszawskiej» («Варшаўская газета»), з 1886 — часопіса «Tygodnik ilustrowапу» («Ілюстраваны штотыднёвік»). У розных перыядычных выданнях друкаваў артыкулы пра Беларусь: «Карціны з берагоў Нёмана», «Некалькі падрабязнасцей пра сям'ю, месца нараджэння і маладосць Адама Міцкевіча», «Канстанцін Тышкевіч» і інш.

З беларускіх вершаў вядомы «Уставайма, братцы, да дзела, да дзела» і прысвечаны А.ВярыгуДарэўскаму «Далі богто, Арцім...». Аўтар элегіі «Туга на чужой старане» (1864).

У зборніку вершаў «Чым хата багата, тым рада» (1857) і паэме «Таміла» (1858), выдадзеных у Вільні на польскай мове, паказана жыццё беларускай вёскі. Мяркуюць, што паэма была напісана на беларускай мове, але з-за немагчымасці надрукаваць яе на мове арыгінала перакладзена на польскую мову. У каментарыях да гэтай паэмы Каратынскі выклаў свае эстэтычныя погляды. Ён лічыў, што крыніцай мастацтва з'яўляецца грамадскае жыццё, а пісьменнік сваёй чулай душой улоўлівае грамадскія думкі, пачуцці, ідэалы і ўвасабляе іх у мастацкіх творах. Мастак, на яго думку, мае права ідэалізаваць гісторыю свайго народа.

В. Каратынскі ў сваіх творах кіраваўся прынцыпамі сентыменталізму.

***Кастусь Каліноўскі (1838–1864)***

Вікенцій Канстанцін Сямёнавіч Каліноўскі паходзіў з дробнай шляхты, нарадзіўся ў Мастаўлянах. Вучыўся спачатку у Свіслацкай прагімназіі (1846-1855гг.), у 1855г. паехаў вучыцца ў Маскву, потым з братам пераехаў у Пецярбург. З 1856 па 1860

Репозиторий ВГУ

гг. вучыўся на юрфаку Пецярбургскага універсітэта без дапамогі дзяржавы і бацькоў. У 1861 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Меў намер абаснавацца ў Вільні, захавалася прашэнне Вікенція Каліноўскага віленскаму генерал-губернатару Назімаву, атрымаў адмову па прычыне адсутнасці месца. К.Каліноўскі свядома адмовіўся ад кар'еры ў Пецярбурзе, паехаў да бацькі ў Якушоўку.

Стаў падпольшчыкам-агітатарам на Гродзеншчыне, пад выглядам бадзягі і купца вёў агітацыйную працу. Стварыў арганізацыю, камітэт паўстання ў Гродзенскай губерніі. Выступаў пад псеўданімам Васіль Світка.

Выдаваў газету "Мужыцкая праўда". З ліпеня 1862 г. па чэрвень 1863 выйшла 7 нумароў (з іх 6 выйшла ў 1862, 1 нумар у 1863). У цэнтры "Мужыцкай праўды" пытанні грамадскага жыцця: "як рабіць трэба, каб дастаць зямлю і свабоду". Асноўны пафас – выкрыццё ілжывага царскага маніфесту, антанароднай сутнасці царскай унутранай і знешняй палітыкі, што выражае інтарэсы дваранства і праваслаўнага духавенства. У самой назве газеты выяўляўся адрасат, блізкая да народных гутарак, народнасць. Артыкулы пісаліся ад імя мужыка і для мужыка. Выдавалася пад псеўданімам Яська – гаспадар з-пад Вільні. У іх, аднак, адчуваецца голас аратара, высокаадукаванага чалавека з брыдычнай адукацыяй, што паслядоўна і красамоўна абараняе правы і інтарэсы народа.

У ноч з 22 на 23 студзеня 1863г. пачалося паўстанне, якое пацярпела паражэнне. Каліноўскі ўзначаліў паўстанне на Беларусі. У студзені 1864 г. паліцыі ўдалося знайсці і арыштаваць Каліноўскага, які хаваўся пад прозвішчам Вітажэнец і шмат разоў выслізгваў з яе рук. Прыгавораны да смерці – павешанне.

Апошнія творы Каліноўскага - "Пісьмы з-пад шыбеніцы", адно з якіх уключае верш "Марыська чарнаброва, галубка мая", прасякнуты верай у "мужны народ". Лірычная форма верша была напоўнена рэвалюцыйна-дэмакратычным зместам.

Пакаранне адбылося 10 сакавіка 1864 г. на Лукішскай плошчы ў Вільні. 22 лістапада 2019 г. пахаваны на могілках ў Вільні, пасля таго як у 2017 г. яго труп быў знойдзены пад час раскопак у гары Гедыміна.

Кастусь Каліноўскі зрабіў вельмі значны ўнёсак у развіццё беларускай публіцыстыкі.

### *Альгерд Абуховіч (1840–1898(?))*

Альгерд Абукховіч нарадзіўся ў в. Калацічы Бабруйскага павета ў радавітай памешчыцкай сям'і, звязанай далёкім сваяцтвам з італьянскім арыстакратычным родам Бандзінэлі. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Шмат падарожнічаў, жыў у Жэневе і Парыжы. За ўдзел у паўстанні 1863—64 сасланы ў Сібір. Пасля адбыцця пакарання і вяртання ў сям'ю Абуховіч паставіў пытанне, каб уласную зямлю раздаць былым прыгонным, супраць яаго ўзнялася ўся радня. У выніку ён вымушаны быў пакінуць родны дом. Займаўся рэпетытарствам у Слуцку, дзе вакол яго ўтварыўся гурток перадавой беларускай моладзі. Як пісьменнік прытрымліваўся прынцыпаў народнасці літаратуры, пісаў у рэчышчы крытычнага рэалізму. Шмат перакладаў з рускай, польскай і заходнееўрапейскіх літаратур.

У байках аўтара сатыра на паслярэформенную Расійскую імперыю («Старшына»), праблемы свабоды чалавечай асобы («Ваўкалак») і інш. Нянавісць да крутэльства ў розных яго праявах і беспрынцыповасць адвакатаў самаўладства пісьменнік выказаў у байцы "Суд".

У крытычнай літаратуры фрагменты з мемуараў Абуховіча-Бандынэлі часта называюць проста "Мемуарамі Абуховіча". Нам вядома 12 фрагментаў з мемураў, кожны з іх своеасаблівы па жанру. Абуховіч у сваіх успамінах завастарэ ўвагу чытача на вядомых яму формах барацьбы і сацыяльнага пратэсту супраць прыгнятальнікаў.



Рэпазіторый ВДУ

Твор сацыяльны і мае аўтабіяграфічную афарбоўку. Шмат пра што сказана нгамёкамі, недагаворкамі. У многіх раздзелах асвятляецца не толькі мінулае, але і сучаснае для пісьменніка жыццё.

### *Эліза Ажэшка (1841–1910)*

Эліза Ажэшка нарадзілася на Гродзеншчыне, у маёнтку Мількаўшчына, у сям'і буйных землеўладальнікаў Паўлоўскіх. Бацька яе рана памёр, маці зноў выйшла замуж. У 1852 г. дзяўчынку адправілі ў Варшаву ў закрыты пансіён. У 1858 г. Эліза выйшла замуж. Істотны ўплыў на светаўспрыманне пісьменніцы аказала паўстанне 1863-1864 гг., да якога яна мела непасрэднае дачыненне як сувязная партызанчскага атрада Рамуальда Траўгута, што дзейнічаў на беларускім Палессі. Эліза, нягледзячы на забароны і незадаволенасць мужа, прымала актыўны ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху. Яна дапамагала паустанцам харчамі, медыкаментамі.

У 1865 г. у выніку рэпрэсій маёнтак Ажэшкаў канфіскавалі, мужа пісьменніцы і яго братоў выслалі ў Расію. Эліза вярнулася ў Мількаўшчыну. У 1869 г. яна атрымала развод і пераехала ў Гродна, у хуткім часе была вымушана прадаць родны маёнтак.

Першым друкаваным творам стала апавяданне "Малюнак з галодных гадоў" (1866). Тэма твора – жыццё беларускага сялянства.

Становішча жанчыны ў тагачасным грамадстве — адна з цэнтральных тэм творчасці Э.Ажэшкі (аповесць "Марта", 1873). Пастунова творчасць Ажэшкі набывае вядомасць у свеце.

Дэмакратычныя погляды пісьменнцы выяўляліся ў яе стаўленні не толькі да беларускага народа, але і да усіх пагарджаных народаў свету (аповесць "Меір Эзафовіч", 1878), што прынесла пісьменніцы сусветную славу.

Падзяляючы погляды пазітывістаў, пісьменніца не толькі ў сваей творчасці, але і ў рэальным жыцці імкнулася зрабіць нешта карыснае для свайго народа. У 1879 г. Эліза Ажэшка арганізавала ў Вільні кніжнае выдавецтва. З 1882 да 1887 г. Эліза Ажэшка не пакідала Гродна, бо знаходзілася пад наглядам паліцыі.

Сярод найбольш значных для беларускай літаратуры вылучаюцца творы, прысвечаныя жыццю беларускай вескі (аповесці "Нізіны" (1884), "Дзюрдзі" (1885), "Хам" (1888)).У аповесці "Нізіны" яна паказала тыя складаныя працэсы, што адбываліся ў парэформеннай беларускай вёсцы, дзе захаваліся рэшткі прыгоннага права і разам з тым усё мацней заяўлялі пра сябе капіталістычныя тэндэнцыі. У цэнтры аповесці "Ддзрдзі" – забойства, спавадаванае коснасцю і прымхамі сялянскага грамадства. Аповесць "Хам" (1888) таксама вылучаецца маральна-этычнай накіраванасцю і паглыбленым псіхалагізмам.

Асаблівае месца ў творчасці Ажэшкі займае раман "Над Нёманам" (1887), прысвечаны асэнсаванню падзей паўстання 1863 г. Месцам дзеяння ў рамане, як і ў аповесцях, з'уляецца беларуская зямля, аднак стрыжань сюжэта складаюць адносіны паміж "вярхамі" і "нізамі" ўласна польскага грамадства, закранаецца тэма знішчэння родных каранёў.

Пісьменніца ніколі не была кансерватыўнай, імкнулася ўсвядоміць і зразумець усе новыя тэндэнцыі і плыні ў тагачасным мастацтве. Аповесць "Меланхолікі" (1896) — гэта ідэйная спрэчка пісьменніцы з дэкадансам. Эліза Ажэшка сурова асуджала яго, але імкнулася вытлумачыць, адкуль ён бярэ вытокі.

### *Янка Лучына (1851–1897)*

Іван Люцыянавіч Неслухоўскі нарадзіўся ў Мінску ў сям'і радавітага шляхціца. Янка Лучына – трохмоўны паэт. У друку дэбютаваў вершам "Не ради славы иль расчёта", які быў змешчаны ў першым нумары "Минского листка" ў 1886 годзе і змяшчаў своеасаблівую праграму літаратурна-грамадскй дзейнасці паэта. У тым жа годзе выступіў і ў польскім друку (верш "Раскоша натхнення" ў часопісе "Клосы") і

Репозиторий ВГУ

заявіў пра сябе як паэт-дэмакрат, як лірык рамантычнага складу. У друку як беларускі паэт ён дэбютаваў у 1889 годзе вершам “Вясновай парой”. Гэты твор паклаў пачатак вяртання беларускага друкаванага слова пасля перапынку, звязанага з царскімі рэпрэсіямі пасля паражэння паўстання 1863 года. Далей надрукаваныя вершы “Вясна”, “Роднай старонцы”, “Пакуль новы год настане на свеце”, у якіх імкнуўся праз малюнкі прыроды падаць і стан душы чалавека-працаўніка, перадаць яго настрой.

Найбольш значны твор – паэма “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”. Прыгажосць і веліч роднай зямлі выступаюць асновай духоўнай і фізічнай сталасці чалавека. Прырода выхоўвае ў чалавеку чуласць, уражлівасць, вучыць разумець і любіць прыгожае, фарміруе эстэтычны густ беларуса.

Янка Лучына сцвердзіў сябе і як таленавіты публіцыст. Ён напісаў на польскай мове нарыс “З крывавых дзён...” аб падзеях 1863 года на Міншчыне і ў 1889 годзе выдаў яго асобнай брашурай у Кракаве.

Займаўся Я.Лучына і перакладамі. Асабліва плённа ўзнаўляў на беларускай мове творы У.Сыракомлі, бо яго творчасць была для Лучыны ідэйна-мастацкім арыенцірам, менавіта таму ён перакладаўна беларускую мову толькі творы Сыракомлі.

***Адам Гурыновіч (1869–1894)***

Нарадзіўся ў фальварку Кавалькі на Мядзельшчыне ў сям'і збяднелага шляхціца. Скончыў Віленскае рэальнае вучылішча (1887), вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце (1887 - 1893). У 1893 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны. Па стану здароўя выпушчаны з турмы, аднак пакараны ссылкай пад нагляд паліцыі ў фальварак Крыстанопаль каля Смаргоні. Памёр ад чорнай воспы, якую набыў у турме.

Пісаў на беларускай, польскай, рускай мовах. Выступаў таксама як перакладчык, этнограф, фалькларыст. Вялікая частка спадчыны Адама Гурыновіча загінула: 8 сшыткаў было канфіскавана паліцыяй, іншыя матэрыялы пасля арышту пісьменніка знішчаны братам. Упершыню творы Адама Гурыновіча апублікаваны ў 1921 годзе ў газеце "Беларускі звон".

Вершы паэта прасякнуты рэвалюцыйнымі матывамі («Што ты спіш, мужычок...» і «Перш душылі цаны...»). Паэт заклікае сялян прачнуцца, усвядоміць сваю чалавечую годнасць, аглянуцца на свет і ісці змагацца за цправа гаварыць на роднай мове, за лепшае жыццё. У творчасці А. Гурыновіча ёсць і вершы элегічнага, медытатыўнага плану. Ім уласцівы мяккасць фарбаў, паглыбленасць ва ўнутраны стан героя, раскрыццё яго думак, перажыванняў («Сцямнела на двары і ціха кругом...»).

А. Гурыновіч увайшоў у беларускую літаратуру як пачынальнік беларускай грамадзянскай лірыкі і дзіцячай паэзіі (вершы «Рыбак», «Каток»), перакладчык твораў А. Пушкіна, І. Крылова, А. Талстога, А. Міцкевіча, Э. Ажэшкі, І. Франка, збіральнік вуснай паэтычнай народнай творчасці.

**Літаратура**

<u>Мастацкія творы для абавязковага вывучэння</u>

1. *А. Абуховіч:* Мемуары. Ваўкалак. Старшына. Воўк і лісіца. Суд. Дума.
2. *А. Адынец:* Песня філарэтаў.
3. *А. Вярыга-Дарэўскі:* Думка. Альбом.
4. *А. Гурыновіч:* Дзякуй табе, Бурачок Мацею… Што ты спіш, мужычок… Сямнела на двры і ціха кругом… Што за звук ды так громка раздаўся… Перш душылі паны… Рыбак. Каток. Вясна. Бор. Звярынец. Месца нячыстае.
5. *А. Міцкевіч:* Пан Тадэвуш. Конрад Валенрод. Дзяды. Гражына. Дзяды. Рамантычнасць. Свіцязь Свіцязянка. Санеты. Да Лаўры. Дзе ні йду я, з сабою

ўвесь час размаўляю… Да Нёмана. Адмаўленне. Да***. Калі я, труп жывы… Крымскія санеты.

6. *А. Петрашкевіч:* Роздум каля руінаў Гедымінавага замка.
7. *А. Рыпінскі:* Макаранічныя вершы. Нячысцік.
8. *А. Ходзька:* Маліны.
9. *Адэля з Устроні:* Мачаха.
10. *Ананімная літаратура:* Віншаванне бондара Савасцея. Вось які цяпер люд стаў. Вясна гола перапала. Скажы, вяльможны пане. Гутарка пана з селянінам. Гутарка старога дзеда. Гутарка Данілы са Сцяпанам. Гутарка двух суседаў.
11. *В. Дунін-Марцінкевіч:* Гапон. Вечарніцы. Благаславёная сям'я. Купала. Злая жонка. Халімон на каранацыі. Люцынка, або Шведы на Літве. Ідылія. Пінская шляхта. Залёты.
12. *В. Каратынскі:* Таміла.
13. *В. Равінскі:* Энеіда навыварат.
14. *В. Савіч-Заблоцкі:* З чужбіны. Да перапёлкі
15. *З. Манькоўская:* Лілея. Новы Двор. Нічога больш. Шчаслівая.
16. *К. Вераніцын:* Тарас на парнасе. Два д'яблы.
17. *К. Каліноўскі:* Мужыцкая праўда. Пісьмы з-пад шыбеніцы. Верш "Марыська чарнаброва, галубка мая…".
18. *М. Косіч:* На перасяленне.
19. *М. Рукевіч:* З пагоняй нашай сцяг.
20. *П. Багрым:* Зайграй, зайграй, хлопча малы.
21. *Т. Зан:* Свіцязь-возера. Песня з турмы ў Вільні. Выгнанец. Мінчук. Трыялет.
22. *Т.Лада-Заблоцкі:* Ваколіцы Віцебска.
23. *У. Сыракомля:* Добрыя весці. Ужо птушкі пяюць цсюды. Лісты з Беларусі. Доля. Паштальён. На Палессі. Не я пяю – народ Божы…
24. *Ф. Багушэвіч:* Зборнік "Дудка беларуская" (Прадмова. Мая дудка. Дурны мужык, як варона. Немец. Бог не роўна дзеле. З кірмашу. Гдзе чорт не можа, там бабу пашле. Кепска будзе!). Зборнік "Смык беларускі" (Прадмова. Смык. Песні. Ахвяра. Скацінная апека. Свіння і жалуды). Запавет. Жаццё – вандроўка ў чоўне па моры… Прэч бутэлькі, люлькі, карты!
25. *Ф. Савіч:* "Дзе ж тое шчасце падзелася?.."
26. *Ф. Тапчэўскі:* Вечарынка. Саўсім не тое, што было. Грошы і праца. Ён і яна. Панскае ігрышча.
27. *Э. Ажэшка:* Дзюрдзі. Хам.
28. *Я. Баршчэўскі:* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Драўляны Дзядок і кабета Інсекта. Душа не ў сваім целе. Жыццё сіраты. Дзеванька. Рабункі мужыкоў (Бунт хлопаў). Гарэліца. Санет для В.П.Буйніцкай. Падарожжа. Да Юлі. Дзве бярозы. Зарослае возера. Русалка-спакусніца.
29. *Я. Лучына:* Паляўнічыя акварэлькі з Палесся. Старасць не радасць. Роднай старонцы. Што думае Янка, везучы дровы ў горад. Вясна. З паэмы "Гануся". Дзень за днём.
30. *Я. Чачот:* Свіцязь. Мышанка. Ямбы. О ты край мой нешчаслівы. Да голуба. Яна далёка. Любым сялянам з-над Нёмана і Дзвіны. На прыезд Адама Міцкевіча. Яжовыя імяніны. Да мілых мужычкоў.

Репозиторий ВГУ

Асноўная літаратура

1. Беларуская літаратура XVIII-XIX стагоддзяў : зб. тэкстаў / БДУ, Філал. фак., Каф. гіст. беларус. літ ; склад. і аўт. камент. М. В. Хаўстовіч. — Мінск : БДУ, 2000. — 229 с.
2. Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / склад. і аўт. камент. А. А. Лойка, В. П. Рагойша. – Мінск: Выш. шк., 1988.
3. Бязлепкіна, А. П. Беларуская літаратура XIX стагоддзя [Электронны рэсурс] : курс лекцый / А. П. Бязлепкіна. – Мінск : БДУ, 2012.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XI - XIX стагоддзяў : у 2 т. Т. 2 : Новая літаратура: другая палова XVIII - XIX стагоддзе / [рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.] ; навук. рэд. тома: У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі] ; Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы . — Мінск : Беларуская навука, 2007. — 582 с.
5. Гісторыя беларускай літаратуры XIX ст. (паслярэформенны перыяд) : вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне / В. В. Лапацінская. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2016.
6. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. У 2 ч. Ч. 1: падруч. для студ. філал. фак. – Мінск : Выш. шк., 1989.
7. Хаўстовіч, М. В. Гісторыя беларускай літаратуры 30-40-х гг. XIX ст.: дапаможнік для студдэнтаў фіал. спец. вышэйш. навуч. Устаноў / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : БДУ, 2001.

Дадатковая літаратура

1. Гісторыя беларускай літаратуры: XIX - пачатак XX ст. : Падруч. для студ. філал. спец. пед. ВНУ / Агул. рэд. М. А. Лазарук, А. А. Семяновіч. — Мінск, 1998.
2. Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя / Уклад.,аўт.прадм.і заўваг Казберук У. — Мінск, 2001.
3. Запрудскі, І. М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя / І. М. Запрудскі. – Мінск : БДУ, 2003.
4. Кісялёў, Г. В. Ад Чачота да Багушэвіча : Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларуская літаратуры XIX ст. / Г. В. Кісялёў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
5. Літаратура Беларусі: Першая палова XIX стагоддзя: хрэстаматыя : Вучэбны дапаможнік для студ. філал. спец. ВНУ / Уклад., аўт. прадм., біягр. даведак і камент. К. А. Цвірка. — Мінск, 2000.
6. Мархель, У. І. Прадвесце: беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. / У. І Мархель. Навука і тэхніка, 1991.
7. Пачынальнікі: з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў, рэд.: В. В. Барысенка, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Бел. навука, 2003.
8. Філаматы і філарэты: Зборнік / Уклад., пер. польскамоўн. твораў, прадм., біягр. даведкі пра аўт. і камент. К.Цвіркі. – Мінск : Міжнар. фонд "Бел. кнігазбор", 1998.
9. Хаўстовіч, М. Шляхамі да беларускасці: нарысы, артыкулы, эсэ / М. Хаўстовіч. – Варшава: каф.беларусістыкі Варш.ун-та, 2010.
10. Штэйнер, І. Ф. Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя / І. Ф. Штэйнер. – Мінск: Беларуская навука, 2002.

Репозиторий ВГУ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ

## Уводзіны

Менавіта XX стагоддзе пазначана беспрэцэдэнтнымі зрухамі ў літаратуры і мастацтве, звязанымі найперш з узнікненнем і ўмацаваннем мадэрнізму. Яго гістарычныя і літаратурныя вытокі невыпадкова ўзыходзяць у дэкаданс, які з'явіўся ў другой палове XIX ст. У аснове мадэрнісцкага светаадчування ляжаць ідэі: а) прынцыповай разнастайнасці жыцця; б) надзвычайнай супярэчлівасці чалавечай натуры; в) творчай прыроды розуму, здольнага не толькі адлюстроўваць рэчаіснасць, але і канструяваць яе на свой лад; г) пафаснага адмаўлення гармоніі, сіметрыі, нормы, меры як праяў традыцыйнага мыслення; д) пераасэнсавання класічнай спадчыны і стварэння новай мастацкай мовы.

*Мадэрнізм* свядома адкідае літаратурную класіку з яе верай у разумнасць светабудовы. На шляхах адмаўлення быцця, якое страціла сэнс, мадэрністы сцвярджаюць сваё права на непаўторнае, індывідуальнае бачанне свету, прэтэндуючы на ролю бунтаўнікоў і творцаў «цалкам новага мастацтва». У гэтым яны вельмі непадобныя паміж сабой. Адсюль такая шматлікасць асобных плыняў і школ: імпрэсіянізм, сімвалізм, экспрэсіянізм, футурызм, дадаізм, сюррэалізм, акмеізм, імажынізм, «плынь свядомасці», экзістэнцыялізм, «новы раман», «тэатр абсурду» і інш. Мадэрнізм адначасова далучае свайго чытача да рэальнасці, даючы яму больш дакладнае, адэкватнае разуменне іадчужае яго ад навакольнага свету, у якім існуюць стыхія, абсурд, выпадак. Адказы на выклік XX ст. у прадстаўнікоў розных мадэрнісцкіх школ амаль супрацьлеглыя – ад «чорнага песімізму» да «бязмежнага аптымізму».

Мадэрнізм варта разглядаць як сукупнасць тэндэнцый, напрамкаў, творчых практык у сусветным мастацтве і літаратуры пачатку XX ст., якую яднае наватарскі характар і апазіцыянізм у дачыненні да звыклых напрамкаў у мастацтве (антытрадыцыяналізм).Вызначальнымі рысамі мадэрнізму з'яўляюцца таксама суб'ектывізм, ірацыяналізм, моцная схільнасць да мастацкага эксперыменту, антыэстэтызм, фармалізм. Вылучаюць шэраг мастацкіх мадэрнісцкіх плыняў: сімвалізм, імпрэсіянізм, футурызм, імажызм, акмеізм, экспрэсіянізм і г.д. як асобныя плыні ў беларускай літаратуры яны не аформіліся. Тым не менш, мадэрніская эстэтыка стала вельмі характэрнай з'явай для творчасці беларускіх аўтараў. Вершы М. Багдановіча прасякнуты сімваліцкім светаадчуваннем і ідэямі французскага сімвалізму, іспрэсіяністычнай эстэтыкай. Ідэі футурызму натхнялі сяброў літаратурнага згуртавання «Маладняк», якія прапаведвалі культурны нігілізм, апазіцыяналізм у дачыненні да традыцый. Тэрмін «бурапена», упершыню прапанаваны паэтам А. Александровічам у вершы «Новы Менск», стасуецца з паэтычным хуліганствам і эксцэнтрыкай пачынальнікаў футурызму. Імкненне расправіцца з «балотам» і «тхлом» старога жыцця, справіць «скокі на могілках», адолець праклятую мінуўшчыну пры дапамозе ачышчальнай стыхіі агню складае пафас паэзіі лідэра літаратурнай суполкі «Маладняк» М. Чарота, аўтара паэмы «Босыяна вогнішчы», створанай не без уплыву А. Блока і У. Маякоўскага. Фармальны досвед У. Маякоўскага, у тым ліку яго «лесвічку», засвоілі многія маладыя паэты Беларусі 1920-х гадоў. Беларускай версіяй літаратурнага футурызму можна лічыць таксама творчасць дзеячаў «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны» на чале з П. Шукайлам. Мае беларускую версію і літаратурны імажызм, або імажынізм, (паходзіць ад англійскага *image* – вобраз). Імажынізм паўплываў на творчую платформу літаратурнага згуртавання «Узвышша», прадстаўнікі якога таксама імкнуліся да пашырэння вобразна-паэтычных сродкаў, «жывапісання словам».

Рэпазіторый ВДУ

Асобнае месца ў літаратуры XX ст. займае так званы *сацыялістычны рэалізм.* У аснове ляжыць камуністычная ідэалогія, класава-партыйны падыход да задач і мэт мастацкай творчасці. Цэнтральнае ў рэалізме паняцце «праўды» зводзіцца ад шматлікіх узораў сацрэалізму да паняццяў «праўдападабенства», «апісанне жыцця ў формах самога жыцця», «паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці ў развіцці».

Апошнія дзесяцігоддзі XX ст. у сусветнай літаратуры прайшлі пад знакам *постмадэрнізму.* Паводле часу гэты кардынальна новы мастацкі напрамак у гісторыі літаратуры сапраўды ўзнік і сцвердзіў сябе «пасля» («*post*») эпохі мадэрнізму, якая завяршылася ў 1950-х гадах. Аднак паводле свайго зместу постмадэрнізм дыстанцуецца не толькі ад класікі, але і ад мадэрнізму, прэзентуючы сябе як «постсучасная літаратура» (мастацтва, культура, філасофія). Прыкметы постмадэрнізму знаходзяць як у блізкай сучаснасці, так і ў далёкай мінуўшчыне. Менавіта там пачынаюць сваё лірычнае жыццё такія «постмадэрнісцкія» паняцці-вобразы, як «лабірынт», «бібліятэка», «кніга», «крыж», «кола» і інш. Адна з галоўных асаблівасцяў постмадэрнізму – гэта імкненне ахапіць як мага шырэй усю прастору сусветнай культуры і актыўна выкарыстаць вядомыя ідэі, сюжэты, вобразы, матывы, трансфармуючы іх у адпаведнасці з задумай. Свет успрымаецца постмадэрністамі як Тэкст, які трэба ўмець чытаць і разумець.

### *Мадэрнізм і беларуская літаратура*

Беларуская літаратура не пазбегла ўплыву мадэрнізму нават у варунках частковай культурнай самаізаляцыі ў 1920–1930-я гады. Яна працягвала рухацца і абнаўляцца паводле агульнаеўрапейскай парадыгмы, і яе авангардысцкі досвед быў недаацэнены савецкім літаратуразнаўствам толькі з ідэалагічных прычын. Зварот да беларускай літаратуры 1920-х гадоў дазваляе сцвярджаць, што ў ёй склаліся прынамсі дзве нацыянальныя версіі літаратурнага мадэрнізму.

Першую можна ўмоўна пазначыць як *маладнякізм*, і звязаны ён з трансфармацыяй уплываў футурызму, экспрэсіянізму, кубізму, заснаваны на падставах палітычнага радыкалізму і «рэвалюцыйнай радасці», антытрадыцыянізму. Нацыянальную спецыфіку маладнякізм мае дзякуючы дэклараваным прынцыпам «ажыўленства» (вітальнасці) і «бурапены»; у прозе – пошуку «жывога чалавека» (К. Чорны).

Другая мадэль беларускага мадэрнізму пазначаецца тут як *узвышэнства*. Прадстаўнікі літаратурнага згуртавання «Узвышша» абапіраліся на досвед французскіх паэтаў-парнаснікаў, часткова – на праграму расійскіх імажыністаў і акмеістаў (С. Ясенін, М. Гумілёў, Г. Ахматава, С. Гарадзецкі, В. Мандэльштам, М. Кузмін), на прынцып «чыстае красы» (успрыняты М. Багдановічам), што выявілася ў іх арыентацыі на элітарнасць творчасці, на стварэнне шэдэўраў. Адметнасць узвышэнства падкрэслена ў «Тэзісах» крытыка А. Бабарэкі, які стварыў, па сутнасці, паўнавартасны мастацкі маніфест літаратурнага аб'яднання. Узвышэнцы практыкавалі літаратурны нонканфармізм, пошук ідэйнай і мастацкай цэласнасці, арыентаваліся на беларускую ідэю (адраджэнізм), шукалі стымулы эстэтычнага абнаўлення ў фальклорнай спадчыне, імкнуліся да дынамічнай вобразнасці, звязанай з рухам (на што іх натхняў, безумоўна, сімвал беларускай «Пагоні»). У адным са сваіх тэзісаў А. Бабарэка абгрунтоўвае прынцып *аквітызму* (ад лац. *aquavita* –чыстая вада), які прадугледжваў пераўтварэнне творчай энергіі мас у творчую энергію літаратуры. Асаблівая энергетыка і віталізм, уласцівыя творчасці сябраў літаратурнай суполкі, паказваюць на адметнасць феномену ўзвышэнства.

Такім чынам, традыцыі мадэрнізму, выяўленыя ў гісторыі еўрапейскіх літаратур, у тым ліку і беларускай, мелі сваё развіццё на працягу ўсяго XX ст.

Рэпазіторый ВДУ

### *Літаратура 1900–1930-х гг.: агульная характарыстыка*

Пачатак XX ст. – асаблівы перыяд у развіцці беларускай літаратуры. Пасля XIX ст., якое характарызавалася замаруджанасцю, а часам і перарывістасцю працэса станаўлення новай літаратуры, гэты этап вызначаецца небывалай да той пары інтэнсіўнасцю пошукаў, росквітам усіх жанраў літаратуры. Вядучую ролю, як і раней, адыгрывала паэзія, аднак у гэты час даволі актыўна развіваюцца і празаічныя жанры, асабліва малых форм, а таксама і драматычныя. Такое "выбуховае" развіццё літаратуры ў многім абумоўлена гістарычным працэсам. Не апошнюю ролю адыгралі рэвалюцыйныя падзеі, уцягненне ў нацыянальна-вызваленчы рух шырокіх народных мас. У перыядызацыі літаратуры гэтага перыяду вылучаецца *нашаніўскі* (або дарэвалюцыйны) і *літаратурны працэс 1920-х гг.*

### *Перыядычны друк у пачатку XX ст.*

Хоць першая руская рэвалюцыя пацярпела паражэнне, царскі ўрад пад напорам шырокіх мас вымушаны быў пайсці на некаторыя паслабленні. Адной з такіх уступак з'явілася легалізацыя беларускага друку, адмена забароны перыядычных выданняў на беларускай мове. Сталі выходзіць першыя беларускія легальныя газеты «Наша доля» і «Наша ніва».

Па ідэйнай накіраванасці публікуемых матэрыялаў, паводле палітычнай арыентацыі *«Наша доля»* (першы нумар яе выйшаў 1 верасня 1906 г.) займала рэвалюцыйна-дэмакратычную пазіцыю, падтрымлівала народную рэвалюцыю. Газета асуджала самаўладства, абуралася жорсткімі рэпрэсіямі царызму, заклікала працоўныя масы працягваць барацьбу за свабоду, за лепшае жыццё. У падзагалоўку да газеты «Наша доля» гаварылася, што яна прызначаецца «для вясковага мясцовага рабочага народу». У рэдакцыйным артыкуле, з якім «Наша доля» (№ 1) звярталася да чытачоў, з радасцю адзначалася, што «прачнуўся з цяжкага сну народ, падняуся як рака на вясну за вялікае дзела свабоды і лепшае долі». У першым нумары «Нашай долі» было надрукавана апавяданне Цёткі (Алаізы Пашкевіч) «Прысяга над крывавымі разорамі», у якім сцвярджаецца ідэя саюза рабочага класа, працоўнага сялянства і салдат у суровай барацьбе за свабоду. У снежні 1906 г. улады дамагліся закрыцця газеты.

Газета *«Наша ніва»* (выходзіла з 10 лістапада 1906 г. па 7 жніўня 1915 г.), нягледзячы на агульны памяркоўны характар яе палітычнай праграмы, таксама адыграла важную ролю ў прапагандзе новых ідэй, у крытыцы самаўладства, у актывізацыі літаратурна-творчага жыцця, аб'яднанні сіл перадавой інтэлігенцыі, разгортванні масавага літаратурнага руху ў передкастрычніцкае дзесяцігоддзе. Газета з яе выдавецтвам і карэспандэнтамі была цэнтрам беларускай культуры і беларускага нацыянальнага руху. Выдатныя беларускія пісьменнікі Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Цётка, Цішка Гартны і іншыя былі актыўнымі яе супрацоўнікамі. Не было амаль ніводнага нумара газеты без іх вершаў, апавяданняў, крытычных артыкулаў і карэспандэнцый.

З часам з'яўляюцца новыя перыядычныя выданні. Гэта беларускія часопісы «Лучынка» (Мінск, 1913–1914), «Саха» (Вільня, Мінск, 1914), «Раніца» (Пецярбург, 1914), літаратурна-публіцыстычны альманах «Маладая Беларусь» (Пецярбург, 1912–1913), штогадовыя літаратурныя зборнікі тыпу «Беларускага календара» (Вільня, 1909–1917) і інш.

Выданнем кніг і брашур на беларускай мове займаюцца культурна-асветныя саюзы, аб'яднанні, суполкі, таварыствы. Многа зрабіла ў гэтым напрамку заснаванае ў 1906 г. пецярбургскае выдавецтва *«Загляне сонца і ў наша аконца»*. Чытанкі для дзяцей і дарослых, календары, альманахі, кнігі паэзіі, прозы, драматургіі – такі параўнальна шырокі дыяпазон дзейнасці гэтага вельмі папулярнага ў свой час выдавецкага таварыства, якое праіснавала аж да 1914 г. Разгортваюць дзейнасць выдавецкія суполкі

ў Вільні: «Наша ніва» (1907–1914), «Наша хата» (1908–1910), «Палачанін» (1910–1911). Асобныя беларускія выдавецтвы ўзнікаюць і ў Мінску: «Саха», «Мінчук».

***Крытыка і літаратуразнаўства***

Першымі найбольш значнымі беларускімі крытыкамі і публіцыстамі пачатку ХХ ст. былі самі пісьменнікі. Гэта Цётка, Я. Купала, Я. Колас, С. Палуян, М. Багдановіч, К. Каганец, Ядвігін Ш., З. Бядуля, М. Гарэцкі, Я. Журба, А. Гурло і інш.

Цётка таксама ўпершыню звязвала нацыянальную публіцыстыку, беларускую літаратуру з ідэямі Рэнесанса, сусветнага мастацтва. Ёсць у публіцыстыцы Цёткі і асобныя рэпартажы – «Беларуская вечарынка ў Пецярбурзе (ад карэспандэнта «Нашае нівы»). Іншую значную старонку складаюць артыкулы, што або мяжуюць з навуковымі даследаваннямі або ўвогуле з'яўляюцца імі. Сярод першых, у прыватнасці, артыкул «Збірайце матэрыялы аб батлейцы!». Навуковымі даследаваннямі сталі артыкулы «Наша народная беларуская песня», «Папараць-кветка».

На старонках перыядычнага друку з'яўляюцца публіцыстычныя і літаратурна-крытычныя нататкі, водгукі, рэцэнзіі, артыкулы Я. Купалы і Я. Коласа. Тут варта прыгадаць найперш артыкул Я. Купалы «Чаму плача песня наша?» і яго ж рэцэнзію на камедыю В. Дуніна-Марцінкевіча «Залёты». Адзінства сацыялагічнага і эстэтычнага аналізу літаратурных з'яў у іх непарыўнай сувязі з жыццём – вось вызначальная вартасць літаратурна-крытычнай спадчыны Я. Купалы.

Самай жа выдатнай, самай каларытнай постаццю на гарызонце беларускай крытыкі пачатку ХХ ст. з'яўляецца М. Багдановіч. М. Багдановіч выпрацаваў сваю літаратурна-эстэтычную сістэму, свой, шмат у чым наватарскі падыход да ацэнкі твораў мастацтва, значэння, ролі і месца іх аўтараў у гісторыка-літаратурным працэсе. Ён тэарэтычна абагульніў практычны вопыт беларускай літаратуры свайго часу, паказаў яе гістарычную сувязь з культурай папярэдніх эпох, у самых агульных рысах намеціў шляхі яе далейшага развіцця. Найбольш значным прыкладам майстэрства Багдановіча-крытыка з'яўляецца артыкул «Глыбы і слаі», прысвечаны агляду беларускай літаратуры за 1910 г.

Сярод крытыкаў-прафесіяналаў перадкастрычніцкага дзесяцігоддзя адно з вядучых месц займае Лявон Гмырак, артыкулы якога часта друкаваліся на старонках тагачасных беларускіх выданняў. Калі ў 1913 г. узнікла дыскусія па праблеме адносін мастацтва да рэчаіснасці, Л. Гмырак адразу ж падтрымаў Я. Купалу, яго артыкул «Яшчэ аб сплачыванні доўгу» («Наша ніва», 1913, № 33–34).

***Літаратурны працэс 1920-х гг.***

Падзеі грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі аказалі ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. У снежні 1917 г. ў Мінску адбыўся Усебеларускі кангрэс, які быў разагнаны бальшавікамі. 25 сакавіка 1918 г. была створана БНР.

З 1921 г. пачалося развіццё лепшых набыткаў беларускага культурнага жыцця: узнікненне БДУ, Інбелкульта (які пасля быў ператвораны ў Акадэмію Навук Беларусі); выданне газет, вяртанне на Радзіму класікаў літаратуры Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота і інш. З 1923 г. палітыка беларусізацыі стала афіцыйнай. Наогул 1920-я гады былі плённымі для беларускай культуры і літаратуры, хоць кастрычніцкая рэвалюцыя неадназначна ўспрымалася беларускімі пісьменнікамі і культурнымі дзеячамі. Дадзены час характарызаваўся наяўнасцю даследаванняў па гісторыі беларускай літаратуры. З'яўляецца праца М. Гарэцкага «Гісторыя беларускай літаратуры» (з 1917 – па 1923 гг.).

У лістападзе 1923 г. ўтварылася літаратурнае аб'яднанне *«Маладняк»*, якое ўвяло стыхійны літаратурны рух у пэўныя арганізацыйныя рамкі. У склад яго першапачаткова ўвайшлі М. Чарот, А. Вольны, А. Дудар, А. Александровіч, Я. Пушча, А. Бабарэка. Старшынёй быў абраны М. Чарот. Аб'яднанне неўзабаве стала масавым і



Репозиторий ВГУ

налічвала больш за 500 сяброў. Філіі (аддзяленні) існавалі і за межамі Беларусі: у Маскве, Ленінградзе, Смаленску, Вільні, Празе, Дзвінску. Маладнякоўцамі лічылі сябе К. Чорны, У. Дубоўка, К. Крапіва, М. Зарэцкі, М. Лынькоў, П. Трус, У. Хадыка, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, Я. Скрыган, Р. Мурашка, П. Галавач, М. Лужанін і інш. «Маладняк» ствараў новую, пралетарскую літаратуру. Найбольшыя дасягненні былі ў галіне паэзіі, што мела рэвалюцыйна-рамантычны характар і трымалася на пафасе адмаўлення «старога». Пераважала захапленне псеўдарэвалюцыйнай фразеалогіяй, што выяўлялася ў выкарыстанні палітычных лозунгаў і прапагандысцкіх штампаў, заўважалася пагоня за экстравагантным словам, імкненне супрацьстаўляць новы стыль састарэлай «нашаніўскай» манеры, якое атрымала назву «бурапены» (жартоўны тэрмін, прыдуманы К. Чорным).

*«Узвышша»*(1926–1931).Паступова «Маладняк» ператвараўся ў культурна-асветніцкую арганізацыю, найбольш таленавітыя прадстаўнікі адчулі розніцу паміж «агіткай» і сапраўднай мастацкай літаратурай. Адбыўся раскол, і група пісьменнікаў (К. Чорны, К. Крапіва, У. Дубоўка, Я. Пушча, А. Бабарэка) выйшла з «Маладняка», стварыўшы самастойную літаратурна-мастацкую суполку «Узвышша» (1926–1931), у якую ўваходзілі таксама пісьменнікі З. Бядуля, У. Жылка, П. Глебка, Т. Кляшторны, М. Лужанін, С. Дарожны, В. Шашалевіч, А. Мрый і інш. Першапачатковай задачай узвышаўцы лічылі авалоданне культурай творчасці, засваенне класічнай спадчыны, напісанне твораў, якія «ўбачаць вякі і народы». Адмовіўшыся ад павярхоўна-рамантызаванага погляду на рэвалюцыю, узвышаўцы стваралі нацыянальна-самабытную літаратуру, якая змагла б выказаць памкненні народа і адшукаць сваё месца сярод іншых народаў свету. З цягам часу арганізацыя ператварылася ў элітарнае аб'яднанне пісьменнікаў нацыянальна-дэмакратычнай і эстэтычнай арыентацыі, што паслужыла падставай для пазнейшага абвінавачвання ў адступленні ад «лініі партыі» і ў контррэвалюцыйнай варожасці савецкай уладзе.

*БелАПП*(Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў), якая працягвала лінію «Маладняка» на стварэнне новай пралетарскай літаратуры. У шэрагах узвышаўцаў адбыўся раскол: «меньшасць» (У. Дубоўка, Я. Пушча, А. Бабарэка, У. Жылка і інш.) настойвала на бескампраміснасці, «большасць» (К. Крапіва, З. Бядула, М. Лужанін, Т. Кляшторны) угаворвала сяброў па суполцы «пакаяцца». Перамаглі другія; летам 1930 г. многія ўзвышаўцы былі арыштаваны і высланы за межы Беларусі, астатнія стараліся «перабудавацца». У канцы 1931 г. «Узвышша» абвясціла аб самароспуску, спыніў сваё існаванне і аднайменны часопіс. Пасля ператварэння «Маладняка» ў БелАПП у лістападзе 1928 г. ўзмацнілася ідэйная барацьба паміж прадстаўнікамі аб'яднання, якая перайшла ў прамыя палітычныя даносы і абвінавачванні.

### *Расстралянае адраджэнне*

Літаратурнае жыццё ў канцы 1920–1930-х гадоў прыкметна палітызавалася, што ўрэшце скончылася трагедыяй. У 1929 г. была прынята ўстаноўка на асуджэнне нацыянал-дэмакратаў («нацдэмаўшчыны»), а ўжо ў 1930 г. «нацдэмаў» пачалі арыштоўваць, дапытваць і высылаць за межы Беларусі. Сярод нявінна асуджаных на высылку і творчую бяздзейнасць апынуліся каля 180 (паводле падлікаў гісторыкаў) пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, у тым ліку М. Гарэцкі, У. Жылка, У. Дубоўка, Я. Пушча, А. Бабарэка, В. Ластоўскі, Я. Лёсік і інш. Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля былі вымушаны пісаць пад дыктоўку афіцыйнай крытыкі, асуджаць сваіх калег за былую творчасць. Пазней была арыштавана альбо выклікана на допыты ў ГПУ (НКВД) пераважная большасць беларускай інтэлігенцыі.

### *Літаратура Заходняй Беларусі*

Пасля Рыжскага міру Заходняя Беларусь апынулася пад польскай акупацыяй. Чатырохмільённаму насельніцтву давялося ствараць сваю культуру ў варунках асіміляцыі і апалячвання.

Выразнікам народных настрояў у 1920-я гады была масавая паэзія, што стваралася ананімнымі «песнярамі з народа» і набыла вялікую папулярнасць. Яе змест і пафас вызначалі песні змагання «Нас не зломіць нядоля ліхая», «Век дваццаты, век прыгожы», «Чырвоная зорка», «Браты мае, ўжо час настаў», «Пад гоман вясёлы» і інш. Вялікае месца ў масавай паэзіі займала «астрожная лірыка» («Як вялі мяне дарожкай», «У мурах сырых на Лукішках», «Амністыі!», «Ой,Бяроза, ты, Бяроза», «Наша песня»). Ужо тут пазначаны асноўныя ідэі, вобразы і матывы заходнебеларускай літаратуры, у якой пераважалі паэтычныя жанры.

У пачатку 1920-х гадоў творчая атмасфера стваралася і падтрымлівалася такімі літаратарамі, як М. Гарэцкі, Ф. Аляхновіч, У. Самойла, А. Луцкевіч, І. Дварчанін Л. Родзевіч, І. Канчэўскі, Ф. Умястоўскі, якія з розных прычын апынуліся за мяжой. Жылі і працавалі яны ў Вільні, якая набыла статус духоўнага цэнтра беларусаў.

Паводле палітычнай арыентацыі, якая вызначала шмат у чым і творчыя прыхільнасці, творчасць заходнебеларускіх пісьменнікаў падзяляюць на некалькіплыняў. Прадстаўнікі *рэвалюцыйна-вызваленчай* плыні былі адначасова і змагарамі, падпольшчыкамі, сядзелі ў астрогах, праследаваліся акупацыйнай уладай. найбольш таленавітых былі М. Танк, В. Таўлай, М. Васілёк, Г. Леўчык, Пестрак, М. Машара, Х. Ілляшэвіч і інш.Змагарная натура найяскравей выяўлялася ў патрыятычнай лірыцы і няўпэўнена адчувала сябе ў інтымных вершах і пейзажнай лірыцы (напрыклад, у даверасnёўскай паэзіі М. Танка вершы любоўнага зместу амаль адсутнічаюць). Рэвалюцыянеры-дэмакраты рэзка асуджалі «адступнікаў», прыхільнікаў «мастацтва дзеля мастацтва». Свае ідэі і погляды паэты рэвалюцыйнага гарту выказвалі на старонках часопісаў «Маланка», «Родныя гоні», «Студэнцкая думка», «Маладое жыццё», альманаха «Беларуская культура», газет «Грамадзянін», «Беларускае жыццё», «Беларускі звон», «Наша будучыня», «Наша думка», «Незалежная думка», «Народная справа», «Наша праўда», штотыднёвіка «Бацькаўшчына», сатырычнага часопіса «Асва».

Асобнае месца ў літаратуры Заходняй Беларусі займае *нацыянальна-дэмакратычная плынь:* Н. Арсеннева, А. Луцкевіч, І. Канчэўскі, У. Самойла, Ф. Аляхновіч, С. Станкевіч і інш. Да *рэлігійнай плыні* належалі К. Сваяк, А. Станкевіч, С. Грынкевіч, В. Гадлеўскі. Хрысціянскія дэмакраты («хадэкі») выдавалі «тоўсты» часопіс «Калоссе». З надыходам Саветаў многія з іх былі арыштаваныяі расстраляныя: А. Луцкевіч, А. Уласаў, У. Самойла, А. Станкевіч.

*Антон Іванавіч Луцкевіч (1884–1941 ці 1946).*Нарадзіўся 29 студзеня 1884 г. ў г. Шаўляі на Ковеншчыне (зараз Шаўляй, Літва) у сям'і служачага. Вучыўся ў Мінскай мужчынскай класічнай гімназіі. Паступіў у Пецярбургскі універсітэт. Адзін са стваральнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Выдаваў разам з І. Луцкевічам і А. Уласавым газеты «Наша Доля», «Наша Ніва», «Гоман». Старшыня Рады БНР са дня стварэння: 25 сакавіка 1918 г. Арыштоўваўся царскімі, а затым польскімі ўладамі. У газетах «Наперад», «Беларускі звон», «Родны край» выкрываў прагу да ўлады Сталіна. 30 верасня 1939 г. быў арыштаваны. Памёр у турме ў 1946-м годзе (звесткі недакладныя). У кнізе «Нашы песняры» дае трапную характарыстыку Я. Купалу («ідэолаг беларускага Адраджэння»), М. Багдановічу («пясняр чыстае красы»), Цётцы («трымае ў адной руцэ меч, у другой пяро»), К. Буйло («песнярка кахання»). У кнізе «Адбітае жыццё» стварае кароткую гісторыю беларускай літаратуры, складзеную з творчых партрэтаў пісьменнікаў і праблемных артыкулаў, сярод якіх «Істота літаратуры і яе грамадскае жыццё», «Эвалюцыя беларускае адраджэнскае ідэалогіі і яе



Рэпазіторый ВДПУ

адбіццё ў літаратуры», «Вільня ў беларускай літаратуры», «Бунт проці Бога». Асобнай брашурай выйшлі «Пуцяводныя ідэі беларускай літаратуры» і «Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі». Паводле афіцыйных звестак памёр у 1946 г. ў зняволенні. Паводле іншых звестак расстраляны ў чэрвені 1941 г. ў час эвакуацыі вязняў.

***Беларуская эміграцыя***

Пакаленне беларускіх эмігрантаў, якое пакідала родны край, мела на ўвазе палітычныя матывы. Шмат хто выбраў растанне з Радзімай, бо на ўласным горкім досведзе пазнаў, што такое сталінізм і як ён ставіцца да «нацдэмаў». Менавіта з гэтага асяроддзя «свядомых беларусаў» выйшла магутнаякагорта таленавітых літаратараў, сярод якіх былі Н. Арсеннева, Ю. Віцьбіч, Х. Ільяшэвіч, А. Адамовіч, У. Глыбінны, Л. Крывічанін, М. Цэлеш, У. Дудзіцкі, А. Змагар, Я. Золак, Р. Крушына, М. Кавыль, Т. Лебяда, У. Клішэвіч, А. Салавей, М. Сяднёў, К. Акула, А. Калубовіч, Я. Юхнавец і інш.

Да асноўных літаратурных суполак належаць: «Шыпшына», «Баявая Ускалось». Суполка «Шыпшына», якая ўзнікла з ініцыятывы Ю. Віцьбіча ў 1945 г. у Берліне, працягвала працу, актыўна прапагандуючы ў аднайменным часопісе нацыянальныя і эстэтычныя ідэі сваіх папярэднікаў-узвышэнцаў. На беларускую культуру працавалі і іншыя эміграцкія арганізацыі, такія, як Беларускі Інстытутт навукі і мастацтва (БІНІМ), Усебеларускі архіў, Беларускае акадэмічнае каталіцкае таварыства «Рунь», Беларуска-амерыканскі навукова-літаратурны клуб і г.д. У эміграцкай паэзіі пераважала пачуццё жорсткай настальгіі па Радзіме, тужлівыя настроі і інтаніяцыі. Паводле формы гэта часта элегіі, медытацыі, думы, пасланні, «ціхая лірыка».

*Наталля Аляксееўна Арсеннева (1903–1997)* – лірык, паэтэса з пакручастым лёсам – пазбягала палітыкі і заставалася «між берагамі» ва ўсе перыяды сваёй творчасці. Нарадзілася 20 верасня 1903 г. у г. Баку ў сям'і службоўца, што паходзіў з роду Арсенневых, сваяцкага М. Лермантаву. Дзяцінства Наталлі прайшло ў Вільні, куды быў пераведзены па службе яе бацька. У 1915 г. сям'я апынулася ў бежанстве ў Яраслаўлі. У 1920 г. вярнулася ў Вільню. Вучылася ў Беларускай (Віленскай) гімназіі. Выйшла замуж за Францішка Кушаля, былога ўрадаўца БНР, а на той час афіцэра Войска Польскага. Нарадзіла двух сыноў. Жыла ў Заходняй частцы Польшчы, дзе адбываў службу муж. У 1939 г. кароткі час працавала ў Віленскай абласной «Сельскай газеце».

У пачатку 1940 г. Францішак Кушаль быў арыштаваны, а паэтэсу з дзецьмі выслалі ў Казахстан. У маі 1941 г. яе судовую справу накіравалі ў Мінск на даследаванне, і паэтка нечакана для сябе апынулася на волі. У вайну Н. Арсеннева працавала ў «Менскай (Беларускай) газэце» – вяла аддзел літаратуры. Удзельніца ІІ Усебеларускага кангрэсу. З 1944 г. жыла ў эміграцыі. Большую частку пасляваеннага жыцця яна правяла ў ЗША, дзе і памерла 25 ліпеня1997 г.

Пяру Н. Арсенневай належаць паэтычныя зборнікі «Пад сінім небам» (1927), «Сягоньня» (1944), «Між берагамі» (1979) і інш. Падрыхтаваны ў канцы 1930-х гадоў зборнік «Жоўтая восень» з друку так і не выйшаў. Крытык А. Адамовіч назваў яе «паэткай восені». У яе творчасці пераважае пейзажная лірыка, мінорная паводле свайго настрою. Слова «восень» вар'іруецца ў вершах ў розных кантэкстах. У вершах шмат імпрэсіяністычнага, яны маляўнічыя і адначасова меладычныя. Шмат якія творы Н. Арсенневай сталі песнямі, у тым ліку і «Малітва» («Магутны Божа»). Сярод мноства фарбаў Н. Арсеннева акцэнтуе ўвагу на «сіняй» і «жоўтай», што выяўляюць глыбіню неба, смутак па красе, драму адцвітання.

Прыкметнае месца ў творчасці Н. Арсенневай займае “начная лірыка”. Жанр элегіі дапаўняецца вершамі-малітвамі, роздумнымі медытацыямі, гімнамі ў гонар жыцця («Мэта жыцьця – захаваці жыцьцё»).

Рэпазіторый ВДУ

## Асобы

### *Я. Купала (1882–1942)*

Янка Купала – народны паэт Беларусі (1925), класік беларускай літаратуры.

Іван Дамінікавіч Луцэвіч нарадзіўся ў фальварку Вязынка Мінскага павета Мінскай губерні ў сям'і дробнай шляхты. У 16-гадовым узросце скончыў поўны курс (два класы за адзін год) Бяларуцкага народнага вучылішча. У 1902 г. памірае бацька Купалы, а праз паўгода адзіны брат і дзве сястры. Да 1908 г. Купала працуе хатнім настаўнікам, пісарам у судовага следчага, прыказчыкам у панскім маёнтку, чорнарабочым, памочнікам вінакура на броварах; пачынае пісаць вершы на польскай мове.

У 1904 г. апублікаваны першы беларускамоўны верш "Мая доля", які быў напісаны лацінкай. У 1905 г. у мінскай рускамоўнай газеце "Северо-Западный край" надрукаваны па-беларуску верш "Мужык", падпісаны псеўданімам "Я. Купала", гэта было першае выступленне паэта ў перыядычным друку. У 1908 г. у Санкт-Пецярбургу ў беларускім выдавецтве "Загляне сонца і ў наша аконца" выйшаў першы зборнік Я. Купалы – "Жалейка", дзе быў змешчаны верш "А хто там ідзе?", які адразу набыў статус нацыянальнага гімна.

1908–1909 гг. жыў у Вільні, працаваў у рэдакцыі газеты "Наша ніва" і адначасова бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы; напісаў першую драматычную паэму "Адвечная песня".

У 1909–1913 гг. па запрашэнні прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы пераязджае з Вільні ў Пецярбург. У 1910 г. Купала выдае зборнік "Гусляр" і драматычную паэму "Сон на кургане", адзін з самых таямнічых твораў пісьменніка. У 1912 г. Купала напісаў першы ўласна драматургічны твор – камедыю "Паўлінка"; упершыню была пастаўлена ў Вільні ў 1913 г. У 1913 г. у выдавецтве "Загляне сонца і ў наша ваконца" выйшаў зборнік "Шляхам жыцця". Побач з творамі выразнай грамадзянскай, патрыятычнай накіраванасці сюды ўвайшлі шэдэўры Купалавай філасофскай, пейзажнай, інтымнай лірыкі; напісаны рамантычныя паэмы "Бандароўна", "Магіла льва", "Яна і я", сцэнічны жарт "Прымакі", драма "Раскіданае гняздо".

З кастрычніка 1913 да жніўня 1915 г. вяртаецца ў Вільню, працуе ў "Нашай ніве" спачатку супрацоўнікам, а з 1914 г. рэдактарам-выдаўцом; з закрыццём газеты выязджае (верасень 1915 г.) у Маскву. Вучыцца ў Маскоўскім гарадскім народным універсітэце імя А. Шаняўскага (слухач гісторыка-філасофскага цыкла); сустракае Уладзіславу Станкевіч, знаёмы з якой быў з 1908 г., бярэ з ёй шлюб; мабілізаваны ў армію, служыць у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін у Полацку.

У 1917 – 1918 гг. пераехаў у Смаленск, дзе служыць агентам па нарыхтоўцы прадуктаў.

З 1919 г. жыў ў Мінску, актыўна ўдзельнічаў у літаратурна-грамадскім і культурна-мастацкім жыцці, у тым ліку ў стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў, уваходзіў у склад камісіі па стварэнні Інбелкульта. У1922 г. выдаў зборнік "Спадчына", які складаецца з вершаў і паэм, напісаных у 1913–1919 гадах. Усе творы знітаваныя ідэяй адраджэння і незалежнасці Бацькаўшчыны, праблемай выбару свайго шляху на зломе гісторыі і адказнасці за гэты выбар; напісаў трагікамедыю "Тутэйшыя", дзе адлюстраванна жыццё беларусаў у гады грамадзянскай вайны. У 1924 г. выдаў паэму "Безназоўнае", праз год выходзіць зборнік з такой назвай.

20 лістапада 1930 г., пасля ціску ўладаў Купала робіць спробу самагубства, але застаецца жывы. У газеце "Звязда" быў апублікаваны так званы "пакаянны" ліст

Рэпазіторый БДУ

Купалы, напісаны, на думку многіх даследчыкаў, пад дыктоўку, у якім паэт вымушаны быў прызнавацца ў "памылках" і "шкодных поглядах", абяцаў "аддаць усе свае сілы сацыялістычнаму будаўніцтву".

У 1941 г. у час Вялікай Айчыннай вайны паэт жыў у Маскве, потым у пасёлку Пячышчы каля Казані. У 1942 г. быў раптоўна выкліканы ў Маскву тэлеграмай ад старшыні Саўнаркаму БССР. 28 чэрвеня 1942 г. Купала трагічна загінуў, упаўшы з лесвічнай пляцоўкі дзевятага паверха гасцініцы "Масква".

Творчасць Я.Купалы даследчыкі падзяляюць на дакастрычніцкі і паслякастрычніцкі перыяды. Найбольшую цікавасць з мастацкага пункту гледжання выклікае дарэвалюцыйная творчая спадчына аўтара.

У лірыцы назіраецца мастацкая эвалюцыя Я. Купалы ў зборніках "Жалейка" (1908), "Гусляр" (1910), "Шляхам жыцця" (1913) ад канкрэтна-побытавага паказу жыцця, ад тэм і матываў пераважна сялянскіх, ад парадаксальна складанай прастаты да індывідуалізаванага, вытанчанага, артыстычнага, паглыбленага і энцыклапедычнага выяўлення асобы паэта і духоўнага вобліку яго героя.

У 1910-1913 гг. Купала напісаў шэраг рамантычных паэм: "Курган", "Бандароўна", "Адплата кахання", "Яна і я", "Магіла льва", інш., а таксама драматычныя паэмы "Адвечная песня", "Сон на кургане", пазначаныя паэтыкай сімвалізму.

Уласна драматургічных твораў у Я.Купалы чатыры: камедыя "Паўлінка", сцэнічны жарт "Прымакі", драма "Раскіданае гняздо" і трагікамедыя "Тутэйшыя". П'еса "*Паўлінка"* (напіс. у 1912 г.) была пастаўлена ўжо ў 1913 г. спачатку Першым беларускім таварыствам у Вільні, пасля ў драматычным гуртку беларускіх студэнтаў у Пецярбургу. П'еса стала самай папулярнай пастаноўкай, сімвалам беларускага тэатру тых часоў. Драма "*Раскіданае гняздо"* (1913 г.) – твор рэалістычны, тым не менш ён нясе на сабе прыкметныя адзнакі рамантычнай выключнасці, сімваліцкай умоўнасці. Цэнтральнай філасофскай праблемай драмы "Раскіданае гняздо" з'яўляецца праблема шчасця; асэнсоўваючы сямейную трагедыю як агульнанародную, Я. Купала паказаў у творы шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны, зямлі і волі; твор вызначаецца самай запаветнай ідэяй жыцця песняра – ідэяй нацыянальнага вызвалення і адраджэння, якую ён рэалізоўваў і ў паэзіі, і ў драматургіі, і ў публіцыстыцы. Трагікамедыя *"Тутэйшыя"* (1922 г.). Доўгі час была пад забаронай, пачынаючы 1927 г. усе зборы твораў Купалы друкаваліся без гэтай п'есы. У ідэйна-мастацкім плане "Тутэйшыя", на думку І.Навуменкі, гэта роздум аб шляхах-пуцявінах роднага народа, аб яго будучыні. Час дзеяння ў творы: люты 1918 – чэрвень 1920 гг. Згадваюцца такія падзеі гісторыі, як разгон Першага Усебеларускага кангрэса, утварэнне БНР, нямецкая і польская акупацыі, прыход бальшавікоў, прыезд Чарвякова.

### *Якуб Колас (1882–1956)*

Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч нарадзіўся ў засценку Акінчыцы Мінскага павета Мінскай губерні. Скончыў народнае вучылішча ў Мікалаеўшчыне, вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. У 1902–1905 гг. як настаўнік працаваў на Палессі ў вёсках Люсіна, Пінкавічы. У 1906 г. ўдзельнічаў у нелегальным настаўніцкім з'ездзе, які адбыўся ў вёсцы Мікалаеўшчына; з'езд разагнала паліцыя, К. Міцкевіч у ліку іншых быў пазбаўлены права працаваць настаўнікам.

1 верасня 1906 г. у газеце "Наша доля" надрукаваны першы твор паэта – верш "Наш родны край", падпісаны псеўданімам Якуб Колас. У наступным нумары газеты пад псеўданімам Дзядзька Карусь змешчана апавяданне "Слабода" – першы надрукаваны празаічны твор пісьменніка; пачынае актыўна супрацоўнічаць у якасці аўтара з газетай "Наша ніва". Зіму 1906–1907 гг. жыў у родных у лесьнічоўцы Смалярня,

Рэпазіторый ВДУ

дзе без афіцыйнага дазволу адкрыў прыватную школу; складаў навучальны дапаможнік “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” (апуб. у 1909 г.).

У 1907 г. некалькі тыдняў працаваў загадчыкам літаратурнага аддзела ў “Нашай ніве”, але паводле загаду паліцыі быў вымушаны пакінуць горад. У 1908 г. засуджаны на 3 гады турэмнага зняволення, тэрмін пакарання адбыў у Мінскім астрозе, дзе пачынае працу над ліра-эпічнымі паэмамі “Новая зямля” і “Сымон-музыка”.

У 1910 г. у Вільні надрукаваны першы зборнік вершаў “Песні жальбы”.

Пасля турмы Колас займаўся настаўніцкай працай. У 1913 г. узяў шлюб з настаўніцай пінскай чыгуначнай школы Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай, мелі трох сыноў.

У 1912 г. у Вільні выходзіць зборнік “Апавяданні”. 1913 г. у Пецярбургу асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні “Нёманаў дар”, “Тоўстае палена”, зборнік вершаваных апавяданняў “Прапаў чалавек”.

У 1915 г. падчас Першай сусветнай вайны разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню, дзе быў мабілізаваны на вайсковую службу, служыў у запасным палку ў г. Пермі.

У 1921 г. па выкліку ўрада Савецкай Беларусі вярнуўся ў Мінск; працаваў на розных пасадах, у тым ліку выкладчыцкіх (у Белпедтэхнікуме, на настаўніцкіх педагагічных курсах у Слуцку, у БДУ). У Коўне выйшаў зборнік апавяданняў “Казкі жыцця” (працу над цыклам аўтар працягваў і надалей). У 1922 г. у Мінску выйшаў зборнік вершаў “Водгулле”.

У 1923 г. у Мінску асобным выданнем выйшла паэма “Новая зямля”.

У 1925 г. у часопісе “Полымя” апублікавана трэцяя рэдакцыя паэмы “Сымон-музыка”.

У 1920-я гг. выдае палескія аповесці “У палескай глушы”, “У глыбі Палесся”.

У 1926 г. выдадзена аповесць “На прасторах жыцця”, прысвечаная моладзі 1920-х гг.

З 1928 г. – акадэмік Акадэміі навук Беларусі, праз год – член Прэзідыума і віцэ-прэзідэнт Акадэміі.

У 1941–1944 гг. паэт жыў пад Масквой у Клязьме, Ташкенце, Маскве. У 1944 г. удастоены звання заслужанага дзеяча навукі Беларусі; напрыканцы 1944 г. вярнуўся ў Мінск.

З сяр. 1940-х гг. – да 13 жніўня 1956 г. працаваў у Акадэміі навук Беларусі, быў вядомы як грамадскі дзеяч.

У 1954 г. завершана аповесць “На ростанях”: 3-я, апошняя частка аднайменнай трылогіі. У 1956 г. пісьменнік напісаў ліст у вышэйшыя партыйныя інстанцыі, у якім выказаў занепакоенасць становішчам беларускай мовы ў грамадскім жыцці, прапанаваў меры па яе абароне. Якуб Колас памёр за сваім рабочым сталом, ледзь паспеўшя дапісаць гэты ліст.

З творчай спадчыны Коласа асабліва вылучаюцца ліра-эпічныя паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”. Задума напісаць дзве велічныя паэмы ўзнікла ў Коласа ў 1911 г.

“Новую зямлю” ён і пачаў пісаць вясною 1911 г., яшчэ знаходзячыся ў турме. Да 1917 г. было напісана 11 раздзелаў паэмы. Закончана яна была ў 1923 г. Прататыпамі герояў паэмы была сям’я Коласа, аўтар нават не змяніў імёнаў. Колас у паэме ўзняў праблемы адносінаў: чалавек і зямля, зямля і Бацькаўшчына, зямля і свабода. “Новая зямля” – гэта не столькі кавалак уласнай зямлі, колькі новая Айчына, “зямля абетаваная”, якую спрабавалі і спрабуюць знайсці не толькі беларусы.

Першы варыянт паэмы “Сымон-музыка” выйшаў у 1918 г. асобным выданнем. Апошняя (трэцяя), кананічная рэдакцыя была закончана ў 1925 г. Другі варыянт,

Репозиторий ВГУ

перапрацаваны Коласам у 1923-1924 гг., быў выкрадзены разам з чамаданам з цягніка, у якім аўтар вяртаўся з адпачынку летам 1924 г. Паэма аўтабіяграфічная, але характар аўтабіяграфізму тут іншы: не падзейны, а ўнутраны. Цэнтральная ў паэме – праблема свабоды творчасці, еднасці мастака і народа (сапраўднае мастацтва – нацыянальнае мастацтва), мастака і Бацькаўшчыны.

Сярод аповесцяў асаблівую ўвагу варта аддаць аповесцям Коласа. «На прасторах жыцця» (1926) – напісана пасля выхаду шэрагу маладнякоўскіх твораў, што ўхвалялі працу як ідэал лепшага жыцця. З'яўляецца імкненнем аўтара прасачыць лёс простых юнака і дзяўчыны ў варунках падзей, што мелі месца ў пачатку XX стагоддзя. Твор напісаны ў русле традыцый сацрэалізму. Аповесць «Дрыгва» (1934) ствараласяпаводле рэальных падзей. Я. Колас зрабіў звычайнага чалавека – Васіля Талаша – гістарычнай асобай. Аўтар імкнуўся пісаць не толькі на патрэбу дня: ён увёў псіхалагічны пачатак у абмалёўку вобразаў галоўных герояў аповесці, паказаў думкі і пачуцці чалавека ў экстрымальнай сітуацыі.

Трылогія "На ростанях" – адзін з першых беларускіх раманаў, які меў вялікае значэнне для развіцця жанру рамана ў беларускай літаратуры. Складаецца з трох частак: «У палескай глушы», «У глыбі Палесся» і «На ростанях». У іх намалявана шырокая карціна жыцця вясковай інтэлігенцыі і працоўнага сялянства пачатку XX стагоддзя. Трылогія займае выключнае месца ў творчасці пісьменніка, ён працаваў над яе тэкстам літаральна ўсё сваё творчае жыццё. Пачатак напісання першай кнігі адносяць да 1921-22 гадоў, а асобным выданнем увесь твор выйшаў толькі ў 1955 годзе. Падыход да тэмы, трактоўка вобраза галоўнага героя вызначаліся навізной: Якуб Колас абраў жанравую форму сацыяльна-псіхалагічнай аповесці з шырокім выкарыстаннем аўтабіяграфічнага матэрыялу.

### *Максім Багдановіч (1891–1917)*

Максім Багдановіч нарадзіўся ў сям'і настаўніка, этнографа і фалькларыста Адама Ягоравіча Багдановіча, праз год сям'я пераязджае ў Гродна. У 1896 г. ад сухотаў памірае маці Максіма. Бацька перавозіць сям'ю на жыхарства ў Ніжні Ноўгарад (неўзабаве жэніцца другі раз на роднай сястры першай жонкі М.Горкага). Паступае ў Ніжагародскую мужчынскую гімназію. За актыўны ўдзел у гімназічных беспарадках падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. быў пакінуты на паўторны год навучання. У 1908 г. ад сухотаў памірае старэйшы брат Максіма Вадзім (праз год гэты самы працэс – сухоты – адкрываецца і ў яго), сям'я пераязджае на жыхарства ў Яраслаўль, дзе Максім працягвае навучанне ў Яраслаўскай гімназіі.

У 1911 г. М.Багдановіч заканчвае гімназію і паступае ў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй (замест філфака Пецярбургскага ўніверсітэта), наведвае Беларусь, Вільню, рэдакцыю "Нашай нівы"; жыве ў Ракуцёўшчыне.

Багдановіч дэбютуе як пісьменьнік у 1907 годзе — газэта «Наша Ніва» друкуе ягонае апавяданьне «*Музыка*». У той самы год друкуюцца «*Прыйдзе вясна*», «*Ноч*», «*На чужыне*», «*Над магілай*».

У 1913 г. у Вільні ў друкарні Марціна Кухты выходзіць адзіны паэтычны зборнік паэта – "Вянок".

Напісаў паэмы «*Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык*» (1914), «*Максім і Магдалена*» (1915), «*Страцім-лебедзь*» (1916).

У 1916 г. Багдановіч закончыў юрыдычны ліцэй, а восенню едзе працаваць на Беларусь, у Мінск; служыць у губернскай харчовай камісіі, актыўна ўдзельнічае ў рабоце Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны; жыве на кватэры ў З.Бядулі.

У лютым 1917 г. па прычыне хваробы выязджае ў Ялту на лячэнне.

25 мая 1917 г – памірае ў Ялце.

Репозиторий ВГУ

М. Багдановіч стварыў шмат узораў грамадзянскай, пэйзажнай, філасофскай лірыкі; напісаў шмат вершаў пра каханне, прысвечаных Ганне Какуевай; пісаў і друкаваўся як на беларускай, так і на рускай мове. Багдановіч упершыню ў беларускай літаратуры ўжыў формы санэту, трыялету, рандо і іншыя класічныя вершаваныя формы, верлібр. Выступаў у прэсе як публіцыст, друкаваў шматлікія крытычныя артыкулы ды літаратурныя агляды. На паэзію Багдановіча паўплывалі творы французскіх сімвалістаў, расійскіх акмеістаў, аднак ён імкнуўся да стварэння ўласнабеларускай паэзіі, арганічнага зліцця беларускіх ды іншаземных традыцый.

***Цётка (1876–1916)***

Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч нарадзілася ў в. Пешчына недалёка ад Ліды ў дробнай шляхецкай сям'і. Алаіза паступіла ў 1894 г. у 4-ты клас прыватнай жаночай гімназіі В. Прозаравай у Вільні. Поўны курс гімназіі скончыла ў 1901 г., а ў 1902 г. пасля спецыяльных іспытаў атрымала пасведчанне на званне хатняй настаўніцы. Марыла працягваць асвету і ў 1903 г. пачала вучобу на Курсах выхавальніц і кіраўніц фізічнай адукацыі П. Ф. Лесгафта ў Пецярбурзе. У гэты час у Пецярбурзе ўжо арганізацыйна аформіўся і дзейнічаў гурток студэнтаў-беларусаў «Круг беларускай народнай прасветы», удзельніцай якога была і Цётка.

Яна становіцца свядомай дзяячкай нацыянальна-вызваленчага руху, актывізаванага рэвалюцыйнай барацьбой супраць царскага самаўладдзя, сябрам першай беларускай рэвалюцыйнай партыі «Беларуская Рэвалюцыйная грамада» (БРГ).

У 1904 г., напярэдадні рэвалюцыйных падзей, Цётка вярнулася з Пецярбурга ў Вільню і распачала тут актыўную прапагандысцкую працу сярод віленскіх рабочых. Цётка прымала ўдзел ў жаночым з'ездзе ў Маскве (май 1905 г.) як дэлегатка ад беларускіх жанчын.

Ужо ў 1905 г. Цётцы даводзілася жыць на нелегальным становішчы. Яна хавалася ад паліцыі ў Нова-Вілейцы, дзе працавала сястрой міласэрнасці ў псіхіятрычным шпіталі. У студзені 1906 г. яна прымала актыўны ўдзел ў 2-м з'ездзе Беларускай рэвалюцыйнай грамады ў Мінску.

У 1906 г. выйшлі зборнікі «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская», «Першае чытанне для дзетак-беларусаў».

У 1907 г. абвастрыліся сухоты, і Цётка на некалькі месяцаў выехала на лячэнне ў Закапанэ. У 1908 г. Цётка ў Кракаве, яна залічана на летняе паўгоддзе на філасофскі факультэт Ягелонскага універсітэта. У 1909-1910 гг. была «надзвычайнай» слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага універсітэта.

У 1912/13 навучальным годзе вучылася Пецярбурзе. Яна збірала матэрыялы і мелася пісаць грунтоўную даследчую працу аб беларускай батлейцы.

У 1910 г. брала ўдзел у стварэнні беларускага тэатра І. Буйніцкага, бо разглядала сцэнічнае мастацтва як сродак абуджэння народа да свядомага культурнага жыцця. Яна сама была выдатнай драматычнай актрысай, сыграўшы ў тэатры І. Буйніцкага ролі Пантурчыхі (у спектаклі «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага), Наталкі («Сватанне» А. Чэхава), старой Насты («У зімовы вечар» Элізы Ажэшкі) пад тэатральным псеўданімам М. Крапівіха.

7 лютага 1911 г. адбыўся шлюб Алаізы Пашкевіч са Сцяпанам Кайрысам, літоўскім інжынерам, дзеячам літоўскай сацыял-дэмакратыі.

Стараннямі Цёткі ў 1914 г. у Мінску пачынае выдавацца часопіс для моладзі «Лучынка», рэдактарам якога яна фактычна з'яўлялася. Каб паправіць здароўе, у сакавіку гэтага ж года яна гасцявала ў Фінляндыі, напісаўшы аб гэтым каштоўныя сваёй пазнавальнасцю ўспаміны. Улетку падарожнічала ў Швецыю, мелася наведаць Нарвегію, але пачатак сусветнай вайны змусіў Цётку вярнуцца дадому. У 1915 г. грамадская дзейнасць Цёткі цесна злучана з Беларускім таварыствам дапамогі ахвярам



Репозиторий ВГУ

вайны. Яна шмат працуе па арганізацыі беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў у Вільні. Як сястра міласэрнасці даглядала хворых у тыфусовым бараку ў Вільні, дапамагала ў арганізацыі дзіцячых прытулкаў. У студзені 1916 г. Цётка атрымала паведамленне аб смерці бацькі і выехала на пахаванне яго ў Ліду. Пасля наведала Стары Двор і, застаўшыся там на некаторы час, каб дапамагчы хворым землякам, сама заразілася і захварэла на тыфус. Яе аслаблены сухотамі і цяжкімі варункамі жыцця арганізм не здолеў змагацца з хваробаю, і ў ноч з 4 на 5 лютага Цётка памерла пад дахам роднага дома. Пахавана яна ў Старым Двары.

***Ядвігін Ш (1868–1922)***

Адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы — жыў на пераломе двух стагоддзяў, двух сацыяльных эпох. Нарадзіўся Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі) у 1868 г. у маёнтку Добасня Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, дзе ў той час яго бацька служыў упраўляючым. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце на медыцынскім факультэце. Удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, арыштаваны. Пасля вызвалення з турмы Ядвігіну Ш. не давялося вярнуцца ва універсітэт. Ён здаў экзамен на аптэкарскага практыканта, прайшоў практыку ў адной з маскоўскіх аптэк, выехаў у Беларусь і стаў працаваць памочнікам правізара ў мястэчку Радашковічы. Ядвігін Ш. становіцца адным з актыўных членаў гуртка інтэлігентаў, на літаратурных вечарах выступае з дэкламацыяй вершаў Багушэвіча, Дуніна-Марцінкевіча. Літаратурную дзейнасць пісьменнік распачаў яшчэ ў турме. Там ён пераклаў на беларускую мову апавяданне Гаршына «Сігнал» (1891).

У 1892 г. Ядвігін Ш. напісаў камедыю «Злодзей». Гурток рыхтаваў гэту п'есу да пастаноўкі, але была забаронена, пасля чаго пісьменнік доўга не пісаў.

У 1897 г. перабраўся з сям'ёй у свой фальварак Карпілаўку і заняўся садоўніцтвам. Тут ён працягвае пісаць, аднак доўгі час не робіць спробы надрукаваць напісанае.

У газеце «Наша доля» (1906, № 3) надрукавана першае апавяданне Ядвігіна Ш. на беларускай мове «Суд». З гэтага часу пісьменнік становіцца актыўным супрацоўнікам першых беларускіх легальных газет «Наша доля» і «Наша Ніва». Яго зборнікі «Бярозка» (1912) і «Васількі» (1914), выдадзеныя адзін за другім, з'яўляюцца вынікам працы не аднаго дзесяцігоддзя.

Вясной 1914 г. Ядвігін Ш. пераехаў у Мінск, дзе да пачатку вайны быў адным з арганізатараў і тэхнічным рэдактарам штомесячных часопісаў «Саха» і «Лучынка». Вайна спыніла гэтыя выданні, але пісьменнік заставаўся ў Мінску.

Ядвігін Ш. пачынае супрацоўнічаць у газеце «Беларусь», друкуе там сваю аповесць «Золата» (1920), адзін з першых твораў буйнога эпічнага жанру ў беларускай літаратуры. Аповесць «Золата» — твор незакончаны. І тым не менш ён вельмі цікавы па некаторых сваіх мастацкіх якасцях і як адзін з першых твораў беларускай прозы вялікага эпічнага жанру.

Восенню 1920 г. зусім хворы Ядвігін Ш. выехаў у Вільню. У 1921 г. ён выдае тут свае «Успаміны», над якімі працаваў яшчэ дома. «Успаміны» таксама засталіся незакончанымі. Першая частка, якая ўбачыла свет, ахоплівае студэнцкія гады пісьменніка, арышт і знаходжанне ў Бутырках. 24 лютага 1922 г. у Вільні на бальнічным ложку, у разлуцы з сям'ёй пісьменнік памёр. Пісьменнік-рэаліст, ён у сваіх творах адлюстраваў пэўны перыяд гістарычнага жыцця беларускага народа, узбагаціў беларускую прозу новымі жанрамі, унёс магчымую на тым этапе стылявую разнастайнасць у розныя віды апавядання, быў адным з пачынальнікаў буйнога эпічнага палатна і мастацкай публіцыстыкі.

Репозиторий ВГУ

### *Змітрок Бядуля (1886–1941)*

Сапраўднае імя – Плаўнік Самуіл Яфімавіч. Нарадзіўся ў мястэчку Пасадзец Віленскага павета Віленскай губерні ў сям'і яўрэя-арандатара, які стаў потым дробным лесапрамыслоўцам. У сямігадовым узросце бацькі аддалі сына вучыцца ў пачатковую яўрэйскую школу хедар, пасля ён вучыўся тры гады ў яўрэйскай духоўнай семінарыі ешыбоце (школа рабінаў). Некаторы час працаваў хатнім настаўнікам, потым з 1902 у якасці пісьмавода-канторшчыка дапамагаў бацьку ў яго лесапрамысловых справах.

У канцы 1912 малады пісьменнік пераехаў у Вільню, дзе пэўны час працаваў у выдавецкім таварыстве, потым — сакратаром газеты "Наша ніва", супрацоўнікам якой, а потым і яе рэдактарам у той перыяд быў Янка Купала. У 1913 у Пецярбургу, у выдавецтве "Загляне сонца і ў наша аконца", выйшаў першы зборнік твораў "Абразкі". Зместам яго былі лірычныя імпрэсіі-мініяцюры, якія ў жанравых адносінах набліжаюцца да вершаў у прозе. Характэрная асаблівасць пераважнай большасці "абразкоў" — рамантычнае ўспрыманне лірычным героем навакольнай рэчаіснасці (роднага краю, беларускай вёскі, яе побыту). У гэты перыяд ён піша серыю рэалістычных па зместу апавяданняў, асноўнай праблемай якіх была праблема народа, лёс працоўных мас Беларусі, галоўным чынам сялянства, у эксплуататарскім грамадстве ("Пяць лыжак заціркі", "Тулягі", "Умарыўся", "Сымон", "Малыя дрывасекі", "Летапісцы", "Злодзей", "Чараўнік" і інш.)

Выступаў як публіцыст. Яго артыкулы на разнастайныя тэмы часта друкаваліся на старонках "Нашай нівы". Адначасова пісаў вершы, многія з якіх вызначаліся вастрынёй сацыяльнай тэматыкі ("Пан", "Заліў быдлячы лой валоў і твае грудзі...", "Пастушка" і інш.). У перыяд імперыялістычнай вайны пісьменнік стварыў цыкл вершаў антываеннага характару, у якіх асуджаў крывавую бойню народаў ("Ад крыві чырвонай", "Вайна", "Не мы...", "І сотнямі тысяч..." і інш.).

Пасля спынення дзейнасці "Нашай нівы" па ўмовах ваеннага часу летам 1915 вярнуўся ў родны Пасадзец, адкуль неўзабаве пераехаў у Мінск, дзе прымаў актыўны ўдзел у нацыянальна-культурным жыцці, у рабоце Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны.

Пасля выгнання акупантаў з тэрыторыі Беларусі Змітрок Бядуля трывала стаў на пазіцыі Савецкай улады і актыўна ўключыўся ў грамадскае і культурнае жыццё краіны. У 1922 выйшаў з друку першы паслякастрычніцкі зборнік "Пад родным небам", які засведчыў ідэйна-творчы рост пісьменніка. Пашырылася тэматыка творчасці, выяўлялася імкненне да эпічнага адлюстравання новых з'яў рэчаіснасці.

У 20-я гады найбольш значных поспехаў Змітрок Бядуля дасягнуў у жанрах апавядання, аповесці і рамана. У многіх творах распрацоўваў тэму тагачаснага жыцця, паказваў складанае ўздзеянне савецкай рэчаіснасці на грамадзянскую актыўнасць, духоўны рост працоўнага чалавека, які нядаўна вызваліўся з ланцугоў няволі (апавяданні "Дэлегатка", "Тры крыжыкі", "Рунь", "Дзве ночы" і інш., аповесці "Год за годам", "Таварыш Мінкін").

У аповесці "Салавей", якая вызначаецца своеасаблівым рамантычным каларытам, у яркіх вобразах і карцінах паказаў эпоху прыгоннага права на Беларусі, барацьбу беларускіх сялян з прыгоннікамі, апаэтызаваў таленавітых і валявых народных самародкаў. Па гэтай аповесці М. Крошнерам была напісана музыка аднайменнага балета.

У канцы 20 — пачатку 30-х гадоў Змітрок Бядуля стварыў сацыяльна-псіхалагічны раман у дзвюх кнігах "Язэп Крушынскі". Гэты твор прысвечаны актуальным праблемам грамадскага жыцця Беларусі 20-х гадоў, галоўным чынам беларускай вёскі ў перыяд аднаўлення, індустрыялізацыі і калектывізацыі. Раман вызначаецца праўдзівасцю ў паказе паасобных з'яў тагачаснай рэчаіснасці, у стварэнні

Рэпазіторый БГУ

вобразаў-персанажаў (асабліва вясковага багацея Язэпа Крушынскага). У гэты час пісьменнік шмат увагі надаваў творам для дзяцей. Яго паэма-казка "Мурашка Палашка", вершаваная аповесць "Хлопчык з-пад Гродна" (1939), аповесць-казка "Сярэбраная табакерка" (1940, інсцэніравана ў 1964) сведчыць пра добрае веданне пісьменнікам дзіцячай псіхалогіі, уменне пісаць для юнага чытача займальна і даходліва.

### *Максім Гарэцкі (1893–1938)*

Максім Гарэцкі нарадзіўся ў вёсцы Малая Багацькаўка, што на Мсціслаўшчыне, у сялянскай сям'і. У 1909 годзе паступіў у Горы-Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча. У 1912 годзе ў газеце «Наша ніва», якая выдавалася ў Вільні, пачалі з'яўляцца карэспандэнцыі, допісы, нататкі Гарэцкага, а 25 студзеня 1913 года там жа пад псеўданімам Максім Беларус было апублікавана яго першае апавяданне «У лазні».

У 1919 годзе пісьменнік пераехаў у Мінск, потым у Вільню. Там выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах і ў Віленскай беларускай гімназіі, дзе пазнаёміўся з настаўніцай Леанілай Усцінаўнай Чарняўскай, якая неўзабаве стала яго жонкай. Па заканчэнні вучобы Гарэцкі жыў у Вільні, дзе працаваў каморнікам Землеўпарадкавальных камісій Віленскай губерніі і дзе ён пазнаёміўся з Янкам Купалам і Змітраком Бядулем. Там жа ў 1914 годзе быў выдадзены і першы зборнік «Рунь».

У 1914 годзе Максіма Гарэцкага прызвалі ў царскую армію. Падчас службы ён адчуў усе цяжкасці салдацкага жыцця ваеннага часу: адразу трапіў на фронт, быў цяжка паранены, лячыўся ў шпіталях. Пасля невялікага перапынку зноў апынуўся на фронце. У 1916 годзе вучыўся ў Паўлаўскім ваенным вучылішчы ў Петраградзе, атрымаў званне прапаршчыка, праходзіў службу ў Іркуцку, Гжацку, адтуль франтавыя дарогі прывялі яго на Палессе. Неўзабаве ізноў трапіў у шпіталь, доўга лячыўся.

Антываенны настрой пісьменніка, антыгуманны характар Першай сусветнай вайны знайшлі сваё яркае адлюстраванне ў такіх яго творах ваеннага часу, як «Літоўскі хутарок», «Генерал», «Палонны», «На этапе», «Рускі», «Прысяга», а запіскі Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» (1914−1919) дазваляюць даследчыкам лічыць яго адным з пачынальнікаў ваеннай дакументалістыкі ў беларускай прозе.

У 1917 г. пераехаў у Смаленск, супрацоўнічаў з газетамі. Выдаў «Руска-беларускі слоўнік», «Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнічак», «Практычны расійска-беларускі слоўнік». У гэты час былі напісаны аповесць «Дзве душы», апавяданні «Апостал», «Кросны», «Панская сучка». У 1920 г. ўбачыла свет «Гісторыя беларускай літаратуры», якая доўгі час была адзіным падручнікам для школ і ВНУ.

У студзені 1922 г. Максім Гарэцкі разам з іншымі дзеячамі беларускай культуры быў арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены ў вядомы астрог на Лукішках. Яго абвінавачвалі ў сувязях з камуністамі і дзейнасці супраць дзяржаўнага ладу, што афіцыйна так і не пацвердзілася. У 1923 г. разам з сям'ёй пераехаў у Мінск, чытаў лекцыі на рабфаку БДУ, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце БССР, выконваў абавязкі навуковага сакратара літаратурнай камісіі Інбелкульта (папярэднік Акадэміі навук), быў яго правадзейным членам. З 1926-га па 1928 год Гарэцкі ўзначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Гэты перыяд жыцця быў вельмі плённым для пісьменніка. Выйшлі з друку яго аповесці «У чым яго крыўда?», «Ціхія песні» («Ціхая плынь»), зборнік «Досвіткі», пасля паездкі ў Сібір і на Далёкі Усход з'явіўся цыкл невялікіх апавяданняў «Сібірскія абразкі», прысвечаны жыццю беларусаў-перасяленцаў. У 1928 годзе пісьменнік разам з сям'ёй вярнуўся ў Мінск, працаваў вучоным спецыялістам Інстытута навуковай мовы Інбелкульта, застаўся на гэтай пасадзе і пасля рэарганізацыі інстытута ў Акадэмію навук.

Рэпазіторый ВГУ

18 ліпеня 1930 года Гарэцкага арыштавалі і беспадстаўна абвінавацілі ў прыналежнасці да неіснуючага «Саюза вызвалення Беларусі». Пісьменніка арыштавалі і асудзілі на 5 гадоў з высылкай у Вятку, дзе яму давялося працаваць чарцёжнікам, тэхнікам-каштарыснікам, простым рабочым. У 1935 годзе пасля сканчэння тэрміна ссылкі Гарэцкі ўладкаваўся настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе ў пасёлку Пясочня Калужскай вобласці. Пісьменнік не спыняў творчай дзейнасці, пісаў раман-хроніку «Віленскія камунары», які лічыцца адным з найбольш значных твораў беларускай літаратуры 1930-х гадоў. Працаваў над задуманай яшчэ у 1920-х гадах «Камароўскай хронікай», своеасаблівай сялянскай, сямейнай хронікай, у якой імкнуўся адлюстраваць лёс беларускага народа ад часу прыгоннага права да сучаснасці. Для работы выкарыстоўваў назапашаныя матэрыялы з уласнага архіва. Яго ў 1932 годзе прывезла жонка, якая прыехала ў Вятку разам з дзецьмі.

У гэтыя ж гады Гарэцкі працуе над сваімі апошнімі творамі «Лявоніус Задумекус» і «Скарбы жыцця», у якіх адлюстроўваецца драматызм становішча рэпрэсаванага пісьменніка, яго роздумы аб сутнасці жыцця.

У ноч на 4 лістапада 1937 года Гарэцкага зноў арыштавалі, а 5 студзеня 1938 года прыгаварылі да расстрэлу. Па некаторых звестках, ён быў расстраляны ў тым жа годзе ў Вязьме.

### *Цішка Гартны (1887–1937)*

Сапраўднае імя пісьменніка – Зміцер Хведаравіч Жылуновіч. Нарадзіўся ў г.п. Капыль Мінскай вобласці ў сям'і селяніна. Псеўданімы: Авадзень, Капылянін, Сымон Друк і інш. Удзельнік рэвалюцыі 1905–1907 гг. Працаваў гарбаром, фрэзероўшчыкам на заводзе «Вулкан» у Пецярбургу. З'яўляўся адным са стваральнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). У снежні 1917 г. прымаў удзел у 1 Усебеларускім кангрэсе ў Мінску. На старонках газеты «Дзянніца», арганізатарам і рэдактарам якой з'яўляўся, выступаў з рэзкай крытыкай БНР. У снежні 1918 г. прыняты ў рады РКП(б), прымаў актыўны удзел у рабоце па стварэнню Беларускай ССР.

Напісаў тэкст Маніфеста аб утварэнні рэспублікі, пасля абвяшчэння якой стаў старшынёй Часовага рабоча-сялянскага рэвалюцыйнага ўрада. У снежні 1923 г. пленум ЦК КП(б)Б прысвоіў Ц. Гартнаму званне народнага паэта Беларусі. У 1928 г. аўтар становіцца акадэмікам АН БССР.

З.Х. Жылуновіч вядомы як паэт, празаік, драматург, крытык і публіцыст. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1908 г. у газеце «Наша Ніва» (паэзія сацыяльная). У 1912–1913 гг. яго вершы друкаваліся ў «Правде». З'яўляецца пачынальнікам беларускага савецкага рамана («Сокі цаліны»). Аўтар папулярных зборнікаў апавяданняў, вершаў. У яго багатай спадчыне ёсць артыкулы пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, А. Гурло і інш. Развіваў псіхалагічны пачатак у беларускай прозе. Адносіны ад творчасці аўтара былі супярэчлівыя. У 1924 і 1929 гг. З.Х. Жылуновіч выключаўся з партыі і зноў прымаўся ў яе рады. У 1936 г. па сфабрыкаванаму абвінавачванню ён быў арыштаваны, а ў красавіку 1937 г. памёр у турме, убіўшы ножку койкі сабе ў горла.

### *Алесь Гарун (1887–1920)*

Нарадзіўся ў Мінску. Яго бацькі былі простымі прадстаўнікамі рабочай каталіцкай грамады Мінска. У пяць гадоў умеў чытаць па-руску і па-польску. У далейшым скончыў мінскія 3-е гарадское прыхадское (1897) і рамеснае (1902) вучылішчы. Працаваў у сталярных майстэрнях і на мэблевай фабрыцы ў Мінску. З 1904 далучыўся да партыі эсэраў-максімалістаў. Пачаў публікавацца з 1907 у газеце «Наша ніва». Арыштаваны за антыўрадавую дзейнасць 4 сакавіка1907 у падпольнай друкарні на вуліцы Шырокай у Мінску, дзе ў той момант друкавалася адозва «Да ўсіх працоўных». У ліпені 1908 Віленскай судовай палатай асуджаны на ссылку і пажыццёвае пасяленне ў Сібіры. Сасланы ў Іркуцкую губерню. З 1914 атрымаў права

Рэпазіторый ВГУ

перамяшчацца па ўсёй Сібіры. Працуючы на баржы на рацэ Лене, падрыхтаваў зборнік «Матчын дар» і ў 1914 пераслаў яго ў Вільню (выйшаў у 1918). Пасля працаваў на залатых прыісках у Бадайба. Хворы на сухоты, вярнуўся ў Мінск у верасні 1917. Віцэ-старшыня Усебеларускага з'езда 1917; удзельнічаў у стварэнні БНР.

Рэдагаваў газету «Беларускі шлях», актыўна выступаў у ёй як публіцыст. Падчас польскай акупацыі быў членам Беларускай ваеннай камісіі, Часовага беларускага нацыянальнага камітэта (з 12 жніўня да 17 кастрычніка1919 — старшыня).

Памёр у Кракаве па дарозе на курорт Закапанэ.

Пісаць вершы Гарун пачаў змалку, спачатку на рускай мове, затым — на беларускай. Раннія яго творы да нас не дайшлі.

Паэтычная спадчына А. Гаруна ўключае ў сябе зборнік «Матчын дар», напісаны напачатку Першай Сусветнай вайны, і вершы, апублікаваныя ў розных выданнях пад псеўданімамі А. Гарун, А. Сумны, а таксама Сальвэсь. У нейкім сэнсе блізкім да праграмных можна лічыць верш «Людзям», якім адкрываецца зборнік і ў якім аўтар непасрэдна звяртаецца да чытачоў. Гэта — свайго роду прадмова, ці можа нават споведзь з выяўленнем асабістых перажыванняў.

Наступны этап развіцця творчасці Алеся Гаруна — гэта вершы, напісаныя ў Сібіры. Яны як водгук пакуты і сімвал веры, споведзь і скарга выгнанніка, а таксама сведчанне нязломнай, непахіснай вытрымкі.

Багата ў Алеся Гаруна песняў жальбы, сумных настрояў, плачу. Але сум яго не так ідзе ад драмы ўласнага жыцця, колькі ад таго, што ён больш за ўсё баяўся страціць духоўную повязь з Бацькаўшчынай. І адначасова паэт паказвае, што ахвяры лірычнага героя і пакуты, якія выпадаюць на яго долю, не могуць быць дарэмнымі.

### ***Вацлаў Ластоўскі (1883–1938)***

Друкаваўся пад псеўданімамі Власт, Юрка Верашчака. Нарадзіўся на Дзісненшчыне ў засценку Калеснікі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Займаўся самаадукацыяй. Будучы ў Пецярбурзе, наведваў лекцыі ва універсітэце. Працаваў у газеце «Гоман», сакратаром рэдакцыі «Нашай Нівы», выступаючы як публіцыст і празаік; на старонках газет выказваў думку пра галоўную задачу пісьменніка – апісанне прыроды і фарміраванне чалавека-мастака праз яе ўплыў. У 1910 г. напісаў «Кароткую гісторыю Беларусі» (упершыню выдадзена на беларускай мове), «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі». Аўтару належыць праца «Падручны расійска-крыўскі слоўнік» (1924). У 1918 г. падрыхтаваў да друку зборнік апавяданняў «Недацветы». У творах для дзяцей беларусаў «Незабудка», «Сейбіт», «Першая чытанка» многа дыдактыкі, акцэнт робіцца на рэлігійным выхаванні. В. Ластоўскі на старонках «Нашай Нівы» выступаў па пытаннях беларускага адраджэнскага руху, вітаў утварэнне БНР, Раду якой узначальваў. У 1926 г. прыехаў на навуковую канферэнцыю ў Мінск. Пасля запрашэння застацца працаваць на тэрыторыі БССР стаў прызнаным беларускім навукоўцам. У 1930 г. арыштаваны і высланы за межы Беларусі (як «нацдэм» і польскі шпіён). Жыў ў Саратаве, працаваў бібліятэкарам. У 1938 г. быў паўторна арыштаваны, а 23 студзеня 1938 г. расстраляны.

Аўтарскія творы цесна звязаны з фальклорам і гісторыяй. Яму належаць філасофска-лірычныя абразкі: «Зайчык», «Мары», «Краскі» і інш. Часта пісьменнік браўся за апрацоўку паданняў і легенд: «Сож і Дняпро», «Адкуль пайшлі беларусы», «Дзень рожавай кветкі».

В. Ластоўскаму належыць аповесць-утопія «Лабірынты», якая з'яўляецца марай-згадкай пра лепшыя часы беларусаў. Імкненне спасцігнуць метафізіку беларускага этнасу прыводзіць аўтара да стварэння і навукова-мастацкага абгрунтавання міфічнай краіны Крывіі, праваобраза Беларусі.

Рэпазіторый ВГУ

### *Францішак Аляхновіч (1883–1944)*

Будучы аўтар мастацка-дакументальнай кнігі «У капцюрох ГПУ» (1933–1943) нарадзіўся ў Вільні ў сям'і музыканта. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, Драматычнай школе ў Кракаве, Школе музычнага таварыства ў Варшаве. Вандраваў па Польшчы з тэатральнай трупай. Наладзіў, разам з І. Буйніцкім, у Вільні першы беларускі спектакль (1910). Дырэктар і галоўны рэдактар Беларускага тэатра ў Мінску (1919–1920). У Вільні выдаваў газету «Беларускі звон». У 1926 г. атрымаў савецкае грамадзянства, быў арыштаваны і высланы на Салаўкі. У 1939 г. яго абмянялі на Б. Тарашкевіча, вязня польскіх астрогаў. У 1939 г., ведаючы, што яго чакае, паўтары гады хаваўся пад маскай жабрака ад савецкіх карнікаў. У вайну выдаваў у Вільні газету «Беларускі голас». 3 сакавіка 1944 г. забіты ў сябе на кватэры невядомым тэрарыстам.

Ф. Аляхновіч напісаў 17 п'ес, сам іх ставіў. Яго п'есы надзвычай сцэнічныя: тут шмат скокаў, прыкметны элемент меладрамы. Вясёлае карнавальнае шэсце ствараюць персанажы камедыі «На Антокалі», якая нагадвае лепшыя ўзоры класікі (Ж. - Б. Мальера, П. -А. Бамаршэ, К. Марашэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы). Некалькі п'ес заснавана на народных легендах («Бутрым Няміра», «Базылішак», «Чорт і баба»). У драмах «Цені» і «Страхі жыцця» ўвага акцэнтуецца на сферы падсвядомага: аўтар не хавае свайго песімізму прыпоглядзе на чалавечую прыроду. У камедыі «Пан Міністар» ствараюцца вобразы беларускіх адраджэнцаў, з сімпатыяй малююцца вобразы маладых патрыётаў і высмейваецца постаць «міністра», які, выявіўшы сябе авантурыстам і дэмагогам, дыскрэдытуе беларускую справу, саму мову (сам размаўляе на дзікім слэнгу, правобразе «трасянкі»). У аповесці «Страшны год» узнаўляе часы «ўз'яднання» Беларусі, калі за ім палявалі савецкія энкавэдзісты.

## Літаратура

Мастацкія творы для абавязковага вывучэння

1. *А. Гарун:*зборнік "Матчын дар", апавяданні ("Першы снег", "Пан Шабуневіч", "П'ера і Каламбіна", інш.), публіцыстыка ("Одгукі", "Уражанні", "Увагі да нацыянальнага руху", інш.).
2. *В. Ластоўскі:* вершы, апавяданні ("На Радуніцу", "О, Крыўская зямля!", "Лебядзіная песня", "Мост у Кутах", "Вясковыя "археолагі", "Часы былі трывожныя", "Дудар", "Нарадзіны", "Апаўшае лісце", інш.), аповесць "Лабірынты", публіцыстыка.
3. *З. Бядуля:* вершы, апавяданні дакастрычніцкага і савецкага перыядаў ("Пяць лыжак заціркі", "На Каляды к сыну", "Малыя дрывасекі", "Велікодныя яйкі", "Летапісцы"), аповесць "Салавей".
4. *М. Багдановіч:*вершы, паэмы "Максім і Магдалена", "Мушка-зелянушка...", "Страцім-лебедзь" апавяданні ("Музыка", "Апокрыф", "Апавяданне аб іконніку і залатару...", інш.), публіцыстыка ("Глыбы і слаі", "За тры гады" "Белорусское возрождение").
5. *М. Гарэцкі:* апавяданні дакастрычніцкага і савецкага перыядаў ("У лазні", "Што яно?", "Роднае карэнне", "Красаваў язмін", "Патаёмнае", "Стогны душы", "Стары прафесар", "Лірныя спевы", "Смачны заяц", "Панская сучка", "Літоўскі хутарок", "Рускі", "Генерал", "На этапе", "Ашуканы палітрэдактар", "Незадача", "Апостал", "Фантазія" інш.), аповесці "Дзве душы", "Ціхая плынь".
6. *Ф. Аляхновіч:* п'есы "Нясконччаная драма", "Чорт і баба", артыкул "Беларускі тэатар".
7. *Цётка:* вершы, апавяданні ("Прысяга над крывавымі разорамі", "Асеннія лісты", "Міхаська", "Зялёнка", "Навагодні ліст"), публіцыстыка.

Рэпазіторый ВГУ

8. *Ц. Гартны:* вершы, апавяданні дакастрычніцкага і савецкага перыядаў (“Штрэйкбрэхер”, “Велікодная каробка”, “Здарэнне з камісарамі”, “Прысады”, інш.), раман “Сокі цаліны”.
9. *Я. Колас:* “Казкі жыцця”, апавяданні дакастрычніцкага і савецкага перыядаў, паэмы “Новая зямля”, “Сымон-музыка”, “Рыбакова хата”, трылогія “На ростанях”, аповесць “Дрыгва”, паэмы.
10. *Я. Купала:* вершы дакастрычніцкага і савецкага перыядаў, паэмы (“Нікому”, “Зімою”, “Адплата кахання”, “Адвечная песня”, “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Курган”, “Соні на кургане”, “Безназоўнае”), п’есы “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Тутэйшыя”.
11. *Ядвігін Ш.:*апавяданні (“Важная фіга”, “З маленькім білецікам”, “Вучоны бык”, “Заморскі звер”, “Дуб-дзядуля”, “Бярозка”, “Васількі”, “Чалавек”, “Зарабляюць”, “Гаротная”, “З бальнічнага жыцця”, “Вяселле”, “Дачэсныя”, “Павук”, “Падласенькі”), раман “Золата”.
12. *Н. Арсеннева, К. Буйло, А. Вольны, А. Дудар, Т. Кляшторны, Ю. Лявонны, В. Маракоў, З. Півавараў, Ю. Таўбін, М. Чарот:* вершы.


Асноўная літаратура

1. Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатку XX ст.: Падруч. для філал. фак. пед. ВНУ / Пад агул. рэд.: М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. – Мн.: Выш. шк., 1998. – 560 с.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. – Мн.: Беларус. навука, 2003. – Т. 1: 1901-1920 / Рэд.: У.В. Гніламёдаў, В.А. Каваленка. – 583 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. – Мн.: Беларус. навука, 1999. – Т. 2: 1921-1941 / Рэд.: У.В. Гніламёдаў, В.А. Каваленка. – 903 с.
4. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. У 2 ч. Ч. 2: Падруч. для філал. фак. ВНУ. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 1989. – 480 с.

Дадатковая літаратура

1. Адамовіч А. Літаратура, мы і час: Літ. – крытыч. артыкулы. – Мн.: Маст. літ., 1979. – 384 с.
2. Андраюк С. Пісьменнікі. Кнігі: Літ. – крытыч. артыкулы. – Мн.: Маст. літ., 1997. – 387 с.
3. Атрашкевіч В. Ад прататыпа да вобраза: Праблема аўтабіяграфізму ў беларускай прозе 20-х гадоў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 213 с.
4. Беларуская літаратура: Проза 20-х гадоў: Хрэстаматыя / Склад.: Д.Я. Бугаёў і інш., Пад рэд. Д.Я. Бугаёва. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 592 с.
5. Беларуская савецкая проза. Апавяданне і нарыс: Зб. арт. / Рэд.: В.В.Барысенка, П.К. Дзюбайла. – Мн.: Навука і тэхніка, 1971. – 327 с.
6. Беларуская савецкая проза. Раман і аповесць: Зб. арт. / Рэд.: В.В.Барысенка, П.К. Дзюбайла. – Мн.: Навука і тэхніка, 1971. – 432 с.
7. Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20-30-х гадоў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 328 с.
8. Гніламёдаў У. В. Янка Купала: Жыццё і творчасць. – Мн.: Бел. навука, 2002.
9. Жураўлёў В.П. У пошуку духоўных ідэалаў: На матэрыяле беларус. літ. XIX – пач. XX ст. / Пад рэд. У.В. Гніламёдава. – Мн.: Беларус. навука, 2000. – 191 с.


Репозиторий ВГУ

10. Каваленка В., Мушынскі М., Яскевіч А. Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы: Агульны рух і галоўныя тэндэнцыі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. – 263 с.
11. Каваленка В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX – XX стагоддзяў. / Рэд. П.К. Дзюбайла. – Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.
12. Корань Л.Дз. Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур. – Мн.: ВПП "Новік", 1996. – 220 с.
13. Лявонава Е.А. Плыні і постаці: З гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX – XX ст. ст.: Дапам. для настаўнікаў. – Мн.: "Крыніца", 1998. – 336 с.
14. Максімовіч В.А. Шыпшынавы край: Старонкі беларускай літаратуры 20 – 30-х гг. XX ст.: Дапам. для настаўнікаў. – Мн.: УП "ІВЦ Мінфіна", 2002. – 160 с.
15. Мішчанчук М.І. Беларуская літаратура XX стагоддзя: Вучэб. дапам. / М.І. Мішчанчук, І.С. Шпакоўскі. – Мн.: Выш. шк., 2001. – 352 с.
16. Мушынская Т.Ф. Беларуская літаратура 20 – 40-х гадоў XX стагоддзя: Дапам. для настаўніка. – 2-е выд., дап. – Мн.: Нар. асвета, 2000. – 223 с.
17. Мушынскі М.І. "І нічога, апроч праўды: Якой быць "Гісторыі беларускай літаратуры". – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 127 с.
18. Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / Склад. Я. Казека. – Мн.: Дзяржвыд БССР, 1963. – 551 с.
19. Тычына М. Карані і крона: фальклор і нацыянальная спецыфіка літаратуры. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 208 с.
20. Хромчанка К.Р. Беларуская мастацкая проза (канец XIX – пачатак XXст.). – Мн.: Выд-ва БДУ, 1979. – 192 с.
21. Чыгрын І.П. Станаўленне беларускай прозы і фальклор: Дакастрычніцкі перыяд. – Мн.: Выш. шк., 1971. – 168 с.

Репозиторий ВГУ

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1930-Х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1950-Х ГАДОЎ

## Асноўныя факты літаратурнага працэсу. Персаналіі

Перыяд 30–50-х гадоў XX стагоддзя – дынамічны і супярэчлівы час у гісторыі беларускай літаратуры. У абставінах неспакойнага, фактычна, дыскрэтнага развіцця айчынная літаратура пашырала ідэйна-тэматычныя межы мастацкага пазнання рэчаіснасці, авалодвала новымі мастацкімі метадамі і прыёмамі, працягнула засваенне надзвычай актуальных у тагачасных умовах жанравых формаў, напрыклад, сацыяльна-псіхалагічнай аповесці, сатырычнай аповесці, інш. Беларускае прыгожае пісьменства гэтага перыяду па-ранейшаму было "заклікана, з аднаго боку, быць мастацтвам агітацыйна-публіцыстычным, надзённа-прыкладным па сваёй накіраванасці, з другога, весці шырокае пазнанне народа" (І.Чыгрын).

**Кандрат Крапіва (Кандрат Кандратавіч Атраховіч) (1896–1991)** – народны пісьменнік БССР, паэт-байкапісец, празаік, драматург, перакладчык, вучоны, грамадскі дзеяч. Шырокую вядомасць Крапіве прынеслі найперш байкі, самыя раннія з якіх пачалі выходзіць яшчэ ў 1920-я гады. Іх поспех у многім быў звязаны з тым, што таленавіты аўтар, арыентуючыся на сусветную жанравую традыцыю (байкі Эзопа, Лафантэна, Крылова), імкнуўся напісаць творы, якія б усімі сваімі кампанентамі (вобразнай сістэмай, сюжэтамі, мастацкімі сродкамі і інш.) раскрывалі б унікальнасць беларускага мастацкага мыслення і карэлявалі б з нашай паўсядзённасцю.

Крапіва ўдала працаваў і ў такіх празаічных жанрах, як камічная замалёўка, камічная навела, сказ ("Вясна", "Мой сусед", "Здаў "акзамінт"", "Каровін мужык" і інш.). Адметна праяўляюцца тут "даступнасць, гранічная яснасць і лаканічнасць" стылю класіка беларускай літаратуры. У выніку гэтага трывіяльны выпадак ці будзёны факт жыцця набываюць аналітычны характар і філасофскую тыповасць. Тэматыцы твораў К. Крапівы ўласціва неаднароднасць, што такім чынам выяўляла жаданне аўтара шматгранна адлюстраваць безліч праяў "атмасферы часу". У якасці мастацкага аб'екта класікам была абрана такая распаўсюджаная грамадская з'ява, як мяшчанства.

Пошукавы характар уласцівы паэмам пісьменніка "Біблія", "Шкірута", "Хвядос – чырвоны нос" і адзінаму буйному эпічнаму твору ў спадчыне Крапівы – сацыяльна-бытавому раману "Мядзведзічы".

Вялікі поспех мелі і п'есы класіка, асабліва яго сатырычныя камедыі "Хто смяецца апошнім", "Мілы чалавек", "Брама неўміручасці". Гэта востра-канфліктныя творы з пастаноўкай грамадскіх і маральна-этычных пытанняў, з рэалістычнай заглыбленасцю і адкрытай аўтарскай пазіцыяй, з маштабнымі цэнтральнымі вобразамі.

**Кузьму Чорнага (Мікалая Карлавіча Раманоўскага) (1900–1944)** крытыкі заслужана называюць "беларускім Дастаеўскім". Дзякуючы яго таленту сацыяльна-псіхалагічная плынь у нацыянальнай прозе дасягнула выключнай шырыні і значнасці.

Уваходзіў у літаратурныя аб'яднанні "Маладняк", "Узвышша". Яго творчая актыўнасць Чорнага, распачатая ў 1920-я гады, уражвае: пяць зборнікаў апавяданняў, два раманы, аповесці і безліч планаў, якія з пачатку 1930-х гадоў імкнуўся рэалізаваць, напісаўшы "гісторыю беларускага народа за часы ад знішчэння паншчыны і да нашых дзён". У выніку з'явіліся раманы "Бацькаўшчына", "Трыццаць год", "Трэцяе пакаленне", аповесць "Люба Лук'янская", п'есы "Бацькаўшчына", "Ірынка". У 1930-я гады Чорны быў у цэнтры літаратурнага жыцця Беларусі, стаў адным з арганізатараў Саюза пісьменнікаў.

У гады вайны, будучы моцна хворым, ён здзейсніў сапраўдны пісьменніцкі подзвіг, напісаўшы раманы "Пошукі будучыні", "Млечны шлях", "Вялікі дзень" і

Рэпазіторый ВГУ

іншыя. У архіве К. Чорнага засталося яшчэ шмат ненадрукаваных твораў (“Смага”, “Сыны Хведара Нявады”, “Алеся” і іншыя).

**Міхась Зарэцкі (Міхась Яўхімавіч Касянкоў) (1901–1937)** – празаік, драматург і публіцыст. З’яўляўся актыўным удзельнікам літаратурна-грамадскага руху, уваходзіў у склад пісьменніцкіх аб’яднанняў “Маладняк” і “Полымя”. З-пад яго пяра выйшла шмат апавяданняў, якія пазней склалі асобныя зборнікі “У віры жыцця”, “Пела вясна”, “Пад сонцам”, “42 дакументы”, “Двое Жвіроўскіх”. М. Зарэцкі не ідэалізаваў паслякастрычніцкую рэчаіснасць, а заглыбляўся ў сацыяльныя супярэчнасці жыцця, псіхалогію сучаснікаў, удала па-мастацку даследаваў тэмы драматычнага лёсу “былых”, кахання, сям’і, эмансіпацыі, духоўнага станаўлення чалавека, складвання новай маралі, новых узаемаадносін паміж людзьмі. У 1926 г. пісьменнік прадставіў твор “Голы звер” – псіхалагізаваную сатырычную аповесць, у якой паказваецца філасофія крайняга эгаізму як маштабная сацыяльная з’ява.

Годам пазней выходзіць раман “Сцежкі-дарожкі”, у якім распачынаецца традыцыя праўдзівага мастацкага паказу тэмы рэвалюцыі. Выдатнай з’явай беларускай літаратуры стала з’яўленне ў 1932 г. рамана “Вязьмо”. Тут аўтарам выказваецца сумненне ў неабходнасці правядзення суцэльнай калектывізацыі, паказваецца, якімі трагедыямі і маральнымі стратамі яна здзяйснялася. Пяру пісьменніка належаць п’есы “Віхор на балоце”, “Белыя ружы”, “Ная”, драматычная аповесць “Сымон Карызна”. Зарэцкі таксама праявіў талент нарысіста і тэатральнага крытыка, закрануў тэмы шчырага патрыятызму, абароны чалавечай свабоды і нацыянальнай беларускай культуры.

Прыхільнік “эмацыйнага рамантызму” ў айчыннай прозе, пісьменнік-наватар, М. Зарэцкі прадставіў шэраг твораў, якія прыкметна ўзбагацілі беларускае слоўнае мастацтва ў ідэйна-тэматычных, жанрава-стылёвых, вобразна-выяўленчых межах.

**Уладзімір Дубоўка (1900–1976)** – паэт, празаік, перакладчык, арганізатар маскоўскай філіі “Маладняка”, “узвышавец”, настаўнік, культурны і грамадскі дзеяч. У беларускай паэзіі імя У. Дубоўкі становіцца вядомым з 1921 года, калі газета “Савецкая Беларусь” надрукавала яго верш “Сонца Беларусі”. Тут знітоўваюцца традыцыйныя для айчыннай літаратуры адраджэнскія ідэі і авангардныя сімвалічныя вобразы. У 1923 годзе ў Вільні выходзіць яго першы паэтычны зборнік “Строма”, услед за ім з’яўляюцца новыя цікавыя кнігі “Там, дзе кіпарысы”, “Трысцё”, “Credo”.

Дубоўка становіцца адным з лідараў элітарнай пісьменніцкай суполкі “Узвышша”. У гэты час ім былі напісаны паэмы “Кругі”, “І пурпуровых ветразей узвівы”, “Штурмуйце будучыні аванпосты!”. Гэтыя творы маюць відавочны наватарскі, эксперыментальны характар. Тут сінтэзуюцца элементы эпасу, лірыкі і драмы. Праз умоўна-метафарычныя сюжэты аўтар вырашаў канцэптуальную звышзадачу, звязаную з мастацкім спасціжэннем нацыянальнага лёсу народа, стану нацыянальнага мастацтва ў трагічны перыяд. Вярнуўшыся пасля выгнання ў канцы 1950-х гадоў, У. Дубоўка па-новаму выяўляў свой талент у прыродаапісальнай лірыцы, мастацкай прозе, дзіцячай літаратуры і мастацкіх перакладах.

За сваё нядоўгае жыццё **Уладзімір Жылка (1900–1933)** паспеў напісаць шмат вершаў і падрыхтаваць некалькі зборнікаў. Выдаваць вершы паэт пачаў у 20-гадовым узросце, неўзабаве з’явіліся зборнікі “На ростані” і “З палёў Заходняй Беларусі”. Перакладаў на беларускую мову творы А. Блока, А. Міцкевіча, Ш. Бадлера і іншых паэтаў.

Вершы Уладзіміра Жылкі прасякнуты глыбокім лірызмам. Сімвалічныя вобразы, ужытыя з іх, грунтуюцца на патрыятычных (адраджэнскіх) канцэптах беларускага слоўнага мастацтва ранейшых перыядаў. Для паэзіі Жылкі ўласцівы матыў высакароднага бунтарства ў гонар сваёй Айчыны, таму тут сярод іншых дамінуюць



Репозиторий ВГУ

тэмы велічнай нацыянальнай гісторыі, узнёслага культу старажытнай пісьменнасці, самаадданага служэння Бацькаўшчыне. Паэтычным запаветам аўтара стала паэма “Тэстамент”. Развагі аўтара пра лёс прадстаўлены тут у двух узаемазвязаных інфармацыйных блоках: філасофскім, агульначалавечым і аўтабіяграфічным, асабістым. Новае выяўленне ў творчасці У. Жылкі знайшлі “вечныя” вобразы і матывы сусветнага мастацтва.

**Платон Галавач (1903–1937)** – пісьменнік, грамадскі дзеяч, адзін з кіраўнікоў літаратурных арганізацый “Маладняк”, БелАПП, рэдактар часопісаў “Маладняк”, “Полымя”. Тэматыка яго апавяданняў, аповесцей, нарысаў звязана з перыядам грамадзянскай вайны і мірным жыццём у вёсцы і горадзе. Лепшыя з іх (“Кнак”, “Вінаваты”, “Спалох на загонах”) закраналі маральна-этычныя асновы ў грамадстве. Творы Галавача карысталіся вялікім поспехам, перакладаліся на іншыя мовы.

**Міхась Лынькоў (1899–1975)** – народны пісьменнік БССР, грамадскі дзеяч, галоўны рэдактар часопіса “Полымя рэвалюцыі”, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва Акадэміі навук Беларусі. М. Лынькоў істотна пашырыў тэматыку і вобразную сістэму беларускай прозы. Удала распрацаваў тэмы лёсу “былых” людзей, міжнацыянальных стасункаў, свету грамадзянскай вайны, усталявання новага жыцця (“Над Бугам”, “Гой”, “Крот”, “Баян”, “Андрэй Лятун” і інш.). М. Лынькоў – майстар дзіцячых вобразаў і дзіцячай літаратуры, што бліскуча было прадэманстравана ім у аповесцях 1930-х гадоў “Міколка-паравоз” і “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”. Некалькі твораў пісьменнік прысвяціў падзеям вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь (“Ядвісін дуб”, “Тры злотых”, “Капля малака”, “Сустрэчы”).

Тэма Вялікай Айчыннай вайны дамінуе ў зборніку апавяданняў “Астап” (1944), тут псіхалагічна пераканаўча раскрываюцца вытокі агульнай нянавісці да фашыстаў і прагі адпомсціць ім за знішчанае жыццё. Усенародную партызанскую барацьбу паказаў Лынькоў у рамане-эпапеі “Векапомныя дні” (1948–1958). Гэта самы маштабны ў айчыннай літаратуры твор аб партызанскай вайне на тэрыторыі Беларусі. Пісьменнік стварыў велічныя вобразы радавых байцоў, кіраўнікоў партызанскага руху і падполля.

**Пушча Язэп (Плашчынскі Іосіф Паўлавіч) (1902–1964)** – паэт, крытык, перакладчык. Стаў адным з заснавальнікаў і арганізатараў літаратурнага аб’яднання “Маладняк”, а пазней — “Узвышша”. Аўтар арыгінальных зборнікаў “Раніца рыкае”, “Vita”, “Дні вясны”. Для ранніх вершаў паэта ўласцівы тонкае лірычнае светаадчуванне і шырыня асацыяцый, дакладнасць вобразнага мыслення і аптымістычныя радасныя фарбы, бадзёрасць і жыццесцвярджальнасць. Трагедыйны характар зборніка “Песні на руінах” і “Лістоў да сабакі” негатыўна ўспрыняла тагачасная крытыка. У абставінах грамадскага астракізму Пушчам былі напісаны паэмы “Крывавы плакат” (“Крывавы год”) і “Сады вятроў”. У паэмах “Песня вайны”, “Цень консула”, “Крывавы год” увага аўтара скіравана да падзей імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў. Геразму беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай прысвечаны паэмы “Бор шуміць” і “Людвіся”. Лірыка паэта апошніх гадоў вельмі меладычная, яе асноўнымі матывамі сталі любоў да Радзімы, шматгалоссе прыроды, услаўленне працоўнага энтузіязму.

**Андрэй Мрый (Андрэй Антонавіч Шашалевіч) (1893–1943)** – выдатны беларускі пісьменнік-сатырык. З канца 1923 г. А. Шашалевіч дасылае ў газету “Савецкая Беларусь” свае апавяданні (“Навалілі”, “Тварам да вёскі”, “Пятрок” і інш.). Гэты перыяд характарызуецца пошукавасцю ўласнага індывідуальнага стылю. Таму заканамерна, што ранняя проза Мрыя была разнароднай па тэматыцы: горад і вёска, жыццё прыроды і чалавека, стасункі старога і новага ў чалавечай свядомасці.



Репозиторий ВГУ

Схільнасць да шырокага аналізу жыцця вызначае лейтматыў творчасці А. Мрыя. Сведчаннем гэтага стала разнапланавасць сюжэтна-кампазіцыйных пабудоў яго апавяданняў, панарамнасць вобразаў у іх, шырыня аналізуемых аўтарам праблем.

Узлётам празаічнай творчасці Андрэя Мрыя можна лічыць 1927–1929 гг., час, калі пісьменнік уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне "Узвышша". Тады пераважна аўтарам былі напісаны сказы ("Камандзір", "Няпросты чалавек", "Гармонія ў ружовым", "Рабін"). Узаемаабумоўленасць чалавека і грамадства вызначае асноўны ідэйны змест сказаў А. Мрыя. Канцэптуальная тэма "герояў новага часу" знайшла ў творчасці празаіка некалькі кірункаў раскрыцця мадэрнізаванага вобраза махляра. Названы персанаж самаператвараецца з "маленькага" чалавека ў гіпертрафічнага носьбіта новай маралі.

У рамане "**Запіскі Самсона Самасуя"** (1929) парадзіруецца даваенная рэчаіснасць, ствараецца вобраз эпохі, у якой разбураліся маральна-этычныя, патрыятычныя і гуманістычныя асновы жыцця. У беларускай сатырычнай прозе 1920-х гадоў названы твор А. Мрыя стаў узорным прыкладам мастацкага камізму. Па жанры гэта сатырычны раман-памфлет. Для яго ўласцівы ўніверсальны, усеахопны прынцып камічнага паказу, моцны крытычны пафас, злабадзённасць і выкрывальная тэндэнцыйнасць. Раман быў напісаны ў выглядзе папулярнай у літаратуры 1920-х гадоў формы запісак. Тут гратэскава-парадыйна праламляюцца заганы тагачаснага грамадства: бюракратызм, мяшчанства, бяздушша і разумовая абмежаванасць чыноўнікаў, парадаксальнасць новаўвядзенняў, псеўданавуковасць і г.д. А. Мрый у карнавальнай мадэлі грамадства цэнтральнае месца адводзіць Самсону Самасую – адметнаму персанажу, у аснову якога пакладзены фальклорны тып дурня, які ў працэсе самавыкрыцця неўсвядомлена выкрывае і парадоксы часу.

Самабытнай з'явай у беларускай літаратуры 1920-х гадоў сталі сказы **Лукаша Калюгі (Канстанціна Пятровіча Вашыны) (1909–1937).** У час, калі адбывалася ўтрыроўка нацыянальных асноў, было важна захаваць гістарычную памяць і ментальнасць народа. Гэтую творчую задачу і імкнуўся рэалізаваць Л. Калюга ў сваіх пацешлівых па форме і філасофска-прытчавых па змесце сказах, галоўны герой якіх – чалавек-унікум, дзівак, што жыве па сваіх законах і ў сваім часе ("Лук'ян – капераціўскі сабака", "Трахім з Пагулянкі", "Трахім – штучны чалавек", "Іллюк – даследчык", "Тахвілін швагер" і інш.). Мастацкай форме сказаў празаік надаў філасофска-камічны змест, што адначасова спрыяла большай даходлівасці і значнасці твораў. Зварот пісьменніка да сказавай прозы быў прадвызначаны і той акалічнасцю, што традыцыйная формула вобразнай архітэктонікі твора (аўтар–апавядальнік–слухач–чытач) дазваляла аўтару стаць выразнікам тыповага, масавага голасу. Даследчыкі слушна адзначаюць цікавасць Калюгі да беларускага фальклору, у якім празаік бачыў не толькі духоўна-мастацкую скарбніцу, але і магчымасць раскрыцця нацыянальнай самабытнасці народа ў адэкватнай для гэтага жанравай форме.

У 1928 г. Л. Калюгам была напісана "юнацкая аповесць" **"Ні госць ні гаспадар"**. Натуральнасць і рэалістычная дакладнасць, якія сталі для празаіка своеасаблівымі мастацкімі арыенцірамі, абумовілі не толькі актуальнасць праблематыкі (аповесць з'яўляецца аўтарскім даследаваннем у рэчышчы літаратурнай канцэпцыі "новага героя"), але і стылёва ўзбагацілі твор. Прынамсі, маральна-псіхалагічная заглыбленасць, перапляценне рэальнага і рэтраспектыўнага планаў падзей, дыскрэтнасць хранатопу, сінтэз аб'ектыўна-суб'ектыўных форм аповеду, побытавая засяроджанасць, лірычнасць – усе названыя кампаненты дазвалялі аўтару пазбегнуць адналінейных апісанняў і кан'юнктурных высноў.

Праблема адчужэння новай генерацыі ад нацыянальных духоўных асноў стала адным з канцэптуальнах аспектаў у фантасмагарычнай аповесці Л. Калюгі **"Нядоля**

Рэпазіторый ВДУ

**Заблоцкіх”** (1929–1931), напісанай у форме апавядальных гісторый сказавага тыпу. Твор набывае непаўторнае стылёвае выяўленне дзякуючы ўмоўнасці яго мастацкага свету, падзелу на рэальную і фантастычную падсістэмы, абстрактнасці хранатопу, ужыванню прыёмаў “завуаляванай (няяўнай) фантастыкі”, трансфармацыі міфалагічных матываў і вобразаў, актыўнай структураўтваральнай ролі наратара, філасофскай падтэкставасці.

У перыяд ссылкі пісьменнік напружана працаваў над новымі значнымі творамі: аповесцямі “Дзе косці мелюць”, “Зэнка малы ніколі не быў”, “Зоры Вам вядомага горада, раманам “Пустадомкі”. Глыбіня аўтарскіх разваг адносна імператываў тагачаснай рэчаіснасці, зместавая і формавая непаўторнасць гэтых мастацкіх прыкладаў якасна вылучаюць іх у сістэме беларускай літаратуры 1930-х гадоў.

**Паўлюк (Павел Адамавіч) Трус (1904–1929)** – паэт, член літаратурнага аб’яднання “Маладняк”. За шэсць год сваёй літаратурнай дзейнасці П.Трус паспеў пакінуць адметны след у беларускай паэзіі. Росквіт яго творчасці прыпадае на перыяд 1923–1929 гадоў. Пры жыцці былі выдадзены толькі дзве кнігі паэта – зборнікі “Вершы” і “Ветры буйныя”. Пісаў у розных жанрах, у тым ліку і сатырычныя вершы, прыпеўкі, гумарыстычныя замалёўкі. З асаблівым лірычным замілаваннем прадстаўлены ў яго творах малюнкі вясковага свету, беларускія краявіды, вобразы блізкіх людзей. П. Трусам было створана некалькі паэм (“Дзясяты падмурак”, “Сірата Алеся”, інш.). Лепшыя творы аўтара вызначаюцца натуральнай народна-песеннай асновай.

**Янка Маўр (Іван Міхайлавіч Фёдараў) (1883–1971)** — пісьменнік, настаўнік, грамадскі дзеяч, класік беларускай дзіцячай літаратуры. Стаў вядомы чытачу з 1926 г., калі ў часопісе “Беларускі піянер” пачала друкавацца яго першая аповесць “Чалавек ідзе”, прысвечаная нашай эвалюцыі. З гэтага твора была ўдала акрэслена аўтарская тэндэнцыя сінтэзаваць пазнавальнасць і прыгодніцтва, якую Маўр развіў у наступных сваіх аповесцях (“У краіне райскай птушкі”, “Сын вады”) і ў рамане “Амок”. Тут пісьменнік выступіў абаронцам правоў каланіяльных, захопленых народаў, сцвердзіўшы такім чынам натуральны гуманізм.

У ідэйна-эстэтычнае рэчышча буйной маўраўскай прозы 1920-х гадоў арганічна ўключаюцца і апавяданні (“Слёзы Тубі”, “Незвычайная прынада”, “Лацароні” і інш.). У іх дамінуюць той жа ідэйна-тэматычны базіс — жыццё ў каланіяльных краінах, тая ж вострая сюжэтнасць, драматызм падзей, але аўтар апісваў лёсы дзяцей, ахвяр антычалавечай палітыкі каланізатараў. У 1930-я гады Маўр апеляваў у творчасці да роднай беларускай рэальнасці, у якой дзейнічаюць юныя героі (“Палескія рабінзоны”). Глыбокае спасціжэнне дзіцячай душы, раскрыццё своеасаблівага дзіцячага ўспрымання праявіліся ў творах “малой” прозы (“Шчасце”, “Бярозавы конь”, “Падарожжа вакол дома”). Сапраўдным мастацкім шэдэўрам аўтара з’яўляецца апавяданне “Максімка”, дзе раскрываецца праблема пошукаў шчасця ў драматычных абставінах пасляваеннай рэчаіснасці.

Вялікая Айчынная вайна пранізлівым болем увайшла ў творы пісьменніка. На працягу 1946–1948 гг. ён разам з П. Рунцом займаўся зборам і рэдагаваннем дзіцячых успамінаў пра вайну для кнігі “Ніколі не забудзем”, якая выйшла з прадмовай Якуба Коласа і атрымала высокую ацэнку грамадскасці не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Доўгі час пісьменнікам вялася дзейнасць па напісанні аўтабіяграфічнай трылогіі “Шлях з цемры”. Актыўна працаваў Я. Маўр і ў жанры навуковай фантастыкі: казка “Вандраванне па зорках”, сацыяльная ўтопія “Аповесць будучых дзён”, раман “Фантамабіль прафесара Цылякоўскага”. Гэтыя творы аб’ядноўвае ідэя неабмежаванасці чалавечых фантазій і думак.

Репозиторий ВГУ

**Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага дзесяцігоддзя**

Многія пісьменнікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіліся ў войску, супрацоўнічалі з франтавым друкам. На старонках цэнтральных газет “Правда”, “Известия”, “Савецкая Беларусь”, “За свабодную Беларусь” былі змешчаны гнеўныя і заклікавыя артыкулы Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, М. Лынькова, П. Броўкі, А. Куляшова, інш.

З першых дзён вайны атрымала шырокае гучанне беларуская патрыятычная лірыка. Яна паказвала ўнутраны свет чалавека, яго маральна-псіхалагічны стан, гераізм народа, уздымала сацыяльна-філасофскія, этычныя пытанні. Сярод жанравых форм вершаў дамінавалі вершы-звароты, вершы-заклікі, пасланні, песні, дыялогі, сяброўскія гутаркі з чытачом, лірыка-публіцыстычныя маналогі, вершаваныя апавяданні, вершы-балады (“Душою і сэрцам мы з вамі, героі”, “Народу-барацьбіту” Я. Коласа, “Беларускім партызанам” Я. Купалы, “Помста” П. Броўкі, “Вастрыце зброю” М. Танка, “Балада аб чатырох заложніках” А. Куляшова).

“Малая” проза ваенных гадоў была прадстаўлена ў аўтарскіх зборніках “Вялікае сэрца” К. Чорнага, “Астап” М. Лынькова, “Помста” А. Якімовіча, “Першая атака” М. Лупсякова і іншых.

Вяршыняй беларускай прозы гадоў Вялікай Айчыннай вайны былі апавяданні, аповесці і раманы К. Чорнага. Яго творы вызначаліся рэалістычнай канкрэтнасцю і псіхалагізмам, уздымалі глыбокія агульначалавечыя праблемы: вытокі подзвігу, сапраўдныя вартасці жыцця, непарушнасць душэўнай чысціні і сумленнасці (“Маленькая жанчына”, “Бацька”, “Вялікае сэрца”, “Пошукі будучыні”, “Млечны шлях” і інш.).

Сярод найбольш прыкметных прыкладаў драматургічных твораў ваеннага часу варта назваць драму “Проба агнём” К. Крапівы, опернае лібрэта “Кастусь Каліноўскі”, драматычную паэму “Адплата” М. Клімковіча.

У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гадоў айчынная літаратура больш шырока асэнсоўвае подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Актыўна ўваходзяць у мастацкія творы публіцыстычныя і дакументальныя элементы. У тагачаснай прозе вылучаюцца жанры рамана, рамана-эпапеі, мемуарных запісаў, успамінаў (“Мінскі напрамак” І. Мележа, “Векапомныя дні” М. Лынькова, “Глыбокая плынь” І. Шамякіна”). Драматургія гэтага перыяду пашырала пераважна жанр гераічнай драмы, выдатным прыкладам можа паслужыць п’еса “Канстанцін Заслонаў” А. Маўзона.

**Літаратура**

Мастацкія творы для абавязковага вывучэння

1. *К. Чорны*: апавяданні (“Пачуцці”, “Срэбра жыцця”, “Па дарозе”, “Справа Віктара Лукашэвіча” і інш.), аповесці “Лявон Бушмар”, “Люба Лук’янская”, раманы “Сястра”, “Зямля”, “Трэцяе пакаленне”, “Пошукі будучыні”, публіцыстыка.
2. *У. Дубоўка*: лірыка 1920-х гг., паэмы “Кругі”, “І пурпуровых ветразей узвівы”, “Штурмуйце будучыні аванпосты!”, вершаваныя цыклы “Чакае ля берагу човен мяне”, “Пасля вандравання”, “Палеская рапсодыя” і інш.
3. *М. Зарэцкі*: апавяданні (“Пела вясна”, “Цішка Бабыль”, “Дзіўная”, “Максіміліст”, “Ракавыя жаронцы” і інш.), аповесць “Голы звер”, раманы “Сцежкі-дарожкі”, “Вязьмо”.
4. *К. Крапіва*: байкі і сатырычныя вершы, паэмы “Хвядос – чырвоны нос”, “Біблія”, апавяданні (“Вясна”, “Каровін мужык”, “Мой сусед”, “Людзі-суседзі”, “Вайна” і інш.), раман “Мядзведзічы”, п’есы “Канец дружбы”, “Мілы чалавек”, “Хто смяецца апошнім”, “Брама неўміручасці”, “На вастрыі”, публіцыстыка (“Думкі

Репозиторий ВГУ

пра сатыру”, “Аб сатырычнай камедыі”, “Канфлікт – аснова п’есы”, “Што мне рупіць”).
5. *П. Галавач*: апавяданні (“Дробязі жыцця”, “Хочацца жыць”, “Кнак” і інш.), аповесці “Вінаваты”, “Спалох на загонах”.
6. *М. Лынькоў*: апавяданні (“Над Бугам”, “Гой”, “Чыгунныя песні”, “Андрэй Лятун”, “Саўка-агіцірнік”, “Астап”, “Васількі” і інш.), аповесць “Міколка-паравоз”, раман “На чырвоных лядах”.
7. *Я. Пушча*: лірыка, паэма “Цень Консула”.
8. *Л. Калюга*: апавяданні (“Трахім з Пагулянкі”, “Іллюк – даследчык”, “Цеснаватая куртачка”, “Тахвілін швагер” і інш.), аповесці “Ні госць ні гаспадар”, “Нядоля Заблоцкіх”.
9. *А. Мрый*: апавяданні (““Цар Максіміліян” у вёсцы”, “Прафесар акультных навук”, “Няпросты чалавек”, “Камандзір”, “Гармонія ў ружовым” і інш.), раман “Запіскі Самсона Самасуя”.
10. *У. Жылка*: лірыка, паэма “Тэстамент”, апавяданні, дзённік.
11. *П. Трус*: лірыка, паэма “Дзясяты падмурак”.
12. *Я. Маўр*: апавяданні, аповесці “Сын вады”, “У краіне райскай птушкі”, раманы “Палескія рабінзоны”, “Амок”, “Фантамабіль прафесара Цылякоўскага”.

Асноўная літаратура

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: У4 т. Т.2: 1921-1941 / Рэд. кал.: Гніламёдаў У.В. і інш. – Мінск, 1999.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. Т. 3: 1941-1965 / Рэд. кал.: У.В. Гніламедаў [і інш.]. — Мінск, 2001.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя (20–50-я гады) / Пад агул. рэд.: М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – Мінск, 2000.
4. Кавалюк, А. С. Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XX ст.: вучэб.-метад. дапаможнік: у 3 ч. Ч. 2 / А.С. Кавалюк. – Брэст, 2009.
5. Макарэвіч, А. М. Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці XX ст.: дапаможнік: у 2 ч. Ч. 1 / А.М. Макарэвіч – Магілёў, 2013.
6. Максімовіч, В.А. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя / В.А. Максімовіч. – Мінск, 2006.

Дадатковая літаратура

1. Бугаёў, Дз.Я. Спавядальнае слова: Літаратурная крытыка, успаміны / Дз.Я. Бугаёў. – Мінск, 2001.
2. Беларуская літаратура: Проза 20-х гадоў: Хрэстаматыя / Склад. Бугаёў Д.Я., Казлова В.В., Каваленка Т.В. і інш. – Мінск, 1997.
3. Бельскі, А.І. Беларуская літаратура XX стагоддзя. Гісторыя і сучаснасць / А.І. Бельскі. – Мінск, 2005.
4. Мельнікава, З.П. “На горне душы...” Творчасць Змітрака Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XXст.: Манаграфія / З.П. Мельнікава. – Брэст, 2001.
5. Навуменка, І.Я. Ранні Кузьма Чорны (1923-1929) / І.Я. Навуменка. – Мінск, 2000.
6. Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура XX ст.: Вучэб. дапам. / М.І. Мішчанчук, І.С. Шпакоўскі. – Мінск, 2001.
7. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск, 2001.
8. Падстаўленка, В.Ф. Гісторыя беларускай літаратуры 1900–1930-х гг.: метад. рэкамендацыі / В.Ф. Падстаўленка. – Віцебск, 2005.
9. Падстаўленка, В.Ф. Беларуская літаратура першай паловы XX ст.: вучэбна-метадычны комплекс / В.Ф. Падстаўленка. – Віцебск, 2010.

Репозиторий ВГУ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

**Беларуская літаратура другой паловы 1950-х – 1960-х гадоў**.

Сярэдзіна 1950-х гг. у гісторыі літаратуры і культуры стала пачаткам якасна новага перыяду развіцця. На абнаўленне мастацтва слова паўплывала грамадская “адліга”. Адбываецца адыход літаратуры ад ілюстрацыйнасці, догмаў і схематызму. Дзякуючы рэабілітацыі рэпрэсаваных пісьменнікаў стала магчымым вяртанне да творчай дзейнасці У. Дубоўкі, Я. Скрыгана, А. Звонака, Я. Пушчы, С. Грахоўскага, М. Хведаровіча і інш. У 1960-я гады адбыўся прыход у літаратуру новага пісьменніцкага пакалення –“філалагічнага”. “Шасцідзясятніцтва” як літаратурна-грамадскі рух паўплываў на развіццё творчасці А. Адамовіча, В. Быкава і інш. Робіцца адчувальным светапогляднае абнаўленне беларускай літаратуры другой паловы 50-х – 60-х гг. Адбываецца эстэтычнае абнаўленне беларускай паэзіі; шматграннае жанрава-тэматычнае і стылёвае развіццё прозы, які праявіўся ў росквіце беларускага рамана. Пашыраюцца праблемна-тэматычныя і жанравыя абсягі драматургіі другой паловы 1950-х – 60-х гг.

***Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко, 1912–1995).*** Паэт, перакладчык. Да вайны выдаў зборнікі паэзіі “На этапах” (1936), “Журавінавы цвет” (1937), “Пад мачтай” (1938), дзе знайшла адлюстраванне шматграннасць унутранага свету лірычнага героя ў заходнебеларускай лірыцы. У часы Вялікай Айчыннай вайны творчасць Максіма Танка пераважна вылучаецца сатырычна-выкрывальнай і публіцыстычна-пафаснай жанравай скіраванасцю. Яго вершы заклікаюць паўставаць на змаганне супраць ворага, нічога не шкадуючы дзеля перамогі, ён паэтызуе подзвіг савецкага воіна, услаўляе родны край, народ, культуру і мову. У творах пасляваенных гадоў М. Танк аддае даніну памяці (зборнікі “Каб ведалі”, 1948; “На камні, жалезе і золаце”, 1951; “У дарозе”, 1954). Паэма “Люцыян Таполя” (1946) з’явілася пратэстам супраць несвабоды мастака. У лірыцы М.Танка другой паловы 50-х-60 гг. адбываецца паглыбленне гуманістычнага пафасу (зборнікі “След бліскавіцы” (1957), “Мой хлеб надзённы” (1962), “Глыток вады” (1964). У 1960-80-я гг. М. Танк займаецца грамадска-культурнай дзейнасцю. У зборніках паэзіі “Хай будзе святло” (1974), “Дарога, закалыханая жытам” (1976), “Прайсці праз вернасць” (1979), “За маім сталом” (1984), “Дарога і хлеб” (1988) паглыбляецца філасофская тэматыка і праблематыка лірыкі, пашыраюцца сродкі мастацкага выяўлення. У лірыцы гэтага часу можна назіраць разнастайнасць жанраў і формаў, спалучэнне нацыянальных традыцый верша і наватарства, арганічную аб’яднанасць нацыянальнага з агульначалавечым. Апошнія кнігі вершаў М. Танка маюць сімвалічныя назвы “Мой каўчэг” (1994), “Errata” (1996).

***Пятрусь (Пётр Усцінавіч) Броўка (1905–1980).*** Станаўленне творчай індывідуальнасці паэта адбылося ў 1930-я гг. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію. У 1941–1942 быў інструктарам-літаратарам франтавой газеты “За Савецкую Беларусь” на Бранскім і Заходнім франтах, супрацоўнічаў з партызанскім друкам. У пасляваеннае дзесяцігоддзе паэт асэнсоўвае свій ваенны вопыт. Эвалюцыя паэтычнага таленту П.Броўкі паўплывала на творчасць ў другой палове 50-х-60-я гг. Адбываецца ідэйна-тэматычнае і жанравае ўзбагачэнне паэзіі П.Броўкі. Развіваецца майстэрства вобразнасці і паэтычнага гукапісу. Эмацыянальнай кранальнасцю, мілагучнасцю, лірычна-камерным характарам адрозніваюцца творы пра каханне. Філасофскія матывы гучаць у паэме-рэквіеме “Голас сэрца” (1960) – адным з лепшых эпічных твораў 1960-х гг. Творы паэта сталі яскравымі дакументамі сваёй эпохі.

Рэпазіторый ВДУ

***Аркадзь Куляшоў (1914–1978).***У 14-гадовым узросце Аркадзь Куляшоў напісаў свой хрэстаматыйны верш "Алеся", прысвечаны першаму каханню. У вершах 1930-х гадоў назіраецца узбагачэнне лірызму, спалучэнне ўзнёсласці з жывымі малюнкамі жыцця. У лірыцы ваеннага часу гучыць глыбокі роздум пра лёс маладога пакалення, пафас патрыятызму, назіраецца ўзмацненне гераічнага пачатку, прысутнічаюць разважанні на тэмы міру і бяспекі Радзімы А. Куляшоў праявіў наватарства ў распрацоўцы жанру балады. Значнае месца ў творчай спадчыне паэта займае паэма "Сцяг брыгады"(1942). Умоўна-казачны свет мадэлюе паэма "Прыгоды цымбал". Канцэптуальнай навізной адрозніваецца "Новая кніга" (1964). Адмаўленне ад спрошчанасці, ілюстрацыйнасці назіраецца ў паэзіі 50-х гг, адбываецца паварот да філасофскага асэнсавання жыцця. У творчасці паэта набываюць маштабнасць думкі і вобразы, лірычны герой асэнсоўвае катэгорыі Часу, Вечнасці, Жыцця, Смерці ў вершах 1960–70-х гг. Трэба адзначыць спалучанасць асабістага з агульначалавечым, эмацыянальную "сагрэтасць" вобразаў у творах А. Куляшова ("Я хаце абавязаны прапіскаю...", "Мне кожны год, нібы жыццём другім...", "Сасна і бяроза" і г.д.). Значнае месца займае тэма паэта і паэзіі. Прыцягвае ўвагу непаўторнасць куляшоўскага стылю, яго інтэлектуальная насычанасць і рытміка-інтанацыйныя асаблівасці. Філасофская і сацыяльная праблематыка знаходзіць асэнсаванне ў паэмах "Цунамі" (1968), "Далека да акіяна" (1972), "Варшаўскі шлях " (1973), "Хамуціус" (1975). Кнігі паэзіі "Сасна і бяроза" (1970), "Хуткасць" (1976).

***Янка (Іван Антонавіч) Брыль (1917–2006).*** У 1946 г. выйшла з друку першая кніга Я. Брыля пад назвай "Апавяданні", куды ўвайшлі некалькі апавяданняў і невялікая аповесць "У сям'і", прысвечаныя жыццю заходнебеларускай вёскі. Мастацкі летапіс улюблёнага пісьменнікам Наднямоння працягваюць яго другі зборнік "Нёманскія казакі" (1947), а таксама аповесці "Сірочы хлеб", працу над якой ён пачаў яшчэ да вайны, "У Забалоцці днее" (1950) і "На Быстранцы" (1955). Ужо першыя творы вылучылі Я. Брыля як арыгінальнага майстра лірыка-псіхалагічнай прозы, добрага знаўцу народнай мовы. У лірычным апавяданні "Галя" (1953) на фоне жыцця заходнебеларускай вёскі раскрыты пачуццёвы свет галоўнай гераіні, яе глыбокая чалавечая драма. Тэма вайны знайшла адлюстраванне ў апавяданнях Я. Брыля са зборніка "Працяг размовы". Майстэрства Янкі Брыля-апавядальніка заключаецца ў ёмістасці мастацкай дэталі, спалучэнні лірызму і псіхалагізму, пластычнасці малюнкаў, самабытнасці фарбаў, народнасці погляду на свет. Раман "Птушкі і гнёзды" (1963) – адзін з самых аўтабіяграфічных твораў пісьменніка, ён стаў прынцыпова новым словам у жанры рамана, які сам аўтар назваў "кнігай адной маладосці". Стылёвыя пошукі Я. Брыля нарадзілі арыгінальнае спалучэнне эпічных і лірыка-псіхалагічных элементаў, тую напружана-эмацыянальную плынь, якая была незвычайнай для традыцыйнай рэалістычнай прозы тых часоў. Стыхія народнага жыцця адлюстравана ў аповесці "Ніжнія Байдуны" (1975). Значнае месца ў творчасці Я. Брыля займаюць лірыка-філасофская аповесць "Золак, убачаны здалёк" (1978), аўтабіяграфічная аповесць "Муштук і папка" (1990).

***Пімен Панчанка (1917–1995).*** Як паэт ён пачаўся з лірыкі, аб чым сведчаць яго першыя зборнікі "Упэўненасць" (1938) і "Вераснёвыя сцягі" (1940). У іх знайшоў адлюстраванне рамантычна-ўзнёслы настрой мастака. Паэт услаўляе хараство і багацце роднай зямлі, увасабляе тыповы настрой і пачуццй пакалення 1930-х гг. Паэтычную сталасць П. Панчанку прынеслі вершы, напісаныя ім у час вайны. На франтавых дарогах ён бачыў кроў, смерць, балюча перажываў трагедыю беларускага народа. Яго ваенныя радкі прасякнуты верай у перамогу над ворагам, суперажываннем, спагадай да чужога гора: зборнікі "Дарога вайны" (1943) і "Далёкія станцыі" (1945). Другая палова 50-х–60-я гг. – уздым у творчасці П. Панчанкі. Ідэйна-светапоглядныя змены



Рэпазіторый ВДУ

знаходзяць адлюстраванне ў творах паэта. Спавядальны лірызм, тонкасць эстэтычных уражанняў прысутнічаюць у пейзажнай і інтымнай лірыцы. Светаразуменне паэта становіцца больш заглыбленым, па-філасофску засяроджаным, разважлівым: зборнікі “Снежань” (1972), “Крык сойкі” (1976), “Вячэрні цягнік” (1977), “Лясныя воблакі” (1985). Тэматычна-праблемная навізна кніг “І вера, і вернасць, і вечнасць” (1986), “Горкі жолуд” (1988), “Высокі бераг” (1993) абумоўлена бескампрамісным маральным судом паэта над сабой і сваім часам.

***Іван Мележ (1921–1976).*** Пісаць вершы і апавяданні І. Мележ пачаў яшчэ вучнем. У 1948 годзе была выдадзена кніга прозы “Гарачы жнівень”. Назву ёй дала аднайменная аповесць, напісаная ў 1946 годзе пасля наведвання спаленай і спустошанай падчас вайны роднай вёскі. Аўтар паэтызуе будзённую сялянскую працу, перадае душэўную прыгажосць простых вясковых людзей. Менавіта ў гэты час пісьменнік па-новаму адчуў, што значыць Палессе ў яго жыцці. Ужо ў ранніх творах І. Мележа назіралася тэндэнцыя да цыклізацыі. Паступова пашыраюцца жанравыя рамкі творчасці пісьменніка. З канца 1947 года ён працуе над раманам “Мінскі напрамак” (1947–1953, 1967–1973), дзе расказваецца пра вызваленчую барацьбу на Беларусі летам 1944 года, пра аперацыю “Баграціён”. Праца над “Мінскім напрамкам” стала важным этапам у творчым росце І. Мележа-празаіка. Іван Мележ – аўтар цыкла раманаў “Палеская хроніка”: “Людзі на балоце” (1962), “Подых навальніцы” (1966) і “Завеі, снежань” (1976). У гэтых творах выявілася грамадзянская смеласць і ідэйна-мастацкая маштабнасць у асэнсаванні складаных абставін калектывізацыі на Палессі, жыцця Беларусі 1920–30-х гг., праўдзівасць і шчырасць аўтара ў спалучэнні з яго высокай прафесійнай культурай, глыбокім і тонкім псіхалагізмам, разуменнем душы беларускага селяніна. Непаўторная мастацкая канцэпцыя тагачаснага жыцця народа, вялікі ідэйны змест данесены праз дасканалую мастацкую форму і адметныя вобразы. “Палеская хроніка” – глыбокае філасофска-мастацкае асэнсаванне жыцця беларускага народа на вельмі важным гістарычным этапе, яна стала нацыянальнай эпапеяй.

***Андрэй Макаёнак (1920–1982).*** Друкаваўся з 1946. Пісаў гумарэскі, фельетоны, нарысы. Першая п’еса – аднаактовая драма “Добра, калі добра канчаецца” (1946). У сатырычнай камедыі “Выбачайце, калі ласка!” (1954) бескампрамісна крытыкуюцца заганныя метады кіраўніцтва гаспадаркай, паказуха, фармалізм, казённае адміністраванне. Камедыі “Каб людзі не журыліся” (1957) і “Лявоніха на арбіце” (1961) прысвечаны жыццю пасляваеннай вёскі. Сацыяльна-палітычнай накіраванасцю вызначаюцца наватарскія п’есы “Зацюканы апостал” (1969) і “Трыбунал” (1970), якія засведчылі значную эвалюцыю ў выяўленчай манеры аўтара. Сатырычная камедыя-памфлет “Зацюканы апостал”, насычаная прыёмамі сцэнічнай умоўнасці, часам з падкрэсленым ігнараваннем праўдападобнасці, вызначаецца своеасаблівасцю мастацкай тыпізацыі, гранічнай абагульненасцю персанажаў, не трацячы пры гэтым мастацкай канкрэтнасці. У трагікамедыі “Трыбунал”, блізкай да традыцый народнай драмы, А. Макаёнак спалучыў нізкае з узвышаным, фарсавае з трагедыйным. Апошні закончаны твор А. Макаёнка – трагікамедыя “Дыхайце эканомна” (1983) – п’еса-прытча, у якой аб’ектам аўтарскага асэнсавання стала найважнейшая агульначалавечая праблема захавання Зямлі ад тэхнагеннай катастрофы.

***Міхась (Міхаіл Лявонавіч) Стральцоў (1937–1987).*** У першым зборніку апавяданняў “Блакітны вецер” (1962) праявіў сябе тонкім псіхолагам, знаўцам побыту вёскі і горада. У зборніку “Сена на асфальце” (1966) раскрыў псіхалагічнае і эстэтычнае ўжыванне нядаўняга вяскоўца ў гарадскую стыхію, магчымасці гарманічнага спалучэння ў чалавеку эмацыянальнага і інтэлектуальнага пачаткаў. У творчасці М. Стральцова гэтага часу дамінуюць “спавядальныя” матывы, прыцягвае ўвагу акварэльнасць, настраёвасць, мілагучнасць і сакавітасць мовы. У аповесці “Адзін

Репозиторий ВГУ

лапаць, адзін чунь” (1970) паказана фарміраванне характару падлетка ў цяжкія пасляваенныя гады. Пазней былі выдадзены кніга прозы “Падарожжа за горад” (апавяданні, аповесці, 1986), кніга выбранага “На ўспамін аб радасці” (1974). Душэўная чысціня і вернасць чалавечаму прызванню знайшлі адлюстраванне ў паэзіі М. Стральцова: зборнікі “Ядлоўцавы куст” (1973), “Цень ад вясла” (1979), “Яшчэ і заўтра” (1983), “Мой свеце ясны” (1986). Экзістэнцыяльнае пранікненне ў сутнасць быцця, спавядальнасць і аўтабіяграфізм, класічная форма верша – характэрныя рысы лірыкі М. Стральцова. Міхась Стральцоў – яркі прадстаўнік пакалення “шасцідзесятнікаў” у беларускай літаратуры.

**Беларуская літаратура 1970-х-першай паловы 1980-х гадоў.**

Адбываецца змена парадыгмы ў грамадскім, культурным, нацыянальным жыцці на рубяжы 1970-х гг. У літаратуры назіраецца значнае пашырэнне тэматыкі (НТР, космас, экалогія і інш.), жанрава-стылёвае развіццё і ўзбагачэнне. Нарастанне экалагічных праблем у жыцці прывяло да адлюстравання іх у літаратуры. Уздымаюцца праблемы: НТР і асоба, “экалогія” душы і “экалогія” культуры. У прозе назіраецца зварот да беларускай гісторыі. Мастацкія набыткі беларускай паэзіі ўзбагачаюцца творчасцю А. Грачанікава, В. Зуёнка, А. Пысіна, А. Вялюгіна, А. Вярцінскага, П. Макаля, Р. Барадуліна, Ю. Свіркі, М. Мятліцкага, інш. Яркі наватарскі характар мае кніга А. Разанава “Шлях – 360”(1981). Спавядальныя матывы гучаць у лірыцы Е. Лось, В. Вярбы, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Т. Бондар, Г. Каржанеўскай, В. Аколавай, інш. Драматызм пачуцця, псіхалагізм характэрызуюць лірыку Д. Бічэль-Загнетавай. Арыгінальнасць, непаўторнасць паэтычных галасоў адрозніваюць творчасць Р. Семашкевіча, К. Камейшы, Ю. Голуба, Г. Пашкова, М. Маляўкі, Л. Галубовіча, Л. Тарасюк, А. Пісьмянкова, В. Шніпа, Л. Дранько-Майсюка і інш. Адбываецца ўзмацненне суб’ектыўнага пачатку ў літаратуры, абумоўленае выхадам з крызісных, “застойных” з'яў у грамадстве, абвостранай ўвагай да чалавека. Гэтым жа тлумачыцца паглыбленне філасофска-канцэптуальнага зместу твораў, інтэлектуалізацыя прозы, яе жанрава-стылёвая эвалюцыя. Пісьменнікі ўсё часцей выкарыстоўваюць разнастайныя формы і прыёмы мастацкай умоўнасці. Назіраецца развіццё жанра фэнтэзі і дэтэктыўнага жанра у беларускай літаратуры. Пашырэнне жанрава-тэматычных абсягаў драматургіі становіцца магчымым у п’есах А. Дударава, К. Крапівы, М. Матукоўскага, А. Дзялендзіка, А. Петрашкевіча і інш. Беларуская літаратура стаіць на парозе істотных змен у грамадска-культурным жыцці.

***Васіль Быкаў (1924–2003).*** Творчая біяграфія пісьменніка пачынаецца ў пасляваенныя гады. Тэма чалавека на вайне знайшла адлюстраванне ў аповесцях “Жураўліны крык” (1959). “Здрада” (1960), “Трэцяя ракета” (1961), “Пастка”, “Праклятая вышыня”, “Абеліск”, “Мёртвым не баліць" (1965). Адметнасць гэтых твораў у тым, што герой вымушаны рабіць маральны выбар у “пагранічных” абставінах, аднак менавіта гэты выбар сведчыць пра чалавечую вартасць асобы. Рамантызацыя і ідэалізацыя сюжэта адбываецца ў аповесці “Альпійская балада” (1963). Аўтарскі вобраз вайны (“мая вайна”) знаходзіць увасабленне ў аповесці “Праклятая вышыня” (1968), якае мае прытчавы характар. Выхад за межы аўтабіяграфізму і пашырэнне фактычнай асновы назіраецца ў аповесці “Круглянскі мост” (1968). Глыбокі гуманістычны сэнс мае аповесць “Сотнікаў” (1970). Публіцыстычнай палемічнасцю адрозніваецца аповесць “Абеліск” (1971). Над паняццем меры чалавечай адказнасці разважае аўтар ў аповесці “Дажыць да світання”(1972). Праблему будучыні ўзнімае В. Быкаў ў аповесці “Воўчая зграя” (1974). Паглыбленне роздуму празаіка пра цану Вялікай Перамогі і каштоўнасць асобнага чалавечага жыцця назіраецца ў аповесці “Яго батальён” (1975). Аповесць “Пайсці і не вярнуцца” (1978) стала новым этапам у

Рэпазіторый ВДУ

мастацкім развіцці пісьменніка. Аповесць “Знак бяды” (1982) – значная мастацкая з’ява ў творчасці празаіка і ў развіцці беларускай прозы другой паловы XX стагоддзя. У творы з асаблівай сілай выявілася праблема трагічнага, адвечная тэма выбару ў складаных умовах акупіраванай тэрыторыі і партызанскай барацьбы народа супраць фашыстаў. Не менш востра паказаў пісьменнік і падзеі калектывізацыі, да якіх упершыню звярнуўся менавіта ў гэтай аповесці. Пераасэнсаванне мінулага стала галоўным напрамкам, па якім рухалася думка пісьменніка ў 1980-я гады. Гэта тэндэнцыя прасочваецца ў аповесці “Круглянскі мост” і атрымлівае мастацка-вобразнае развіццё ў рамане “Кар'ер” (1985), аповесцях “У тумане” (1988), “Аблава” (1989), “Сцюжа” (1969, 1991). Быкаўскае асэнсаванне экзістэнцыялісцкага паняцця абсурду абумовіла творчасць пісьменніка 1990-х гг. (зборнікі апавяданняў і прыпавесцей “Сцяна”, “Пахаджане”, аповесці “Пакахай мяне, салдацік”, “Балота”, “Труба”, “Ваўчыная яма”).

***Іван Навуменка (1925–2006).***Дэбютаваў апавяданнямі ў 1955 годзе ў часопісе “Маладосць”. Эпічнасць мыслення І. Навуменкі праявілася ў раманнай трылогіі “Сасна пры дарозе” (1962), “Вецер у соснах” (1967), “Сорак трэці” (1970). Выдатнае псіхалагічнае майстэрства пісьменніка назіраецца ў стварэнні вобразаў-персанажаў. Асаблівасці мастацкай формы абумовілі спалучанасць частак трылогіі. Раман “Смутак белых начэй” (1979) стаў своеасаблівым працягам трылогіі. Аўтабіяграфізм многіх твораў – адметная рыса прозы І. Навуменкі: аповесць пра студэнцтва “Бульба” (1964), вобразы герояў-інтэлігентаў ў рамане “Летуценнік” (1983) і аповесці “Асеннія мелодыі” (1987). Тэма драматычнага кахання раскрываецца пісьменнікам ў навелах і аповесцях. Узаемадачыненні дзіцяці і яго роду, дзіцяці і соцыуму, дзіцяці і прыроды знаходзіць адлюстраванне ў аўтабіяграфічнай трылогіі “Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва” (1997).

***Алесь Адамовіч (1927–1994).*** У 1958 годзе з друку выйшла першая кніга Адамовіча, літаратуразнаўчае даследаванне “Шлях да майстэрства: станаўленне мастацкага стылю Кузьмы Чорнага”. У 1959 годзе пабачыў свет зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў “Культура творчасці”. Аўтабіяграфізм – адметная рыса рамана-дылогіі “Вайна над стрэхамі” (1960) і “Сыны ідуць у бой” (1962). Твор адрозніваецца паглыбленым псіхалагізмам і лірызмам, завостранасцю маральнай праблематыкі і філасафічнасцю. “Хатынская аповесць” ўяўляе сабой сінтэз дакументалізма і мастацкасці (1972). Працягам жанрава-стылёвых пошукаў празаіка ў мажах метажанра стала дакументальная кніга А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка “Я з вогненнай вёскі...” (1975). Вобраз вайныпаўстаюць і ў дакументальнай “Блакаднай кнізе” (1982) А. Адамовіча і Д. Граніна. Раман “Карнікі” (1980) дэманструе рэцэпцыю традыцый “плыні свядомасці”. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка накіравана на асэнсаванне антымаральнай з’явы фашызму. Жанр антыутопіі ў прозе А. Адамовіча знайшоў адлюстраванне ў аповесці “Апошняя пастараль” (1986). Актуалізацыя рысаў народнай трагедыі адбываецца ў аповесцях “Венера, або Як я быў прыгоннікам” (1982–1992) і “Нямко” (1993).

***Уладзімір Караткевіч (1930–1984).*** Творчасць У. Караткевіча вызначаецца рамантычнай скіраванасцю, высокай культурай, патрыятычным пафасам і гуманістычным гучаннем. У гэтым – мастацкая непаўторнасць зборнікаў паэзіі “Матчына душа” (1958), “Вячэрнія ветразі” (1960), “Мая Іліяда” (1969), “Быў. Ёсць. Буду.” (1986). У. Караткевіч быў глыбока нацыянальным творцам, выказваючы адмысловую прыхільнасць да фальклору і гістарычных сюжэтаў, якія склалі ідэйна-мастацкую спецыфіку аповесцяў “Дзікае паляванне караля Стаха” (1950, 1958), “Цыганскі кароль” (1958), “Сівая легенда” (1960). Раман “Леаніды не вернуцца да Зямлі” ("Нельга забыць") (1960–1962) – твор інтэлектуальна-псіхалагічны,

Рэпазіторый ВГУ

шматпланавы, эксперыментальны. Раман “Каласы над сярпом тваім” (1962–1964) дэманструе шматпланавасць і маштабнасць эпічнага мыслення аўтара, які па-майстэрску перадае атмасферу і дух эпохі, стварае глыбінную беларускасць твора. Аповесці “Зброя” (1964), “Ладдзя Роспачы”(1964) маюць прытчавы характар. Раман “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” (1965–1966) стаў з’явай не толькі ў беларускай, але і ў еўрапейскай літаратуры. Веліч, краса кахання і прыроды апісаны ў аповесці “Чазенія” (1966). Гісторыка-дэтэктыўны раман “Чорны замак Альшанскі” (1979) заклаў падмурак дэтэктыўнай прозы ў беларускай літаратуры. Значнае месца ў творчай спадчыне У. Караткевіча займае драматургія: п’есы “Кастусь Каліноўскі” (1963), “Званы Віцебска” (1973), “Маці ўрагану” (1982) і інш.

***Ніл Гілевіч (1931–2016).*** Аўтар кніг паэзіі “Песня ў дарогу” (1957), “Прадвесне ідзе па зямлі” (1959), “Неспакой” (1961), “Бальшак” (1965), “Пераховы” (1967), “Лісце трыпутніку” (1968), “А дзе ж тая крынічанька” (1972), “Запаветнае” (1975), “Актавы” (1976), “Як дрэва карэннем” (1986), “Повязь” (1987), “Жыта, сосны і валуны” (1992), “На высокім алтары” (1994), “Ёсць зямля” (1997) і інш. Асноўны змест паэзіі – любоў да роднага краю, асэнсаванне гістарычнага вопыту беларускага народа. У паэтычных творах Н. Гілевіча пераважаюць традыцыйныя формы класічнай паэтыкі, тэмы гістарычнай повязі часоў і пакаленняў, памяці маленства, суровых выпрабаванняў ваенных гадоў. Паэзія Н. Гілевіча вызначаецца жанрава-стылёвай разнастайнасцю: ода, гімн, малітва, элегія, балада, санет, замова, эцюд, казка, байка, эпіграма і інш. Меладычна-песенная аснова паэзіі Н. Гілевіча вынікае са спалучанасці з традыцыямі вуснай народнай творчасці. Псіхалагічная глыбіня ў раскрыцці першага кахання і звязаных з гэтым пачуццём учынкаў героя-падлетка назіраецца ў паэме “Лодачкі” (1998). Н. Гілевічу належыць раман у вершах “Родныя дзеці” (1985), у якім аўтар сцвярджае неабходнасць вярнуць страчаныя сацыяльныя, сямейныя, духоўныя каштоўнасці.

***Іван Пташнікаў (1932–2016).*** Творчая прыхільнасць І. Пташнікава – вясковая тэматыка, веданне паўсядзённага побыту, звычаяў, псіхалогіі вяскоўцаў, здольнасць аўтара грунтоўна і ўсебакова паказаць дыялектыку характараў, праўду рэальных абставін. Свет падлетка стварае пісьменнік ў апавяданнях “Алені”, “Алёшка”, “Бежанка” (1962). Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды. У аповесці “Лонва” (1964) упершыню пачала праяўляцца асаблівая ўвага да ўнутранага стану чалавека, загучаў матыў вайны ў чалавечых лёсах. Тэма вайны займае ў творчасці пісьменніка значнае месца. Трагедыі спаленых разам з людзьмі вёсак (“Тартак” (1967)), барацьба партызанаў супраць акупантаў (“Найдорф” (1976)), антываенны пафас многіх апавяданняў сведчаць пра тое, што вайна ў І. Пташнікава свая, перажытая ў дзяцінстве. Апавяданне “Львы” (1987) – яркае ўвасабленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Репозиторий ВГУ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

**Літаратурны працэс сярэдзіны 1980-х гг. ХХст. – пачатку ХХІ ст.**

Літаратурны працэс сярэдзіны 1980-х гг. ХХст. – пачатку ХХІ ст. быў вызначаны наступнымі эстэтыка-выяўленчымі кірункамі, плынямі, тэндэнцыямі: рэалізм, неарамантызм, авангардызм, імпрэсіянізм, постмадэрнізм і інш. У сучаснай Беларусі актывізуецца літаратурна-выдавецкі працэс. СМІ ў беларускай культурнай прасторы адыгрываюць значную ролю. Творчыя пошукі моладзі атрымліваюць развіццё ў авангардных кірунках. Адметная рыса сучаснага літаратурнага працэсу – у полілінгвістычнасці, сукупнасці традыцый і наватарства.

**Агульныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай паэзіі.**

На развіццё сучаснай паэзіі ў значнай ступені паўплывалі традыцыя філасафізму. Адбываецца інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Актуалізуюцца біблейска-філасофскія і рэлігійна-хрысціянскія матывы (М. Танк, В. Зуёнак, М. Шамякіна, інш.). Мадэрнізацыя паэтычнай свядомасці абумовіла жанравую разнастайнасць беларускай паэзіі. Назіраецца паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай лірыцы (П. Панчанка, В. Зуёнак, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, інш.). Сучасная паэтычная міфатворчасць уяўляе сабой апеляцыю да вобразаў і матываў нацыянальнай беларускай міфалогіі (М. Танк, Р. Барадулін, А. Мінкін, А. Сыс, інш.). Асновай мыслення сучасных паэтаў становіцца прыродацэнтрызм, які выклікае раматызм вершаў на экалагічную тэматыку. Летапісцам чарнобыльскай трагедыі называюць М. Мятліцкага (“Горкі вырай” (1989), “Палескі смутак” (1991), “Бабчын” (1996), “Хойніцкі сшытак” (1999), “Замкнёны дом” (2005)). Багаццем духоўнага зместу вызначаецца лірыка кахання Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Г. Бураўкіна, інш. Лірыка Л. Дранько-Майсюка развіваецца ў кантэксце эстэтыкі імпрэсіянізму (зборнік “Вандроўнік”, 1983). Л.Дранько-Майсюк выступае і як пясняр кахання (цыкл “Вершы для А.”). Сучасная паэзія дэманструе тэндэнцыю да выяўлення розных аспектаў чалавечага быцця: маральнага, сацыяльнага, гістарычнага, рэлігійнага і інш.

***Рыгор Барадулін (1935–2014).*** У ранняй творчасці: кнігі паэзіі «Маладзік над стэпам» (1959), «Рунець, красавацць, наліваццa!» (1961), «Нагбом» (1963), «Неруш» (1966), «Адам і Ева» (1968) – паэт данёс да чытача трываласць асноў народнай маралі і этыкі, пераканаў у таленавітасці беларускага народа, у яго багатай духоўнасці. Творчасць паэта вызначаецца разнастайнасцю жанраў, вобразна-стылявых сродкаў, яркай метафарычнасцю, тонкім псіхалагізмам, багаццем моўнай палітры. Яго паэтычны голас гучыць самабытна сярод творцаў “новай хвалі”. У яго творах адкрываецца жывая крыніца хараства мовы і мудрасці народа, яго традыцый і звычаяў, своеасаблівай натурфіласофіі. Многія вобразы ранняй лірыкі нярэдка маюць працяг у пазнейшых творах: кнігі “Рум” (1974), “Абсяг” (1978), “Вечалле” (1980), “Амплітуда смеласці” (1983), “Маўчанне перуна” (1986), “Самота паломніцтва” (1990), “Міласэрнасць плахі” (1992), “Евангелле ад Мамы” (1995), “Босая зорка” (2001) і інш. У апошніх кнігах узмацняецца гучанне біблейскіх матываў. Паэт нярэдка звяртаецца да жанру малітвы. У 2005 годзе выйшаў зборнік малітоўнай паэзіі “Ксты”. Зборнік “Руны Перуновы” (2006), у які ўвайшла выбраная лірыка, таксама насычаны духоўнымі вершамі.

***Янка Сіпакоў (1936–2011).*** Ранняя паэзія Я. Сіпакова вызначаецца прастатой і ўзвышанасцю: “Сонечны дождж” (1960), “Лірычны вырай” (1965), “Дзень” (1968), “З вясны ў лета” (1972), “Вочы ў вочы” (1978, выбранае), “Усміхніся мне” (1984). Вялізнае месца ў творчай спадчыне паэта займае паэзія кахання, пейзажная лірыка. Наватарскі характар набыла кніга “Веча славянскіх балад” (1973). Паглыбленне філасофскага зместу характарызуе прозу Я. Сіпакова: цыкл апавяданняў “Жанчына сярод мужчын” (1980).

Репозиторий ВГУ

Трэбы адзначыць інтэлектуалізацыю прозы пісьменніка: кнігі “Крыло цішыні” (1976), “Усе мы з хат” (1982), “Спадзяванне на радасць” (1983), “Пяць струн” (1984), “Сад людзей” (1985), “Журба ўстылі рэтра” (1990), “Тыя, што ідуць” (1993), фантастычная аповесць “Блуканні па іншасвеце” (1994) і інш. Ідэйна-жанравыя пошукі пісьменніка адбіліся ў прыпавесцевасці яго твораў, якія маюць філасофска-канцэптуальную аснову. Адметнасцю стылю пісьменніка сталі павышэнне суб’ектывізму, выкарыстанне алегорый, сімволікі, настраёвы, пачуццёвы характар прозы.

***Раіса Баравікова (1947).*** У творчасці паэта дамінуе тэма кахання, прага высокага духоўнага ідэалу, роздум пра час, абавязак перад сваім народам, долю жанчыны, пошук чалавечага шчасця: “Рамонкавы бераг” (1974), “Слухаю сэрца” (1978), “Такое кароткае лета” (1981), “Адгукнуся голасам жалейкі” (1984), “Каханне” (1987), “Пад небам першага спаткання” (1990), “Люстэрка для самотнай” (1992), “Сад на капялюшыку каханай” (1998). Стылю Р. Баравіковай уласцівы экспрэсіўнасць вобразна-выяўленчых сродкаў, філасофская рэфлексія, медытатыўны роздум, ускладненасць пачуццяў, спасціжэнне сутнасці жыцця, чалавечага шчасця, зямнога існавання. Зварот да вобразаў мінулага назіраецца ў творах “Партрэт жонкі Станіслава Ксаверыя Прушынскага XVIII стагоддзя”, “Кастусь Каліноўскі”, “Саламея”, “Барбара Радзівіл”, інш. Драматургічнае майстэрства Р. Баравіковай праявілася ў паэме “Барбара Радзівіл” (1992). Творчыя пошукі Р. Баравіковай адбываюцца і ў прозе: аповесць “Кватарантка” (1980), кніга “Вячэра манекенаў” (2002) і інш.

***Алесь Разанаў (1947).*** У першым зборніку “Адраджэнне” (1970) пераважалі імклівыя рытмы, рамантычная ўзнёсласць, ускладненая метафарычнасць. У наступным зборніку “Назаўжды” (1974) навідавоку яго пошукавы характар, схільнасць да паэтычнага эксперыменту, павышаная ўвага да філасофскіх праблем. З гэтага часу з імем Алеся Разанава звязваецца ўяўленне аб інтэлектуальнай плыні ў беларускай паэзіі. Аўтарскі жанр “пункціраў” уяўляе сабой варыянт філасофскай лірыкі. У гэтым жанры праявіліся асаблівасці асацыятыўна-вобразнага пісьма і адцягнена-філасофская змястоўнасць верша. Наватарскія памкненні паэта ў сферы зместу і формы выявіліся ў кнізе паэм-балад “Каардынаты быцця” (1976) і этапным зборніку “Шлях – 360” (1981). А. Разанаў імкнуўся да складанай вобразатворчасці, алегарычнага і сімвалічнага адлюстравання рэчаіснасці, што пакідала ўражанне нейкага тайнапісу, не заўсёды зразумелага падтэксту. Зборнікі “Вастрыё стралы” (1988) і “Паляванне ў райскай даліне” (1995) сталі працягам інтэлектуальна-філасофскіх і творча-эстэтычных пошукаў паэта. Версэты – яшчэ адзін аўтарскі жанр філасофскай лірыкі са сваімі стылёвымі прыкметамі. Працяг паэтычнага аповеду пра жыццё рэчаў у нацыянальнай гісторыі беларусаў адбыўся ў зборніку “У горадзе валадарыць Рагвалод” (1992). Зборнікі “Рэчаіснасць” (1998) і “Гановерскія пункціры” (2002) адлюстравалі развіццё пошукаў паэта ў новай літаратурнай сітуацыі.

***Яўгенія Янішчыц (1948–1988).*** З самага першага зборніка “Снежныя грамніцы” (1970) тэма роднага краю становіцца візіткай паэзіі Яўгеніі Янішчыц. Далейшая творчая эвалюцыя паэтэсы знайшла адлюстраванне ў кнігах “Дзень вечаровы” (1974), “Ясельда” (1978), “На беразе пляча” (1980), “Пара любові і жалю” (1983), “Каліна зімы” (1987). Кнігамі творчай спадчыны паэтэсы сталі “У шуме жытняга святла” (1988) і “Выбранае” (2000). Вясковы свет успрымаецца лірычнай гераіняй як сфера ідэальнага, прыгожага, гарманічнага быцця. Вобраз маці асэнсоўваецца як апірышча духоўнага свету. Музычна-песенная прасодыя вершў Я. Янішчыц абумоўлена зваротам да народнай культуры, арганічным выкарыстаннем фальклору сваёй мясцовасці, палескай дыялектнай лексікі, імёнаў, тапонімаў. Спалучэнне сілаба-танічнага верша і рыфмаванай прозы назіраецца ў паэме “Ягадны Хутар”. Лірыка-драматычны пачатак, эмацыянальная экспрэсія і псіхааналіз спалучаецца ў паэмах “Акно ў дождж” і

Рэпазіторый ВДУ

“Прызнанне вачамі”. Я. Янішчыц – аўтар літаратурна-крытычных артыкулаў і рэцэнзій. Яна перакладала мастацкія творы на беларускую мову з рускай і ўкраінскай.

**Асноўныя тэндцыі развіцця сучаснай беларускай прозы.**

Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей – адметныя рысы беларускай прозы 1980–1990-х гг. Значныя мастацкія набыткі назіраюцца ў жанрах рамана, аповесці і апавядання. Трэба адзначыць разнастайнасць тэматыкі і праблематыкі сучаснай прозы: лёс беларускага народа ў ХХ ст. (раман В. Карамазава “Бежанцы”); трагедыйнае адлюстраванне даваеннага часу (аповесць В. Быкава “Аблава”); чарнобыльская тэма (І.Пташнікаў “Львы”, І. Шамякін “Злая зорка”, В. Карамазаў “Краем Белага шляху”); паказ пасляваеннага жыцця (раман Г. Далідовіча “Заходнікі”). Новыя падыходы з’яўляюцца ў мастацкім асэнсаванні ваеннага мінулага. Трагічная праўда часу адлюстравана ў творах другой паловы 1980–1990-х гг. (А. Адамовіч, В. Быкаў, І. Шамякін, І. Чыгрынаў і інш.). З’яўляюцца творы, напісаныя на мемуарным матэрыяле, звязаныя з рэпрэсіямі, парушэннем законнасці: Я. Бяганская, Л. Геніюш, С. Грахоўскі, П. Крэнь, Б. Мікуліч, П. Пруднікаў. Сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы ўзнімаюцца ў прозе пра беларускую вёску (А. Жук, В. Казько, А. Федарэнка і інш.). Падзеі і вобразы беларускай гісторыі паўстаюць у празаічных творах сучасных пісьменнікаў (І. Шамякін, В. Іпатава, Г. Далідовіч, К. Тарасаў, У. Арлоў, В. Чаропка, А. Наварыч).

***Іван Шамякін (1921–2004).*** Раман “Глыбокая плынь” (1949) атрымаў папулярнасць і высокую грамадскую ацэнку. Наватарства пісьменніка праявілася ў распрацоўцы партызанскай тэмы. У рамане “У добры час” (1952) адлюстраваны першыя гады мірнага жыцця. Надзённасць, актуальнасць пастаўленых праблем, асэнсаванне складаных грамадскіх працэсаў – адметныя рысы рамана “Крыніцы” (1956). Сюжэтна-кампазіцыйным наватарствам, імкненнем да метажанра характарызуецца пабудова пенталогіі “Трывожнае шчасце”, якая ўключае цыкл аповесцей “Непаўторная вясна” (1957), “Начныя зарніцы” (1958), “Агонь і снег” (1959), “Пошукі сустрэчы” (1959) і “Мост” (1965). Аўтабіяграфічнасць твораў абумовіла лірычную плынь аповеду ў “Трывожным шчасці”. І.Шамякін – адзін з лепшых у беларускай літаратуры майстроў паказу жаночых характараў. Складанасць чалавечых узаемаадносінаў паказаў пісьменнік у аповесці “Ах, Міхаліна, Міхаліна” (1966). Тэма “жанчына і вайна” узнімаецца ў аповесцях “Шлюбная ноч” (1974), “Гандлярка і паэт” (1975), рамане “Зеніт” (1987) і інш. Асэнсаванне пісьменнікам вострых маральна-этычных праблем і агульнафіласофскіх пытанняў чалавечага быцця знайшло ўвасабленне ў сацыяльна-этычнай сутнасці канфлікту раманў “Сэрца на далоні” (1963), “Снежныя зімы” (1968), “Атланты і карыятыды” (1974). Катэгорыя памяці, праблема злачынства і даравання асэнсоўваюцца ў рамане “Вазьму твой боль” (1979). Аповесць “Драма” (1988) стала мастацкім дакументам часу перабудовы. Мастацкае пераасэнсаванне савецкай гісторыі адбываецца ў аповесці “Ахвяры” (1990). І. Шамякін напісаў першы раман пра Чарнобыль у беларускай літаратуры – “Злая зорка” (1991). Працягам асэнсавання трагічных падзей стала аповесць “Зона павышанай радыяцыі” (1997). Адлюстраванне разнастайных бакоў сучаснага жыцця і завостранасць маральна-этычнай праблематыкі назіраюцца ў аповесцях “Сатанінскі тур” (1993), “Падзенне” (1994), “Без пакаяння” (1995), “Палеская мадонна” (1996), “Крывінка” (1995), “Завіхрэнне” (1998), “У засені палаца” (2000) і інш. У гэтых творах відавочна набліжэнне аўтарскай трактоўкі свету да антыутопіі і літаратуры абсурду. Аднак рэалізм застаецца вызначальным творчым метадам І. Шамякіна.

**Іван Чыгрынаў *(1934–1996).*** Апавяданні І. Чыгрынава са зборнікаў “Птушкі ляцяць на волю” (1965), “Самы шчаслівы чалавек” (1967), “Ішоў на вайну чалавек” (1973) дэманструюць спецыфіку жанру апавяданняў-вандровак, апавяданняў-

Репозиторий ВГУ

даследаванняў. Дакументалізм становіцца адной з прыкмет “малой прозы” І. Чыгрынава. Пісьменнік найбольш вядомы як аўтар пенталогіі раманаў: “Плач перапёлкі” (1972), “Апраўданне крыві” (1977), “Свае і чужыя” (1984), “Вяртанне да віны” (1992), “Не ўсе мы згінем” (1996). Мастацкая канцэпцыя пенталогіі пра вайну – увасабленне “ўсенароднай вайны”, трагедыі чалавецтва, праблемы адказнасці і віны, тэмы болю і памяці.

***Віктар Казько (1940).*** Віктар Казько – прадстаўнік “міфалагічнага рэалізму” ў беларускай літаратуры. Пісьменніка спасціг трагічны лёс “дзяцей вайны”. Мастацкае адлюстраванне біяграфія В. Казько знайшла ў аповесцях “Высакосны год” (1972), “Добры дзень і бывай” (1974), “Суд у Слабадзе” (1978). Раман “Неруш” (1981) уздымае праблемы экалогіі прыроды, гэтая ж тэма гучыць у аповесці “Цвіце на Палессі груша” (1978). Межы рэалістычнага светабачання пашыраюцца ў рамане “Хроніка дзіцячага саду” (1986). Асноўны матыў рамана – сімволіка Саду як зямнога раю. Драматызацыя і парабалізацыя жанру аповесці, паглыбленне філасафізму адбываецца ў творах “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел” (1993), “Но Пасаран” (1993), “Прахожы” (1995), “Да сустрэчы...” (1997) і інш. Засваенне сэнсу экзістэнцыяльнай катэгорыі абсурду ў дачыненні да сучаснай беларускай гісторыі становіцца асновай рамана “Бунт незапатрабаванага праху” і аповесці “Час збіраць косці” (2005).

**Агульныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай драматургіі.**

У драматургіі канца XX – пачатку XXI ст. назіраецца зварот да вопыту тэатра і драмы абсурду: А. Дзялендзік, Г. Багданава, І. Сідарук і інш. У сучаснай драматургіі развіваецца тэндэнцыя да гістарычнай рэтраспекцыі (І. Чыгрынаў, А. Петрашкевіч, А. Дудараў, Р. Баравікова, інш.). Разнастайныя спосабы стварэння сатырычнага і гумарыстычнага выкарыстоўваюцца ў камедыях Г. Марчука, У. Сауліча і інш. Сацыяльна-маральная завостранасць канфлікту – адметная рыса п’ес М. Матукоўскага.

***Аляксей Дудараў (1950).*** Ранняй творчасці А. Дударава ўласцівыя пошукі свайго стылю ў драматургіі і прозе (зборнік апавяданняў “Святая птушка” (1979)). У творах А. Дударава з’яўляюцца вобразы герояў-“дзівакоў” як носьбітаў беларускіх уяўленняў пра мараль (павышаная чуласць, ранімасць, арыентацыя на высокае і прыгожае ў жыцці, вонкавая прасцякаватасць). Праблема духоўнасці ў бездухоўным свеце ўзнімаецца у п’есах “Выбар” (1979) і “Апошні ўзлёт” (1982). Актуальнасць маральна-этычнай праблематыкі, яскравыя людскія тыпы знайшлі ўвасабленне ў п’есе “Вечар”; канфлікт асобы і асяроддзя – у п’есе “Парог” (1981). П’еса “Радавыя” (1984) вылучаецца ідэйна-вобразнымі асаблівасцямі у кантэксце беларускай і рускай ваеннай літаратуры. Рэальнае і фантастычнае спалучаецца ў драме “Адцуранне” (1994), у ёй раскрываецца трагізм Чарнобыля. Засваенне драматургічнага вопыту майстроў сімвалістычнай трагедыі (сімволіка, умоўнасць, фантасмагорыя, “кніжнасць”), а таксама зварот да нацыянальнай гісторыі назіраюцца ў п’есах “Купала” (“Князь Вітаўт”, 1994), “Палачанка” (1998), “Чорная панна Нясвіжа” (1998), “Крыж” (2000) і інш.

**Літаратура**

Мастацкія творы для абавязковага вывучэння

1. *М. Танк:* зборнікі: “На этапах”, “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай”, “Каб ведалі”, “На камні, жалезе і золаце”, “У дарозе”, “След бліскавіцы”, “Мой хлеб надзённы”, “Глыток вады”, “Хай будзе святло”, “Дарога, закалыханая жытам”, “Прайсці праз вернасць”, “За маім сталом”, “Дарога і хлеб”, “Мой каўчэг”, “Errata”; паэма “Люцыян Таполя”
2. *П. Броўка:* “Голас сэрца”.
3. *А. Куляшоў:* “Сцяг брыгады”, “Новая кніга”; паэмы “Цунамі”, “Далека да акіяна”, “Варшаўскі шлях “, “Хамуціус”.

Рэпазіторый ВДУ

4. *Я. Брыль:*“У Забалоцці днее”, “На Быстранцы”, “Птушкі і гнёзды”, “Ніжнія Байдуны”.
5. *П. Панчанка:*зборнікі “Дарога вайны” і “Далёкія станцыі”, “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Высокі бераг”.
6. *І. Мележ:* “Палеская хроніка”, “Мінскі напрамак”.
7. *А. Макаёнак:* “Выбачайце, калі ласка!”, “Каб людзі не журыліся”, “Лявоніха на арбіце”.
8. *М. Стральцоў:*“Адзін лапаць, адзін чунь”, “Падарожжа за горад”.
9. *В. Быкаў:* “Жураўліны крык”, “Альпійская балада”, “Сотнікаў”, “Абеліск”, “Знак бяды”, “Кар’ер”, “У тумане”, “Аблава”, “Сцюжа”.
10. *І. Навуменка:* “Сасна пры дарозе” (1962), “Вецер у соснах” (1967), “Сорак трэці”, “Смутак белых начэй”, “Бульба”, “Летуценнік”, “Асеннія мелодыі”, “Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва”.
11. *А. Адамовіч:*“Вайна над стрэхамі”, “Сыны ідуць у бой”, “Хатынская аповесць”, “Я – з вогненнай вёскі...”, “Карнікі”, “Апошняя пастараль”, “Венера, або Як я быў прыгоннікам”, “Нямко”.
12. *У. Караткевіч:* “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Цыганскі кароль”, “Сівая легенда”, “Каласы пад сярпом тваім”, “Леаніды не вернуцца да Зямлі” (“Нельга забыць”), “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”.
13. *Н. Гілевіч:* зборнікі “Песня ў дарогу”, “Прадвесне ідзе па зямлі”, “Неспакой”, “Бальшак”, “Перазовы”, “Лісце трыпутніку”, “А дзе ж тая крынічанька”, “Запаветнае”, “Актавы”, “Як дрэва карэннем”, “Повязь”, “Жыта, сосны і валуны”, “На высокім алтары”, “Ёсць зямля”; раман у вершах “Родныя дзеці”.
14. *А. Вярцінскі:* зборнікі “Тры цішыні”, “Чалавечы знак”, “З'яўленне”, “Час першых зорак”, “Ветрана”, “Хлопчык глядзіць...” (1992).
15. *І. Пташнікаў:* “Алені”, “Алёшка”, “Бежанка”, “Лонва”, “Тартак”, “Мсціжы”, “Найдорф”, “Алімпіяда”, “Львы”.
16. *В. Адамчык:* “Чужая бацькаўшчына”, “Год нулявы”, “І скажа той, хто народзіцца”, “Голас крыві брата твайго”, “Падарожжа на Буцафале”.
17. *Р. Барадулін:* зборнікі: “Маладзік над стэпам”, “Рунець, красаваць, наліваццa!”, “Нагбом”, “Неруш”, “Адам і Ева”, “Рум”, “Абсяг”, “Вечалле”, “Амплітуда смеласці”, “Маўчанне перуна”, “Самота паломніцтва”, “Міласэрнасць плахі”, “Евангелле ад Мамы”, “Босая зорка”, “Ксты”.
18. *Я. Сіпакоў:* зборнікі “Сонечны дождж”, “Лірычны вырай”, “Дзень”, “З вясны ў лета”, “Вочы ў вочы”, “Усміхніся мне”, кніга “Веча славянскіх балад”; зборнікі апавяданняў “Жанчына сярод мужчын”, “Усе мы з хат”, “Пяць струн”, “Журба ў стыле рэтра”, “Тыя, што ідуць”; паэмы ў прозе “Ахвярны двор”, “Одзіум”.
19. *А. Разанаў:* зборнікі “Адраджэнне”, “Назаўжды”, “Каардынаты быцця”, “Шлях – 360”, “Вастрыё стралы”, “Рэчаіснасць”, “Гановерскія пункціры”; паэмы “Гліна”, “Камень”, “Жалеза”.
20. *Я. Янішчыц:* зборнікі “Ясельда”, “Дзень вечаровы”, “На беразе пляча”, “Пара любові і жалю”; паэмныя творы “Ягадны хутар”, “Зорная паэма”, “Акно ў дождж”, “Прызнанне вачамі”.
21. *Р. Баравікова:* зборнікі “Рамонкавы бераг”, “Слухаю сэрца”, “Такое кароткае лета”, “Адгукнуся голасам жалейкі”, “Каханне”, “Пад небам першага спаткання”, “Люстэрка для самотнай”, “Сад на капялюшыку каханай”; паэма “Барбара Радзівіл”; п’еса “Пятля часу”; аповесць “Кватарантка”.
22. *Л. Драньbig-Майсюк:* зборнік “Вандроўнік”; цыкл “Вершы для А.”.
23. *М. Мятліцкі:* зборнікі “Горкі вырай”, “Палескі смутак”, “Бабчын”, “Хойніцкі сшытак”, “Замкнёны дом”.

Репозиторий ВГУ

24. *І. Шамякін:* “Глыбокая плынь”, “У добры час”, “Крыніцы”, “Трывожнае шчасце” (пенталогія), “Ах, Міхаліна, Міхаліна”, “Шлюбная ноч”, “Гандлярка і паэт”, “Сэрца на далоні”, “Атланты і карыятыды”, “Вазьму твой боль”, “Сатанінскі тур”, “Падзенне”, “Без пакаяння”, “Палеская мадонна”, “Крывінка”, “Завіхрэнне”, “У засені палаца”, “Paradis auf erden”, “Вернісаж”, “Адна на падмостках”, “Пошукі прытулку”, “Злая зорка”.
25. *А. Жук:* “Праклятая любоў”, “Халодная птушка”.
26. *В. Казько:* “Высакосны год”, “Добры дзень і бывай”, “Суд у Слабадзе”, “Цвіце на Палессі груша”, “Неруш”, “Хроніка дзіцячага саду”, “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”, “Прахожы”, “Но Пасаран”, “Да сустрэчы...”, “Бунт незапатрабаванага праху”, “Час збіраць косці”.
27. *А. Дудараў:* зборнік “Святая птушка”; п’есы “Выбар”, “Вечар”, “Парог”, “Радавыя”, “Злом”, “Адцуранне”, “Купала”, “Палачанка”, “Чорная панна Нясвіжа”, “Крыж”.
28. *І. Чыгрынаў:* зборнікі “Птушкі ляцяць на волю”, “Самы шчаслівы чалавек”, “Ішоў на вайну чалавек”; раманы “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”, “Вяртанне да віны”, “Не усе мы згінем”; п’есы “Звон – не малітва”, “Следчая справа Вашчылы”, “Чалавек з мядзведжым тварам”, “Ігракі”, “Осцей – Альгердаў унук”.
29. *М. Матукоўскі:* п’есы “Мудрамер”, “Бездань”, “Калізей”.

Асноўная літаратура


1. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына. – Мінск, 2006.
2. Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / рэдкал. І.Э. Багдановіч і інш. – Мінск: Энцыклапедыкс, 1992 – 1995.
3. Бельскі, А. Беларуская літаратура XX стагоддзя: Гісторыя і сучаснасць / А. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2005.
4. Бельскі, А. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80 – 90-я гг.) / А. Бельскі. – Мінск: Нар. асвета, 1997.
5. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2000.
6. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / рэдкал. : У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. - Мінск: Беларуская навука,1999 –2003. – 4 т.
7. Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе: 20–50-я гг.: / М.А. Лазарук (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2000.
8. Гісторыя беларускай літаратуры: XX ст. (20-50-я гады): падруч. для студ. філал. спец. ВНУ / М.А. Лазарук, А.А. Семяновіч. – Мінск: Выш. шк., 2000.
9. Кавалюк, А.С. Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XX ст.: вучэб.-метад. дапам. для студ. IV-V курсаў філалагічнага факультэта гуманітарных і педагагічных спец. стацыянара і АЗН, факультэта замежных моў: у 3 ч. / А.С. Кавалюк. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2009.
10. Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура XX ст.: вучэб. дапам. / М.І. Мішчанчук, І.С. Шпакоўскі. – Мінск: Вышэйшая школа, 2001.


Дадатковая літаратура


1. Арочка, М.М. На парозе 90-х: літаратурны агляд / М.М. Арочка, П.К. Дзюбайла, С.С. Лаўшук. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993.
2. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск: Беларуская навука, 2001.


Репозиторий БрГУ

3. Бельскі, А. Галасы і вобразы: літ.-крыт. артыкулы / А. Бельскі. – Мінск: Литература и Искусство, 2008.
4. Бугаёў, Д. Служэнне Беларусі: прабл. арт., літ. партр., эсэ, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 2003.
5. Васючэнка, П.В. Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм / П.В. Васючэнка. – Мінск, 2004.
6. Гніламёдаў, У.В. Ад даўніны да сучаснасці : нарыс пра беларускую паэзію / У.В. Гніламёдаў – Мінск: Маст. літ., 2001.
7. Мікуліч, М. Максім Танк і сучасная беларуская лірыка / М. Мікуліч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994.
8. Мішчанчук, М. Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі / М. Мішчанчук. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992.
9. Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-эстэтычнага пошуку /навук. рэд. В.М. Стральцова [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2008.

Репозиторий ВГУ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## Мэты і задачы вывучэння беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

Падчас вывучэння беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца рэалізацыя мэтаў, акрэсленых Законамі Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" і "Аб агульнай сярэдняй адукацыі", адукацыйным стандартам "Агульная сярэдняя адукацыя. Асноўныя нарматывы і патрабаванні", адукацыйным стандартам вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура" (I-XI класы), канцэпцыяй вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура". Мэта вывучэння беларускай літаратуры – далучыць вучняў да набыткаў айчыннай мастацкай славеснасці (у кантэксце сусветнай), развіць іх здольнасці да эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі з'яў літаратуры; фарміраванне на гэтай падставе эстэтычных густаў, інтарэсаў, грамадзянскай, духоўна-маральнай, камунікатыўнай культуры вучняў. Дасягненне акрэсленай мэты звязана з вырашэннем наступных задач: азнаямленне вучняў з асаблівасцямі літаратуры як віду мастацтва; развіццё дыферэнцыраванага ўспрымання літаратурных твораў у залежнасці ад іх мастацка-эстэтычнай спецыфікі і жанрава-стылёвай своеасаблівасці; фарміраванне асноўных ведаў, уменняў і навыкаў аналізу і ацэнкі літаратурных твораў; фарміраванне ў вучняў ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць самастойнае засваенне мастацка-эстэтычных, духоўна-маральных каштоўнасцей; сістэматызацыя ведаў пра літаратуру як цэласнасць, прадстаўленую ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзейнасці; фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі, развіццё ўяўленняў пра літаратуру як сацыякультурны феномен; развіццё літаратурна-творчых здольнасцей; выпрацоўка навыкаў вуснага (пісьмовага) маўлення.

## Прынцыпы, змест і асноўныя этапы літаратурнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь патрабуюць іх рэалізацыі пры выкладанні літаратуры. У Рэспубліцы Беларусь існуюць канцэпцыя літаратурнай адукацыі, канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура", адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура".

Дыдактычныя і літаратуразнаўчы прынцыпы: навуковасць, гістарызм, сувязь навучання і выхавання, установка на развіццё вучня, аналіз твора ў адзінстве зместу і формы і інш. Метадычныя прынцыпы выкладання літаратуры: узаемадзеянне мастацтва і рэчаіснасці ў эстэтычнай свядомасці школьнікаў, улік узроставых асаблівасцей літаратурнага развіцця вучняў, асобасны характар чытацкай і літаратурна-творчай дзейнасці, сувязь літаратуры з законамі мастацкага мыслення, варыятыўнасць заняткаў па літаратуры, адзінства літаратурнага і моўнага развіцця, вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай.

Мастацкі твор – творчасць пісьменніка – літаратурны працэс – аснова літаратурнай адукацыі школьнікаў. Вучні павінны засвоіць гісторыка-літаратурныя і тэарэтыка-літаратурныя звесткі, элементы літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі.

Кампаненты зместу літаратурнай адукацыі: а) веды; б) уменні і навыкі; в) вопыт творчай дзейнасці; г) маральныя крытэрыі.

Прынцыпы адбору літаратурных твораў: мастацкая дасканаласць, маральна-эстэтычная значнасць, месца ў творчасці пісьменніка і ў гісторыі літаратуры, надзённасць, даступнасць, цікавасць для школьнікаў пэўнага ўзросту.

Рэпазіторый ВДУ

**Этапы літаратурнай адукацыі.**

Структура літаратурнай адукацыі будуецца з улікам узроставай і асобаснай дыферэнцыяцыі.

Прапедэўтычны курс літаратурнага чытання на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі (I–IV кл.) патрабуе пераемнасці дадзенага этапа з дашкольным. Задачы курса: фарміраванне вобразных уяўленняў аб навакольным свеце, далучэнне да нацыянальна-культурнай спадчыны, выпрацоўка элементарных механізмаў работы вучняў з літаратурным тэкстам, развіццё эмоцый і фантазіі вучняў, пашырэнне іх слоўніка.

***II ступень агульнай сярэдняй адукацыі (V–IX класы).*** Беларуская літаратура як самастойны прадмет выступае з V класа. Галоўны аб'ект вывучэння – літаратурны твор, яго жыццёва-пазнавальныя, мастацка-эстэтычныя, каштоўнасна-ацэначныя якасці. Асноўныя задачы навучання літаратуры: фарміраванне ў вучняў здольнасцей разумець своеасаблівасць і мастацкую манеру пісьменніка ў межах асобнага твора; успрымаць літаратуру як від мастацтва, фарміраванне ўяўленняў пра родава-жанравыя, стылёвыя асаблівасці твораў, уменняў вызначаць узаемасувязь і функцыянальнае значэнне кампанентаў твора.

***III ступень агульнай сярэдняй адукацыі (*X–XI класы*)***. Курс літаратуры X-XI класаў завяршае літаратурную адукацыю, пабудаваны на гісторыка-літаратурнай аснове і адлюстроўвае асобныя этапы ў развіцці мастацтва слова. Задачы курса: развіццё канцэптуальнага чытацкага мыслення; вывучэнне канкрэтных твораў і творчасці пісьменнікаў у літаратурным кантэксце.

**Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу па прадмеце**

Дзейнасць настаўніка літаратуры патрабуе прафесійных ведаў і ўменняў: псіхолага-педагагічных, прадметна-навуковых, метадалагічных, агульнакультурных.

Педагагічныя ўменні – валоданне педагогам вызначанымі спосабамі і прыёмамі педагагічнай дзейнасці, якія заснаваны на свядомым прымяненні псіхолага-педагагічных ведаў (А.А. Абдуліна).

***Класіфікацыя педагагічных уменняў, якія вынікаюць з функцый педагога:***

а) агульнапедагагічныя;
– пазнавальныя;
– праекціровачныя;
– канструкцыйныя;
– арганізатарскія;
– камунікатыўныя.

б) спецыяльныя ўменні, што звязаны з выкладаннем літаратуры, заснаваныя на веданні гісторыі і тэорыі літаратуры і валоданні метадамі навуковага даследавання.

***Асобасныя якасці настаўніка:***

– наяўнасць цікавасці да вучняў, умення разумець іх пачуцці, вызначаць іх пазіцыю ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі, камунікабельнасць, кантактнасць, цярплівасць (К.С. Усманаў);

– стрыманасць, ураўнаважанасць, добразычлівасць, ветлівасць, павага да асобы вучня (А.А. Жураўлёў);

– паслядоўнасць, прынцыповасць, такт, самадысцыпліна (У.С. Гронеў);

– дабрыня, любоў да дзяцей, павага да асобы вучня, эмпатыя.

**Літаратурнае развіццё школьнікаў**

Важнейшыя катэгорыі літаратурнага развіцця:

– начытанасць школьнікаў;

Репозиторий ВГУ

– аб’ём тэарэтыка-літаратурных ведаў;

– здольнасць дя выяўлення актуальнай сацыяльна-маральнай праблематыкі;

– развітасць успрымання літаратурных твораў на чатырох узроўнях: эмацыянальная чуйнасць, актыўнасць чытацкага ўяўлення, асэнсаванне зместу твора, мастацкай формы;

– уменні аналізаваць тэкст мастацкага твора;

– здольнасці і ўменні, звязаныя з літаратурна-творчай дзейнасцю школьнікаў (У.Г. Маранцман).

Вывучэнне чытача-школьніка як метадычная праблема (З.Я. Рэз, Н.Д. Малдаўская, У.Г. Маранцман і нш.).

**Этапы развіцця чытача-школьніка**

Пачатковы этап ***(дашкольны і школьны,I-V класы)***. Гэты этап мае вялікае значэнне для далейшай літаратурнай адукацыі школьнікаў. У дашкольным і раннім школьным узросце вылучаюцца пэўныя асаблівасці слухання і чытання літаратурных твораў, спецыфіка ўспрымання мастацкага твора; адбываюцца першыя спробы літаратурнай творчасці.

“Наіўны рэалізм” – характэрны для вучняў ***I–VI класаў*** спосаб успрымання мастацтва і рэчаіснасці, спалучэнне эмацыянальнай цэласнасці і лагічнай фрагментарнасці ў непасрэдным чытацкім успрыманні, цяжкасці спасціжэння мастацкай формы.

***VII–VIII класы*** – інтэнсіўнае развіццё чытацкага ўяўлення і абстрактнага мыслення, паглыбленая ўвага да сваёй асобы. Назіраецца абвостраная ўспрымальнасць старэйшых падлеткаў, якая становіцца ўмовай паглыбленага прачытання мастацкіх твораў.

***Юнацкі ўзрост (IX–XI класы)*** – важны этап у развіцці чалавечай асобы, перыяд асэнсавання гістарычных і эстэтычных сувязей мастацтва з жыццём. На гэтым этапе фарміруецца высокі ўзровень чытацкага ўспрымання, развіваюцца здольнасць абстрагавання і пазнання заканамернасцей акаляючага свету, багацце і асэнсаванасць эмоцый.

**Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры**

Першымі асобамі, якія мелі дачыненне да працэсу адукацыі, сталі выдатныя беларускія асветнікі і мысліцелі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі і інш.

Значную ролю ў развіцці методыкі выкладання літаратуры як навукі адыгралі рускія педагогі і метадысты XIX-XX стагоддзяў: працы Ф.І. Буслаева, В.І. Вадавозава, У.Я. Стаюніна, В.П. Астрагорскага, Ц.П. Балталона і нш.

У XIX – пачатку XX стагоддзя паўстала праблема барацьбы за родную мову і школу на роднай мове: Ф. Багушэвіч, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Янка Купала, Якуб Колас, Алесь Гарун і іншыя адзначалі вялізную беларускай мовы ў жыцці грамадства. Стваральнікамі першых беларускіх чытанак сталі К. Каганец, В. Ластоўскі, Цётка, Якуа Колас і інш.

Узнікненне методыкі выкладання беларускай літаратуры ў школе як навукі адбылося ў перыяд нацыянальнага адраджэння.

- Першыя праграмы па беларускай літаратуры для школ (1924 – 1927), чытанкі, першыя хрэстаматыі і падручнікі.
- Комплексная праграма для 5-7 класаў (1924 г.), чытанка “Родныя шляхі” І. Самковіча і І. Пратасевіча.



Репозиторий ВГУ

- Першы падручнік для сістэматычнага курса па беларускай літаратуры (7 клас) – "Выпісы з беларускай літаратуры XIX-XX стагоддзяў (з далучэннем уводных і крытычных артыкулаў, артыкулаў, літаратурных тэм, пытанняў і заданняў)" У. Дзяржынскага.
- Лабараторная сістэма навучання: "Заданні па беларускай літаратуры для 5, 6, 7 класаў: З практыкі Мінскай цэнтральнай даследчай школы" І.К. Самковіча.
- Роля І.І. Замоціна, В.П. Тэпіна, К.М. Міцкевіча ў развіцці методыкі выкладання беларускай літаратуры.
- "Методыка роднае мовы" К.М. Міцкевіча (Якуб Колас), "Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні" І.І. Замоціна. "Гісторыя беларускае літаратуры" Максіма Гарэцкага.

Перыядычны ***педагагічны друк*** у 20-30-я гады: часопісы "Школа і культура Савецкай Беларусі" (1919, 1921), замест якога ў 1921-1922 гг. выдаваўся "Вестник Народного комиссариата просвещения ССРБ"; "Асвета" (1924), з 1930 – да 1936 г. – "Камуністычнае выхаване", які пад назвай "Народная асвета" выдаецца і цяпер; "Абвеснік Народнага камісарыяту асветы БССР" (1925), "Працаўнік асветы" (1928-1929) – дадатак да газеты "Савецкая Беларусь"; "Наш край", з 1930 г. пад назвай "Савецкая краіна", праіснаваў да студзеня 1933 г., з 1940 г. – "Савецкая школа".

***Асаблівасці выкладання беларускай літаратуры ў школах рэспублікі ў 30-я гады XX стагоддзя.*** Пастанова СНК і ЦК УКП(б) "Аб пачатковай і сярэдняй школе". Карэнная перабудова савецкай школы (1932-1933 гг.). Абавязковае сямігадовае навучанне, адкрыццё сярэдніх дзесяцігадовых школ. Беларуская літаратура як самастойны прадмет у школах розных тыпаў. Падручнікі-хрэстаматыі для 5-10 класаў. Аўтары-складальнікі падручнікаў-хрэстаматый: С. Гапіенка, А. Севярнёва (5 клас), З. Ліхтэрман (6 клас), Р. Блях, А. Ус (7 клас), А. Кучар (8-10 класы).

***Развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры ў 40-80-я гады XX стагоддзя.*** Аўтары-складальнікі падручнікаў-хрэстаматый (40-50-я гг.): І.С. Счасны (5 клас); Н. Вайтковіч (6 клас), А. Александровіч, А.Г. Гарачун (7 клас), М.Ларчанка, С. Васілёнак (8 клас), Л. Баўдзей, А. Кучар (9 клас), Л. Гарачун, Л.Баўдзей, В. Барысенка (10 клас).

Аўтары-складальнікі падручнікаў-хрэстаматый (60-80-я гг.): М.Масальская, А. Пушкарэвіч, Р. Шкраба (4 клас); А.М. Клачко, С.А.Мітраховіч (5 клас); У.М. Вярбіла, М.Б. Барсток (7 клас), Л.Ф. Тамашова, Л.А. Царанкоў (8 клас). Новыя пакаленні хрэстаматый для 8-10 (9-11) класаў.

Аўтары-складальнікі падручнікаў гісторыка-літаратурнага тыпу: В.Барысенка, В. Івашын (8 (9) клас), Н. Перкін, Ю. Пшыркоў (9-10 класы).

Конкурс на стварэнне новых падручнікаў гісторыка-літаратурнага тыпу. Аўтары-пераможцы: В.У. Івашын, М.А. Лазарук (8 (9) клас); Р.В. Шкраба (9-10 і 10-11 класы).

***Педагагічны друк.*** Трэба адзначыць значную ролю педагагічнага друку ў рэфармаванні літаратурнай адукацыі. "Настаўніцкая газета" (1948). Метадычны часопіс "Роднае слова"("Беларуская мова і літаратура ў школе" (1988).

***Метадычная літаратура ў 50-60-я гады.*** "Методыка літаратурнага чытання" (1956) І. Счаснага. Выданні тыпу "Пісьменнік у школе": М. Барсток "Нарыс аб жыцці і творчасці Максіма Багдановіча" (1961); У. Міцкевіч "Максім Танк у школе" (1966); У. Казбярук "Якуб Колас у школе" (1967); С. Сонцаў "Вывучэнне творчасці Янкі Купалы ў школе" (1959); Л. Семяноўская "Міхась Лынькоў у школе" (1963); У. Міцкевіч "Пятрусь Броўка у школе" (1964).

Працы Л.Ф. Тамашовай: "Вывучэнне паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" ў школе", "Вывучэнне трылогіі Якуба Коласа "На ростанях" у школе". Метадычныя



Рэпазіторый БДПУ

дапаможнікі З. Чарвяковай “Метадычныя распрацоўкі па літаратурным чытанні ў 6 класе” (1958); Л. Тамашовай і Л. Царанкова “Вывучэнне беларускай літаратуры ў 8 класе” (1965); Г. Сондак “Вывучэнне беларускай літаратуры XIX ст.” (1963).

Працы настаўнікаў-практыкаў: У. Урбановіч “Па дарагіх мясцінах” (1964), “Шляхамі паэтаў і герояў” (1970); І. Говар “Літаратурныя гульні” (1965); А. Раманоўскі і Л. Раманоўская “Кемлівым і знаходлівым” (1966); І.Рабкоў “Пазакласная работа па беларускай літаратуры” (1967); М. Пашкевіч “З вопыту работы літаратурнага гуртка Сваткоўскай школы Мядзельскага раёна” (1968) і інш.

Кнігі па вывучэнні тэорыі літаратуры ў школе: М. Лазарук “Тэорыя літаратуры ў школе” (1967), А. Макарэвіч “Кароткі слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў” (1968).

***70-80-я гады.*** Метадычныя дапаможнікі настаўніку-славесніку:

− кнігі серыі “Пісьменнік у школе”: У.А. Міцкевіч “Аркадзь Куляшоў у школе” (1979), Р.В. Аляхновіч “Янка Брыль у школе” (1979), В.А. Ляшук “Іван Мележ у школе” (1981);

− выданні, прысвечаныя вывучэнню літаратуры ў пэўным класе: А.У. Рагуля “Беларуская літаратура ў 4 класе” (1980), П.І. Лявонава “Беларуская літаратура ў 5 класе” (1981);

− выданні, прысвечаныя пазакласным заняткам: В.Я. Ляшук, Л.П.Смальянава “Матэрыялы для пазакласнай работы па беларускай літаратуры” (1971), М.Б. Яфімава “Літаратурныя вечары ў школе” (1977), “Гучыць жывое слова” (1983); В.Я. Ляшук “Урокі пазакласнага чытання” (1984);

− кнігі па выкарыстанні краязнаўчага матэрыялу, твораў выяўленчага мастацтва на ўроках літаратуры, развіцці культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў: В.Я. Ляшук “Краязнаўчыя матэрыялы на ўроках літаратуры” (1980); М.Н. Шчыракоў “Творы выяўленчага мастацтва на ўроках літаратуры ў 5-7 класах” (1978); В.І. Смыкоўская “Развіццё мовы вучняў на ўроках літаратуры” (1988); А.А. Каляда “Выразнае чытанне” (1982).

Першыя падручнікі па методыцы выкладання беларускай літаратуры: “Вывучэнне літаратуры: Пытанні методыкі” (1980) пад рэд. В.У. Івашына; “Методыка выкладання беларускай літаратуры” (1986) пад рэд. В.Я. Ляшук і А.У. Рагулі, “Методыка выкладання беларускай літаратуры” пад рэд. ВЯ. Ляшук (1999).

З 1990-х гадоў і па сённяшні час дамінуючым у пошуках і напрацоўках навукоўцаў-метадыстаў ( А.І.Бельскі, В.У. Івашын, М.А. Лазарук, В.Я. Ляшук, П.І. Лявонава, М.І. Мішчанчук, В.І. Смыкоўская, В.І. Русілка, А.В. Руцкая і інш.) з’яўляюцца тэарэтычныя праблемы сучаснай метадычнай навукі.

***Перыядычны друк.*** Часопісы “Народная асвета”, “Адукацыя і выхаванне”, “Беларуская мова і літаратура”, “Роднае слова”. Прычыны і характар рэформы школы, перспектывы ўдасканалення літаратурнай адукацыі школьнікаў.

## Метады і прыёмы навучання літаратуры

Спроба класіфікаваць метады выкладаня літаратуры належыць шматлікім метадыстам: М.І. Новікаў, Ф.І. Буслаеў, У.Я. Стаюнін, В.І. Вадавозаў, М.А. Рыбнікава і інш.

Класіфікацыя метадаў навучання ў методыцы выкладання літаратуры:

− па крыніцах атрымання ведаў (В.В. Галубкоў) – лекцыя настаўніка, гутарка, самастойная работа вучняў;

− па характары пазнавальнай дзейнасці вучняў (М.І.Кудрашоў) – метад творчага чытання, рэпрадуктыўны, эўрыстычны, даследчы;

− сістэма метадаў М.Р. Качурына: чытанне, аналіз, мастацкая інтэрпрэтацыя літаратурнага твора;



Репозиторий ВГУ

− класіфікацыя У.Г. Маранцмана: чытанне, аналіз, каменціраванне, ператварэнне літаратурных твораў у іншыя віды мастацтва, метад літаратурнай творчасці і інш.

Прыём – дэталь метаду, прыватнае паняцце ў адносінах да агульнага паняцця “метад”.

***Прыёмы эмацыянальна-вобразнага спасціжэння літаратурнага твора*** (уласна метадычныя): выразнае чытанне, завучванне на памяць, вуснае славеснае маляванне, розныя віды пераказаў (падрабязны, сціслы, выбарачны, творчы), мізансцэніраванне, складанне кінасцэнарыя, псіхалагічныя эцюды і інш.

***Прыёмы спаціжэння аўтарскай пазіцыі*** (узятыя з арсенала літаратуразнаўства): аналіз эпізоду, сцэны; розныя віды каментарыяў (гістарычны, літаратурны, культуралагічны); выяўленне асаблівасцей кампазіцыі твора, своеадметнасцей стылю пісьменніка, вывучэнне творчай гісторыі твора, супастаўленне дадзенага твора з іншымі творамі пісьменніка, параўнанне твораў розных пісьменнікаў або асобных элементаў мастацкіх тэкстаў, супастаўленне літаратурнага тэксту з творамі іншых відаў мастацтва. Ператварэнне літаратурных твораў у іншыя віды мастацтва.

**Этапы вывучэння мастацкага твора ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі**

Вывучэнне мастацкага твора ў школе – складаны і супярэчлівы працэс, які патрабуе намаганняў з боку настаўніка і вучняў.

***Уступныя занятkі як этап вывучэння мастацкага твора.*** Функцыі ўступных заняткаў: “стварэнне ўстаноўкі” на чытанне; агульная арыентацыя вучняў у памеры і характары будучай працы. Падчас уступных заняткаў выкарыстоўваюцца прыёмы аналізу літаратурнага твора, накіраваныя на ажыўленне асабістых уражанняў школьнікаў з мэтай акрэсліць кола асацыяцый, важных для ўспрымання твора.

Асноўныя метадычныя прыёмы, якія выкарыстоўваюцца ў базавай школе: папярэдняя гутарка, эмацыянальнае слова настаўніка, работа па карціне, сачыненне-мініяцюра, эцюд або эсэ па асабістых уражаннях вучняў.

Метадычныя прыёмы, якія выкарыстоўваюццана заключным этапе школьнай літаратурнай адукацыі: гістарычны, літаратурны, культуралагічны каментарыі, сувязь мастацкага твора з фактамі біяграфіі аўтара, гісторыя стварэння твора і інш.

***Чытанне твора і арыенціровачныя заняткі.*** Пры арганізацыі чытання патрэбна стварыць ўстаноўку на аналіз. Віды чытання: класнае і дамашняе, індывідуальнае і калектыўнае, чытанне па ролях.

Вылучаюць выразнае чытанне настаўніка і вучняў на ўроках літаратуры.

Арыенціровачная гутарка па тэксце праводзіцца з мэтай выяўлення глыбіні і асаблівасцей чытацкага ўспрымання пасля першапачатковага чытання (эмацыянальная рэакцыя, работа ўяўлення, першапачатковае асэнсаванне зместу і мастацкай формы твора).

***Аналіз як этап вывучэння літаратурнага твора.*** Педагагічная канцэпцыя – аснова аналізу мастацкага твора ў школе. Назіраецца ўзаемасувязь літаратуразнаўчага і школьнага аналізу твора. Варыятыўнасць, цэласнасць і праблемнасць – абавязковыя характарыстыкі аналізу літаратурнага твора ў школе. Прадуктыўна выкарыстоўваць спалучэнне агульных, групавых і індывідуальных заданняў вучняў. Значная роля належыць праблемным пытанням і заданням ва ўдасканаленні школьнага аналізу твора. Вылучаюуь аналіз “услед за аўтарам”, “павобразны”, праблемна-тэматычны, комплексны.

Абавязковае патрабаванне – адпаведнасць шляхоў, метадаў і прыёмаў аналізу прыродзе літаратурнага твора, узроставым і індывідуальным асаблівасцям успрымання школьнікаў, родава-жанравай спецыфіцы твора, педагагічным мэтам настаўніка.



Репозиторий ВГУ

***Заключны этап вывучэння літаратурнага твора.*** Асноўныя функцыі заключнага этапа: стварэнне цэласнай канцэпцыі твора, абарона пазіцый, якія склаліся ў працэсе аналізу, адкрыццё перспектыў для далейшага засваення творчай індывідуальнасці пісьменніка. Абагульняючы характар заданняў.

Аб’ём, змест і методыка правядзення заключных заняткаў наII і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі

**Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы**

Узаемасувязь успрымання і аналізу мастацкага твора. Інтэрпрэтацыя літаратурнага тэксту. Залежнасць чытацкага ўспрымання твораў ад іх родава-жанравай спецыфікі. Узроставыя і індывідуальна-тыпалагічныя асаблівасці чытацкага ўспрымання. Спосабы вывучэння чытацкага ўспрымання (анкеціраванне, тэсціраванне і нш.). Узмацненне маральна-эстэтычнага і эмацыянальнага ўздзеяння ўрокаў літаратуры на вучняў як важнейшая задача выкладання літаратуры.Своеасаблівасць метадаў і прыёмаў вывучэння кожнага літаратурнага роду.

**Вывучэнне эпічных твораў**

Асаблівасці ўспрымання і вывучэння эпічных твораў розных жанраў. Спецыфіка вывучэння вялікіх эпічных твораў наII і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

Тры цэнтры ўвагі чытача: падзеі, героі твора, аўтар. Работа над асобнымі кампанентамі мастацкага твора з улікам агульнай аўтарскай канцэпцыі: работа над эпізодам і вобразам-персанажам, сістэмай вобразаў, сюжэтам, вывучэнне кампазацыі, мовы і стылю пісьменніка. Шматграннасць метадаў і прыёмаў аналізу эпічных твораў у сярэдніх і старшах класах: выразнае і каменціраванае чытанне; пераказы; састаўленне плана, характарыстык; высвятленне функцыі пейзажу і інтэр’ера; супастаўленне эпічнага твора з яго сцэнічным увасабленнем і інш.

**Вывучэнне лірычных твораў**

Асаблівасці ўспрымання і аналізу лірычных жанраў. Значэнне агульнага і літаратурнага развіцця школьнікаў у працэсе ўспрымання лірычнага твора. Узроставыя асаблівасці вучняў і школьны аналіз лірыкі.

Рух аўтарскіх пачуццяў і думак у вершы. Аўтар як непасрэдны суб’ект лірычнага перажывання ці ўмоўны лірычны герой; лірычны матыў; вобраз-перажыванне. Кампазіцыя лірычных вершаў. Шматзначнасць паэтычнага слова. Вывучэнне сістэмы вершаскладання, вершаваных памераў, паэтычнай мовы, фонікі. Выкарыстанне іншых відаў мастацтва пры вывучэнні лірыкі.

Месца і роля навучання выразнаму (мастацкаму) чытанню на ўроках лірыкі. Асноўныя прыёмы вывучэння лірыкі: завучванне на памяць, складанне лірычных кампазіцый, ажыўленне асабістых уражанняў вучняў, напісанне сачынянняў і і нш.

Асаблівасці вывучэння лірычных твораў у сярэдніх і старшых класах.

**Вывучэнне драматычных твораў**

Паняцце аб драме як літаратурным родзе і яго жанравых адрозненнях. Жанры драматычных твораў (трагедыя, драма, камедыя). Своеасаблівасць выяўлення аўтарскай пазіцыі пры ўспрыманні драматычнага твора. Актывізацыя дзейнасці ўяўлення. Выяўленне канфлікту ў драме і спосабы стварэння характараў. Шляхі аналізу драматычнага твора. Спецыфічныя элементы аналізу: драматургічны канфлікт, знешняе і ўнутранае дзеянне, развіццё інтрыгі, элементы драматургічнага дзеяння: экспазіцыя, завязка, кульмінацыя, развязка. Маналог, дыялог, мова персанажаў, іх характары.

Прыёмы аналізу драмы: аналітычнае чытанне па ролях, вуснае моўнае маляванне, складанне рэжысёрскага плана, мізансцэніраване, рэжысёрскі каментарый, каментарый пры чытанні п’есы па дзеях, успрыманне праз “дзеючых асоб”, уключэнне момантаў гісторыі сцэнічнага ўвасаблення п’есы, абмеркаванне спектакля і інш.



Репозиторий ВГУ

Выкарыстанне сцэнічнай гісторыі п’есы, нагляднасць і ТСН на ўроках па вывучэнні драмы.

### Урок літаратуры як асноўная форма навучання і выхавання

Урок як асноўная форма арганізацыі навучальнай дзейнасці вучняў. Тэхналогія сучаснага ўрока.

Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры: цэласнасць, праблемнасць, варыятыўнасць, творчы характар, выхаваўчая накіраванасць.

Тэарэтычная праблемы ўрока ў даследаваннях М.І. Махмутава, М.М.Скаткіна, М.А. Данілава, В.І. Стрэзікозіна, Ю.К. Бабанскага, І.Г.Агароднікава і інш. Адлюстраванне праблемы ў працах беларускіх метадыстаў (М.А. Лазарука, В.Я. Ляшук, В.А. Івашына, А. Бельскага, В.І. Русілкі, А.В. Руцкай і інш.).

Класіфікацыя ўрокаў літаратуры ў школе: у залежнасці ад яго месца ў сістэме работы па вывучэнні мастацкага твора (уступныя заняткі, чытанне, урокі аналізу, заключныя ўрокі); ад віду работы: урок-лекцыя, урок-гутарка, урок-экскурсія, урок-дыспут і г.д. (В.В. Галубкоў); ад зместу прадмета: урокі вывучэння мастацкіх твораў, урокі вывучэння гісторыі і тэорыі літаратуры, урокі развіцця мовы (М.І. Кудрашоў). Аналіз асноўных класіфікацый урокаў, іх моцныя і слабыя бакі.

Традыцыйныя і нетрадыцыйныя ўрокі як метадычная праблема. Здабыткі настаўнікаў-эксперыментатараў. Віды нетрадыцыйных урокаў: урок-завочная экскурсія, урок-дыспут, урок-залік, урок-літаратурная гасцёўня, урок-свята, урок-літаратурны суд, урок-прэс-канфереэнцыя і інш.

Мажлівасці выкарыстання чатырохэлементнай (традыцыйнай) і паэтапнай структуры ўрока ў сувязі з неабходнасцю павелічэння творчага пачатку ў засваенні вучнямі новых ведаў, арыентацыяй на шматлікія віды дзейнасці на ўроку і на спалучэнне калектыўнай, групавой і індывідуальнай форм работы.

Падрыхтоўка настаўніка да ўрока літаратуры. Пастаноўка пазнаваўчых задач, матывацыя вывучэння, адбор матэрыялу і паслядоўнасць вывучэння, прымяненне спосабаў і сродкаў, якія дазваляюць дасягнуць вынікаў, забяспечыць кантроль, самакантроль, разуменне, прымяненне ведаў і ўменняў. Інтэграцыя на ўроках літаратуры. Выкарыстанне ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей. Новыя педагагічныя тэхналогіі навучання літаратуры, выкарыстанне актыўных форм навучання.

Класіфікацыя ўрокаў у залежнасці ад **этапаў вывучэння мастацкага твора** і шляхоў яго аналізу (уступныя заняткі (урокі), арыентацыйныя заняткі (урокі), заключныя заняткі (урокі), урокі аналізу (вобраза, праблемы, кампазіцыі, эпізода, раздзела, дзеі).

Класіфікацыя ўрокаў па **жанравай спецыфіцы твора**:

***Урокі вывучэння фальклорных твораў.***

Улік жанравай спецыфікі і адметнасці бытавання фальклорных твораў пры іх вывучэнні. Выкарыстанне займальных формаў працы. Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі пры вывучэнні фальклору. Актывізацыя творчай дзейнасці вучняў як умова эфектыўнага вывучэння вуснай народнай творчасці. Краязнаўчая праца пры вывучэнні фальклору. Адметнасць вывучэння абрадавай і пазаабрадавай паэзіі.

***Урокі вывучэння лірыкі.***

Уплыў жанравай прыроды лірычнага твора на яго вывучэнне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Роля эмацыянальнай падрыхтаванасці, настраёвасці вучняў на ўспрыманне лірыкі. Выразнае чытанне на ўроках гэтага тыпу. Спецыфіка аналізу паэтычнага тэксту, абумоўленая неабходнасцб раскрыць вобраз-перажыванне:

Репозиторий ВГУ

падключэнне да лірычнай сітуацыі, асэнсаванне экспрэсіўнасці слова, выяўленне асацыяцый і інш. Асаблівасці адукацыі. Шляхі аналізу лірычнага твора: па тэмах, матывах, праблемах; аналіз лірычнага твора ў сувязі з пэўным перыядам творчай біяграфіі пісьменніка. Навучанне выразнаму чытанню і завучванне на памяць лірычных твораў.

***Урокі вывучэння эпічных твораў.***

Улік жанравых асаблівасцяў пры аналізе эпасу. Адметнасць вывучэння апавяданняў, аповесцей, твораў вялікай эпічнай формы. Цэласнасць успрымання эпічнага твора як умова эфектыўнага яго вывучання. Арганізацыя дамашняга чытання эпічных твораў вялікай формы. Сістыма ўрокаў па асэнсаванні эпічнага твора, спалучэнне ў ёй асноўных этапаў вывучэння мастацкага твора, шляхоў яго аналізу. Варыянты сістэмы ўрокаў па адным і тым самым творы і іх абумоўленасць навучальна-выхаваўчымі задачамі.

***Урокі вывучэння драматычных твораў.***

Спецыфіка драматычных твораў і яе ўплыў на адметнасць іх вывучэння ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Асэнсаванне літаратурнай і тэатральнай прыроды драмы. “Следам за аўтарам” – адзін з найбольш эфектыўных шляхоў аналізу п’есы, скіраваны на асэнсаванне развіцця канфлікту ў ёй. Спецыфічныя метады і прыёмы працы над драмай: чытанне па ролях, распрацоўка мізансцэн і рэжысёрскага каментарыя, вуснае апісанне дэкарацый, касцюмаў і інш. Выкарыстанне пры вывучэнні драмы фоназапісаў, фотаздымкаў асобых актаў і сцэн спектакляў, тэатральных мемуараў, эскізаў, дэкарацый і інш. Прагляд і абмеркаванне спектакля, фільма па п’есе. Рэцэнзіі вучняў на спектакль. Дзейнасць школьнага драматычнага гуртка і яго ўплыў на ўзровень успрымання п’есы.

***Урокі пазакласнага чытання.*** Асаблівасць і месца ўрокаў пазакласнага чытання ў сістэме літаратурнага навучання. Сувязь урокаў пазакласнага чытання з асноўным курсам літаратуры. Тыпы ўрокаў пазакласнага чытання: уводныя, навучальна-падрыхтоўчыя, паглыблена-аналітычныя, абагульняльныя; іх спецыфіка. Спалучэнне на ўроках пазакласнага чытання метадаў і прыёмаў, формаў і відаў класнай і пазакласнай працы. Планаванне ўрокаў пазакласнага чытання. Варыянты планаў. Асаблівасць падбору твораў для ўрокаў пазакласнага чытання ў базавай і сярэдняй школе.

***Урокі вывучэння аглядавых тэм.*** Месца і адметнасць аглядавых тэм у гісторыка-літаратурным курсе, іх сувязь з манаграфічнымі тэмамі. Этапы вывучэння аглядавай тэмы: характарыстыка эпохі, асвятленне найбольш важных культурных падзей перыяду, раскрыццё асноўных тэндэнцый у развіцці літаратуры, знаёмства з жыццём і творчасцю найбольш значных пісьменнікаў. Шляхі вывучэння жыцця і творчасці пісьменнікаў у аглядавай тэме. Жанрава-тэматычны аналіз і вылучэнне невялікіх манаграфічных тэм, крытычны артыкул, нарыс, водзыў і рэцэнзія на самастойна прачытаную кнігу, прагледжаны спектакль, тэлеперадачу, твор жывапісу, музыкі.

***Урок вывучэння манаграфічных тэм.*** Асаблівасці вывучэння манаграфічнай тэмы. Этапы вывучэння манаграфічнай тэмы: канкрэтызацыя агульных тэндэнцый літаратурнага працэсу пэўнай эпохі на прыкладзе жыцця і творчасці аднаго пісьменніка, знаёмства з біяграфіяй пісьменніка і яго творамі, рэкамендаванымі для вывучэння праграмай. Тэарэтыка-літаратурныя паняцці і крытычныя артыкулы на ўроках вывучэння манаграфічнай тэмы. Два шляху вывучэння манаграфічнай тэмы. Развіццё вопытаў вучэбнай прадметна-творчай дзейнасці пры правядзенні ўрокаў вывучэння манаграфічнай тэмы: напісанне сачыненняў, эсэ, рэцэнзій, рэфератаў і да т.п.



Рэпазіторый ВДУ

***Урокі аналізу сачыненняў.*** Падрыхтоўка настаўніка да ўрока аналізу сачыненняў. Методыка правядзення ўрока аналізу сачыненняў: інфармацыя пра агульнае ўражанне ад сачынення, азнаямленне вучняў (пры неабходнасці) з узорам сачынення, практыкаванні, скіраваныя на фарміраванне ўменняў, якія патрабуюць удасканалення. Асноўныя этапы ў навучанні сачыненню:асэнсаванне тэмы, вызначэнне ідэі, збор і сістэматызацыя матэрыялу, распрацоўка плана, асвятленне пунктаў плана, рэфлекія. Праверка, выпраўленне, ацэнка сачыненняў, навучальна-выхаваўчая яе накіраванасць. Віды памылак у сачыненнях: фактычныя, ідэйныя, у раскрыцці тэмы, у структуры, у мове, у афармленні працы. Заўвагі на палях сшытка і ў тэксце сачынення. Дзве адзнакі за сачыненне. Нормы ацэнак пісьмовых работ. Рэцэнзаванне, узаемарэцэнзаванне, самарэцэнзаваннеі іх роля ў навучанні сачыненням.

**Тыпы ўрокаў у залежнасці ад методыкі іх правядзення. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках літаратуры:**

- урокі-лекцыі
- урокі-гутаркі
- урокі-дэманстрацыі
- урокі інсцэніравання эпічных твораў
- урокі-семінары
- Дальтон-урок
- модульныя ўрокі.

**Тыпы урокаў, у аснове якіх адна з формаў пазакласнай працы:**

- урокі-мантажы
- урокі-канцэрты
- урокі-дыспуты
- урокі-экскурсіі
- урокі гульнёвага характару.

**Нестандартныя урокі:**

- літаратурны суд
- прэс-канферэнцыя
- урок з элементамі інсцэніравання і інш.

## Гісторыя літаратуры ў школьным навучанні

Гістарызм у выкладанні літаратуры прысутнічае на розных этапах курса. Важнае значэнне набывае адзінства гісторыка-літаратурнага і тэарэтыка-літаратурнага падыходу да аналізу літаратурных з’яў.

Характэрныя прыёмы работы: гісторыка-бытавы каментарый, паведамленне звестак гісторыка-літаратурнага характару, звязаных з вывучаемым творам. Праблема мастацкай індывідуальнасці пісьменніка, мастацкай структуры твора як цэнтр увагі ў базавай школе.

Асаблівасці **аглядавых тэм**: уступныя і абагульняючыя тэмы, характарыстыкі пэўнага перыяду грамадска-літаратурнага працэсу, кароткія агляды, гісторыка-літаратурныя агляды і інш.

Задачы вывучэння аглядавых тэм і іх роля ў літаратурнай адукацыі школьнікаў. Тыпы аглядавых тэм. Змест і структура. Кароткі аналіз мастацкіх тэкстаў, звесткі аб развіцці культуры, крытыкі, аб асобных пісьменніках. Спецыфіка аглядавага вывучэння мастацкага твора: лекцыя з элементамі гутаркі, дыялог, выразнае чытанне, каменціраванае чытанне, аналіз асобных эпізодаў мастацкага твора, самастойна падрыхтаваныя выступленні вучняў (даклады і паведамленні), запіс плана і тэзісаў лекцыі, выкарыстанне розных сродкаў нагляднасці: табліц, ілюстрацый, тэхнічных сродкаў.

Репозиторий ВГУ

Вывучэнне **манаграфічнай тэмы.** Разнастайны характар вывучэння мастацкага твора ў рамках манаграфічнай тэмы. Пабудова сістэмы ўрокаў, аб'яднанай адзінай педагагічнай канцэпцыяй. Апераджальныя заданні да ўсёй тэмы. Адбор матэрыялу. Актывізацыя дзейнасці школьнікаў. Выкарыстанне нагляднасці.

Вывучэнне жыцця і творчасці пісьменніка адбываецца менавіта ў межах манаграфічнай тэмы. Вывучэнне мемуараў, пісьмаў, фотаздымкаў, партрэтаў. Прынцыпы вывучэння біяграфіі пісьменніка: сувязь светаўспрымання з грамадскімі падзеямі эпохі, творчая індывідуальнасць пісьменніка, фарміраванне асобасных якасцей вучняў у працэсе вывучэння біяграфіі пісьменніка.

Прыёмы работы: слова пра пісьменніка, каменціраване партрэтаў, фотаздымкаў, экскурсіі ў літаратурны музей, выкарыстанне дадатковай літаратуры (I ступень агульнай сярэдняй адукацыі); лекцыя настаўніка, кінаўрокі, розныя формы нагляднасці, самастойная работа з дакументальнай і мемуарнай літаратурай, літаратурна-краязнаўчая работа (II ступень агульнай сярэдняй адукацыі).

Фарміраванне аналітычных і літаратурна-творчых уменняў у працэсе вывучэння манаграфічнай тэмы.

### Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні

Сістэмна-функцыянальны падыход да вывучэння ў сярэдняй школе тэорыі літаратуры як умова рэальнага засваення тэарэтыка-літаратурных паняццяў. Спалучэнне канцэптуальнай сістэмнасці, устаноўка на выпрацоўку ўласнага пункту гледжання на вобраз, з'яву, на твор і творчасць пісьменніка, на гісторыка-літаратурны працэс эпохі – функцыянальная канкрэтнасць, прызначэнне кожнага элемента. Шматмаштабнасць катэгорыі мастацкага вобраза: мікра-, макра-, мегавобраз; эпітэт, метафара; персанаж; пейзаж; сюжэтны ход; кампазіцыйны прыём; твор і творчасць у цэлым.

Значэнне ведаў па тэорыі літаратуры ў літаратурнай адукацыі вучняў. Сістэма тэарэтыка-літаратурных паняццяў, якія вывучаюцца ў курсе беларускай літаратуры ў базавай школе. Тэорыя літаратуры на заключным этапе ўкольнай літаратурнай адукацыі.

Паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроках літаратуры: ад першапачатковыхназіранняў да ўсведамлення сутнасці паняцця, ад узбагачэння паняцця да свядомага выкарыстання яго ў працэсе аналізу мастацкага твора і выкарыстання ва ўласнай літаратурнай творчасці.

Цэнтральная ўстаноўка – ад засваення катэгорыі мастацкага вобраза да спасціжэння літаратуры як мастацтва слова. Прынцып пераемнасці.

Шляхі спасціжэння вобраза ў сярэдніх класах: у працэсе чытання і аналітычнага абмеркавання твораў розных жанраў; авалоданне тэарэтыка-літаратурнымі ведамі ўнутры канцэптуальных тэм-праблем: літаратура як мастацтва слова; мастацкая літаратура і вусная народная творчасць; літаратурны твор у яго родава-жанравай спецыфіцы.

Сувязь тэорыі літаратуры ў сярэдняй школе з гісторыка-літаратурнымі ўстаноўкамі курса (фарміраванне паняцця аб літаратурных напрамках, мастацкіх метадах і стылях, аб гісторыка-літаратурным працэсе і г.д.). Паглыбленне паняцця аб мастацкім вобразе праз скразныя тэмы-праблемы: гісторыка-літаратурны працэс з яго кірункамі, метадамі і стылямі; эстэтычныя адносіны мастацтва і рэчаіснасці; узаемадзеянне светаўспрымання і творчасці пісьменніка; літаратурна-мастацкая крытыка.

Пераемнасць, этапнасць працэсу фарміравання і прымянення тэарэтыка-літаратурных ведаў вучняў.



Репозиторий ВГУ

Значэнне вывучэння твораў беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай для фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў. Выкарыстанне міжпрадметных сувязей з урокамі рускай і сусветнай літаратуры для фарміравання ведаў і ўменняў па тэорыі літаратуры.

**Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі**

Асноўныя прынцыпы работы па ўзбагачэнні маўлення вучняў: жыццёвыя і літаратурныя ўражанні, сістэматычны характар заняткаў па развіцці маўлення, творчая накіраванасць заданняў і практыкаванняў па ўзбагачэнні маўлення.

Напрамкі работы па развіцці маўлення вучняў: узбагачэнне слоўнікавага запасу, удасканаленне звязнага маўлення, работа над логікай і выразнасцю выказванняў, актывізацыя міжпрадметных узаемадзеянняў у аспекце маўленчай дзейнасці, улік узроставай паслядоўнасці ў авалоданні вучнямі сродкамі моўнай выразнасці праз сістэму спецыяльных заданняў.

Крытэрыі маўленчага развіцця вучняў: валоданне актыўнай лексікай, нормамі літаратурнай мовы, навуковай тэрміналогіяй, сродкамі мастацкай выразнасці мовы; разуменне асаблівасцей віду і жанру выказвання; змястоўнасць, лагічнасць, стройнасць кампазіцыі выказвання, валоданне прыёмамі зносін са слухачамі ў час выступлення; вядзенне дыялогу на літаратурныя тэмы; самастойнасць у падрыхтоўцы выступлення; валоданне асаблівасцямі моўнага стылю ў адпаведнасці з жанрам выказвання і сітуацыяй зносін.

Пераемнасць, узаемазвязанасць развіцця вуснага і пісьмовага маўлення на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі: вусныя выступленні вучняў з выкарыстаннем розных функцыянальных стыляў: выступленне творчага характару: “слова пра пісьменніка”, інтэрв’ю, мастацка-біяграфічнае паведамленне, рэпартаж на літаратурную і мастацтвазнаўчую тэму. Узбагачэнне маналагічнай мовы вучняў, уменне весці дыялог.

Віды вусных выказванняў вучняў пры вывучэнні літаратуры на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі: каментарый тэксту пры чытанні ў класе, пераказы (кароткі, падрабязны, выбарачны), творчы пераказ, вуснае моўнае маляванне, адказ на пытанні ўзнаўляючага характару і на праблемнае пытанне, разгорнутае маналагічнае і інш.

Віды вусных выказванняў вучняў па літаратуры на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі: разважанне, выказванне сваёй думкі, рэпліка ў дыялогу, паведамленне ці даклад на літаратурную тэму, выступленне на семінары, пераказ-аналіз і інш.

Узаемасувязь вуснага і пісьмовага маўлення: складанне плана, тэзісаў, канспекта, запіс асобных палажэнняў будучага выказвання пры навучанні вуснаму адказу, паведамленню, дакладу; вусныя адказы на пытанні, пераказы мастацкага тэксту, дыялогі пры падрыхтоўцы пісьмовага пераказу, сачынення, кінасцэнарыя, работы-мініяцюры.

Віды пісьмовых работ у V-VIIIкласах, методыка іх падрыхтоўкі і правядзення. Пісьмовыя адказы на пытанні; пераказы падрабязныя, сціслыя, выбарачныя, з заменай асобы апавядальніка, ускладненыя граматычнымі заданнямі; пераказы з элементамі сачынення, гэта значыць якія ўключаюць у сябе ўласныя аналітычныя роздумы над тэкстам тыпу невялікіх каментарыяў; сачыненні розных жанраў: сачыненне-мініяцюра, сачыненне па прыказцы, загадцы, па асабістых назіраннях, сачыненне па карціне, на аснове жыццёвых уражанняў, на літаратурным матэрыяле; сачыненні і пераказы з элементамі мастацкай творчасці: характарыстыка героя твора, сачыненне казкі, афарызма, загадкі, апавядання (па ўзоры вывучаных), “дамысліванне” незакончаных гісторый у адпаведнасці з логікай развіцця сюжэта і характараў герояў, мастацкія

Рэпазіторый ВДУ

замалёўкі, сцэнкі, напісанне сцэнарыяў для пастаноўкі (фрагменты) і інш. Навучальныя і кантрольныя пісьмовыя работы.

Віды пісьмовых работ у IX-XIкласах. Пераказы ў сувязі з вывучэннем мастацкага тэксту як форма авалодання асновамі пісьмовай літаратурнай мовы. Сачыненні розных форм – асноўны від пісьмовых работ па літаратуры. Роля сачыненняў у фарміраванні творчай самастойнасці, светапогляду вучняў, у паглыбленым пазнанні літаратурнага твора. Тэматычная класіфікацыя сачыненняў: на літаратурныя тэмы, аб літаратурным героі, аналіз твора ў цэлым, мастацкіх форм, разбор асобных эпізодаў і частак твора, літаратурныя агляды, роздумы аб адносінах літаратуры да жыцця, сачыненні-даследаванні праблемнага характару, супастаўленне твораў, параўнальная характарыстыка; сачыненні па жыццёвых уражаннях, па карціне; аб наведванні музея, аб экскурсіях; водгукі і рэцэнзіі на прачытаныя кнігі, на спектаклі. Жанравая спецыфіка сачыненняў. Патрабаванні да вучнёўскіх сачыненняў: паўната раскрыцця тэмы, граматнасць, валоданне стылямі. Падрыхтоўка да напісання: складанне плана, выбар жанру пісьмовай работы, абмеркаванне і выбар эпіграфаў, падбор тэкставага матэрыялу, фармуліроўка асобных палажэнняў.

Авалоданне жанрамі пісьмовага маўлення (пісьмо, дзённік, успаміны, эсэ і інш.). Аналіз і крытэрыі ацэнкі пісьмовых работ вучняў. Рэцэнзія настаўніка. Работа над памылкамі: класіфікацыя, аналіз, выпраўленне.

**Літаратура**


1. Богданова, О.Ю. Методика преподавания литературы: учебник для студентов вузов, обучающихся по педагогическим специальностям / О.Ю. Богданова, С.А. Леонов, В.Ф. Чертов. – М., 1999.
2. Вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай: зб. артыкулаў / пад. рэд. М.А. Лазарука. – Мн., 1994.
3. Вывучэнне літаратуры: пытанні методыкі / пад рэд. В.У. Івашына. – Мн., 1980.
4. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / пад. аг. рэд. С.І. Цыбульскай. – Мн., 2006.
5. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю / М.А. Лазарук. – Мн., 1996.
6. Лугоўскі, А.І. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэб.-метад. дапам. / А.І. Лугоўскі. – 3-е выд. – Мінск, 2007.
7. Лугоўскі, А.І. Слоўнік студэнта-філолага па методыцы выкладання беларускай літаратуры / А.І. Лугоўскі. – 2-е выд. – Мінск, 2008.
8. Ляшук, В.Я. Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе: гіст.- метад. нарыс (даваенны перыяд) / В.Я. Ляшук – Мінск, 1994.
9. Ляшук, В.Я. Літаратурнае краязнаўства ў школе / В.Я. Ляшук. – Мн., 1991.
10. Методика преподавания литературы: пособие для студентов и преподавателей: В 2 ч. / под ред.: О.Ю. Богдановой, В.Г. Маранцмана. – М., 1995.
11. Методика преподавания литературы: учеб. для студентов пед. вузов / под ред. О.Ю. Богдановой. – М., 1999.
12. Методика преподавания литературы: Учебная хрестоматия-практикум: для студентов высших пед. учеб. заведений / автор-составитель Б.А. Ланин. – 3-е изд., испр. и доп. – М., 2007.
13. Методика преподавания литературы: учебник для студентов пед. институтов / под ред. З.Я. Рез. – 2-е изд., дораб. – М., 1985.
14. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэб. дапам. / Л.В. Асташонак, Г.С. Гарадко, Г.М. Ішчанка [і інш.]; пад рэд. В.Я. Ляшук. – Мінск, 2002.
15. Мішчанчук, М.І. Настаўніку – пра настаўнікаў / М.І. Мішчанчук. – Мн., 1989.


Репозиторий ВГУ

16. Нестандартныя ўрокі па беларускай мове і літаратуры. 5 – 11 класы: дапам для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў / А.М. Евіч [і інш.]. – Мазыр, 2009.
17. Пазакласная праца па беларускай мове і літаратуры: дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў. – Мн., 2007.
18. Рашэтнікава, Н.Б. Практыкум па методыцы выкладання беларускай літаратуры: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў / Н.Б. Рашэтнікава, В.Ю. Дылеўская. – Мінск, 1996.
19. Рашэтнікава, Н.Б. Хрэстаматыя па методыцы выкладання беларускай літаратуры / Н.Б. Рашэтнікава, В.Я. Дылеўская, В.У. Праскаловіч. – Мн., 1999.
20. Руцкая, А. Пазакласная праца па беларускай літаратуры: дапам. для настаўнікаў / А. Руцкая. – Мн., 2000.
21. Руцкая, А.В. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэб. дапам. / А.В. Руцкая, М.У. Грынько. – Мінск, 2010.
22. Урок літаратуры ў школе: кніга для настаўніка // М.А. Лазарук [і інш.]; пад.рэд. М.А. Лазарука, В.У. Івашына. – Мн., 1995.

Репозиторий ВГУ

# ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

### 1 СЕМЕСТР

**Заняткі № 1, 2**
**Літаратура ранняга Сярэднявечча (XI–XIII стст.)**

1. “Біблія” як помнік сусветнай літаратуры, дыдактычнае і эстэтычнае значэнне біблейскіх кніг.
2. Гістарычныя ўмовы фармавання канону.
3. Асноўныя жанры Старога Запавету.
4. Паэтыка Псалтыра.
5. Філасофскі сэнс прытчаў Саламона.
6. Любоўна-лірычны пачатак “Песні несняў”.
7. Структура Новага Запавету.
8. Характарыстыка кананічных евангелляў.
9. Эсхаталагічныя матывы ў “Апакаліпсісе”.
10. Афарыстычнасць біблейскіх выказванняў, іх сімвалічны сэнс.

**Заняткі № 3**
**Жыццёвы шлях і творчая спадчына Кірылы Тураўскага**

1. Жыццё і творчая спадчына тураўскага епіскапа.
2. Ідэйна-тэматычныя і жанрава-стылёвыя асаблівасці яго твораў (пропаведзей, малітваў, канонаў).
3. Жанр прыпавесці ў творчасці Тураўскага (“Пра чалавечую душу і цела”).
4. “Словы” (казанні) К. Тураўскага, іх ідэйна-мастацкія адметнасці.

**Заняткі № 4, 5**
**Жыційная літаратура XI–XIII стст.**

1. Гісторыя ўзнікнення першых жыційных твораў на ўсходнеславянскіх землях.
2. Умоўнасць, дыдактыка, царкоўна-рэлігійная фантастыка ў жыціях.
3. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, ідэйна-мастацкія адметнасці твора.
4. “Жыціе Кірылы Тураўскага”, ідэйна-мастацкія адметнасці твора.
5. “Жыціе Аўраамія Смаленскага”, ідэйна-мастацкія адметнасці твора.
6. “Аповесць пра Мяркурыя Смаленскага”, ідэйна-мастацкія адметнасці твора.

**Заняткі № 6**
**Летапісанне XII–XШ стст.**

1. Роля летапісаў у фармаванні гістарычнай свядомасці грамадства.
2. Асноўныя цэнтры летапісання.
3. Тэорыі А.А. Шахматава, Д.С. Ліхачова пра пачатковы перыяд летапісання на Русі.
4. “Аповесць мінулых гадоў”, ідэйна-мастацкія адметнасці твора.

**Заняткі № 7, 8**
**Мастацкі феномен “Слова пра паход Ігара”**

1. “Слова пра паход Ігара” як феномен усходнеславянскай культуры.
2. Гісторыя адкрыцця і апублікавання твора.

Репозиторий ВГУ

3. Гістарычныя падзеі ў творы.
4. Ідэйны змест і кампазіцыя паэмы.
5. Стылявая адметнасць і жанр помніка.
6. Язычніцкія і хрысціянскія элементы, вобразы славянскай міфалогіі ў творы.
7. Сімволіка і каларыстыка, час і прастора ў "Слове…".
8. Майстэрства беларускіх перакладчыкаў "Слова пра паход Ігара".

**Заняткі № 9**
**Беларуска-літоўскія летапісы XV ст.**

1. Цэнтры летапісання. Дзелавое пісьменства і развіццё летапісання.
2. "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх". Структура і сінкрэтычны характар летапісу.
3. "Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.". Структура і крыніцы помніка, яго рэдакцыі.
4. Час і месца ўзнікнення летапісаў.
5. Гістарычныя факты і мастацкія элементы ў творах.
6. Ідэйная канцэпцыя і жанрава-стылявыя асаблівасці "Пахвалы Вітаўту".

**Заняткі № 10**
**Агульнадзяржаўнае беларуска-літоўскае летапісанне.**
**"Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага". "Хроніка Быхаўца"**

1. Легендарныя паданні пра патрыцыя Палямона, яго сыноў, заснаванне першых літоўскіх гарадоў і замкаў.
2. Паэтычнае паданне пра заснаванне Вільні Гедымінам.
3. Звесткі пра абрады, звычаі і вераванні старажытных ліцвінаў, дзяржаўную сімволіку Вялікага княства Літоўскага.
4. Гістарычныя факты і мастацкія элементы ў творы.
5. Структурныя часткі "Хронікі Быхаўца" і гісторыка-літаратурныя крыніцы твора.
6. Мастацкія асаблівасці падачы падзей.
7. Ваенна-патрыятычная тэматыка (паход Альгерда на Маскву, Грунвальдская бітва і інш.).
8. Міндоўг, Гедымін, Вітаўт, Ягайла ў ацэнцы летапісца.

Рэпазіторый ВДУ

## 2 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1
### Творчасць Мікалая Гусоўскага

1. Рымскі перыяд творчасці паэта-новалацініста: "Шматшаноўнаму [біскупу] Плоцкаму суцяшэнне", "На ахвярапрынашэнне чорнага быка", "Да Боскага Себасцяна", інш.
2. Кракаўскі перыяд творчасці: "Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпені месяцы", "Пра жыццё і подзвігі Святога Гіяцынта".
3. "Песня пра зубра" (1523). Творчая гісторыя паэмы.
4. Жанравыя асаблівасці "Песні пра зубра".
5. Кампазіцыя і паэтыка помніка.
6. Сімвалічнасць вобраза зубра і зубрынага статку.
7. Вайна і мір у паэме.

### Заняткі № 2, 3
### Францыск Скарына – усходнеславянскі першадрукар

1. Жыццё і дзейнасць усходнеславянскага першадрукара.
2. Патрыятычны і грамадзянскі пафас прадмоў Ф. Скарыны.
3. Глыбіня і афарыстычнасць мыслення ў прадмовах.
4. Выяўленне ў прадмовах асветніцкага крэда першадрукара.
5. Асаблівасці мовы выданняў і мастацка-графічнага афармлення.
6. Хрысціянскае асветніцтва Ф. Скарыны, роля антычнай культурнай спадчыны ў фарміраванні яго ідэйных пазіцый.
7. Элементы тэалогіі, філасофіі, правазнаўства, эстэтыкі і этыкі ў прадмовах першадрукара.
8. Паэтычная спадчына асветніка.
9. Прадаўжальнікі справы Скарыны ў Беларусі.

### Заняткі № 4
### Творчасць Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага

1. Сымон Будны, яго філалагічныя, гістарычныя, філасофскія, тэалагічныя погляды.
2. Выданні на старабеларускай мове "Катэхізіса" і трактата "Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам" (1562).
3. Прадмова да "Катэхізіса", ідэйна-мастацкія адметнасці твора.
4. Васіль Цяпінскі. Выданне Евангелля паралельна на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах.
5. Прадмова да Евангелля, ідэйна-мастацкія адметнасці твора.

### Заняткі № 5
### Гісторыка-мемуарная літаратура ў Беларусі XVI–XVII стст.

1. Фёдар Еўлашоўскі. Творчая гісторыя "Успамінаў" Ф. Еўлашоўскага, адлюстраванне ў іх звестак з 1566 да 1604 гг.
2. "Лісты" Філона Кміты-Чарнабыльскага (1530–1587) як узор службовай перапіскі.
3. "Баркулабаўскі летапіс", ідэйна-мастацкія адметнасці твора.

Рэпазіторый ВГУ

**Заняткі № 6**

**Літаратура Барока. Смехавая культура Беларусі ў XVI–XVII стст.**

1. Асаблівасці смехавой культуры ў Беларусі ў XVII ст.
2. “Прамова Мялешкі”, ідэйна-мастацкія асаблівасці твора.
3. “Ліст да Абуховіча”, ідэйна-мастацкія асаблівасці твора.
4. **Творчыя гісторыі твораў, прычыны іх папулярнасці ў XVII – XVIII ст.**
5. **Сатырычны пафас твораў, народна-размоўныя элементы ў мове.**

**Заняткі № 7**

**Творчасць Мялеція Сматрыцкага і Афанасія Філіповіча**

1. Біяграфічныя звесткі пра М. Сматрыцкага.
2. “Трэнас”. Асаблівасці архітэктонікі твора, яго кампазіцыі, стылю, мовы.
3. Біяграфічныя звесткі пра А. Філіповіча.
4. “Дыярыуш”. Асаблівасці архітэктонікі твора, яго паэтыкі, жанравай прыроды і стылю.

**Заняткі № 8**

**Творчасць Сімяона Полацкага**

1. Сімяон Полацкі. Педагагічная і асветніцкая дзейнасць.
2. Вершы на старабеларускай, старапольскай, лацінскай мовах.
3. Вершы-паліндромы, вершы-асіндэтоны, вершы-рэха, акравершы і інш. Сатырычна-дыдактычныя вершы (“На гультая”, “На п’яніцу”, “На грэшніка”, інш.).
4. “Рыфмалагіён”.

Репозиторий ВГУ

## 3 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1
### Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча

1. Адам Міцкевіч і еўрапейскі рамантызм.
2. Санеты. Патрыятычная накіраванасць «Крымскіх санетаў».
3. Паэма "Гражына": праблематыка твора, асноўны канфлікт і яго вырашэнне.
4. Паэма "Конрад Валенрод": праблематыка, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці.
5. Паэма Пан Тадэвуш": праблематыка, патрыятычны пафас твора. Вобразная сістэма, сюжэт. Кампазіцыя, стыль.

### Заняткі № 2
### Творчасць паэтаў-філаматаў

1. Творчасць паэтаў філамацкага асяроддзя. Рамантычны і аптымістычны пафас іх паэзіі.
2. Творчасць Яна Чачота. Яго польскамоўная і беларускамоўная паэзія.
3. Балада як адзін з асноўных жанраў рамантычнай паэзіі філаматаў.
4. Возера Свіцязь у баладах А.Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана: агульнае і адметнае ў сюжэтнай і кампазіцыйнай будове твораў, іх ідэйна-мастацкія асаблівасці.

### Заняткі № 3
### Творчасць Яна Баршчэўскага

1. Гісторыя напісання і аўтабіяграфічнасць твораў Я. Баршчэўскага.
2. Праблематыка кнігі «Шляхціц Завальня». Міфалагічная аснова.
3. Кампазіцыйныя, жанравыя і стылёвыя асблівасці кнігі «Шляхціц Завальня».
4. Аповесць "Драўляны дзядок і кабета Інсекта": праблематыка твора, алегарычнасць вобразаў.

### Заняткі № 4
### Жыццё і творчая спадчына В. Каратынскага і К. Каліноўскага

1. Антыпрыгонніцкі пафас паэмы "Таміла" В. Каратынскага.
2. Літаратурна-грамадская дзейнасць К. Каліноўскага.
3. "Мужыцкая праўда". Ідэйна-тэматычны змест.
4. Праблематыка артыкулаў "Мужыцкай праўды".
5. Асаблівасці стылю і рытарычныя прыёмы К. Каліноўскага.
6. "Лісты з-пад шыбеніцы" К. Каліноўскага.
7. Верш "Марыська чарнаброва, галубка мая…"
8. Вобраз Каліноўскага ў літаратуры і культуры.

### Заняткі № 5
### Драматургія В. Дуніна-Марцінкевіча

1. Асоба і творчасць В.Дуніна-Марцінкевіча.
2. Праблематыка п'есы "Ідылія". Цэнтральныя вобразы і сродкі стварэння камічнага.
3. "Пінская шляхта": канфлікт, вобразныя сродкі, развязка твора.
4. Майстэрства Дуніна-Марцінкевіча-драматурга.

Репозиторий ВГУ

**Заняткі № 6**
**Творчасць Э. Ажэшкі і беларуская культура**

1. Беларускія матывы ў прозе Э. Ажэшкі.
2. Аповесць “Дзюрдзі”: вобразная сістэма, праблематыка, кампазіцыя, жанр.
3. Псіхалагізм аповесці “Хам” .
4. Вобразы галоўных персанажаў аповесці “Хам”. Асаблівасці вырашэння канфлікта.

**Заняткі № 7**
**Жыццё і творчасць Янкі Лучыны**

1. Асноўныя матывы лірыкі Янкі Лучыны.
2. Этыка адказнасці за чалавека ў паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся».
3. Лёс беларусаў і навакольны свет ў паэме.
4. Экалагічная праблематыка паэмы.
5. Вобразы Грышкі і аўтара.

**Заняткі № 8**
**Творчасць Ф. Багушэвіча**

1. Кампазіцыя зборніка “Дудка беларуская”. Праблематыка твораў.
2. Жанравы склад зборніка, стылёвыя адметнасці твораў.
3. Вершаваная аповесць “Кепска будзе”: праблематыка твора, кампазіцыя твора.
4. Праблематыка, кампазіцыйныя асаблівасці зборніка “Смык беларускі”.
5. Вобраз лірычнага героя ў вершы “Запавет”.
6. Прадмовы да зборнікаў як узоры публіцыстыкі, іх ідэйная накіраванасць, вобразы Мацея Бурачка і Сымона Рэўкі з-пад Барысава.

Репозиторий ВГУ

## 4 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1, 2
### Творчасць Алаізы Пашкевіч (Цёткі)

1. Жыццёвы шлях паэткі. Маштабнасць грамадскай дзейнасці.
2. Ідэйны змест зборнікаў “Скрыпка беларуская”, “Хрэст на свабоду”. Светапоглядна-мастацкія сыходжанні лірыкі Цёткі з паэзіяй Ф. Багушэвіча, У. Сыракомлі (на прыкладзе вершаў “Мужыцкая доля”, “Мужык не змяніўся”, “Добрыя весці”, “Скрыпка” і інш.).
3. Стыхіі ветру (буры) і мора як вобразныя ўвасабленні эмацыйнага неспакою паэткі (“Мора”, “Мае думкі”, “У дарогу”, “Бура ідзе” і інш.).
4. Ідэя яднання ў грамадскай барацьбе (“Пад штандарам”, “Нямаш, але будзе”, “Вам, суседзі”, “Вера беларуса”, “Суседзям у няволі” і інш.).
5. Сімвалічная выява вобраза творцы (артыста) у паэзіі Цёткі (“Скрыпка”, “Артыст грайка”, “Музыкант беларускі”, “Грайка”, “На магіле”).
6. Ліра-эпічны характар вершаў Цёткі “Лета” і “Восень”. Гарманічнасць свету ў іх.
7. Фальклорныя матывы і вобразы ў паэзіі Цёткі (“Вясковым кабетам”, “Тры кветкі”, “Арлы-брацці, дайце скрыдлы”, “Гаданне”, “Сірацінка”).
8. “Эміграцыйная” тэма ў лірыцы паэткі (“На чужой старонцы”, “З чужыны” і інш.).
9. Жанрава-стылёвыя адметнасці прозы А. Пашкевіч. Суб’ектываванасць, псіхалагізм, філасофская заглыбленасць апавяданняў “Прысяга над крывавымі разорамі”, “Асеннія лісты”, “Зялёнка”, “Міхаська”, “Навагодні ліст”.
10. Актуальнасць праблематыкі, маральная накіраванасць артыкулаў А. Пашкевіч “Як нам вучыцца”, “Шануйце роднае слова”, “Наша народная беларуская песня” і інш.

### Заняткі № 3, 4
### Творчасць Янкі Купалы: лірыка, ліра-эпас, драматычныя паэмы

1. Асноўныя падзеі жыцця і творчасці Я. Купалы.
2. Галоўныя ідэі, цэнтральныя вобразы, мастацкія асаблівасці паэтычных зборнікаў “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”. Прамоўніцкі характар вершаў, іх песеннасць.
3. Жанравая панарамнасць купалаўскай паэзіі.
   - Антываенная лірыка (“Песні вайны”, “1914-ты”, “Вясна 1915-ая” і інш.).
   - Камічныя вершы і байкі (“Чын”, “Герб і лапаць”, “Янка і свабода”, “Груган і салавей”, “Пчолы і трутні”).
   - Лірыка кахання (“Песня”, “Страшны вір”, “Гэй ты, дзяўчына...”, “Кветка-лілея”, “Таей даўгажданнай...”).
   - Санеты (“Бацькаўшчына”, “На суд”, “Маё цярпенне”, “Чаму?” і інш.).
4. Ідэйная накіраванасць, праблематыка ранніх паэм Я. Купалы “Зімою”, “Нікому”, “Адплата кахання”.
   - Спалучэнне рамантычна-баладнага і сацыяльна-побытавага кампанентаў у ранніх паэмах.
   - Трагічнасць матываў, фальклорны ўплыў, натуралістычнасць эпізодаў у ранніх паэмах.
5. Рысы рамантызму ў паэмах “Курган”, “Бандароўна”, “Магіла льва”.
6. Драматычныя паэмы “Адвечная песня”, “Сон на кургане”. Філасофская шматзначнасць і грамадская актуальнасць даследуемых у творах пытанняў. Аўтарская трактоўка экзістэнцыяльных ідэй абсурднасці чалавечага існавання. Алегарычнасць мастацкіх вобразаў.

Репозиторий ВГУ

**Заняткі № 5**
**Драматургія Я. Купалы**

1. Драматургія Я.Купалы. Станаўленне “сцэнічнага” майстэрства класіка. Сутнасць мастацкага канфлікту ў п’есе “Паўлінка”.
2. Ідэйны змест драмы “Раскіданае гняздо”. Прататыпнасць падзей у творы. Сацыяльна-філасофскі спектр праблематыкі. Філасофскія пазіцыі персанажаў.
3. П’еса “Тутэйшыя”.
   - Гісторыя напісання і сцэнічны лёс твора.
   - Сістэма дзейных асоб у п’есе. Рысы статычнасці і дыялектычнай зменлівасці характарыстык станоўчых і адмоўных персанажаў. Тыповасць герояў і абставін, паказаных у трагікамедыі.
   - Кампазіцыйная зладжанасць п’есы.
   - Стылявое майстэрства драматурга. “Смехавыя” прыёмы пераапранання, “маскі”, камічных становішчаў. Адзенне персанажаў і іх мова як сімвалічнае ўвасабленне іх грамадскіх статусаў і жыццёвых філасофій. Элементы гратэску і шаржу.

**Заняткі № 6, 7**
**Творчасць Я. Коласа**

1. Асноўныя факты жыццёвага і творчага шляху пісьменніка.
2. “Новая зямля”, “Сымон-музыка” – класічныя ўзоры беларускага паэтычнага эпасу.
   - Гісторыя стварэння “Новай зямлі”.
   - Праблематыка паэмы. Адлюстраванне ў творы грамадска-сацыяльных пытанняў: беззямелля, пошукаў працы, ідэйнай канфрантацыі паміж рознымі сацыяльнымі класамі.
   - Прататыпнасць вобразаў і падзей у “Новай зямлі”. Тыповасць галоўных герояў.
   - Паэтызацыя стваральнай дзейнасці чалавека і беларускага сялянскага свету ў паэме.
   - Апісанні народнай абраднасці і фальклорных святаў у творы (Вялікдзень, Каляды і інш.).
   - Вобраз прыроды як чыннік фарміравання духоўнага свету герояў і адбітак іх псіхалагічнага стану.
   - Сутнасць і функцыя аўтарскіх адступленняў у паэме. Кампазіцыя твора. Дасканаласць яго мастацкай мовы.
   - Жанравая спецыфіка паэмы, яе ліра-эпічны характар, адзнакі рамана ў вершах і паэмы-эпапеі.
3. Час і ўмовы працы над “Сымонам-музыкам”. Тры рэдакцыі твора, ідэйна-сюжэтныя змены ў ім.
   - Філасофская значнасць праблематыкі твора. Фальклорныя вытокі і “ўнутраны” біяграфізм “Сымона-музыкі”.
   - Канфліктная аснова твора.
   - Сімвалічная вобразнасць у паэме (Сымон, Ганна). Аўтарская інтэрпрэтацыя сусветнай вобразнай мадэлі Музыкі (Песняра). Камбінаванне рамантычна-рэалістычных рысаў пры падзейным апісанні і характарыстыцы мастацкіх вобразаў (Курыла, жабрак, князь, Дамінік і інш.).
   - Роля аўтарскіх лірычных адступленняў і алегарычных гісторый у паэме.
   - Сюжэтна-кампазіцыйная вытанчанасць “Сымона-музыкі”.

Репозиторий ВГУ

4. Месца паэм "Новая зямля" і "Сымон-музыка" ў творчай спадчыне Я.Коласа і нацыянальным літаратурным працэсе.

**Заняткі № 8**
**Трылогія "На ростанях" Я. Коласа**

1. Творчая гісторыя, аўтабіяграфічнасць і прататыпа герояў рамана.
2. Праблематыка твора. Андрэй Лабановіч як прадстаўнік перадавой часткі беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, як асветнік і шукальнік сэнсу жыцця.
3. Своеасаблівасць пейзажных апісанняў.
4. Лірычнае, публіцыстычнае і філасофскае ў трылогіі.
5. Народнасць трылогіі, яе значэнне для станаўлення і развіцця беларускай прозы.

**Заняткі № 9, 10**
**Творчасць Максіма Багдановіча**

1. Асноўныя этапы жыцця М.Багдановіча:
   - гродзенскі (1892-1896),
   - ніжагародскі (1896-1908),
   - яраслаўскі (1908-1916),
   - мінскі (1916-1917).
2. Пачатак творчасці М.Багдановіча.
3. Ідэйна-тэматычны і жанрава-стылёвы аналіз зборніка "Вянок" (1913).
4. Паэмы М.Багдановіча "Максім і Магдалена", "Страцім-лебедзь", "Мушка-зелянушка...".
5. Проза М.Багдановіча ("Музыка", "Апокрыф", "Апавяданне аб іконніку і залатару" і інш.).
6. Літаратурна-крытычныя артыкулы М.Багдановіча ("Глыбы і слаі", "За тры гады", "Белорусское возрождение").
7. Лірыка М.Багдановіча апошняга перыяду творчасці (канец 1916 – пачатак 1917 года).
8. Значэнне творчасці М.Багдановіча ў гісторыі беларускай літаратуры.

**Заняткі № 11**
**Творчасць Ядвігіна Ш.**

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадская і адраджэнска-асветніцкая дзейнасць А. Лявіцкага.
2. Творчая спадчына Ядвігіна Ш. Разнастайнасць жанравых форм, аналізуемых праблем і стылёвых рашэнняў у прозе пісьменніка.
   - Гумарэскі ("Важная фіга", "З маленькім білецікам", "Вучоны бык", "Заморскі звер" і інш.).
   - Байкі ў прозе ("Вяселле", "Дачэсныя", "Павук", "Падласенькі").
   - Алегарычныя апавяданні ("Дуб-дзядуля", "Бярозка").
   - Лірыка-філасофскія імпрэсіі і прыпавесці ("Васількі", "Чалавек").
   - Псіхалагічна-побытавыя навелы ("Зарабляюць", "Гаротная", "З бальнічнага жыцця" і інш.).
3. Трагікамізм мастацкага свету ў малой прозе Ядвігіна Ш.
4. Сінтэз традыцыйнага і наватарскага ў пісьменніцкім стылі.
5. Важкасць мастацкай дэталі і сэнсавая ёмістасць вобразаў-сімвалаў у прозе Ядвігіна Ш.
6. Раман "Золата". Маральна-сацыяльныя аспекты праблематыкі. Арыгінальнасць сюжэта. Сістэма персанажаў.

Репозиторий ВГУ

**Заняткі № 12, 13**
**Творчасць Змітрака Бядулі**

1. Асноўныя факты жыцця і творчасці пісьменніка.
2. Мастацкі свет дакастрычніцкай прозы З. Бядулі.
3. Уплыў імпрэсіянізму на аўтарскі стыль. Праблематыка твораў.
   - Псіхалагічная дасканаласць сацыяльна-бытавых навел “Пяць лыжак заціркі”, “Малыя дрывасекі”, “На Каляды к сыну”, “Летапісцы”. Трагічны адбітак рэчаіснасці ў апавяданнях.
   - Сюжэтны дынамізм, кампазіцыйная зладжанасць, трапнасць мастацкіх дэталяў у малой прозе З. Бядулі.
   - Тэма мастака і мастацтва ў апавяданні “Велікодныя яйкі”. Перагук тэмы апавядання з іншымі творамі беларускай літаратуры гэтых часоў.
4. Аповесць “Салавей”.
   - Гісторыя напісання твора, прататыпнасць мастацкіх вобразаў.
   - Варыянтнасць жанравага вызначэння “Салаўя” (гістарычная аповесць, “маладнякоўская” аповесць, прыгодніцкая аповесць, фальклорна-рамантычная аповесць).
   - Складанасць кампазіцыйнай пабудовы твора.
   - Стылёвая камбінаванасць аповесці; псіхалагічныя, камічныя, натуралістычныя элементы ў ёй.
   - Ідэйна-тэматычнае і вобразнае суладдзе твора з нацыянальнай і сусветнай літаратурнай традыцыяй.

**Заняткі № 14**
**Творчасць Максіма Гарэцкага**

1. Асноўныя факты біяграфіі пісьменніка.
2. Перыядызацыя творчасці М.Гарэцкага.
3. Зборнік “Рунь”: праблематыка, самабытны характар ідэйнага зместу кнігі. Сімвалізм назвы зборніка.
4. Аўтарская мадэль сюжэтна-разгорнутага сацыяльна-псіхалагічнага апавядання (“У лазні”, “Што яно?”, “Роднае карэнне”).
5. Раннія лірыка-філасофскія апавяданні пісьменніка (“Красаваў язмін”, “Патаёмнае”, “Стогны душы”).
6. Гуманізм апавяданняў М.Гарэцкага 1914-1918 гг. (“Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “Генерал”, “На этапах” і інш.).
7. “Гістарычныя” апавяданні пісьменніка (“Лірныя спевы”, “Стары прафесар”, “Смачны заяц”, “Панская сучка” і інш.).
8. Аўтарскае імкненне да аналітычна-аб’ектыўнага паказу рэчаіснасці ў апавяданнях 1921-1922 гг. (“Фантазія, “Апостал”, “Незадача”).

**Заняткі № 15, 16**
**Аповесці Максіма Гарэцкага**

1. Філасофскае асэнсаванне гістарычнага шляху Беларусі ў аповесці “Ціхая плынь”. Варыянты назваў твора, іх сэнсавая матываванасць.
   - Панарамнасць праблематыкі аповесці.
   - Эпічны характар рэтраспектыўных эпізодаў твора.
   - Эвалюцыя вобраза інтэлігента ў аповесці “Ціхая плынь”.
   - Трагізм твора. Лірычныя замалёўкі ў аповесці, іх роля для адэкватнай ацэнкі герояў і падзей.

Репозиторий ВГУ

- Асаблівасці кампазіцыі. Функцыянальная важнасць эпіграфаў у “Ціхай плыні”.

2. Аповесць “Дзве душы”.
   - Сістэма вобразаў. Ідэйныя пазіцыі персанажаў.
   - Праблема духоўнай раздвоенасці і вырашэнне ў аповесці такіх пытанняў, як бацькаўшчына і рэвалюцыя, адносіны рэвалюцыі да нацыянальных праблем, стаўленне нацыянальнай інтэлігенцыі да рэвалюцыі.

**Заняткі № 17**
**Творчасць Алеся Гаруна**

1. Біяграфічныя звесткі. Грамадскія погляды А.Гаруна. Наватарства творчай спадчыны А.Гаруна. Уплыў фальклорных традыцый на паэзію аўтара.
2. Патрыятычная лірыка паэта. Мастацкае ўвасабленне вобраза маці-Радзімы ў ёй.
3. Матывы народных песень у паэзіі А.Гаруна (“Песня”, “Хатка”, “Завіруха”, “Эх, сягоння, у гэту ночку”, “На смерць”, “Сын”, “Салдацкія песні” і інш.).
4. Аўтарская інтэрпрэтацыя біблейскіх матываў і вобразаў (“Хрыстос нарадзіўся! Хрыстос нарадзіўся!..”, “Малітва”, “Адбітак”, “Нязнаны госць”, “Самсон” і інш.).
5. Філасофская лірыка А.Гаруна (“Nokturno”, “Як ліст вярбінкі маладой”, “Жыццё”, “Шчаслівы той...”, “Навука” і інш.).
6. Тэма кахання ў лірыцы паэта (“Асенні спеў”, “Мяцеліца”, “Развaж, гаю зеляненькі”, “З астрожных картак” і інш.).
7. Маральна-сацыяльны аспект вершаваных апавяданняў, баек і фельетонаў пісьменнніка (“Варожба”, “Што каму”, “Канец Паўлючонка”, “Спогадзь”, “Апякун”, “Кар’ера” і інш.).
8. Ідэйна-тэматычная шырыня апавяданняў А.Гаруна (“Першы снег”, “Пан Шабуневіч”, “П’ера і Каламбіна” і інш.).

**Заняткі № 18**
**Творчасць Цішкі Гартнага**

1. Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага.
2. Апавяданні “Калядная каробка”, “Прысады”.
3. Раман “Сокі цаліны” ў чатырох квадрах (1922–1930).
   - Асаблівасці хранатопа вёскі і вобраз зямлі як Маці-карміцелькі, выяўленне яе жыватворнай сілы, шматгалосся жыцця.
   - Адметнасці кампазіцыйнай пабудовы рамана, стылёвая інварыянтнасць, арнаменталізм прозы, роля дыялектнай мовы.
   - Рэалістычныя тэндэнцыі ў паказе нацыянальнай псіхалогіі селяніна-беларуса.
   - Значэнне кнігі ў чатырох частках у беларускай раманістыцы.

**Заняткі № 19**
**Творчасць Вацлава Ластоўскага**

1. Біяграфія і перыядызацыя творчасці пісьменніка (віленскі, “эміграцыйны”, мінскі). Маштабнасць грамадска-палітычнай, навуковай дзейнасці Ластоўскага. Непахіснасць аўтарскай светапогляднай пазіцыі, рознааспектнасць яе мастацкага ўвасаблення.
2. Паэтычнае майстэрства В.Ластоўскага. Наватарства матываў, тэм, літаратурных прыёмаў. Спалучанасць сучасных аўтару мастацкіх тэндэнцый (мадэрнісцкай паэтыкі) і фальклорнай вобразатворчасці (“На Радуніцу”, “О, Крыўская зямля!” і інш.).



Рэпазіторый ВДУ

3. Жанрава-стылёвыя знаходкі пісьменніка ў межах апавядання (“Нарадзіны”, “Апаўшае лісце”, “Лебядзіная песня”, “Вясковыя “археолагі”, “Дудар” і інш.).
4. “Лабірынты”. Жанравая форма ўтапічнай аповесці ў аўтарскай трансфармацыі. Аб’ектыўнасць і мастацкі вымысел пры паказе нацыянальнай гісторыі ў сістэме сусветнай культуры. Вобраз Крывіі ў кантэксце твора.

**Заняткі № 20**
**Творчасць Францішка Аляхновіча**

1. Жыццёвы і творчы шлях Ф.Аляхновіча.
2. Традыцыі і наватарства драматургіі Ф. Аляхновіча. Развіццё “новай драмы”, фальклорныя п’есы аўтара.
3. «Няскончаная драма» як узор “новай драмы”.
   - Прыёмы псіхалагізму, двайніцтва ў стварэнні вобразаў.
   - Элементы сімвалізму і экзістэнцыялізму ў п’есе.
   - Кампазіцыйныя адметнасці.

Репозиторий ВГУ

## 5 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1, 2, 3
### Творчасць Кузьмы Чорнага

1. Біяграфія пісьменніка.
2. Праблематыка і цэнтральныя вобразы апавяданняў К. Чорнага:
   - камічная “малая” проза (“Маё дзела цялячае”, “Усяму свой час”, “Дзякуй богу, як шклянка”, “Вясковая ветэрынарыя”, “Фэст”, “Мяшчане ў густой пары”). Тыповасць, схематызм вобразаў, разнастайнасць смехавых сродкаў і прыёмаў, уплыў “маладнякоўскай” паэтыкі;
   - ідэйны змест, праблемна-тэматычная шырыня сацыяльна-псіхалагічных апавяданняў “Па дарозе”, “Хвоі гавораць”, “Пачуцці”, “Вераснёвыя ночы”, “Справа Віктара Лукашэвіча”;
   - гуманістычна-філасофская аснова апавяданняў “Сцены”, “Буланы”, “Ноч пры дарозе”, “Васпаваты чалавек”.
3. Адметны тып “былога чалавека” ў аповесці “Лявон Бушмар”.
4. Сімвалічнае значэнне прозвішча героя (ад ням. Busch – кустоўе, лясны гушчар, Mar – паданне, дзіўная гісторыя).
   - паказ у аповесці тагачасных сацыяльна-гістарычных працэсаў;
   - уздзеянне тэорый “жывога чалавека”, “зрывання масак” на стыль твора;
   - псіхалагічныя рысы ў аповесці. Элементы ўмоўнасці, мастацкай трафарэтнасці ў распрацоўцы канфліктнай асновы твора.
5. Раман “Пошукі будучыні” К. Чорнага:
   - ідэйна-тэматычная аснова твора;
   - сістэма цэнтральных вобразаў рамана;
   - асаблівасці кампазіцыі твора;
   - сімвалічнасць вобразаў і падзей у рамане.
6. Роля творчасці К. Чорнага ў працэсе развіцця айчыннага прыгожага пісьменства.

### Заняткі № 4, 5, 6
### Творчасць Кандрата Крапівы

1. Галоўныя падзеі жыццёвага і творчага шляху пісьменніка.
2. Вершаваная сатыра К. Крапівы:
   - праблемна-тэматычная спектральнасць баек пісьменніка;
   - сатырычны верш К. Крапівы ў сістэме нацыянальнай і сусветнай баечнай традыцыі;
   - тыповасць вобразаў крапівінскай байкі, яе народнасць;
3. Апавяданні К. Крапівы:
   - шматпрыкладнасць сказавых формаў у “малой” прозе пісьменніка (“Каровін мужык”, “Смерць”, “Мой сусед”, “Вайна” і інш.);
   - выкрыццё мяшчанскай філасофіі ў апавяданнях К. Крапівы;
   - экспрэсіўнасць аўтарскага аповеду, анекдатычнасць, майстэрства камічнага партрэтавання ў “малой” прозе пісьменніка;
   - стылявая абумоўленасць публіцыстычных элементаў у апавяданнях “Вясна”, “Споведзь”;
   - фальклорна-фантастычны каларыт твора “Людзі-суседзі”;
   - рэалістычна-псіхалагічныя карціны ў творах “Здаў “акзамінт”” і “Пальчык”.
4. Драматургія К. Крапівы:
   - маральна-этычная скіраванасць драмы “Канец дружбы”. Праблема выбару паміж грамадскімі абавязкамі і сумленнем. Трагічнасць часу;

Рэпазіторый ВДУ

- аб’ектыўнасць у паказе рэчаіснасці пачатку 1930-х гадоў. Градацыя драматычных падзей у п’есе;
- сатырычная камедыя “Хто смяецца апошнім”;
- ідэйныя праявы мужнай грамадзянскай пазіцыі аўтара. Яркасць і злабадзённасць персанажаў, элементы карыкатурнасці ў іх, паказ атмасферы страху, падазронасці ў п’есе;
- сатырычная камедыя “Мілы чалавек”;
- выкрыццё “жлуктаўшчыны”. Філасофскі падтэкст вобраза Язвы. Няўдалы тэатральны лёс п’есы;
- сатырычная камедыя “Брама неўміручасці”;
- фантастычны фон твора, яго філасофскі падтэкст. Сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці п’есы. Майстэрства стварэння камічных персанажаў, сродкі індывідуалізацыі мовы герояў.

**Заняткі № 7, 8**
**Творчасць Міхася Лынькова**

1. Асноўныя біяграфічныя звесткі.
2. “Малая” проза М. Лынькова:
   - аадлюстраванне падзей грамадзянскай вайны ў апавяданнях “Над Бугам”, “Гой”, “Крот” і інш.;
   - трагізм аповеду ў іх, псіхалагічная напружанасць, гуманістычнасць пафасу. Рамантычныя элементы ў творах;
   - ідэя стваральнай дзейнасці ў апавяданнях “Кларнет”, “Андрэй Лятун”. Тыповасць галоўных вобразаў. Праявы псіхалагічнай дасканаласці, народнасць гумару, жыццесцвярджальныя ідэі твораў;
   - прадбачанне пісьменнікам негатыўных наступстваў калектывізацыі (“Салавей-разбойнік”, “Саўка-агіцірнік”). Праблема асоба і ўлада ў творах;
   - вобраз чалавека сацыяльнага дна ў апавяданнях “Баян”, “На вялікай хвалі”. Рысы рэалізму і ідэалізаванасць рэчаіснасці, дыдактызм твораў, адметнасці аўтарскай пазіцыі.
   - “ваенныя” апавяданні пісьменніка (“Васількі”, “Ірына”, “Астап”, “Недапетыя песні”, “Пацалунак”), ідэйна-мастацкія адметнасці твораў, трагізм прадстаўленых падзей і вобразаў.
3. Аповесць “Апошні зверыядавец”. Праблематыка. Ідэйны змест твора. Фактычна дакладная аснова аповесці. Вартасці і недахопы твора.
4. Аповесць “Міколка-паравоз”. Праблематыка. Ідэйны змест твора. Прыгодніцкія элементы аповесці, моўнае майстэрства ў ёй. Вартасці і недахопы твора.

**Заняткі № 9, 10**
**Творчасць Міхася Зарэцкага**

1. Біяграфія пісьменніка.
2. Маральна-этычная скіраванасць “малой” прозы М. Зарэцкага (“Цішка Бабыль”, “Ракавыя жаронцы”, “Максімаліст”, “Ой, ляцелі гусі” і інш.):

- “вяршынная” кампазіцыя твораў, іх драматычная напружанасць, іранічнасць аповеду і навелістычнасць;
- дасканаласць і сэнсавая шматзначнасць мастацкіх дэталей (сюжэтных, апісальных і псіхалагічных);
- сімвалічнасць і слушнасць аўтарскага версіфікавання грамадскай сітуацыі ў краіне. Рамантызацыя падзей і вобразаў у апавяданнях М. Зарэцкага.

3. Аповесць “Голы звер” як узор псіхалагізаванай сатыры 1920-х гг.:

Репозиторий ВГУ

- уздзеянне тэорый “зрывання масак”, “жывога чалавека” на стылёвыя асаблівасці твора;
- трагікамічнасць мастацкага свету і аўтарскіх характарыстык персанажаў;
- мастацкія матывы гульні, палявання і ўсёдаравання ў творы;
- мастацкія сродкі выкрыцця дэструктыўнай мізантрапічнай філасофіі.

**Заняткі № 11**
**Творчасць Уладзіміра Дубоўкі**

1. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.
2. Лірыка У. Дубоўкі:
   - патрыятычныя матывы ў вершах. Сімвалізм паэзіі У. Дубоўкі, яе аўтабіяграфічнасць;
   - апеляцыя да біблейскай метавобразнасці ў лірыцы паэта (“Нікне ўсё ў нейкай шэрай мгле”, “О, Беларусь, мая шыпшына”, “Часіна ды з сокам рабіны” і інш.);
   - матывы захаплення сапраўднай прыгажосцю і прадчування трагічнай эпохі ў паэзіі У. Дубоўкі 1920-х гадоў;
   - мастацкая дасканаласць вершаў, іх рытмічная разнастайнасць, метафарызацыя аўтарскага мыслення.
3. Эксперыментальнасць паэм “Кругі”, “І пурпуровых ветразей узвівы”, “Штурмуйце будучыні аванпосты!”:
   - умоўнасць мастацкага свету ў паэмах. Праявы драмы, лірыкі і эпасу ў іх. Кампазіцыйная адметнасць паэм;
   - вечнае і часовае ў праблематыцы твораў. Філасофскае асэнсаванне гістарычнага лёсу беларусаў і лёсу нацыянальнага мастацтва;
   - роля антаганістычных вобразаў Лірыка і Матэматыка, Кандуктара і Пасажыра ў паэмах.
4. Традыцыйнае і новае ў стылі вершаваных цыклаў “Чакае ля берагу човен мяне”, “Пасля вандравання”, “Палеская рапсодыя”, “Дактылічныя рытмы”.

**Заняткі № 12, 13**
**Творчасць Уладзіміра Жылкі**

1. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.
2. Лірыка У. Жылкі:
   - патрыятычныя матывы ў вершах. Дамінаванне ідэі гераічнага змагання ў іх;
   - вобраз Вільні ў вершах аўтара;
   - пейзажная лірыка Жылкі;
   - любоўная паэзія аўтара;
   - матыў харāства ў яго творчасці;
   - класічныя вершаваныя формы ў паэзіі Жылкі;
   - мастацкая дасканаласць вершаў, іх рытмічная разнастайнасць, глыбіня аўтарскага мыслення.
3. Філасофскі характар паэмы “Тэстамент”. Асноўныя вобразы аўтара і часу ў ёй. Кампазіцыйная адметнасць паэмы.
4. Проза У. Жылкі, яе ідэйна-мастацкія асаблівасці.

**Заняткі № 14**
**Творчасць Язэпа Пушчы**

1. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.



Рэпазіторый ВДУ

2. Лірыка Я. Пушчы:
   - тэма суладдзя лірычнага героя з прыродай у вершах;
   - адзнакі метафарычнага “маладнякоўскага” светабачання ў творах;
   - вобразы-сімвалы ў вершах;
   - шматаспектны характар матыву жыцця ў лірыцы Пушчы;
   - матывы трагедыйнасці, расчаравання, біблейскай іншасказальнасці ў вершах.

**Заняткі № 15, 16**
**Творчасць Андрэя Мрыя**

1. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.
2. Тэматычная шырыня ранніх апавяданняў А. Мрыя ““Цар Максіміліян” у вёсцы”, “Разбудзілі”, “Прафесар акультных навук”.
3. Публіцыстычныя элементы, тыповасць вобразаў, анекдатызм мастацкіх фабул.
4. Сказавая форма ў “малой” прозе А. Мрыя (“Камандзір”, “Гармонія ў ружовым”, “Няпросты чалавек”, “Рабін”):
   - ідэяператварэння маленькага чалавека ў носьбіта новай грамадскай маралі;
   - трагікамічныя элементы ў сказах пісьменніка, іх маральна-філасофская, духоўная накіраванасць;
   - трапнасць выкарыстання камічных матываў змены масак і прыкідвання ў апавяданнях. Гуманістычная канцэпцыя аўтара.
5. Сатырычны раман-памфлет “Запіскі Самсона Самасуя”:
   - творчая гісторыя “Запісак...”. Арыгінальнасць жанравай формы;
   - усеахопны характар праблематыкі рамана;
   - мастацкі свет твора, яго трагікамічнасць, рысы антыўтопіі;
   - Самсон Самасуй – вобраз-тып, жахлівасць яго дэструктыўнай дзейнасці;
   - універсальнасць мастацкага смеху ў рамане, гратэскава-алегарычная сутнасць яго персанажаў;
   - стылявая поліфанічнасць камічных сродкаў: іронія, самаіронія, парадзіраванне, карыкатура, парадокс, шарж і інш. Уплыў бурлескна-травесційных прыёмаў. Месца “Запісак...” у кантэксце сусветнай мастацкай смехавой традыцыі.

**Заняткі № 17, 18**
**Творчасць Лукаша Калюгі**

1. Асноўныя факты біяграфіі і творчасці празаіка.
2. Рэалістычны паказ вясковага жыцця ў ранніх апавяданнях Л. Калюгі (“Як Баркаўцы Міхалюку даліся ў знакі”, “Краўцы і чаляднікі”).
3. Сказы Л. Калюгі “Лук’ян – кaпераціўскі сабака”, “Трахім з Пагулянкі”, “Трахім – штучны чалавек”, “Іллюк – даследчык”, “Тахвілін швагер” і інш.:
   - праблема даследавання народнай ментальнасці і захавання гістарычнай памяці ў апавяданнях пісьменніка;
   - вобраз дзівака, яго нацыянальная унікальнасць і тыпалагічная суаднесенасць з вобразнымі адпаведнікамі ў сусветнай літаратуры (К. Гашак, В. Шукшын);
   - вобразна-кампазіцыйная дасканаласць сказаў Л. Калюгі. Самабытнасць моўнай арганізацыі апавяданняў.
4. Навелістыка Л. Калюгі (“Цеснаватая куртачка”, “Вам знаёмае”):
   - сацыяльна-бытавы фон апавяданняў. Метафарычнасць мастацкай дэталі;
   - псіхалагічная матываванасць паводзін герояў, лірызм твораў. Элегізм аўтарскага аповеду.

Рэпазіторый ВДУ

**Заняткі № 19, 20**
**Творчасць Янкі Маўра**

1. Асноўныя факты біяграфіі і творчасці празаіка.
2. Апавяданні Я. Маўра:
   - ідэйна-тэматычная аснова твораў “Шчасце”, “Бярозавы конь”, “Падарожжа вакол дома”. Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці вобразаў дзяцей, нюансаў іх псіхалогіі і светабачання;
   - дасканаласць сацыяльна-псіхалагічнага апавядання “Максімка”, раскрыццё ў ім праблемы пошукаў шчасця ў драматычных абставінах пасляваеннай рэчаіснасці;
   - апавяданне “Багіра” ў рэчышчы айчыннай і сусветнай анімалістычнай літаратуры.
3. “Палескія рабінзоны” як прыклад прыгодніцкага рамана для школьнікаў:
   - ідэйна-тэматычная аснова твора;
   - спецыфіка сюжэтабудовы;
   - тыповасць цэнтральных вобразаў;
   - пазнавальнасць апісаных падзей;
   - вартасці і недахопы твора.

Репозиторий ВГУ

## 6 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1
### Творчасць Максіма Танка

1. Жыццёвы і творчы шлях паэта.
2. Эвалюцыя індывідуальнага стылю ў ранніх зборніках паэзіі.
3. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэзіі М. Танка 1960-1980 гг.
4. Паэтычны эпас М. Танка. Асаблівасці паэтыкі верлібру.
5. Традыцыі М. Танка ў сучаснай беларускай паэзіі.

### Заняткі № 2
### Творчасць Пятруся Броўкі

1. Жыццёвы і творчы шлях паэта.
2. Узмужненне таленту П. Броўкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ідэйна-тэматычнае і жанравае ўзбагачэнне творчасці П. Броўкі ў другой палове 1950-х–1960-я гг. Майстэрства вобразнасці і паэтычнага гукапісу.
3. Паэма-рэквіем “Голас сэрца” (1960).
4. Творы паэта як яскравыя дакументы сваёй эпохі.

### Заняткі № 3
### Творчы шлях Аркадзя Куляшова

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Ваенная паэзія А. Куляшова.
3. Наватарства ў распрацоўцы жанру балады.
4. Тэмы і вобразы паэзіі 1950 – пачатку 1960-х гг. Канцэптуальная навізна “Новай кнігі” (1964). Непаўторнасць куляшоўскага стылю.
5. Паэмы А.Куляшова.

### Заняткі № 4
### Творчасць Янкі Брыля

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Адлюстраванне заходнебеларускай рэчаіснасці ў ранніх творах.
3. Тэма народнага подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
4. Аповесці “У Забалоцці днее”, “На Быстранцы”
5. Раман “Птушкі і гнёзды” (1963).
6. Стыхія народнага жыцця ў аповесці “Ніжнія Байдуны” (1975).
7. Я. Брыль як майстар лірычнай мініяцюры.

### Заняткі № 5
### Творчасць Пімена Панчанкі

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Паэзія 1930-хг. Зборнікі “Дарога вайны” і “Далёкія станцыі”
3. Другая палова 1950-х – 1960-я гг. – уздым у творчасці П. Панчанкі.
4. Асноўныя вобразы і матывы, жанравая разнастайнасць зборнікаў 1970-х гг. Тэматычна-праблемная навізна кніг “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Высокі бераг”.

Репозиторий ВГУ

**Заняткі № 6**
**Творчая спадчына Івана Мележа**

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў ранніх апавяданнях.
3. Раман “Мінскі напрамак”.
4. Драматургія І. Мележа, яе праблематыка, жанравыя асаблівасці.
5. “Палеская хроніка” як галоўная кніга І. Мележа.

**Заняткі № 7**
**Творчасць Міхася Стральцова**

1. Першыя зборнікі апавяданняў.
2. Аповесць “Адзін лапаць, адзін чунь”, кніга прозы “Падарожжа за горад”.
3. Адметнасць паэтычнага бачання свету ў паэзіі М. Стральцова.
4. Міхась Стральцоў – яркі прадстаўнік пакалення “шасцідзясятнікаў” у беларускай літаратуры.

**Заняткі № 8, 9**
**Творчасць Васіля Быкава**

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. “Ваенныя аповесці” 1960-х гг.
3. “Партызанскія” аповесці. Гуманістычны сэнс аповесці “Сотнікаў”.
4. Публіцыстычная палемічнасць аповесці “Абеліск”.
5. Аповесць “Знак бяды” як значная мастацкая з'ява ў творчасці празаіка.
6. Раман “Кар’ер”.
7. Аповесці “У тумане”, “Аблава”, “Сцюжа”. Быкаўскае асэнсаванне экзістэнцыялісцкага паняцця абсурду.
8. Творчасць В. Быкава 1990-х г

**Заняткі № 10**
**Творчы шлях Івана Навуменкі**

1. Эпічнасць мыслення І. Навуменкі ў раманнай трылогіі “Сасна пры дарозе” (1962), “Вецер у соснах” (1967), “Сорак трэці” (1970).
2. Выдатнае псіхалагічнае майстэрства пісьменніка ў стварэнні вобразаў-персанажаў. Асаблівасці мастацкай формы.
3. Раман “Смутак белых начэй” (1979) як своеасаблівы працяг трылогіі. Аўтабіяграфізм твораў.
4. Аповесць пра студэнцтва “Бульба” (1964).
5. Героі-інтэлігенты ў рамане “Летуценнік” (1983) і аповесці “Асеннія мелодыі” (1987).
6. Аўтабіяграфічная трылогія “Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва” (1997).

**Заняткі № 11**
**Творчасць Алеся Адамовіча**

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Аўтабіяграфізм рамана-дылогіі “Вайна над стрэхамі” (1960) і “Сыны ідуць у бой” (1962).
3. Дакументалізм “Хатынскай аповесці” (1972). Жанрава-стылёвыя пошукі празаіка.
4. Дакументальная кніга А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка “Я – з вогненнай вёскі...” (1975) і яе ўнікальнасць.

Репозиторий ВГУ

5. Вобраз вайны ў дакументальнай “Блакаднай кнізе” (1982) А. Адамовіча і Д. Граніна.
6. Раман “Карнікі” (1980) і літаратура “плыні свядомасці”.
7. Жанр антыутопіі ў прозе А. Адамовіча: аповесць “Апошняя пастараль” (1986).
8. Аповесці “Венера, або Як я быў прыгоннікам” (1982–1992) і “Нямко” (1993).

**Заняткі № 12, 13**
**Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Караткевіча**

1. Біяграфія пісьменніка.
2. Тэматычная і жанрава-стылёвая разнастайнасць паэзіі У. Караткевіча.
3. Мастацкі свет казак У. Караткевіча.
4. Ідэйна-мастацкая спецыфіка аповесцяў “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Цыганскі кароль”, “Сівая легенда”.
5. Раман “Каласы пад сярпом тваім”.
6. Раман “Леаніды не вернуцца да Зямлі” (“Нельга забыць”) як інтэлектуальна-псіхалагічны твор.

**Заняткі № 14**
**Творчасць Ніла Гілевіча**

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Творчая актыўнасць паэта ў другой палове 1950-х – 1960-я гг.
3. Асаблівасці ідэйна-творчай эвалюцыі паэта ў 1970–1980-я гг і ў сучасны перыяд. Класічныя традыцыі і наватарства. Жанрава-стылёвая разнастайнасць паэзіі Н. Гілевіча
4. Сатырычны і гумарыстычны талент паэта.
5. Раман у вершах “Родныя дзеці” (1985): жанравая адметнасць, сюжэт і кампазіцыя, канфлікт, сістэма вобразаў, праблематыка твора.

**Заняткі № 15**
**Творчасць Івана Пташнікава**

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Свет падлетка ў апавяданнях “Алені”, “Алёшка”, “Бежанка” (1962). Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды.
3. Аповесці “Лонва” (1964), “Тартак” (1967). Раман “Мсціжы” (1970). Рэальная аснова аповесці “Найдорф” (1976). Увасабленне народнага погляду на вайну ў творах.
4. Супярэчнасці часу ў рамане “Алімпіяда” (1984). Моўна-стылёвыя асаблівасці твора.
5. Апавяданне “Львы” (1987).
6. Творы 1990-х гг., іх жанравая разнастайнасць.

Репозиторий ВГУ

## 7 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1
### Творчасць Рыгора Барадуліна

1. Біяграфія. Вайна ў лёсе паэта.
2. Кнігі паэзіі “Маладзік над стэпам” (1959), “Рунець, красавацць, наліваццa!” (1961), “Нагбом” (1963), “Неруш” (1966), “Адам і Ева” (1968). Інтэнсіўнае развіццё творчай індывідуальнасці паэта, яго наватарства. Самабытнасць яго паэтычнага голасу сярод творцаў “новай хвалі”.
3. Трывога паэта пра нацыянальныя духоўныя каштоўнасці (“Неруш”).
4. Паэтычны плён: кнігі “Рум” (1974), “Абсяг” (1978), “Вечалле” (1980), “Амплітуда смеласці” (1983), “Маўчанне перуна” (1986), “Самота паломніцтва” (1990), “Міласэрнасць плахі” (1992), “Евангелле ад Мамы” (1995), “Босая зорка” (2001).
5. Матывы смутку, жалобы, смяротнай пагрозы ў кнігах “Самота паломніцтва” і “Міласэрнасць плахі”.
6. Эстэтычная адметнасць кнігі “Ксты” (2005).

### Заняткі № 2
### Творчасць Янкі Сіпакова

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. Прастата і ўзвышанасць ранняй паэзіі: “Сонечны дождж” (1960), “Лірычны вырай” (1965), “Дзень” (1968), “З вясны ў лета” (1972), “Вочы ў вочы” (1978, выбранае), “Усміхніся мне” (1984).
3. Наватарскі характар кнігі “Веча славянскіх балад” (1973). Шырокі ахоп гістарычных падзей.
4. Канцэпцыя чалавека і часу ў баладах “Чубы”, “Булава”, “Вяселле”, “Касцёр” і інш.
5. Паглыбленне філасофскага зместу ў прозе Я. Сіпакова. Цыкл апавяданняў “Жанчына сярод мужчын” (1980).
6. Навізна кнігі прытчаў “Тыя, што ідуць” (1993). Філасофска-канцэптуальная аснова твораў празаіка.
7. “Паэтызацыя” прозы і “празаізацыя” паэзіі. Паэмы ў прозе з кніг “Ахвярны двор” (1991).
8. Праблема наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў паэме “Одзіум”.

### Заняткі № 3
### Творчасць Раісы Баравіковай

1. Жыццёвы і творчы шлях.
2. “Сонечнасць” ранняй паэзіі. Топасы радзімы і іх вобразна-паэтычнае ўвасабленне (“Наша вёска”, “Прыводзяць шляхі-дарогі...”, інш.).
3. Архетыповы вобраз саду (“Мне сёння прыснілася хата...”, “Мазурка”, “Восеньскі сад”, “Рамантычная дзяўчына шукае шчасце”, інш.).
4. Інтымная лірыка ў кнігах “Рамонкавы бераг” (1974), “Слухаю сэрца” (1978), “Такое кароткае лета” (1981), “Адгукнуся голасам жалейкі” (1984), “Каханне” (1987), “Пад небам першага спаткання” (1990), “Люстэрка для самотнай” (1992), “Сад на капялюшыку каханай” (1998).
5. Зварот да вобразаў мінулага ў творах “Партрэт жонкі Станіслава Ксаверыя Прушынскага XVIII стагоддзя”, “Кастусь Каліноўскі”, “Саламея”, “Барбара Радзівіл”.

Репозиторий ВГУ

6. Драматургічнае майстэрства ў паэме “Барбара Радзівіл” (1992).
7. П’еса “Пятля часу” (1996): праблемная скіраванасць, жанравыя і сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці.
8. Проза Р. Баравіковай. Аповесць “Кватарантка” (1980).

**Заняткі № 4**
**Паэзія Алеся Разанава**

1. Жыццяпіс і творчасць.
2. Лёс зборніка “Адраджэнне” (1970). Сімволіка назвы. Праблематыка кнігі.
3. Пошукавы характар зборніка “Назаўжды” (1974). Агульны рамантычны пафас кнігі і паглыбленне ў нацыянальную гісторыю беларусаў, цікавасць да яе трагічных старонак.
4. Зборнік “Каардынаты быцця” (1976). Жанр філасофскай паэмы ў кнізе. Пошукі “новай рэальнасці” (“метарэальнасці”).
5. Зварот да старажытнагрэчаскай міфалогіі ў “Паэме калодзежа”.
6. Зборнік “Шлях – 360” (1981).
7. Зборнікі “Вастрыё стралы” (1988) і “Паляванне ў райскай даліне” (1995) як працяг інтэлектуальна-філасофскіх і творча-эстэтычных пошукаў паэта.
8. Версэты як аўтарскі жанр філасофскай лірыкі і яго стылёвыя прыкметы.
9. Працяг паэтычнага аповеду пра жыццё рэчаў у нацыянальнай гісторыі беларусаў ўзборніку “У горадзе валадарыць Рагвалод” (1992).
10. Зборнікі “Рэчаіснасць” (1998) і 'Тановерскія пункціры” (2002) як працяг і развіццё пошукаў паэта ў новай літаратурнай сітуацыі.
11. Паэмы “Гліна”, “Камень”, “Жалеза” і сэнс архетыпаў у беларускай ментальнасці.

**Заняткі № 5**
**Паэзія Яўгеніі Янішчыц**

1. Асоба і лёс.
2. Першая кніжка “Снежныя грамніцы” (1970) і яе ацэнка у тагачаснай крытыцы.
3. Далейшая творчая эвалюцыя наэтэсы, выхад кніг “Дзень вечаровы” (1974), “Ясельда” (1978), “На беразе пляча” (1980), “Пара любові і жалю” (1983), “Каліна зімы” (1987).
4. Кнігі творчай спадчыны паэтэсы “У шуме жытняга святла” (1988) і “Выбранае” (2000).
5. Паэтызацыя родных краявідаў і палескага краю (“Прыедзь у край мой ціхі...”, “Старана мая азёрная” і інш.). Вясковы свет як сфера ідэальнага, прыгожага, гарманічнага быцця.
6. Інтымная лірыка. Вобразы землякоў, працавітых людзей беларускага Палесся.
7. Вобраз маці як апірышча духоўнага свету Я. Янішчыц.
8. Аднавяскоўцы паэтэсы як ахвяры часу, пакутнікі, людзі трагічнай эпохі.
9. Паэмныя творы Я. Янішчыц, іх жанравая спецыфіка, вобразны свет, сюжэтна-кампазіцыйная адметнасць.
10. Спалучэнне сілаба-танічнага верша і рыфмаванай прозы ў паэме “Ягадны Хутар”.
11. Лірыка-драматычны пачатак, эмацыянальная экспрэсія і псіхааналіз у паэмах “Акно ў дождж” і “Прызнанне вачамі”.
12. Грамадзянскасць пафасу “Зорнай паэмы”.

Репозиторий ВГУ

### Заняткі № 6, 7
### Творчасць Івана Шамякіна

1. Раман "Глыбокая плынь" (1949), яго папулярнасць і высокая грамадская ацэнка. Прычыны фенаменальнага поспеху твора. Блізкасць герояў рамана да іх прататыпаў. Наватарства пісьменніка ў распрацоўцы партызанскай тэмы.
2. Адлюстраванне ў рамане "У добры час" (1952) першых гадоў мірнага жыцця. Змены ў ацэнцы твора крытыкай на працягу дзесяцігоддзяў.
3. Творчасць І. Шамякіна другой паловы 1950-х – 1960-х гг. Наватарская адметнасць рамана "Крыніцы" (1956). Надзённасць, актуальнасць пастаўленых праблем, асэнсаванне складаных грамадскіх працэсаў. Стылёвыя асаблівасці рамана: публіцыстычнасць, спалучэнне рэалізму і рамантызму.
4. Сюжэтна-кампазіцыйная пабудова пенталогіі "Трывожнае шчасце".
5. Складанасць чалавечых узаемаадносінаў у аповесці "Ах, Міхаліна, Міхаліна" (1966).
6. Жанчына і вайна ў аповесцях "Шлюбная ноч" (1974), "Гандлярка і паэт" (1975).
7. Сацыяльна-этычная сутнасць канфлікту ў рамане "Сэрца на далоні" (1963).
8. Тэматычна-праблемная навізна рамана "Атланты і карыятыды" (1974).
9. Катэгорыя памяці, праблема злачынства і даравання ў рамане "Вазьму твой боль" (1979). Маральна-псіхалагічная сутнасць канфлікту.
10. Першы раман пра Чарнобыль у беларускай літаратуры – "Злая зорка" (1991).
11. Адлюстраванне разнастайных бакоў сучаснага жыцця і маральна-этычная праблематыка ў аповесцях "Сатанінскі тур" (1993), "Падзенне" (1994), "Без пакаяння" (1995), "Палеская мадонна" (1996), "Крывінка" (1995).

### Заняткі № 8
### Проза Івана Чыгрынава

1. Апавяданні І. Чыгрынава са зборнікаў "Птушкі ляцяць на волю" (1965), "Самы шчаслівы чалавек" (1967), "Ішоў на вайну чалавек" (1973). Спецыфіка жанру апавяданняў-вандровак, апавяданняў-даследаванняў.
2. Пенталогія пра вайну, яе жанравая адметнасць. Асаблівасці мастацкага хранатопу. Гісторыя напісання.
3. Раман "Плач перапёлкі" (1972). Мастацкая канцэпцыя "ўсенароднай вайны".
4. Раман "Апраўданне крыві" (1977).
5. Раман "Свае і чужынцы" (1984). Драматычны канфлікт паміж станоўчымі і адмоўнымі персанажамі твора як увасабленне трагедыі народа.
6. Раман "Вяртанне да віны" (1992). Праблема адказнасці і віны як сведчанне зменаў у светапоглядзе празаіка. Рэалістычны паказ трагедыі народа на акупіраванай тэрыторыі.
7. Раман "Не усе мы згінем" (1996). Змены ў стылістыцы твора. Сістэма вобразаў.
8. Драматургія І. Чыгрынава. Арыгінальнае прачытанне вядомых фактаў і падзей беларускай мінуўшчыны ў п'есах "Звон – не малітва", "Следчая справа Вашчылы", "Чалавек з мядзведжым тварам", "Ігракі", "Осцей – Альгердаў унук".

### Заняткі № 9
### Творчасць Віктара Казько

1. Віктар Казько як прадстаўнік "міфалагічнага рэалізму" ў беларускай літаратуры.
2. Лёс "дзяцей вайны". Мастацкае адлюстраванне біяграфіі ў аповесцях "Высакосны год" (1972), "Добры дзень і бывай" (1974).

Репозиторий ВГУ

3. Аповесць “Суд у Слабадзе” (1978). Сімволіка назвы. Міфавобразы і міфаматывы ў творы. Маналогі і “плынь свядомасці” ў творы.
4. Раман “Неруш” (1981). Праблемы экалогіі прыроды ў рамане і ў аповесці “Цвіце на Палессі груша” (1978). Узбагачэнне паняцця рэалізму. Міфалагічнае ў прозе В. Казько. Вобраз Палесся як Эдэму. Вобразы палешукоў.
5. Раман “Хроніка дзіцячага саду” (1986). Сімволіка Саду як зямнога раю. Вобразы дзяцей-сірот. Жыццё чалавека ў свеце прыроды. Роля гістарычнай рэтраспекцыі ў стварэнні вобраза сучаснасці. Міфалагічны пачатак ва ўспрыманпі свету.
6. Драматызацыя жанру і паглыбленне філасафізму ў аповесцях “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел” (1993), “Но Пасаран” (1993), “Прахожы” (1995), “Да сустрэчы...” (1997) і інш.
7. Засваенне сэнсу экзістэнцыяльнай катэгорыі абсурду ў дачыненні да сучаснай беларускай гісторыі ў рамане “Бунт незапатрабаванага праху” і ў аповесці “Час збіраць косці” (2005).

**Заняткі № 10**
**Творчасць Аляксея Дударава**

1. Зборнік апавяданняў “Святая птушка” (1979). Жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы А. Дударава і праблема драматызацыі сюжэта. Вобразы герояў-“дзівакоў” як носьбітаў беларускіх уяўленняў пра мараль (павышаная чуласць, ранімасць, арыентацыя на высокае і прыгожае ў жыцці, вонкавая працякаватасць).
2. Праблема духоўнасці ў бездухоўным свеце. П’есы “Выбар” (1979) і “Апошні ўзлёт” (1982).
3. Актуальнасць маральна-этычнай праблематыкі (каштоўнасці чалавечага жыцця, “неперспектыўных вёсак”). Яскравыя людскія тыпы ў п’есе “Вечар” (Гастрыт, Мульцік, Ганна). Канфлікт асобы і асяроддзя.
4. П’еса “Парог” (1981). Сімволіка-метафарычны пласт у змесце п’есы (вобраз “парога”).
5. П’еса “Радавыя” (1984), яе сцэнічны поспех. Ідэйна-вобразныя і жанрава-стылёвыя асаблівасці твора у кантэксце беларускай і рускай “ваеннай літаратуры”. Сістэма вобразаў.
6. Новыя героі (“лішнія людзі”, “людзі дна”, бамжы, бадзягі) у п’есе “Злом” (1987).
7. Рэальнае і фантастычнае ў драме “Адцуранне” (1994), раскрыццё ў ёй трагізму Чарнобыля.
8. Зварот да нацыянальнай гісторыі ў п’есах “Купала” (“Князь Вітаўт”, 1994), “Палачанка” (1998), “Чорная панна Нясвіжа” (1998), “Крыж” (2000).

**Заняткі № 11**
**Творчасць Міколы Матукоўскага**

1. Майстэрства тыпізацыі і камізму ў п’есе “Мудрамер” (1987).
2. Публіцыстычная скіраванасць драмы “Бездань” (1992), выяўленне ў ёй складанасці ўнутранага стану чалавека.
3. Гратэск і парадокс у мастацкай сістэме камедыі “Калізей” (1992).

Репозиторий ВГУ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## 7 СЕМЕСТР

### Заняткі № 1
### Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе

1. Роля і месца вучэбнага нрадмета "Беларуская літаратура" ў структуры зместу агульнай сярэдняй адукацыі.
2. Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура" (I-XI класы), канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура".
3. Аналіз вучэбных праграм і вучэбных дапаможнткаў па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі

### Заняткі № 2
### Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу. Літаратурнае развіццё школьнікаў

1. Прафесійныя веды і педагагічныя ўменні настаўніка-славесніка: псіхолага-педагагічныя, прадметна-навуковыя, метадалагічныя, агульнакультурныя.
2. Планаванне і імправізацыя як умовы педагагічнай творчасці. Значэнне планавання работы настаўніка ў павышэнні эфектыўнасці заняткаў па літаратуры. Перспектыўнае і бягучае планаванне.
3. Віды планаў: каляндарны, тэматычны, паўрочны. Варыянтнасць планаў у залежнасці ад узроўню літаратурнага і агульнага развіцця вучняў, ад спецыфікі мастацкага твора, ад вучэбна-выхаваўчых задач.
4. Узроставыя асаблівасці і этапы літаратурнага развіцця вучняў.

### Заняткі № 3
### Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры

1. Гістарычныя вытокі методыкі выкладання беларускай літаратуры і асноўныя этапы яе развіцця.
2. Першыя беларускія чытанні. Роля Цёткі, Я. Коласа, І. Замоціна і інш.
3. Першыя праграмы па беларускай літаратуры. Падручнікі І. Самковіча, І. Пратасевіча, У. Дзяржынскага.
4. Метадычны друк на Беларусі.
5. Сучасны стан методыкі літаратуры.

### Заняткі № 4
### Метады і прыёмы навучання літаратуры

1. Класіфікацыі метадаў і прыёмаў навучання літаратуры.
2. Прыёмы эмацыянальна-вобразнага спасціжэння твора (уласнаметадычныя): выразнае чытанне, вуснае славеснае маляванне і інш. Эўрыстычная гутарка.
3. Прыёмы спасціжэння аўтарскай пазіцыі.
4. Інавацыйныя метады і прыёмы аналізу мастацкага твора: эксплікацыя, метад мастацкай інтэрпрэтацыі, метад літаратурнага пошуку і інш.

Репозиторий ВГУ

**Заняткі № 5**

**Этапы вывучэння мастацкага твора ў сярэдняй школе**

1. Уступныя заняткі як этап вывучэння мастацкага твора.
2. Чытанне твора і арыенціровачныя заняткі.
3. Аналіз як этап вывучэння літаратурнага твора.
4. Заключны этап выучэння літаратурнага твора.

**Заняткі № 6**

**Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родава-жанравай спецыфіцы.**
**Урокі па вывучэнні эпічных, лірычных, драматычных твораў**

Родава-жанравая спецыфіка эпічных твораў.

1. Вывучэнне малых эпічных форм у V–VIII кл.
2. Вывучэнне эпічных твораў, у старшых класах.
3. Метады і прёмы работы.
4. Асаблівасці ўспрымання і аналізу лірычных жанраў.
5. Спецыфіка вывучэння лірыкі ў V–VIII і IX–XI класах.
6. Метады і прыёмы аналізу лірычнага верша на ўроку літаратуры.
7. Асаблівасці ўспрымання і аналізу драматычных жанраў.
8. Спецыфіка драматычных твораў і яе ўплыў на выбар метадаў і прыёмаў аналізу тэкста.
9. Стварэнне сцэнічнага эфекту на ўроку.
10. Метады і прыёмы працы на ўроку.

**Заняткі № 7**

**Урок літаратуры ў сучаснай школе**

1. Змест, структура, тыпалогія ўрокаў.
2. Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры.
3. Класіфікацыі ўрокаў літаратуры.
4. Сучасныя навучальныя тэхналогіі на ўроку літаратуры.
5. Урокі-канферэнцыі, дыспуты, завочныя экскурсіі і г.д.
6. Гульнёвыя формы навучання.

**Заняткі № 8**

**Гісторыя літаратуры ў школьным вывучэнні**

1. Задачы вывучэння аглядных тэм і іх роля ў літаратурнай адукацыі школьнікаў.
2. Тыпы аглядавых тэм. Змест і структура.
3. Кароткі аналіз мастацкіх тэкстаў, звесткі аб развіцці культуры, крытыкі, аб асобных пісьменніках.

**Заняткі № 9**

**Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні**

1. Паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроках літаратуры.
2. Першапачатковае назіранне.
3. Усведамлення сутнасці паняцця, яго ўзбагачэнне і свядомае выкарыстанне ў працэсе аналізу мастацкага твора і ва ўласнай літаратурнай творчасці.

**Заняткі № 10**

**Развіццё маўлення на ўроку літаратуры**

1. Асноўныя прынцыпы работы па ўзбагачэнні маўлення вучняў.

Репозиторий ВГУ

2. Накірункі работы па развіцці маўлення вучняў.
3. Развіццё вуснага і пісьмовага маўлення вучняў.
4. Віды вусных выказванняў і пісьмовых работ ў V–VIII і IX–XI класах.
5. Тэматычная класіфікацыя сачыненняў.
6. Сачыненні розных жанраў.
7. Сачынненні і пераказы з элементамі мастацкай творчасці.
8. Навучальныя і кантрольныя сачыненні.
9. Падрыхтоўка да напісання сачынення.
10. Праверка і аналіз сачыненняў.
11. Жанры мастацкай літаратуры і публіцыстыкі ў літаратурнай творчасці школьнікаў.
12. Метадычныя шляхі, прыёмы і ўмовы развіцця літаратурнай творчасці школьнікаў.

**Заняткі № 11**

**Пазакласная і пазашкольная праца па літаратуры**

1. Развіццё творчых літаратурных здольнасцей вучняў.
2. Гурткі літаратурнага профілю.
3. Літаратурнае краязнаўства.
4. Арганізацыя і правядзенне літаратурных ранішнікаў і вечароў у школе.
5. Роля і месца пазакласнага (дадатковага) чытання ў сістэме літаратурнай адукацыі.
6. Формы кантролю.
7. Спецыфіка ўрокаў пазакласнага чытання.

Репозиторий ВГУ

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (ЭКЗАМЕН)

### 1 СЕМЕСТР

1. Перыядызацыя літаратуры XI – XVIII стст. Асноўныя жанры рэлігійнай і свецкай літаратуры (арыгінальнай і перакладной) XI – XVI стст.
2. Асноўныя жанры рэлігійнай і свецкай літаратуры (арыгінальнай і перакладной) другой паловы XIII – XVI стагоддзяў.
3. Рэлігійныя перакладныя кнігі XI – XIII стст. Сутнасць, змест, гісторыя іх з'яўлення ў Старажытнай Русі.
4. Біблія як твор мастацкай літаратуры. Сакральнае значэнне Бібліі. Тэматычны змест "Евангелля" (на выбар).
5. Біблія, гісторыя яе ўзнікнення. Паняцце тэандрычнасці Бібліі. Структура Старога Запавету. Першыя пераклады Бібліі.
6. Біблія, асноўныя жанры біблійных кніг. Структура Новага Запавету. Тэматычны змест кнігі "Быццё".
7. Біблія. Тэматычны змест кнігі "Прароцтва св. Яна Багаслова". Дэкалог.
8. Біблія. Жанр прытчы ў біблійных кнігах (на прыкладзе "Евангелляў"). Афарызмы ў кнізе "Еклезіяст".
9. Біблія. Тэматычны змест кнігі "Псалтыр". Гісторыя яе напісання. паняцце сінаптычнасці ў дачыненні аўтараў "Евангелляў".
10. Апокрыф "Хаджэнне Багародзіцы па пакутах". Тэматычны змест апокрыфа, сутнасць жанру. Мараліта ў творы.
11. Агіяграфія. Генезіс і сутнасць. Гісторыя ўзнікнення агіяграфіі ў Старажытнай Русі. "Жыціе Барыса і Глеба".
12. Агіяграфія. Генезіс і сутнасць. Гісторыя ўзнікнення агіяграфіі на тэрыторыі Белраусі "Жыція Еўфрасінні Полацкай".
13. Агіяграфія. Генезіс і сутнасць. "Жыціе Аўраама Смаленскага". Праложнае "Жыціе Кірылы Тураўскага".
14. Агіяграфія. Генезіс і сутнасць. "Жыціе трох віленскіх пакутнікаў". Паняцце кананічнай і апакрыфічнай агіяграфіі, яе структура.
15. "Аповесць пра Меркурыя Смаленскага" як прыклад секулярызацыйных працэсаў ў літаратуры XII – XIII стст. Тэматычны змест аповесці, вобраз Меркурыя.
16. Паняцце летапісу. Гіпотэзы ўзнікнення летапісання ў Кіеўскай Русі (Дз.Ліхачоў, А.Шахматаў).
17. "Аповесці мінулых гадоў" як першы агульнадзяржаўны летапісны звод XII стагоддзя. Тыпы пагадовых запісаў у "Аповесцях".
18. "Аповесці мінулых гадоў". Тэма, ідэя летапісу. Паняцце летапіснага апавядання. Летапісныя апавяданні пра княгіню Вольгу, Рагнеду, Рагвалода і інш.
19. Кірыла Тураўскі. Агульная характарыстыка жыцця і літаратурнай творчасці. Філасофскі змест "Прытчы пра сляпога і кульгавага".
20. З гісторыі красамоўства ў Старажытнай Русі. К. Тураўскі. "Слова на Узнясенне" (або іншае, на выбар).
21. К. Тураўскі. Паэтыка ўрачыстых слоў пісьменніка (на прыкладзе аднаго, на выбар). Паняцце ампліфікацыі.
22. Клім Смаляціч. Біяграфічныя звесткі. "Пасланне смаленскаму прасвітару Фаме". Ідэя перавагі духоўнага над матэрыяльным.
23. Бібліяграфія курса старажытнай беларускай літаратуры.

Репозиторий ВГУ

24. Гістарычная тэма ў сучаснай беларускай прозе (творчасць А. Лойкі, У. Арлова, Л. Дайнекі, В. Іпатавай і інш.).
25. Навуковыя даследаванні па старажытнай беларускай літаратуры за апошнія 20 год (І. Саверчанка, А. Мельнікаў, А. Лойка, С. Гаранін і інш.).
26. Кірыла Тураўскі. Жанравая спецыфіка ўрачыстых слоў пісьменніка, іх тэматыка і кампазіцыя (“Слова на Фаміну Нядзелю”).
27. “Слова пра паход Ігаравы”. Адкрыццё і вывучэнне помніка. Гістарычныя факты і асобы ў “Слове…” Праблема аўтарства.
28. “Слова пра паход Ігаравы”. Праблема аўтэнтычнасці “Слова…” Жанравая прырода твора, яго колеравая сімволіка.
29. Міфалогія ў “Слове пра паход Ігаравы”. Язычніцкі боскі пантэон і яго прызначэнне ў творы.
30. Міфалогія ў “Слове пра паход Ігаравы”. Анімізм, дэманалагічныя персанажы ў творы і іх сімволіка.
31. Сістэма вобразаў “Слова пра паход Ігаравы”. Вобраз полацкага князя Усяслава Чарадзея. Паняцце “панарамнага зроку”.
32. Сімволіка “Слова пра паход Ігаравы”. Ваенныя сімвалы, прыродныя сімвалы.
33. “Слова пра паход Ігаравы”. Паэтыка сна князя Святаслава, плачу Яраслаўчы і бітвы на Нямізе.
34. Геаграфія “Слова пра паход Ігаравы”. Траян і Баян – рэаліі і гіпотэзы. Фальклорныя элементы ў творы.
35. Язычніцтва і хрысціянства ў “Слове пра паход Ігаравы”. Пераклады “Слова” на беларускую мову.
36. Хаджэнні. Іх спецыфіка як жанру. Апісанне падарожжаў да святынь Візантыі і Палестыны. “Хаджэнне ігумена Данііла”.
37. Беларуска-літоўскае летапісанне. Асноўныя зводы і спісы летапісаў, іх структура. Гісторыя вывучэння беларуска-літоўскіх летапісаў у беларускай медыявістыцы.
38. Беларуска-літоўскае летапісанне. “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”. Час напісання, тэматычны змест.
39. Беларуска-літоўскае летапісанне. Летапіснае апавяданне ў “Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх”, сутнасць і літаратурнасць.
40. “Летапіс 1446 года”. Ідэя, тэматычны змест летапісу, структура.
41. Навуковыя даследаванні па курсе за апошнія 20 гадоў ( І. Саверчанка, У. Арлоў, С. Кавалёў, Ж. Некрашэвіч і інш.).
42. Гістарычная тэма ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў.
43. Мастацкія асаблівасці, вобраз Вітаўта ў “Пахвале Вітаўту”.
44. Легенды і паданні ў “аповесцях мінулых гадоў”.
45. Асаблівасці награцыі ў “Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх”.
46. Жанравыя разнавіднасці кніг Старога і Новага Запаветаў.

**2 СЕМЕСТР**

1. Беларуска-літоўскія летапісы. “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”. Летапіснае апавяданне пра Палямона, пра заснаванне Вільні князем Гедымінам.
2. Беларуска-літоўскія летапісы. “Хроніка Быхаўца”. Ідэйна-тэматычны змест летапісных апавяданняў пра Палямона і паход князя Альгерда на Маскву.
3. Адраджэнне, асноўныя ідэі і асаблівасці эпохі. Гуманізм. Антрапацэнтрызм.
4. Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны (пражскі і беларускі перыяды). Агульная характарыстыка біблейных кніг, выдадзеных Ф. Скарынам.

Рэпазіторый ВГУ

5. Прадмовы і пасляслоўя Ф. Скарыны як выяўленне асветніцтва і гуманізму.
6. М. Гусоўскі. Біяграфія і агульная характарыстыка творчага шляху. Творчая гісторыя паэмы "Песня пра зубра".
7. "Песня пра зубра" як гераічны эпас. Вобраз князя Вітаўта. Ідэйная сувязь "Песні..." са "Словам пра паход Ігаравы".
8. Вобраз зубра ў паэме М. Гусоўскага "Песня пра зубра". Адлюстраванне ў ім сярэднявяковага і рэнесанснага светабачання.
9. Ян Вісліцкі. Біяграфічныя звесткі. Паэма "Пруская вайна". Структура паэмы, яе ідэйны змест.
10. Агульнае паняцце аб Рэфармацыі. Рэфармацыйныя плыні (лютэранства, кальвінізм, арыянства, антытрынітарыі і інш.).
11. С. Будны. Грамадская і кнігавыдавецкая дзейнасць. Кнігі С. Буднага на старабеларускай мове. Прадмова да "Катэхізіса", патрыятычныя ідэі аўтара, яго погляды на мову і асвету.
12. С. Будны. Агульная характарыстыка напісанага і выдадзенага С. Будным на лацінскай і польскай мовах.
13. В. Цяпінскі. Біяграфічныя звесткі. Кнігавыдавецкая дзейнасць В. Цяпінскага. Прадмова да "Евангелля", яе патрыятычны пафас, антыфеадальная накіраванасць.
14. Ф. Еўлашоўскі. Біяграфічныя звесткі. "Дзённік" Ф. Еўлашоўскага, яго творчая гісторыя. Вобраз шляхты ў "Дзённіку".
15. Ф. Кміта-Чарнабыльскі. Біяграфічныя звесткі. "Лісты" Ф. Кміты-Чарнабыльскага як выдатны помнік мемуарнай літаратуры канца XVI стагоддзя.
16. А. Рымша. Біяграфічныя звесткі. Агульная характарыстыка літаратурнай творчасці. Ідэйны змест паэмы "Дзесяцігадовая аповесць…", вобраз К. Радзівіла.
17. Царкоўна-палемічная публіцыстыка. Прычыны яе ўзнікнення. Пісьменнікі-палемісты (М. Сматрыцкі, А. Філіповіч, К. Філалет і інш.).
18. Мялецій Сматрыцкі. Біяграфія. "Трэнас". Прадгісторыя ўзнікнення помніка. Вобраз маці-царквы, мастацкія вартасці "Трэнаса".
19. Апанас Філіповіч. Біяграфічныя звесткі. "Дыярыуш" А. Філіповіча як выдатны помнік палемічнай літаратуры першай паловы XVII ст.
20. Крыштоф Філалет і яго "Апокрысіс". Тэматычны змест твора.
21. Сатырычная літаратура. "Прамова Мялешкі". Творчая гісторыя помніка. Ідэйна-тэматычны змест "Прамовы...".
22. Сатырычная літаратура. "Ліст да Абуховіча". Ідэйна-тэматычны змест "Ліста...", народна-размоўныя элементы ў яго мове.
23. Паняцце пра мемуары. "Баркулабаўская хроніка". Час узнікнення. Праблема аўтарства. Летапісныя традыцыі ў "Хроніцы...".
24. "Баркулабаўская хроніка". Асоба летапісца ў творы.
25. "Баркулабаўская хроніка", ідэйна-тэматычны змест твора, яго мастацкія асаблівасці.
26. "Хроніка" Яна Цадроўскага. Тэматычны змест, жыццёвы шлях мемуарыста.
27. "Дыярыуш" П.К. Абуховіча. Тэматычны змест і мастацкія вартасці "Дыярыуша", асоба мемуарыста ў ім.
28. "Дыярыуш" і запіскі Я.У. Пачобута-Адланіцкага. Тэматычны змест, мастацкія вартасці "Дыярыуша", асоба мемуарыста ў ім.
29. Гарадское летапісанне. "Магілёўская хроніка" Т.Р. Сурты і Ю. Трубніцкага. Звесткі пра аўтараў. Тэматычны змест "Хронікі", яе мастацкія вартасці.
30. Гарадское летапісанне. "Віцебскі летапіс" М. Панцырнага і С. Аверкі. Звесткі пра аўтараў. Тэматычны змест летапіса.

Репозиторий ВГУ

31. Сімяон Полацкі. Жыццёвы шлях. Агульная характарыстыка творчасці беларускага перыяду.
32. Сімяон Полацкі. Жыццёвы шлях. Агульная характарыстыка творчасці маскоўскага перыяду.
33. Саламон Рысінскі. Агульная характарыстыка жыццёвага і літаратурнага шляху.
34. Агульнае паняцце пра паломніцкую літаратуру. Час узнікнення. "Падарожжа да святой зямлі" М. Крыштофа Радзівіла (Сіроткі).
35. "Авантуры майго жыцця" С. Пільштыновай-Русецкай: ідэйна-мастацкія асаблівасці твора.
36. Школьны тэатр і драматургія XVII ст.: ідэйна-мастацкая спецыфіка.
37. Жыццё і творчасць Ф.У. Радзівіл.
38. Драматургія XVIII ст. "Камедыя" К. Марашэўскага.
39. Драматургія XVIII ст. Батлейка. Творчасць М. Цяцерскага.
40. Творчасць Лаўрына і Сцяпана Зізаніяў.
41. Вобраз Ф. Скарыны ў беларускай літаратуры.
42. Гістарычная тэма ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў (У. Арлоў, В. Іпатава і інш.).

## 3 СЕМЕСТР

1. Новая беларуская літаратура. Развіццё літаратуры ў XIX ст. Сувязь літаратуры з палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі падзеямі. Трохмоўе беларускай літаратуры ў гэты перыяд. Асноўныя мастацкія плыні.
2. Літаратура эпохі Рамантызму (20-40-я гг. XIX ст.): асаблівасці развіцця. Літаратурна-грамадскі рух першай трэці XIX ст.: філаматы, філарэты, шубраўцы. Фальклор і літаратура 20-40-х гг.
3. Жыццёвы і творчы шлях Адама Міцкевіча. Санеты і балады Адама Міцкевіча: праблематыка, мастацкая спецыфіка.
4. Паэмы Адама Міцкевіча "Гражына" і "Конрад Валенрод": праблематыка, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці.
5. Паэма "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча. Яе прыгодніцкая фабула, патрыятычныя матывы. Вобразная сістэма твора. Іронія і гумар у адлюстраванні шляхецкага жыцця і прадстаўнікоў улады.
6. Паэма "Дзяды" Адама Міцкевіча: асноўныя праблемы, мастацкія асаблівасці.
7. Жыццёвы і творчы шлях Яна Чачота. Беларуска- і польскамоўная творчасць. Асветніцкія і рамантычныя тэндэнцыі.
8. Творчая спадчына паэтаў філаматцкага асяроддзя: Тамаш Зан.
9. Творчая спадчына паэтаў філаматцкага асяроддзя: Антон Эдвард Адынец, Петрашкевіч, Аляксандр Ходзька, Ігнат Дамейка, Юльян Корсак, інш.
10. Жыццё і творчасць Паўлюка Багрыма.
11. Ананімныя творы 20-40-х гадоў XIX стагоддзя: тэмы і вобразы.
12. "Энеіда навыварат": устанаўленне аўтарства і месца напісання, праблематыка твора.
13. Асноўныя прадстаўнікі беларускай паэзіі (браты Грымалоўскія Валерыян, Клеменс, Юльян; Гаўдэнты Шапялевіч, Габрыеля Пузыня, інш.), прозы і публіцыстыкі 1820-40-х гг (Генрык Жавускі, Марцін Асорыя-Цяплінскі, Аляксандр Гроза, Рамуальд Падбярэзскі, Ігнат Храпавіцкі, інш.).
14. Жыццёвы і творчы шлях Тадэвуша Лады-Заблоцкага. Праблематыка і мастацкія асаблівасці паэмы "Ваколіцы Віцебска".
15. Жыццёвы і творчы шлях Яна Баршчэўскага.
16. Беларускамоўная і польскамоўная паэзія Яна Баршчэўскага.

Репозиторий ВГУ

17. Балады Яна Баршчэўскага.
18. Кніга Яна Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”: праблематыка, мастацкія асаблівасці.
19. Ідэйна-мастацкія асаблівасці аповесці Яна Баршчэўскага “Драўляны Дзядок і кабета Інсекта”.
20. Ідэйна-мастацкія асаблівасці аповесці Яна Баршчэўскага “Душа не ў сваім целе”.
21. Ідэйна-мастацкія асаблівасці твора Яна Баршчэўскага “Жыццё Сіраты”.
22. Літаратурна-грамадскі рух 50-60-х гадоў.
23. Ігнацы Яцкоўскі і Адам Плуг: творчая спадчына. Асоба і творчая дзейнасць Юльяна Ляскоўскага.
24. Жыццёвы і творчы шлях Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Паэзія Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
25. Праблематыка і мастацкія асаблівасці вершаваных аповесцяў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
26. Праблематыка і мастацкія асаблівасці вершаваных апавяданняў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
27. Праблематыка і мастацкія асаблівасці п’есы “Ідылія” (“Сялянка”) Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
28. Праблематыка і мастацкія асаблівасці п’есы “Пінская шляхта” Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Пытанне аўтарства.
29. Праблематыка і мастацкія асаблівасці п’есы “Залёты” Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
30. Асоба і творчасць Уладзіслава Сыракомлі.
31. Творчасць Вінцэся Каратынскага. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэмы “Таміла”.
32. Грамадска-літаратурная дзейнасць Кастуся Каліноўскага.
33. Ананімная літаратура 50-60-х гг., яе ідэйна-мастацкія асаблівасці. Паэма “Мачыха”.
34. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэмы “Тарас на Парнасе” і гутаркі “Два д’яблы”, гісторыя ўстанаўлення іх аўтарства.
35. Літаратурна-грамадскі рух на Віцебшчыне ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Дзейнасць Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Аляксандра Рыпінскага, Гераніма Марцінкевіча, Ялегі Вуля.
36. Літаратурна-грамадскі рух пасля паўстання Кастуся Каліноўскага. Ідэалогіі заходнерусізму і народніцтва. Публіцыстыка народнікаў.
37. Літаратурна-грамадская дзейнасць Адама Кіркора і Аляксандра Ельскага.
38. Творчасць Фелікса Тапчэўскага. Гумарыстычная накіраванасць вершаў (“Ён і яна”, “Вечарынка”), ідэалізацыя мінулага (“Саўсім не тое, што было”), дэмакратычная пазіцыя (“Грошы і праца”). Творчасць В. Савіча-Заблоцкага.
39. Жыццёвы і творчы шлях Элізы Ажэшкі.
40. Праблематыка, палемічная скіраванасць і асаблівасці псіхалагізму ў аповесці “Хам” Элізы Ажэшкі.
41. Праблематыка і мастацкія асаблівасці аповесці Элізы Ажэшкі “Дзюрдзі”.
42. Агульная характарыстыка літаратурнага працэсу канца 80-х- 90-х гг. XIX ст. Асноўныя аўтары, літаратурныя напрамкі, культурны і грамадскі рух. Друк.
43. Жыццёвы і творчы шлях Альгерда Абуховіча. “Мемуары” аўтара.
44. Жыццёвы і творчы шлях Адама Гурыновіча.
45. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Лучыны. Ідэйна-мастацкі аналіз паэмы “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”.
46. Жыццёвы і творчы шлях Францішка Багушэвіча. Публіцыстыка і проза Францішка Багушэвіча, значэнне яго творчасці.

Репозиторий ВГУ

47. Паэтычныя зборнікі Францішка Багушэвіча "Дудка беларуская" і "Смык беларускі". Асноўныя мастацкія прынцыпы, асаблівасці псіхалагізму і лірызму, тэмы, матывы.
48. Творчая спадчына Зоф'і Манькоўскай і Марыі Косіч.

**4 СЕМЕСТР**

1. Беларуская літаратура перыяду нацыянальнага Адраджэння (1900–1930-я гг.): гістарычныя ўмовы і асаблівасці развіцця. Перыяд культурна-літаратурнага ўсплёску.
2. Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў дакастрычніцкі перыяд. Першыя беларускія грамадска-культурныя аб'яднанні, выдавецкія органы і друкаваныя выданні на тэрыторыі Беларусі і Расіі.
3. Роля першых беларускіх газет у развіцці літаратурнага працэсу. "Наша ніва" як адзін з найбуйнейшых цэнтраў культурна-літаратурнага жыцця беларусаў у першыя дзесяцігоддзі XX ст.
4. Беларуская літаратура ў паслякастрычніцкі перыяд. Літаратура ўсходняй і заходняй Беларусі. Умовы развіцця, ідэйна-мастацкая спецыфіка, жанры і плыні.
5. Асаблівасці развіцця беларускай паэзіі ў 1900–1930-я гг. Разнастайнасць праблематыкі і паэтыкі. Уплыў на беларускую паэзію рэалізму, рамантызму, мадэрнісцкіх плыняў.
6. Усплёск жаночай паэзіі ў 1900-1930-я гг. Творчасць Канстанцыі Буйло, Наталлі Арсенневай у беларускім культурна-літаратурным кантэксце. Феномен беларускага жаночага руху ў першай трэці XX стагоддзя.
7. Літаратурныя аб'яднанні "Маладняк", "Полымя", "Узвышша" і іх роля ў літаратурным працэсе. Асаблівасці развіцця беларускай паэзіі ў рамках гэтых аб'яднанняў у 1920-я гг.
8. Беларускай проза 1900–1930-я гг. Праблематыка, жанравая разнастайнасць. Развіццё філасофскай, дакументальна-мастацкай, аўтабіяграфічнай, сатырычнай, лірычнай прозы. Станаўленне буйных празаічных формаў.
9. Развіццё беларускай драматургіі ў 1900–1930-я гг. Станаўленне беларускага тэатра. Драматургічныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, Ф. Аляхновіча.
10. Жыццёвы і творчы шлях Я. Купалы.
11. Мастацкая эвалюцыя Я. Купалы ў зборніках "Жалейка", "Гусляр", "Шляхам жыцця".
12. Ідэйна-мастацкія адметнасці ранніх паэм Я. Купалы ("Адплата кахання"). Услаўленне кахання, жанчыны і працы ў паэме-ідыліі "Яна і я".
13. Услаўленне чалавечай годнасці і непадкупнасці ў рамантычных паэмах Я. Купалы "Курган" і "Бандароўна". Дэманічнае і гераічнае ў персанажах паэмы "Магіла льва".
14. Драматычная паэма "Сон на кургане" Я. Купалы: ідэйна-мастацкія, кампазіцыйныя асаблівасці. Сімволіка.
15. Праблематыка, вобразная сістэма, мастацкія адметнасці камедыі "Паўлінка" Янкі Купалы. Творчая гісторыя камедыі.
16. Драма "Раскіданае гняздо": аўтабіяграфічная аснова, сацыяльна-філасофскі і сімвалічны характар.
17. Трагікамедыя "Тутэйшыя" Я. Купалы, ідэйна-мастацкія асаблівасці, трагічнае і камічнае ў п'есе.
18. Паэзія Янкі Купалы 1920-х і 1930-х гадоў: ідэйны змест, тэматыка, мастацкія асаблівасці. "Ляўкоўскі цыкл", зборнік "Спадчына".

Репозиторий ВГУ

19. Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа.
20. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэзіі Я. Коласа. Творчая эвалюцыя Коласа-паэта.
21. Псіхалагічна заглыбленая і філасофская проза Я. Коласа. Філасофскі змест і алегарычнасць вобразаў са зборніка “Казкі жыцця” Якуба Коласа.
22. Ідэйны змест, мастацкія асаблівасці паэмы “Сымон-музыка” Я. Коласа. Гісторыя стварэння. Тры рэдакцыі паэмы. Асаблівасці кампазіцыі.
23. Тэматыка, праблематыка, асноўныя вобразы паэмы “Новая зямля” Я. Коласа. Кампазіцыя паэмы, яе аўтабіяграфічнасць.
24. Творчая гісторыя, праблематыка, асноўныя вобразы трылогіі “На ростанях” Я. Коласа.
25. Жыццёвы і творчы шлях Ядвігіна Ш.
26. Апавяданні Ядвігіна Ш. Алегарычнасць апавяданняў, іх гумар і сатыра.
27. Прыгодніцка-дэтэктыўныя элементы ў рамане “Золата” Ядвігіна Ш.
28. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага. Жанрава-стылёвая разнастайнасць твораў пісьменніка. М. Гарэцкі як празаік, драматург, літаратурны крытык.
29. Праблематыка ранніх апавяданняў М. Гарэцкага. Вобразы інтэлігентаў. Гуманістычная скіраванасць апавяданняў М. Гарэцкага пра вайну. Фантасмагарычныя творы пісьменніка.
30. Аповесць “Дзве душы” М. Гарэцкага, яе праблематыка. Вобраз галоўнага героя і персанажаў з выразнай грамадскай пазіцыяй. Феномен “двудушнасці” ў прозе М. Гарэцкага.
31. Аповесць М. Гарэцкага “Ціхая плынь”, яе ідэйна-мастацкія асаблівасці.
32. Жыццёвы і творчы шлях М. Багдановіча. Наватарства паэзіі М. Багдановіча.
33. Гісторыя напісання, структура зборніка “Вянок” М. Багдановіча. Жанравая разнастайнасць, імпрэсіяністычнасць і сімвалізм лірыкі. М. Багдановіч як першы беларускі паэт-урбаніст.
34. Позняя лірыка М. Багдановіча (1914 – пачатак 1917 гг.), яе спецыфіка.
35. Праблематыка і мастацкія асаблівасці прозы і паэм М. Багдановіча. М. Багдановіч як літаратуразнаўца і крытык.
36. Жыццёвы і творчы шлях З. Бядулі. Лірычнае і рамантычнае ў паэзіі З. Бядулі.
37. Проза З. Бядулі, апавяданні пра дзяцей.
38. Аповесць “Салавей”. Цэнтральныя вобразы, трагічнае і камічнае ў аповесці, кампазіцыйная будова твора.
39. Жыццёвы і творчы шлях Цёткі. Зборнікі паэзіі “Скрыпка беларуская” і “Хрэст на свабоду”: праблематыка, вобразы.
40. Псіхалагізм, экспрэсіўнасць, драматызм і гуманістычны змест апавяданняў Цёткі 1910–1914 гг. Кнігі Цёткі для дзяцей: выхаваўчы пафас і мастацкія асаблівасці.
41. Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Ц. Гартнага.
42. Проза Ц. Гартнага. Праблематыка рамана “Сокі цаліны”.
43. Жыццёвы і творчы шлях А. Гаруна.
44. Зборнік “Матчын дар” А. Гаруна: творчая гісторыя, структура, тэматыка. Вершы Алеся Гаруна 1917– 1920-х гг.: вобразная сістэма, ідэйны змест.
45. Жыццёвы і творчы шлях В. Ластоўскага. В. Ластоўскі як празаік, паэт, мемуарыст.
46. Спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця ў аповесці “Лабірынты” В. Ластоўскага.
47. Жыццёвы і творчы шлях Ф. Аляхновіча.
48. Мастацкае наватарства Ф. Аляхновіча-драматурга.

Репозиторий ВГУ

## 5 СЕМЕСТР

1. Беларускія літаратурныя суполкі 1920-1930-х гадоў.
2. Сатырычныя вершы і байкі К. Крапівы, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
3. Паэмы К. Крапівы, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
4. Апавяданні К. Крапівы, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
5. П'есы К. Крапівы "Канец дружбы", "Хто смяецца апошнім", іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
6. П'есы К. Крапівы "Мілы чалавек", "Брама неўміручасці", "На вастрыі", іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
7. Публіцыстыка К. Крапівы, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
8. Апавяданні П. Галавача, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
9. Аповесці П. Галавача "Вінаваты", "Спалох на загонах", іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
10. Апавяданні М. Лынькова 1920-30-х гадоў, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
11. Апавяданні М. Лынькова перыяду Вялікай Айчыннай вайны, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
12. Аповесці М. Лынькова, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
13. Лірыка Я. Пушчы, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
14. Паэмы Я. Пушчы ("Песня вайны", "Цень консула", "Крывавы плакат"), іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
15. Апавяданні Л. Калюгі, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
16. Аповесці Л. Калюгі "Ні госць ні гаспадар", "Нядоля Заблоцкіх", іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
17. Аповесці і раманы Л. Калюгі 1930-х гадоў, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
18. Лірыка У. Жылкі, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
19. Вершаваная сатыра і лірыка П. Труса, ідэйна-тэматычны змест твораў, іх мастацкія асаблівасці.
20. Паэмы П. Труса, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
21. Проза перыяду Вялікай Айчыннай вайны, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
22. Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
23. Драматургія перыяду Вялікай Айчыннай вайны, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
24. Паэма "Тэстамент" У. Жылкі, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
25. Малая проза У. Жылкі (апавяданні, дзённік), яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
26. Раман "Мядзведзічы" К. Крапівы, яго ідэйна-тэматычны змест, праблематыка, вобразная сістэма.
27. Літаратура Заходняй Беларусі, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
28. Апавяданні К. Чорнага 1920-30-х гадоў, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
29. Раннія раманы К. Чорнага "Сястра", "Зямля", іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.

Репозиторий ВГУ

30. Аповесці і раманы К. Чорнага 1930-х гадоў, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
31. Малая проза К. Чорнага перыяду Вялікай Айчыннай вайны, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
32. Аповесці і раманы К. Чорнага перыяду Вялікай Айчыннай вайны, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
33. Публіцыстыка К. Чорнага, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
34. Паэтычныя зборнікі У. Дубоўкі 1920-х гадоў, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
35. Паэмы У. Дубоўкі, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
36. Творчасць У. Дубоўкі к.1950 – сяр.1970-х гадоў, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
37. Літаратурна-крытычныя артыкулы К. Чорнага, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
38. Апавяданні М. Зарэцкага 1920-30-х гг., іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
39. Аповесць "Голы звер" і раман "Сцежкі-дарожкі" М. Зарэцкага, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
40. Раман "Вязьмо" М. Зарэцкага, яго ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
41. Апавяданні А. Мрыя, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
42. Раман "Запіскі Самсона Самасуя" А. Мрыя, яго ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
43. Апавяданні Я. Маўра, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
44. Аповесці Я. Маўра, іх ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
45. Раман "Палескія рабінзоны" Я. Маўра, яго ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.
46. Беларуская літаратура пасляваеннага перыяду, яе ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці.

## 6 СЕМЕСТР

1. М. Танк. Пачатак літаратурнай творчасці, станаўленне ўласнага паэтычнага голасу. Вобраз лірычнага героя ў даверасnёўскай паэзіі М. Танка.
2. Гуманістычны пафас, філасофская глыбіня, фальклорная аснова паэзіі М. Танка 60 – 80-х гг. Верлібр.
3. Міхась Стральцоў як прадстаўнік лірыка-рамантычнай прозы.
4. Паэзія А. Куляшова перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Жанр балады.
5. "Новая кніга" А. Куляшова як этап творчасці паэта і як новае слова ў беларускай паэзіі.
6. Жанравая і ідэйна-тэматычная разнастайнасць паэм А. Куляшова.
7. Пімен Панчанка. Адметныя рысы творчай асобы.
8. Ідэйна-мастацкая адметнасць асэнсавання падзей Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці П. Панчанкі.
9. Грамадская пазіцыя, публіцыстычная актыўнасць паэзіі П. Панчанкі 50 – 80-х гг. і сучаснага перыяду. Інтымная і пейзажная лірыка паэта.
10. Раман І. Мележа "Мінскі напрамак": творчая гісторыя, праблематыка, жанравыя асаблівасці, вобразная сістэма. Драматургія І. Мележа.
11. "Палеская хроніка" І. Мележа: праблематыка, вобразная сістэма, мастацкія асаблівасці. Традыцыйнае і наватарскае ў раманах "Палескай хронікі".

Рэпазіторый ВДУ

12. Праблемна-тэматычнае наватарства раманаў І. Навуменкі “Сасна пры дарозе”, “Вецер у соснах”, “Сорак трэці”.
13. Юнацкі свет у творах І. Навуменкі.
14. Маральна-этычныя праблемы ў раманах І. Навуменкі “Летуценік”, “Асеннія мелодыі” і аповесцях пісьменніка (адзін твор на выбар).
15. Беларуская літаратура другой паловы 50-х – 60-х гг.
16. Беларуская літаратура 70-х – першай паловы 80-х гг.
17. П’еса А. Макаёнка “Пагарэльцы”, яе мастацкая адметнасць.
18. Ідэйны змест і мастацкая адметнасць п’ес А. Макаёнка “Трыбунал”, “Зацюканы апостал”.
19. Сацыяльна-філасофскія пошукі А. Макаёнка ў камедыях 70-80-х гг.
20. Васіль Быкаў. Адметнасць творчай індывідуальнасці, эвалюцыя жанру і стылю аўтара, яго роля ў беларускай літаратуры.
21. “Ваенная аповесць” В. Быкава.
22. Тэма партызанскай барацьбы ў прозе В. Быкава.
23. Ідэйна-мастацкія асаблівасці, сістэма вобразаў аповесці В. Быкава “Знак бяды”.
24. Аповесці В. Быкава “Аблава”, “Сцюжа”, прыпавесці пісьменніка.
25. Аўтабіяграфізм рамана-дылогіі А. Адамовіча “Вайна пад стрэхамі” і “Сыны ідуць у бой”. Псіхалагізм і лірызм твора.
26. Праблематыка і мастацкая адметнасць прозы А. Адамовіча.
27. Вобразная сістэмы, жанрава-стылёвыя асаблівасці “Хатынскай аповесці” А. Адамовіча.
28. Псіхалагізм творчасці А. Адамовіча. Ідэйна-мастацкія асаблівасці рамана “Карнікі”.
29. Мастацкая адметнасць лірычнай прозы Я. Брыля. Апавяданні “Галя”, “Гуртавое”. Жанр лірычнай мініяцюры ў творчасці Я. Брыля.
30. Гумар у прозе Я. Брыля. Аповесць “Ніжнія Байдуны”.
31. Раман Я. Брыля “Птушкі і гнезды”. Ідэйна-філасофскі змест, аўтабіяграфізм, сімволіка назвы.
32. У. Караткевіч, яго роля ў развіцці беларускай літаратуры. Традыцыі У. Караткевіча ў сучасным літаратурным працэсе.
33. Паэзія У. Караткевіча.
34. Гістарычны дэтэктыў у творчасці У. Караткевіча.
35. Драматургія У. Караткевіча.
36. Асэнсаванне гістарычнага мінулага народа ў рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”. Сацыяльна-філасофскі змест і мастацкія асаблівасці рамана.
37. Раман У. Караткевіча “Леаніды не вернуцца да зямлі” (“Нельга забыць”), яго ідэйна-мастацкая адметнасць.
38. Ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце паэзіі П. Броўкі 50-70-х гг.
39. Паэма “Голас сэрца” П. Броўкі, яе ідэйна-мастацкія асаблівасці.
40. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэзіі Н. Гілевіча.
41. Раман у вершах Н. Гілевіча “Родныя дзеці”: праблематыка, сюжэт і кампазіцыя, сістэма вобразаў.
42. Ідэйна-мастацкія асаблівасці паэзіі А. Вярцінскага.
43. Паэмы А. Вярцінскага.
44. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў прозе І. Пташнікава.
45. Жанрава-тэматычная разнастайнасць творчасці І. Пташнікава 80-90-х гг.
46. Беларуская гісторыя ў раманах В. Адамчыка.

Рэпазіторый ВГУ

## 7 СЕМЕСТР

1. Агульныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай прозы і іх асэнсаванне ў літаратуразнаўчых працах.
2. Праблематыка рамана І. Шамякіна "Сэрца на далоні". Сюжэтна-кампазіцыйныя, стылявыя асаблівасці твора.
3. Ідэйна-тэматычны змест, вобразная сістэма, кампазіцыя пенталогіі І. Шамякіна "Трывожнае шчасце".
4. Ідэйна-мастацкая накіраванасць, жанравая адметнасць рамана І. Шамякіна "Вазьму твой боль".
5. Маральна-этычная праблематыка аповесцей І. Шамякіна "Гандлярка і паэт", "Шлюбная ноч".
6. Ідэйна-мастацкія і жанрава-стылявыя асаблівасці рамана І. Шамякіна "Злая зорка". Літаратуразнаўства пра раман празаіка.
7. Маральна-этычная праблематыка аповесцей І. Шамякіна к. 90-х гг. ХХ – п. ХХІ стст.
8. Тэма вёскі, селяніна і зямлі ў творах А. Жука ("Халодная птушка", "Паляванне на апошняга жураўля", "Праклятая любоў").
9. Ідэйна-тэматычны змест, вобразная сістэма, кампазіцыя аповесці А. Жука "Паляванне на апошняга жураўля".
10. Лёс дзяцей вайны ў аповесці В. Казько "Суд у Слабадзе"
11. Праблемы экалогіі ў рамане В. Казько "Неруш", аповесці "Цвіце на Палессе груша". Міфалагічнае ў прозе В. Казько.
12. Драматызацыя жанру і паглыбленне філасафізму ў аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел".
13. Чарнобыльская трагедыя ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў (С. Алексіевіч "Чарнобыльская малітва", В. Быкаў "Ваўчыная яма", В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел", І. Пташнікаў "Львы"...).
14. Ідэйна-мастацкая накіраванасць, жанравая адметнасць раманнай пенталогіі І. Чыгрынава пра Вялікую Айчынную вайну.
15. Беларуская "вясковая" проза (А. Жук, В. Казько, А. Кудравец, А. Федарэнка).
16. Гістарычная проза У. Арлова.
17. Гістарычная тэма ў сучаснай беларускай прозе.
18. Жанрава-стылявыя, ідэйна-тэматычныя асаблівасці прозы А. Федарэнкі.
19. Ідэйна-тэматычныя, жанрава-стылявыя асаблівасці прозы А. Наварыча.
20. Ідэйна-тэматычныя, жанрава-стылявыя асаблівасці прозы Ю. Станкевіча.
21. Беларуская паэзія на сучасным этапе і яе асэнсаванне ў літаратуразнаўстве.
22. Ідэйна-мастацкія , жанрава-стылявыя асаблівасці паэзіі Рыгора Барадуліна. Творчасць паэта ў літаратуразнаўстве.
23. Рэлігійна-духоўныя і маральна-філасофскія пошукі Р. Барадуліна ў зборніку "Ксты".
24. Смехавая культура ў творчасці Р. Барадуліна (зборнікі "Дойны конь", "Прынамсі", "Асобы螺 рознай пробы", "Неакадэмічная калода", "Дуліна ад Барадуліна" і інш.).
25. Жанр паэмы ў творчасці Р. Барадуліна.
26. Тэматычна-вобразнае багацце паэзіі Л. Дранько-Майсюка. Творчасць паэта ў літаратуразнаўстве.
27. Ідэйна-мастацкія, жанрава-стылявыя асаблівасці паэзіі А. Разанава. Творчасць паэта ў літаратуразнаўстве.
28. Інтэлектуальная заглыбленасць думкі ў паэмных творах А. Разанава ("Гліна", "Усяслаў Чарадзей" і інш.).

Рэпазіторый ВГУ

29. Ідэйна-тэматычная, жанрава-стылявая накіраванасць паэзіі Я. Янішчыц.
30. Паэмныя творы Я. Янішчыц, іх жанравая спецыфіка, вобразны свет, сюжэтна-кампазіцыйная адметнасць (“Ягадны хутар”, “Акно ў дождж”, “Зорная паэма”, “Прызнанне вачамі”).
31. Тэматычна-вобразная, жанрава-стылявая адметнасць драматычнай паэмы Р. Баравіковай “Барбара Радзівіл”.
32. Ідэйна-тэматычныя і жанрава-стылявыя асаблівасці паэзіі Р. Баравіковай. Літаратуразнаўства пра творчасць паэтэсы.
33. Жанр прытчы ў прозе Я. Сіпакова (зборнік “Тыя, што ідуць”).
34. Ідэйна-тэматычная накіраванасць, мастацкая адметнасць паэзіі Я. Сіпакова.
35. Наватарскі характар кнігі Я. Сіпакова “Веча славянскіх балад”. Тэматычная разнастайнасць, жанравы сінтэтызм, стылёвая адметнасць балад.
36. Ідэйна-жанравыя асаблівасці прозы Я. Сіпакова. Філасофска-канцэптуальная аснова твораў празаіка. Адметнасць стылю.
37. Тэматычна-вобразныя, ідэйна-мастацкія асаблівасці паэзіі М. Мятліцкага.
38. Фальклорна-міфалагічныя матывы, культурныя рэмінісцэнцыі ў паэзіі А. Сыса.
39. Маральна-этычная праблематыка, жанравая адметнасць п’ес М. Матукоўскага, (“Мудрамер”, “Бездань”, “Калізей” і інш.).
40. Беларуская драматургія на сучасным этапе (А. Дудараў, А. Петрашкевіч, І. Чыгрынаў, С. Кавалёў, Г. Марчук, У. Бутрамееў).
41. Маральна-этычная праблематыка п’ес А. Дударава (“Вечар”, “Парог”, “Радавыя”, “Злом”).
42. Гістарычная драматургія А. Дударава (“Князь Вітаўт”, “Купала”, “Палачанка”, “Крыж”).
43. Гістарычныя рэтраспекцыі ў сучаснай беларускай драматургіі (І. Чыгрынаў, А. Петрашкевіч, А. Дудараў, Р. Баравікова).
44. Полілінгвістычнасць літаратуры Беларусі.
45. Роля і стан мастацкага перакладу на сучасным этапе.
46. Адлюстраванне ўрбанізаванага жыцця і побыту ў сучаснай беларускай прозе (А. Глобус, Ю. Станкевіч, Г. Багданава).

Репозиторий ВГУ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (ЗАЛІК)

## 7 СЕМЕСТР

1. Планаванне вучэбнай працы па беларускай літаратуры.
2. Пазакласнае (дадатковае) чытанне, формы арганізацыі і кантролю чытацкай дзейнасці вучняў.
3. Вывучэнне пытанняў тэорыі літаратуры ў школе.
4. Вывучэнне драматычных твораў.
5. Вывучэнне эпічных твораў.
6. Вывучэнне лірычных твораў.
7. Этапы вывучэння мастацкага твора на ўроку літаратуры.
8. Шляхі аналізу літаратурнага твора: “следам за аўтарам”, павобразны, праблемна-тэматычны, кампазіцыйны, камбінаваны.
9. Тыпы і структура ўрока літаратуры. Патрабаванні да ўрока літаратуры. Аналіз прапанаванага канспекта ўрока.
10. Паняцце пра метад і прыём выкладання літаратуры ў школе. Класіфікацыя метадаў у сучаснай методыцы.
11. Шляхі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры.
12. Беларуская літаратура ў школе як вучэбны прадмет.
13. Праграмы і вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры, іх змест і прынцыпы пабудовы. Метадычны аналіз вучэбнага дапаможніка (на выбар) па беларускай літаратуры.
14. Методыка выкладання літаратуры як навуковая дысцыпліна.
15. Прынцыпы літаратурнай адукацыі ў сучаснай школе.
16. Вывучэнне жыццёвага і творчага шляху пісьменніка ў межах манаграфічнай тэмы: мэты, крытэрыі адбору матэрыялу, формы арганізацыі вучэбнай працы.
17. Значэнне, віды і формы пазакласнай працы па літаратуры.
18. Гісторыя літаратуры ў школьным вывучэнні: аглядавыя тэмы.
19. Сачыненне – асноўны від пісьмовых работ па літаратуры. Методыка падрыхтоўкі, правядзення і аналізу сачыненняў.
20. Літаратурнае развіццё школьнікаў.
21. Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу.
22. Віды нетрадыцыйных урокаў па літаратуры.
23. Змест і асноўныя этапы літаратурнага навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
24. Развіццё вуснага маўлення на ўроках беларускай літаратуры.
25. Факультатыўныя заняткі па беларускай літаратуры.

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 1-21 05 01 БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАЛОГІЯ**

Зборнік вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных дысцыплінах

Складальнікі:
**КРЫКЛІВЕЦ** Алена Уладзіміраўна
**ПАДСТАЎЛЕНКА** Віталь Феліксавіч
**ГЛАЗМАН** Любоў Якаўлеўна
**РУСІЛКА** Вольга Іванаўна

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп'ютарны дызайн *Л.Р. Жыгунова*

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 7,38. Ул.-выд. арк. 8,94. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ